НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

МАТЭРЫЯЛЫ ПА АРХЕАЛОГІІ БЕЛАРУСІ

MATERIALS ON THE ARCHAEOLOGY OF BELARUS

Зборнік навуковых артыкулаў
Заснаваны ў 1957 годзе

Выпуск 24

Даследаванне сярэдневяковых старажытнасцей Цэнтральнай Беларусі (памяці Ю. А. Заяца)

The investigations of medieval antiquities of Central Belarus (in remembrance of Y. A. Zayatc)

Мінск
«Беларуская навука»
2013

УДК 902/904«653»(476.1)

У выданні прадстаўлены навуковыя працы Ю. А. Заяца па даследаванні старажытнасцей VI–XIII стст. на тэрыторыі Цэнтральнай Беларусі, якія яшчэ не былі ўведзены ў навуковы зварот, а таксама артыкулы іншых даследчыкаў, прысвечаныя сярэдневяковай тэматыцы. У зборнік ўключаны таксама новыя матэрыялы з палявых даследаванняў 2009–2011 гг.

Зборнік навуковых прац разлічаны на археолагаў, гісторыкаў, краязнаўцаў, музейных работнікаў, настаўнікаў і ўсіх тых, хто любіць старажытную гісторыю, цікавіцца матэрыяльнай і духоўнай культурай нашых далёкіх продкаў.

У к л а д а л ь н і к і:

В. М. Ляўко, доктар гістарычных навук, прафесар;
В. Л. Лакіза, кандыдат гістарычных навук;
А. М. Мядзведзеў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я:

В. М. Ляўко, доктар гістарычных навук, прафесар (галоўны рэдактар);
П. Ф. Лысенка, доктар гістарычных навук, прафесар (намеснік галоўнага рэдактара);
Г. В. Штыхаў, доктар гістарычных навук, прафесар;
А. Г. Калечыц, доктар гістарычных навук, прафесар;
Э. М. Загарульскі, доктар гістарычных навук, прафесар;
С. Я. Рассадзін, доктар гістарычных навук, прафесар;
І. А. Марзалюк, доктар гістарычных навук, прафесар;
С. А. Піваварчык, доктар гістарычных навук, дацэнт;
А. М. Мядзведзеў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (адказны сакратар);
В. Л. Лакіза, кандыдат гістарычных навук (намеснік адказнага сакратара)

Н а в у к о в ы р э д а к т а р

В. М. Ляўко, доктар гістарычных навук, прафесар

Р э ц э н з е н т ы:

доктар мастацтвазнаўства, прафесар А. М. Кушнярэвіч,
доктар гістарычных навук, прафесар Г. В. Штыхаў,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. І. Кошман

Выданне падрыхтавана ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гады «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі» (ДПНД «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава») (навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя), падпраграмы № 1 «Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа» («Гісторыя і культура») (кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. В. Даніловіч), раздзела 1 «Археалагічныя помнікі першабытнай і сярэднявечнай эпох на тэрыторыі Беларусі: этнагенэз, дзяржаўнасць, матэрыяльная і духоўная культура» (кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар В. М. Ляўко).

На вокладцы змешчана гербавая кафля з раскопак Ю. А. Заяца ў Заслаўі

ISBN 978-985-08-1543-9

© ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2013
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2013

ЗМЕСТ

Памяці Юрыя Афанасьевіча Заяца 5
Спіс публікацый Юрыя Афанасьевіча Заяца 7

АРТЫКУЛЫ

Заяц Ю. А. Да праблемы распаўсюджвання хрысціянства на Беларусі 12
Заяц Ю. А. Полоцкий княжеский дом: правовой аспект взаимоотношений князей Полоцкого и Киевского домов (985–1129 гг.) 18
Заяц Ю. А. Земли и уделы до середины XIII в. на территории Беларуси в трудах Л. В. Алексеева 22
Заяц Ю. А. Завершение восточно-европейской эпопеи принца Эймунда, или Варяги на юго-восточной окраине Полоцкой земли в первой половине XI в. 28
Заяц Ю. А. Минск: по следам истории 34
Заяц Ю. А. Меньск и его пригороды 38
Заяц Ю. А. Сельские поселения центральных районов Беларуси X – первой половины XIII в. 56
Заяц Ю. А. Характеристика методик и направлений изучения средневековых могильников 69
Віцязь С. П. Прусы ў кантэксце палітычных падзей Старажытнай Русі першай паловы XI ст. 77
Дубицкая Н. Н. Раскопки поселения Симоновичи на р. Птичь 91
Капустин К. Н. «Взлет на холмы» и исторические реалии Южной Руси 99
Левко О. Н. Роль Менского княжества в территориально-административном и политическом развитии Полоцкой земли 103
Магалінскі І. У. Вырабы з каляровых металаў у кантэксце культурна-эканамічных кантактаў Полацка ў X–XVII стст. 113
Марзалюк І. А. Культурны слой Магілёўскага замчышча як гістарычная крыніца 119
Рассадин С. Е. Челенга из Казимира 138
Риер Я. Г. Динамика раннего развития славян в европейском контексте 142
Саливон И. И., Помазанов Н. Н., Хартанович В. И. Краниологическая характеристика серии из курганных погребений XI–XII вв. на территории Витебской области 147
Штыхов Г. В. История Лукомля по письменным источникам и княжеский род Лукомльских 155

МАТЭРЫЯЛЫ

Заяц Ю. А. Археологические памятники территории Менской земли: материалы к археологической карте 158
Заяц Ю. А. Новые памятники археологии в пределах городской черты Минска (правый берег р. Свислочь) 172
Заяц Ю. А. Эталонное поселение X–XIII вв. – селище у д. Дворецкая Слобода 177
Заяц Ю. А. Раскопки большой курганной группы могильника у д. Новосады в верховьях р. Уса 192
Заяц Ю. А. Работы на реставрируемых и реконструируемых объектах Минска (Лошицкий парк, Лошицкий усадебный дом, Замчище) 195
Заяц Ю. А. Отчет об археологических исследованиях участка-2 на территории Замчища в г. Минске летом 2009 г. 200
Ашэйчык В. Выпадковая знаходка каменнай шліфаванай сякеры-кліна з Пухавіцкага раёна 231

Ляшкевич Э. А. Предметы и объекты рыболовного промысла из раскопок археологического комплекса на р. Менка 233

Рассадин С. Е., Звягинцев В. Б. Монастырский и местечковый остеологические комплексы по раскопкам 2011 г. 236

Ткачева М. И. Случайные находки неолитической керамики с территории Гомельского и Добрушского районов 239

ПАЛЯВЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ (2009–2011 гг.)

Першабытны перыяд

Белявец В. Г. Археалагічныя разведкі у Бярозаўскім раёне ў 2011 г. 243

Вашанаў А. М. Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Бялыніцкага і Івацэвіцкага раёнаў у 2011 г. 251

Зуева А. У. Вынікі археалагічных раскопак паселішча Краснасельскі-8 у 2011 г. 259

Калечиц Е. Г. Археологические разведки на территории Берестовицкого и Пружанского районов в 2009 г. 265

Калечиц Е. Г. Археологические разведки в междуречье Ясельды и Пины в 2011 г. 269

Колосов А. В. Археологические работы на территории Могилевской области в 2011 г. 271

Колосов А. В., Хомченко Я. Л. Результаты археологических работ в бассейне р. Остер в 2011 г. 278

Лакіза В. Л. Археалагічныя даследаванні ў зоне будаўніцтва Гродзенскай ГЭС на р. Нёман у 2010–2011 гг. 283

Лакіза В. Л. Папярэднія вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 2011 г. ... 293

Ткачоў А. Ю. Археалагічныя даследаванні на поўдні Белавежскай пушчы ў 2011 г. 303

Харытановіч З. А. Археалагічныя даследаванні гарадзішча Бірулі ў 2011 г. 308

Чарняўскі Макс. М. Даследаванні на Беларускім Паазер'і ў 2011 г. 313

Чарняўскі Міх. М. Даследаванні на Панямонні і Падзвінні ў 2011 г. 319

Язэпенка І. М., Юрэцкі С. С. Раскопкі на паселішчы каменнага веку Ніжняя Алба-1 (урочышча Лукошыніца) у нізоўі р. Бярэзіна ў 2011 г. 323

Перыяд сярэдневякоўя і ранняга новага часу

Вайцяховіч А. В., Плавінскі М. А. Новыя даследаванні археалагічнага комплексу на р. Менка..... 329

Войтехович А. В. Археологические работы на селище «Дружба» в городе Минске в 2011 г. 334

Вяргей В. С. Даследаванні на паселішчы Снядзін-3 у Петрыкаўскім раёне ў 2011 г. 342

Иов О. В. Раскопки древнерусских памятников в Припятском Полесье 349

Касюк А. Асноўныя вынікі археалагічных даследаванняў на Палессі ў 2011 г. 355

Клімаў М. В. Завяршэнне археалагічных доследаў на помніку Лучна-1 362

Кошман В. І. Археалагічныя даследаванні помнікаў басейна сярэдняй Бярэзіны ў 2011 г. 368

Левко О. Н. Археологические исследования строительного котлована под административное здание в г. Витебске по ул. Калинина в 2010–2011 гг. 374

Левко О. Н. Исследования на территории Задвинья в г. Витебске в 2011 г. 380

ПАМЯЦІ ЮРЫЯ АФАНАСЬЕВІЧА ЗАЯЦА



Прайшлі амаль два гады, як пайшоў з жыцця наш калега, які пакінуў прыкметны след у айчыннай археалогіі і гісторыі – Юрый Афанасьевіч Заяц. У студзені 2011 г. калектыў археолагаў інстытута адзначыў 60-годдзе навукоўца, а ўжо 3 красавіка таго ж года яго не стала.

Больш за 30 гадоў прайшло з таго часу, як будучы маладым чалавекам, Юрый Афанасьевіч упершыню ў 1979 г. прыйшоў працаваць у Інстытут гісторыі на пасаду старшага лабаранта і адначасова стаў аспірантам-завочнікам гэтай навуковай установы. Аднак да пачатку працы ў Інстытуце гісторыі ў яго ўжо быў некаторы досвед паслявузаўскай практычнай дзейнасці. Скончыўшы ў 1977 г. Мінскі педагагічны інстытут, Ю. А. Заяц стаў супрацоўнікам Дзяржаўнага музея Беларускай ССР, а ў 1978 г. перайшоў на працу ў сектар старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Там ён займаўся падрыхтоўкай да экспанавання ў новым музеі археалагічных калекцый, якія паступалі з Інстытута гісторыі. Гэтая праца не была для яго складанай, таму што яшчэ ў студэнцкія гады Ю. А. Заяц неаднаразова выязджаў ў археалагічныя экспедыцыі Г. В. Штыхава, засвойваючы прафесію археолага ў палявых умовах. Будучая навуковая дзейнасць у гэтай галіне ўяўлялася Юрыю Афанасьевічу жаданай і цалкам магчымай, таму, рыхтуючы сябе да яе, ён актыўна ўдзельнічаў з дакладамі ў рэспубліканскіх і ўсесаюзных навуковых студэнцкіх канферэнцыях. Прыйшоўшы ў Інстытут гісторыі АН БССР, малады спецыяліст пад кіраўніцтвам настаўніка – Георгія Васільевіча – прыступіў да падрыхтоўкі кандыдацкай дысертацыі па старажытным Ізяслаўлі. Яшчэ да яе паспяховай абароны ў Інстытуце археалогіі АН УССР ў 1989 г. ён апублікаваў невялікую, але вельмі прафесійна падрыхтаваную манаграфічную працу «Заславль X–XVIII веков (историко-археологический очерк)» (1987), заявіўшы сябе перспектыўным археолагам і гісторыкам-медыевістам. Гэтыя рысы выявіліся і ў навуковых выданнях Ю. А. Заяца: «Заслаўская кафля» (1990), «Оборонительные сооружения Минска XI–XIII вв.» (1996). Уменне глыбока аналізаваць фактычны матэрыял, укараняць у навуку новыя, добра абгрунтаваныя ідэі, імкненне прафесійна вывучаць тыя накірункі ў археалогіі і гісторыі, якімі раней не займаўся, і затым на добрым акадэмічным узроўні публікаваць вынікі сваёй працы – вось галоўныя якасці, якія адрознівалі Юрыя Афанасьевіча Заяца як навукоўца. За час навуковай працы ў Інстытуце гісторыі (з 1980 па 1989 г. – малодшы навуковы супрацоўнік сектара археалогіі сярэдневяковага перыяду, з 1989 па 1992 г. – навуковы супрацоўнік аддзела археалагічных даследаванняў зон новабудоўляў, з 1992 па 2001 г. – старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі і гісторыі Полацкай зямлі) ён апублікаваў значную колькасць рознабаковых навуковых прац, у тым ліку аднаасобныя манаграфіі і раздзелы ў калектыўных фундаментальных працах, шматлікія разгорнутыя і абагульняючыя артыкулы ў энцыклапедычных выданнях. Навуковыя інтарэсы Ю. А. Заяца былі сканцэнтраваны ў галіне вывучэння гісторыі і археалогіі старажытных гарадоў, сельскіх паселішчаў, пахавальных помнікаў, галоўным чынам, з тэрыторыі цэнтральнай Беларусі (Менская зямля). За манаграфію «Заславль в эпоху феодализма» (1995) ён быў удастоены звання Ганаровага грамадзяніна г. Заслаўля. Вялікі ўклад зроблены Ю. А. Заяцам у падрыхтоўку 4-га тома фундаментальнага выдання «Археалогія Беларусі» (2001), у якім прадстаўлены напісаныя ім часткі, а таксама праведзена вялікая праца ў складзе навуковай рэдкалегіі.

За плённую працу ў вышэйшых навучальных установах: Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце і Беларускім дзяржаўным тэхналагічным ўніверсітэце на працягу 2001–2005 гг., дзе раскрыліся выкладчыцкія здольнасці Ю. А. Заяца, – яму было прысвоена вучонае званне дацэнта (2009).

Асаблівую цікавасць у Ю. А. Заяца выклікалі сярэдневяковая ваенна-палітычная тэматыка і гісторыя хрысціянства. Гэтым пытанням прысвечаны шэраг яго найноўшых публікацый пасля вяртання на працу ў Інстытут гісторыі ў канцы 2005 г. У іх прадстаўлена арыгінальнае бачанне праблем, звязаных з развіццём абарончых (Мірскі замак, 2006), стратэгічных і тактычных (бітва пад Клецкам, 2007) магчымасцей Вялікага

Княства Літоўскага у эпоху сярэдневякоўя. Гэтыя пытанні адлюстраваны і ў падрыхтаваных Ю. А. Заяцам параграфах калектыўнай працы «Беларусь: народ, государство, время» (2009).

Працуючы ў складзе аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны, сваю навуковую дзейнасць Юрый Афанасьевіч спалучаў з працай па правядзенні ахоўных археалагічных раскопак на тэрыторыі г. Мінска і ў яго наваколлях, актыўна папулярызаваў археалагічную навуку, стаў адным з аўтараў даведачнага выдання «Археологическая научно-музейная экспозиция НАН Беларуси» (2009).

Ю. А. Заяц заўсёды меў заслужаны аўтарытэт прынцыповага вучонага-прафесіянала не толькі сярод сваіх калег, але і ў краінах блізкага замежжа.

Беларуская археалагічная навука панесла значную страту ў асобе Юрыя Афанасьевіча Заяца. Засталася незавершанай яго шматгадовая праца – доктарская дысертацыя «Менская земля», па матэрыялах да якой ён апублікаваў і падрыхтаваў да друку шэраг важных артыкулаў і частак даследавання. У гэтым зборніку мы прадстаўляем найбольш значныя для тэмы «Менская зямля» і некаторыя раней не ўведзеныя ў навуковы зварот працы Ю. А. Заяца.

Калектыў археолагаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі

СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ЮРЫЯ АФАНАСЬЕВІЧА ЗАЯЦА

Манаграфіі і брашуры

Заславль X–XVIII веков : ист.-археолог. очерк. – Минск : Наука и техника, 1987. – 63 с.

Заслаўская кафля. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 62 с.

Заславль в эпоху феодализма. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 207 с.

Оборонительные сооружения Менска XI–XIII вв. – Минск : Изд. В. Н. Милютин, 1996. – 79 с.

Археалогія Беларусі : у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 4 : Помнікі XIV–XVIII стст. (Калектыўная манаграфія, у якой аўтарам напісаны наступныя раздзелы і параграфы і падрыхтаваны ілюстрацыі да іх: Уступ – с. 5–10; Асаблівасці матэрыяльнай культуры мястэчак (у сааўт. з Ю. М. Боханам) – с. 62–65; Замкі – с. 66–84, 146, 159, 173–188; Кафля і кафляныя печы – с. 319–348, 443– 459; рэзюмэ (на рускай мове) – с. 503–505, 509–510, 511–512, 512–516, 518, 519, 520, 555–557, 558–559, 560, 561. Аб'ём – 10,12 друк. арк. Аўтар таксама з'яўляецца адным з навуковых рэдактараў тома і членам рэдакцыйнай калегіі ўсіх тамоў выдання.)

Аўтарэферат

Заславль (Изяславль) X–VIII вв. Хронология и социально-историческая топография. – Киев, 1989. – 19 с. – Объем – 1,25 печ. л.

Артыкулы навуковыя, рэфераты

Работы в окрестностях Заславля и Дзержинска // Археологические открытия 1977 г. – М. : Наука, 1978. – С. 414.

Раскопки и разведки в окрестностях Заславля // Археологические открытия 1978 г. – М. : Наука, 1979. – С. 435.

Раскопки в окрестностях Заславля // Археологические открытия 1979 г. – М. : Наука, 1980. – С. 362.

Работы Заславльского отряда // Археологические открытия 1980 г. – М. : Наука, 1981. – С. 335–336.

К истории изучения древнего Изяславля // Древности Белоруссии и Литвы. – Минск : Наука и техника, 1982. – С. 110–116.

Работы Заславльского отряда // Археологические открытия 1981 г. – М. : Наука, 1983. – С. 349.

Гарадзішча Замэчак у Заслаўі // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1983. – № 3. – С. 70–76.

Курганный могильник Изяславля // Древнерусское государство и славяне. – Минск : Наука и техника, 1983. – С. 36–40.

Раскопки посада Изяславля // Археологические открытия 1982 г. – М. : Наука, 1984. – С. 365.

Беларуская кафля з выявай чалавека // Мастацтва Беларусі. – 1983. – № 3. – С. 53–55 (у сааўт. з В. М. Ляўко).

Работы в Изяславле // Археологические открытия 1983 г. – М. : Наука, 1985. – С. 390–391.

Таямніцы геральдыкі : Датаванне некаторых тыпаў заслаўскай кафлі // Мастацтва Беларусі. – 1985. – № 8. – С. 68–71.

Зброя блізкага бою, рыштунак коніка і верхавога каня з раскопак Заслаўя // Помнікі культуры. Новыя адкрыцці. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – С. 183–190.

Раскопки в Минске // Археологические открытия 1984 г. – М. : Наука, 1986. – С. 386–389 (в соавт. с Г. В. Штыховым, М. Ф. Гуриным).

Исследования в Минске и его округе // Археологические открытия 1986 г. – М. : Наука, 1988. – С. 386–389 (в соавт. с Г. В. Штыховым, З. С. Позняком).

Минская брама XII ст. // Помнікі культуры Беларусі : Новыя даследванні – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – С. 174–179.

Керамическая посуда Заславля // Сярэдневекавыя старажытнасці Беларусі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – С. 107–118.

Дзейнасць Заслаўска-Мінскага атрада // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1993. – № 1. – С. 123–125.

Полоцкие события «Саги об Эймунде» // Полоцкий летописец. – 1993. – № 1(2). – С. 5–11.

Мінская зямля : Этапы фарміравання // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 4. – С. 8–15.

Паселішча X–XIII стст. каля в. Дружба (Рылаўшчына) // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 1993. – С. 132–147.

Проблема возникновения Минска и поселения на р. Менка в свете исследования их округи // Археалогія і старажытная гісторыя Магілёўшчыны і сумежных тэрыторый : матэрыялы канф. – Магілёў, 1994. – С. 165–167.

Полоцкий князь Всеслав и Ярославичи в 1065–1069 гг. : от Пскова до Белгорода // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 1994. – № 4. – С. 88–113.

У истоков белорусской государственности : у 2 ч. // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы) : Усебеларус. канф. гісторыкаў. – Мінск : Універсітэтскае, 1994. – Ч. 1 : Гісторыя Беларусі. – С. 24–28.

Социальные группы населения Изяславля на стадии формирования и раннем этапе развития города (X–XI вв.) : по материалам Заславского курганного могильника // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 1996. – № 8. – С. 129–147.

Анусинские курганы // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 1996. № 10. – С. 43–57.

Заславль в эпоху феодализма // Беларусістыка : рэферат. зб. : Гуманітарныя і сацыяльныя навукі. – Мінск, 1996. – № 28. – С. 41–52.

Основные итоги археологического изучения Заславля // Заслаўскія чытанні 1995 г. – Заслаўе, 1997. – С. 48–50.

Новые археологические исследования Заславля // Заслаўскія чытанні 1995 г. – Заслаўе, 1997. – С. 50–56.

История белорусских земель X – первой половины XIII в. в отображении летописей и хроник Великого княжества Литовского // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 1997. – № 12. – С. 85–91.

О постройке с изразцовыми печами возле княжеского терема в Полоцке // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 1997. – № 12. – С. 92–102.

Оборонительные сооружения Менска XI–XIII вв. // Беларусістыка : рэферат. зб. : Гуманітарныя і сацыяльныя навукі. – Мінск, 1997. – № 29. – С. 84–86.

Роль земледелия и животноводства в хозяйстве горожан Беларуси в X–XIII вв. // Труды VI Междунар. конгр. славян. археолог. – М., 1998. – Т. 4 : Общество, экономика, культура и искусство славян. – С. 61–69.

К вопросу о достоверности татищевского рассказа о Святохне // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 2000. – № 15. – С. 106–115.

Друцк и Друть // Материалы к науч.-практ. конф. – Витебск, 2001. – С. 18–24.

Новые археологические исследования Верхнего города Минска // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 2001. – № 16. – С. 151–166.

Эволюция системы расселения в центральной Белоруссии в X–XVIII вв. (на примере Лошицкого микрорегиона) // Проблемы археологии и древней истории Верхнего Поднепровья и соседних территорий : Междунар. науч. конф. (докл. и сообщ.), Могилев, 30 янв.–1 февр. 2002 г. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2002. – С. 193–201.

К вопросу о времени зарождения и первоначальной топографической структуре г. Гродно (летописного Городно) // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2003. – № 7. – С. 20–22.

Великий князь литовский Витовт как политик, военный и государственный деятель // Труды БГТУ. – Минск, 2003. – Сер. V, вып. XI. – С. 42–52.

Новые материалы и памятники раннего железного века и третьей четверти первого тысячелетия н. э. в Минском Поднепровье и Витебском Подвинье // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2003. – Вып. 8 : Ранние славяне Белорусского Поднепровья и Подвинья. – С. 118–126.

Земли-княжения и уделы периода феодальной раздробленности на территории Беларуси в историков и археологов // Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі : у 3 ч. : матэрыялы Рэспубл. навук.-практ. канф., Мінск, 28 лістап. 2003 г. – Мінск : Вучэбна-выдавецкі цэнтр БДПУ, 2003. – С. 15–23.

Правовой аспект взаимоотношений князей полоцкого и киевского домов (985–1129 гг.) // Беларусь Украіна : гістарычны вопыт узаемаадносін : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 18–19 сакав. 2003 г. – Мінск, 2004. – С. 59–63.

Деятельность краеведческих обществ в первой трети XX в. (организационное оформление краеведческого движения в Беларуси) // Труды БГТУ. – Минск, 2004. – Сер. V, вып. XII. – С. 40–45.

К проблеме первоначального Менска (сравнительная хронология поселений на реках Немига и Мена) // Материалы по археологии Беларуси. – Минск, 2005. – Вып. 9 : Древности Белоруссии (железный век и средневековье). – С. 26–31.

Результаты разведочных работ на территории неукрепленной феодальной усадьбы Лошица Сухая // Материалы по археологии Беларуси. – Минск, 2005. – Вып. 9 : Древности Белоруссии (железный век и средневековье). – С. 188–194.

Сельские поселения и курганные могильники Менской земли в верхнем течении рек Птичь и Свислочь // Шляхі магілёўскай гісторыі : зб. навук. прац удзельнікаў IV Міжнар. навук. канф. «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць». – Магілёў, 2005. – С. 15–20.

Е. Р. Романов – один из зачинателей изучения периода позднего средневековья (XIV–XVIII вв.) в Беларуси // «Открыть миру душу белоруса…» : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., прысв. 150-годдзю з дня нараджэння Е. Р. Раманава, Гомель, 25–26 кастр. 2005 г. – Гомель, 2005. – С. 45–47.

Археологические памятники Менской земли (курганные могильники и селища) в верхнем течении рек Птичь и Свислочь // Материалы по археологии Беларуси. – Минск, 2006. – Вып. 11 : Древности Беларуси в системе международных связей. – С. 114–117.

О прототипе изображения на лицевой пластине изразца XVII в. из Тупичевского монастыря в г. Мстиславле // Религия и общество : актуальные проблемы современного религиоведения : сб. науч. трудов / под общ. ред. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2008. – С. 84–90.

Менск на Свислочи конца XI – XIII в. : проблема формирования поселенческой структуры // Мінск і мінчане : дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя горада) : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 7–9 верас. 2007 г. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – С. 23–30.

Новые памятники археологии в пределах городской черты Минска (правый берег Свислочи) // Древняя история восточной Европы : сб. науч. ст., посвящ. 80-летию проф. Э. М. Загорульского. – Минск : БГУ, 2009. – С. 55–67.

Тэзісы дакладаў

К вопросу о происхождении Изяславля // Актуальные проблемы археологических исследований в Украинской ССР : тез. докл. республ. конф. молодых ученых, Киев, апр. 1981 г. – Киев, 1981. – С. 118.

Менская волость-удел в X–XII вв. // История и археология Полоцка и Полоцкой земли : тез. докл. конф. – Полоцк, 1987. – С. 21–22.

Сельское население Менской волости-удела X–XIII вв. // Сельское хозяйство : история, современный опыт и перестройка : тез. докл. конф. – Минск, 1988. – С. 15–17.

Новые данные об оборонительных сооружениях Менска второй половины XI – XII в. // Археология и история Пскова и Псковской земли : тез. докл. науч.-практ. конф. – Псков, 1988. – С. 77–79.

Об одной группе погребений Заславского курганного могильника // Археология и история Пскова и Псковской земли : тез. докл. науч.-практ. конф. – Псков, 1990. – С. 55–56.

Сельские поселения на р. Лошица // Древнерусская деревня. Археологическое исследование микрорегионов : тез. докл. науч. конф. – М., 1991. – С. 20–21.

Полоцкие события «Саги об Эймунде» // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : тэз. дакл. навук. канф., прысвеч. 1130-годдзю Полацка. – Полацк, 1992. – С. 23–24.

Распространение христианства в городах Полоцкой земли (по материалам археологии) // Тэз. дакл. навук. канф., прысвеч. 1000-годдзю Полацкай епархіі праваслаўнай царквы на Беларусі, Мінск, 25 верас. 1992 г. – Мінск, 1992. – С. 21–22.

У истоков белорусской государственности // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы) : Тэз. дакл. і паведамленняў Усебеларус. канф. гісторыкаў. – Мінск, 1993. – Ч. 1. – С. 27–29.

К вопросу о сельском населении Изяславского удела Полоцкой земли в X–XII вв. // Час, помнікі, людзі. Памяці рэпрэсаваных археолагаў : тэз. дакл. Міжнар. канф. – Мінск, 1993. – С. 50–53.

Роль земледелия и животноводства в хозяйстве горожан Беларуси в X–XIII вв. // Тэз. дакл. і паведамленняў беларускай дэлегацыі на VI Міжнар. кангр. славянскай археалогіі, Ноўгарад, 26–31 жн. 1996 г. – Мінск, 1996. – С. 28–30.

Рэцэнзіі

Новае даследаванне па археалогіі Старога замка ў Гародні // Крыўя, 1996. – № 1. – С. 97–111. – Рэц. на кн. : Трусаў, А. А. Стары замак у Гродне. XI–XVIII стст. : гістар.-археалаг. нарыс / А. А. Трусаў, В. Е. Собаль, Н. І. Здановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 152 с. : іл.

Адлюстраванне міфа ці міфатворчасць? // Мастацтва, 1996. – № 8. – С. 62–64. – Рэц. на музейную экспазіцыю : «Мара аб Заслаўі» ў дзяржаўным гісторыка-культурным запаведніку «Заслаўе».

Беларускі гістарычны агляд. – 1998. – Т. 5, сш. 1(8). – С. 242–257. – Рэц. на кн. : Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да 1996 г. : у 3 т. – Мінск, 1997. – Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. – 431 с.

Навукова-метадычныя публікацыі

Паходжанне беларусаў // Матэрыялы па гісторыі Беларусі. – Мінск, 1997. – С. 4–9.

Праблема дзяржаўнасці ва ўсходніх славян і на беларускіх землях у курсе гісторыі для 10-га класа сярэдняй школы // Матэрыялы па гісторыі Беларусі. – Мінск, 1997. – С. 9–16.

Распаўсюджванне хрысціянства на беларускіх землях // Матэрыялы па гісторыі Беларусі. – Мінск, 1997. – С. 16–21.

Узнікнене і развіццё ўсходнеславянскіх і старабеларускіх гарадоў (да канца XIII ст.) // Матэрыялы па гісторыі Беларусі. – Мінск, 1997.

Артыкулы ў энцыклапедычных выданнях

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск : БелСЭ, 1985. – Т. 2. – Са зместу : Заслаўская кафля (с. 494–495); Заслаўская кераміка (с. 496).

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1985. – Са зместу : В. Бор, курганный могільнікі (с. 276); в. Занькі, курганны могільнік (с. 279); в. Звязда, гарадзішча, курганныя могільнікі, курган (у сааўт. з А. Р. Мітрафанавым) (с. 281, 283).

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. – Мінск : БелСЭ, 1986. – Т. 3. – Са зместу : Кастрыца (с. 581).

Збор помнікаў гісторыі і культры Беларусі. Мінская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1987. – Кн. 1. – Са зместу : в. Аздяцічы, гарадзішча, курганныя могільнікі (у сааўт. з Г. В. Штыхавым) (с. 62–63); в. Бягі, курганны могільнік (с. 65); в. Гара, курган (с. 66); в. Вяляцічы, курганныя могільнікі (с. 67); в Ніўкі, курганныя могільнікі (у сааўт. з Г. В. Штыхавым) (с. 78); г. Дзяржынск, гарадзішча (с. 81); в. Баравікі, курганны могільнік (с. 163); в. Грычына, курганныя могільнікі (с. 165–166); в. Каменка, гарадзішча, селішчы, курганны могільнік (с. 169); в. Курганне, курганныя могільнікі, курган (с. 170); в. Леніна, курган (с. 171); в. Лукашына, курганны могільнік (с. 172); в. Навасады, гарадзішча, селішчы, курганныя могільнікі (с. 173); в. Павуссе, курганныя могільнікі, в. Перхурава, курганны могільнік (с. 174); в. Радзіма, курганныя могільнікі, в. Ружампаль, курган; в. Скварцы, курган, в. Слабодка, курганныя могільнікі (с. 175); в. Старая Рудзіца, гарадзішча, в Цяўлава, курган, в. Чэрнікаўшчыны, курганны могільнік, курган (с. 177); в. Шпількі, курганны могільнік (с. 178); в. Шыкатавічы, курган (с. 179).

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1987. – Са зместу : В. Анусіна, курганны могільнік (у сааўт. з Э. М. Зайкоўскім) (с. 42); Заслаўе : горад (у сааўт. з В. Б. Караткевіч, Т. І. Чарняўскай), бескурганны могільнік, гарадзішча Вал, гарадзішча Замэчак, курганны могільнік (с. 46–48, 48–49, 49–51).

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінск. – Мінск : БелСЭ, 1988. – Са зместу : г. Мінск : рэшткі замка, селішча, курганны могільнік, курган (у сааўт. з Г. В. Штыхавым) (с. 65–67, 68, 147–148).

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск : БелСЭ, 1987. – Т. 4. – Са зместу : Пацеркі (с. 229–230).

Архітэктура Беларусі : энцыкл. даведнік. – Мінск : БелСЭ, 1993. – Са зместу : Заслаўе (у сааўт. з Р. А. Арцёмчыкам) (с. 220–221); Мінская брама (с. 319).

Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. – Мінск : БелЭн, 1993. – Са зместу : Анусіна (с. 40); Барздынь (с. 46); Бранзалет (у саўт. з С. Я. Расадзіным, Т. С. Скрыпчанка) (с. 94–95); Васілеўшчына (с. 116), Вяляцічы (с. 146–147); геральдыка (у сааўт. з Г.В. Штыхавым) (с. 170); Грычына (с. 200); Дворышча (с. 214); Доўбарава (с. 229–230); Дружба (с. 233–234); Дудаўка (с. 243); Заслаўе (с. 264–265); Заслаўскае гарадзішча «Замэчак» (с. 265); Заслаўскі бескурганны могільнік (с. 265); Заслаўскі замак (с. 265–267); Заслаўскія курганныя могільнікі (с. 267–268); Каменка (с. 298); Клінок (с. 331–332); Лошыцкія могільнікі (с. 374); Мінская брама (с. 430); Міцуры (у саўт. з Г. В. Штыхавым) (с. 439); Навасады (с. 456); Нож (у сааўт. з В. Я. Кудрашовым, С. Я. Расадзіным) (с. 466–467); Пацеркі (с. 492); Пашкавічы (с. 492–493); Пятроўшчына (с. 526); Сенніца (с. 561–562); Чэрнікаўшчына (с. 648).

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск : БелЭн, 1993. – Т. 1. – Са зместу : Барысаўскі раён (у сааўт. з Кіберман) (с. 322–323).

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск : БелЭн, 1994. – Т. 2. – Са зместу : Бранзалет (у сааўт. з С. Я. Расадзіным, Т. С. Скрыпчанка) (с. 65); Вяляцічы (с. 439).

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск : БелЭн, 1996. – Т. 3. – Са зместу : Глябовічы (с. 53); Заслаўе (с. 410); Заслаўскі замак (с. 411–412); Ізяслаўскае княства (с. 478).

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск : БелЭн, 1997. – Т. 5. – Са зместу : Кіеўскае паўстанне 1068–1069 гг. (с. 167–168).

Энцыклапедыя ВКЛ. – Мінск : БелЭН, 2005. – Т. 1. – Са зместу : Глябовічы (с. 540); Заслаўскі замак (с. 648–649).

Археалогія Беларусі : энцыкл. : у 2 т. – Мінск : БелЭН, 2009. – Т. 1. – Са зместу : Абарончыя збудаванні (с. 23); Азярышча (с. 25); Анусіна (с. 36); Барздынь (с. 86); Бастыён (с. 91); Бастэя (с. 91); Брама (с. 113–114); Бранзалет (с. 114–115); Брылеўшчына (с. 122); Васілеўшчына (с. 147); Вежа (с. 153); Гарадзішча (с. 222–223); Геральдыка (с. 237–238); Грычына (с. 272–273); Дворыцкая Слабада (с. 295–296); Дворышча (с. 296); Дзяржынскі (Койданаўскі) замак (с. 303); Дзядзінец (с. 303–304); Дружба (с. 315–331); Дуброва (с. 326); Дудаўка (с. 327); Жужлянка (с. 326–327); Забарола (с. 345); Замак (с. 351); Заслаўе (с. 361–362); Заслаўскае Гарадзішча «Замэчак» (с. 362–363); Заслаўскі бескурганны могільнік (с. 363); Заслаўскі Дзяржаўны гісторыка-культурны запаведнік (с. 363); Заслаўскі замак (с. 363–364); Заслаўскія курганныя могільнікі і курганы (с. 364–366); Іказненскі замак (с. 382); Каменка (с. 404–405); Канвентхаўз (с. 416); Кангрэсы МУСА (с. 416–417); Кастэль (с. 42); Кіеўская Русь (с. 444–446).

Археалогія Беларусі : энцыкл. : у 2 т. – Мінск : БелЭН імя Петруся Броўкі, 2011. – Т. 2. – Са зместу : Лецкаўшчына (с. 14); Ліпень (с. 17); Лошыцкія курганныя могільнікі (с. 25); Лошыцкія селішчы (с. 25); Мінская брама (с. 79); Навасады (с. 120); Пацеркі (с. 178–179); Пашкавічы (с. 179); Усціж (с. 370); Чэрнікаўшчына (с. 408–409).

Навукова-папулярныя выданні

Зямля нашых продкаў. Помнікі археалогіі. У складзе Полацкай дзяржавы // Памяць : гіст.-дакумент. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Мінскі раён. – Мінск : БелЭн, 1988. – С. 23–32, 33–37, 40–45.

Зямля нашых продкаў. Археалагічныя помнікі Заслаўя. Заславская кафля. У складзе Полацкай дзяржавы. Заслаўе ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Заслаўе ў складзе Рэчы Паспалітай // Памяць : гіст.-дакумент. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. г. Заслаўе. – Мінск : БелТА, 2000. – С. 20–52, 59–77.

Лошыцкія могільнікі. Курганы Рылаўшчыны. Бітва на Чарэсе і Нямізе. Цэнтр воласці, удзельнага княства, зямлі. Брама // Памяць : гіст.-дакумент. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. г. Мінск : у 4 кн. – Мінск : БелТА, 2001. – Кн. 1. – С. 45, 45–46, 70–71, 82–83. 106–107.

Помнікі археалогіі : Баравікі, Васілеўшчына, Вялікія Навасёлкі, Глухое Перхурава, Грычына; Забалоцце, Зарэчнае, Каменка; Крысава, Курганне, Курганы, Леніна, Лукашына, Машніца, Мезенаўка, Мораўшчына, Навасады, Павуссе, Перацяткі, Путчына, Перхурава, Радзіма, Ружампаль, Скварцы, Слабодка, Цяўлава, Чэрнікаўшчына, Шпількі, Шыкатавічы // Памяць : гіст.-дакумент. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Дзяржынскі раён. – Мінск : БелТА, 2004. – С. 27–29, 30–35, 35–36, 37–38.

Заславль : знакомый и незнакомый // Архитектура и строительство. – 2006. – № 2. – С. 82–85.

Примирить город и историю // Архитектура и строительство. – 2008. – № 9. – С. 14–19.

АРТЫКУЛЫ

УДК 27-9(476)

Ю. А. Заяц, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, старшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Мінск)*

Да праблемы распаўсюджвання хрысціянства на Беларусі

У гісторыі Беларусі, як і ў гісторыі іншых краін Еўропы, адной з найбольш значных падзей было прыняцце і распаўсюджванне хрысціянскай рэлігіі. У вывучэнні гэтай з'явы вызначальнымі з'яўляюцца наступныя праблемы:

– час зацвярджэння хрысціянства ў якасці афіцыйнай (дзяржаўнай) рэлігіі;

– распаўсюджванне новай веры ў часе і прасторы;

– умацаванне, ці ўкараненне новай веры сярод насельніцтва, тое, што ў багаслоўскай традыцыі называецца «глыбінёй схілення да веры».

Немалаважным з'яўляецца таксама пытанне аб адносінах да новай рэлігіі розных сацыяльных пластоў насельніцтва, а для тэрыторый з поліэтнічным насельніцтвам – і пытанне аб успрыманні новай веры прадстаўнікамі розных плямён (этнасаў). Для дзяржаў і тэрыторый, якія параўнальна позна ўспрынялі хрысціянства, значнай з'яўляецца таксама праблема аб шляхах яго пранікнення, гэта значыць аб тым, ад каго непасрэдна (краіна, місія) было яно ўспрынята.

У беларускай гістарычнай навуцы большасць гэтых пытанняў, калі не сказаць «усе», не атрымалі адпаведнай распрацоўкі, прыкладам чаго з'яўляюцца сучасныя навуковыя, навукова-папулярныя выданні, а таксама падручнікі. Асноўнымі недахопамі гэтых выданняў і прац з'яўляюцца ігнараванне рускіх, расійскіх, ўкраінскіх і польскіх даследаванняў па праблеме і адсутнасць комплекснага падыходу і навуковай аб'ектыўнасці ў выкарыстанні і ацэнцы ўсяго комплексу крыніц.

Неабходна адзначыць, што пісьмовыя крыніцы, якія з'яўляюцца асноўнай базай шмат якіх даследаванняў, характарызуюцца малой інфарматыўнасцю (асабліва для тэрыторыі Беларусі) і пэўнай супярэчлівасцю звестак. Археалагічныя крыніцы, больш шматлікія, даюць звесткі ўскоснага характару, якія дазваляюць па-рознаму іх інтэрпрэтаваць.

Большасць даследчыкаў зыходзяць з таго, што падчас увядзення вялікім князем Уладзімірам хрысціянства ў якасці афіцыйнай (дзяржаўнай) рэлігіі, амаль уся тэрыторыя Беларусі, у тым ліку і Полацкае княства, уваходзіла ў склад Кіеўскай Русі, і таму дата прыняцця хрысціянства Кіеўскай Руссю ёсць таксама і датай хрышчэння беларускіх земляў. З гэтай думкай трэба пагадзіцца, таму што ніякіх слушных звестак і доказаў аб хрысціянізацыі ранніх дзяржаўных утварэнняў, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі, няма.

Не выклікае сумнення інфармацыя «Аповесці мінулых гадоў», што Кіеўская Русь прыняла хрысціянства ў яго ўсходнім варыянце (праваслаўе) ад Візантыйскай царквы. Версіі аб прыняцці праваслаўя ад аўтакефальнай Ахрыдскай царквы [12, с. 35–38, 42–45] звычайна рэаніміруюцца, калі ўзнікаюць ідэі стварэння ў той ці іншай сучаснай дзяржаве альбо яе частцы царквы, адасобленай ад Маскоўскай патрыярхіі, і патрабуецца абгрунтаваць гэтыя намеры гістарычнымі прыкладамі. Аднак ніякіх слушных доказаў гісторыкі, якія спрабуюць зрабіць падобнае абгрунтаванне, у сваіх публікацыях не прыводзяць, а хутчэй, не ў стане прывесці.

Даследаванні, новыя пераклады і прачытанні расійскімі гісторыкамі прац візантыйскіх і арабскіх аўтараў пераканаўча паказалі, што хрышчэнне вялікім князем Уладзімірам жыхароў сталіцы Кіеўскай Русі – акт, які сімвалізаваў хрысціянізацыю краіны, адбыўся менавіта ў 988 г., верагодна, 1 жніўня [1, с. 39, 46; 13, с. 46].

Аднак гэтая дата не тлумачыць ні хуткага і паспяховага распаўсюджвання хрысціянства ва Усходняй Еўропе, ні наяўнасці раней за 988 г. хрысціянскіх храмаў і святароў у Кіеве і некаторых іншых гарадах Усходняй Еўропы. З другога боку, паколькі новую рэлігію князь Уладзімір успрыняў ад Візантыі, незразумелым застаецца замоўчванне гэтай падзеі візантыйскай гістарыяграфіяй і канстанцінопальскай патрыярхіяй. Прычыну гэтага пераканаўча паказаў польскі даследчык Анжэй Поппэ: афіцыйная візантыйская гістарыяграфія адносіць хрышчэнне Русі да IX ст., калі пры патрыярху канстанцінопальскім Фоціі кіеўскі князь Аскольд – прыблізна у 867 г. (гісторык рускай царквы Е. Голубінскі адносіў хрышчэнне Русі Аскольда да 860 г., яго датаванне прыняў і М. Ю. Брайчэўскі [2, с. 35; 3, с. 279–280]), прыняў хрышчэнне, а потым пачаў распаўсюджваць яго сярод падуладных яму плямёнаў [11, с. 205]. (Аб гэтым паведамляецца ў акруговым пасланні канстанцінопальскага патрыярха Фоція да ўсходніх патрыярхаў, а таксама і ў жыццяпісанні імператара Васіля I Македонскага, якое склаў каля 950 г. імператар Канстанцін Парфірагенет.) Дарэчы, згадван-

не ў царкоўным статуце князя Уладзіміра патрыярха Фоція вымушае меркаваць, што на справе гэты статут быў прыняты яшчэ пры князі Аскольдзе. Таму слушнай падаецца думка вядомага ўкраінскага гісторыка М. Ю. Брайчэўскага, што шматлікія анахранізмы, якія маюцца ў пасланні Фоція да князя Уладзіміра, ліквідуюцца, калі пагадзіцца з тым, што сапраўдным адрасатам Фоція быў князь Аскольд [2, с. 31, 35].

Князь і адначасова язычніцкі святар Алег пасля таго, як ён захапіў Кіеў і забіў князя Аскольда, аб'яднаў Паўднёвую (Кіеўскую) і Паўночную (Наўгародскую) федэрацыі, альбо канфедэрацыі, у адзіную дзяржаву – Русь, са сталіцай у Кіеве. Ён жа вярнуў язычніцтву статус афіцыйнай веры, але хрысціянскія храмы пры Алегу і яго наступніках, як сведчаць летапісы, захоўваліся і функцыянавалі, захоўвалася і руская мітраполія. Відавочна, што праваслаўная царква на Русі, існаваўшая не з канца X ст., а амаль з паловы IX ст., працягвала місіянерскую дзейнасць сярод усходніх славян, чаму садзейнічала і мэтанакіраваная палітыка Візантыі: згодна з дамовамі паміж Кіевам і Канстанцінопалем усе пасольствы і караваны гандляроў, якія прыязджалі ў сталіцу Візантыі з Кіеўскай Русі, павінны былі размяшчацца на падвор'і царквы (манастыра) св. Мамонта. Пісьмовыя крыніцы фіксуюць не толькі наяўнасць хрысціянскіх храмаў у Кіеве, але і згадваюць хрысціян у княскай дружыне, паведамляюць аб асабістым хрышчэнні княгіні Вольгі, якая працяглы час кіравала дзяржавай [10, с. 20, 25, 35, 38, 39]. Спрыяў распаўсюджванню хрысціянскай веры сярод усходніх славян і прыток місіянераў з Панноніі і Маравіі, дзе хрысціянства прапаведвалі св. Кірыл і Мяфодзій, а таксама місіянеры з Ірландыі , якія да XI ст. былі бліжэй да Візантыйскай, чым да Рымскай царквы і якіх у сярэдневякоўі называлі «грэкамі» [8, с. 49–51, 62; 9, с. 13–14]. Пасля разгрому Вялікай Маравіі венграмі і ганенняў на праваслаўе, якое пасля таго, як у 885 г. памёр св. Мефодзій, пачалі нямецкія і рымскія святары, а таксама мясцовыя правіцелі, якія трапілі пад іх уплыў, паслядоўнікі Кірыла і Мяфодзія шукалі прытулку ў Балгарыі і Кіеўскай Русі, дзе яны садзейнічалі распаўсюджванню і ўмацаванню праваслаўя. Відавочна, што хрышчэнне Кіеўскай Русі Уладзімірам разглядалася Канстанцінопалем хутчэй як аднаўленне дзяржаўнага статусу хрысціянскай рэлігіі і царквы на землях усходніх славян. Гэты наш тэзіс блізкі да думкі А. Поппэ, які лічыць: «похоже, что во время восстания Варда Фоки светские и церковные власти обращались к Руси как к христианской, а имевшие место события рассматривали не более как личное крещение Владимира и вместе с ним тех русов, которые раньше не были крещены» [11, с. 205].

Не даводзіцца сумнявацца, што на тэрыторыю Беларусі хрысціянства таксама прыйшло ва ўсходняй праваслаўнай форме. Усе спробы некаторых аўтараў давесці, што адначасова хрысціянства тут распаўсюджвалі і выхадцы са Скандынаўскіх краін, не заслугоўваюць даверу, як і інфармацыя «Сагі пра Олава Тругвасона» аб схіленні падлеткам Олавам кіеўскага князя Уладзіміра да хрышчэння.

Было б, аднак, некарэктным гаварыць пра «другое, ці паўторнае хрышчэнне» Русі пры князі Уладзіміры, бо яго дзяржава і тэрыторыя і колькасцю і складам насельніцтва была прынцыпова іншай, чым тая, якой у IX ст. уладарыў князь Аскольд.

Трэба адзначыць, што вяртанне усходнеславянскай дзяржавы да язычніцтва пасля хрышчэння ў 860-я гады не было нейкай выключнай з'явай, уласцівай выключна усходнім славянам – падобныя працэсы мелі месца і ў іншых краінах Еўропы падчас іх хрысціянізацыі: так, у Польшчы пасля смерці караля Мешкі II (1034 г.) успыхнула народнае паўстанне, якое суправаджалася вяртаннем да язычніцтва; у канцы XI ст. швецкі кароль Свейн аднавіў звычай крывавых ахвярапрынашэнняў; польскі кароль Баляслаў II у 1079 г. уласнай рукой забіў у храме кракаўскага біскупа Станіслава; у Нарвегіі, якая прыняла хрысціянства ў канцы X ст. пры Олаве Тругвасоне, у XII ст. пачалася сапраўдная грамадзянская вайна, альбо рух «біркебейнераў» («берасценікаў»), што змагаліся супраць узмацнення дзяржаўнай улады, узвышэння свецкай і духоўнай знаці, які супаў з супрацьстаяннем свецкай і царкоўнай уладзе, а на Балтыйскім Памор'і падчас паўстання 983 г. супраць нямецкіх феадалаў былі разгромлены хрысціянскія абшчыны [4, с. 62–64, 85; 5, с. 203–213; 9, с. 15; 13; 14]. Падобнага супраціўлення хрысціянізацыі не ведалі ні Кіеўская Русь, ні Полацкая зямля, ні іншыя тэрыторыі Беларусі. Звычайна значныя выступленні супраць новай веры пад кіраўніцтвам язычніцкіх святароў – валхвоў – мелі месца пераважна на ўскраінах Кіеўскай дзяржавы, дзе працэс распаўсюджвання хрысціянства супаў з працэсам рассялення усходніх славян сярод неславянскага насельніцтва, ці ў землях з поліэтнічным насельніцтвам, такіх, як Наўгародская.

Відавочна, што перыяд неафіцыйнага статусу хрысціянскай царквы ў Кіеўскай Русі быў даволі плённым для яе місіянерскай дзейнасці. Хрысціянскі храм з'явіўся нават у аддаленым ад Кіева Ноўгарадзе: апавяданне Іякімаўскага летапісу, які у сваёй працы выкарыстоўваў і цытаваў В. Н. Тацішчаў, сведчыць, што, калі пасланыя вялікім князем Уладзімірам Дабрыня і Пуцята пачалі гвалтоўна хрысціць наўгародцаў, у горадзе ужо былі хрысціяне і існавала драўляная царква Ператварэння Гасподняга,

якая, зразумела, была пабудавана раней за 989 г. Падзеі, апісаныя Іякімаўскім летапісам, былі пацверджаны археалагічнымі раскопкамі [17, с. 50, 54–56]. Менавіта пад уплывам хрысціянства адбывалася адмова язычнікаў ад звычаю трупаспальвання пры пахаваннях у курганах, прычым, як слушна паказалі ўкраінскія і расійскія даследчыкі, працэс гэты пачаўся яшчэ да 988 г. У гэты ж перыяд і пазней у язычніцкіх курганных пахаваннях, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі, сярод язычніцкіх амулетаў і абярэгаў з'яўляюцца нацельныя крыжыкі, што, на нашу думку, сведчыць аб прызнанні язычнікамі, ці нейкай часткай іх, пры захаванні імі асноў сваёй веры і прыхільнасці да яе, моцы хрысціянскай веры і хрысціянскага бога.

Амаль адразу пасля хрышчэння дзяржавы і сваёй сям'і вялікі кіеўскі князь Уладзімір перавёў свайго сына Ізяслава з правінцыйнага пагранічнага гарадка Ізяслаўля на Полацкі княскі стол. Ізяслаў памёр маладым у 1001 г., уладу прынялі яго маленькія дзеці – спачатку Усяслаў, а потым, у 1003 г., Брачыслаў. У гэтых абставінах паспяховае распаўсюджванне хрысціянства ў Полацкай зямлі магло адбывацца толькі пры падтрымцы баярства, дружыны і ўплывовых гараджан – гандляроў і рамеснікаў. Пісьмовыя крыніцы нічога не гавораць аб працэсе хрысціянізацыі Полацкай зямлі, больш інфармацыйнымі па гэтай праблеме з'яўляюцца археалагічныя крыніцы. Параўнанне колькасці кургановых (язычніцкіх) пахаванняў у курганным могільніку горада Ізяслаўля з колькасцю насельніцтва горада, якое пастаянна расло (што вынікае з пашырэння гарадской тэрыторыі), паказала, што ўжо да паловы XI ст. язычніцкі кургановы пахавальны абрад (дарэчы, вельмі кансерватыўны) адмірае, што сведчыць аб поўнай хрысціянізацыі пераважнай колькасці гарадскога насельніцтва [6, с. 22]. Між іншым, Ізяслаўль (Заслаўе) і яго акруга (воласць), якія знаходзіліся на перыферыі Полацкай зямлі, былі хутчэй выключэннем, чым правілам: у суседняй з імі Менскай воласці (у X ст., магчыма, перыферыя Тураўскага княства) насельніцтва ўпарта трымалася за язычніцкі абрад пахавання, бадай, на працягу ўсяго XI ст. Пра марудны працэс пранікнення сюды хрысціянства сведчыць тое, што у канцы X – пачатку XI ст. сярод насельніцтва Менскай воласці толькі пачынае распаўсюджвацца хрысціянскі звычай пахавання ў курганах [7, с. 115–116]. Вельмі верагодна, што прыкладна такімі ж тэмпамі, як і ў Ізяслаўлі, працэс хрысціянізацыі ішоў у іншых гарадах Беларусі, пра што сведчыць будаўніцтва храмаў і манастыроў, рэшткі якіх адкрыты і вывучаны археолагамі ў Полацку, Віцебску, Мінску, Гродне, Тураве, Друцку, Ваўкавыску, Навагрудку, і знаходкі ў культурным пласце гарадоў прадметаў хрысціянскага культу. Сцвярджэнні некаторых аўтараў аб схільнасці да язычніцтва ці двухвер'я некаторых полацкіх князёў супярэчаць добра вядомым фактам ці засноўваюцца на памылковай іх трактоўцы.

У вясковай мясцовасці хрысціянізацыя адбывалася больш марудна, што тлумачыцца недахопам святароў і аддаленасцю шмат якіх вёсак і сёл ад гарадоў, якія былі цэнтрамі распаўсюджвання новай веры. Таму ў вёсках язычніцкія пахавальныя звычаі і абрады захоўваліся яшчэ ў XII ст., а дзе-нідзе нават і пазней. Трэба мець на ўвазе, што некаторыя язычніцкія культы былі цесна звязаны з земляробствам, жывёлагадоўляй, некаторымі промысламі і іх абрады ўспрымаліся як неабходная і неад'емная частка падрыхтоўкі да працы, і таму былі вельмі жывучыя.

Аналіз вядомых нам археалагічных матэрыялаў дазваляе канстатаваць, што ў XI ст. паспяхова адбывалася хрысціянізацыя не толькі Полацкай зямлі, дзе больш-менш значныя астраўкі язычніцтва захоўваліся пераважна на паўночных і паўночна-заходніх ускраінах, на якіх славянскае насельніцтва яшчэ не з'яўлялася колькасна дамінуючым. На іншых абшарах беларускай тэрыторыі, за выключэннем шырокай паласы правабярэжнага Гродзенскага Панямоння, у глыб якога яшчэ толькі пачалі пранікаць паселішчы ўсходніх славян, з'яўляецца ўсе больш хрысціян.

І яшчэ некалькі значных праблем у гісторыі хрысціянізацыі – праблема ўзаемаадносін царкоўнай (духоўнай) і свецкай уладаў, а таксама праблема адпаведнасці вайсковай службы і прыналежнасці да ваеннага саслоўя нормам і патрабаванням новай рэлігіі. У беларускай гістарыяграфіі, як і ў расійскай і ўкраінскай, амаль наогул не закранаецца праблема адаптацыі ўлады і грамадства да нормаў і дагматаў хрысціянства, якая была вельмі актуальная ў Візантыі і ў шмат якіх краінах Заходняй Еўропы. У межах былой Заходнерымскай імперыі першая праблема вырашылася на карысць царквы – улада намесніка прастола св. Пятра лічылася вышэйшай за каралеўскую і нават імператарскую, хоць асобныя канфлікты паміж папскай і імператарскай уладай мелі месца яшчэ ў II тысячагоддзі н. э. У заходнееўрапейскіх краінах, якія далучыліся да хрысціянскага свету пазней, ідэалам лічылася магутная каралеўская ўлада, якая б забяспечвала мір і парадак, кіруючыся ўказаннямі біскупаў. Галоўнымі абавязкамі караля лічыліся абарона царквы і людзей царквы, а таксама ўсіх слабых і безабаронных: удоў, сірот, дзяўчат і жанчын. Менавіта з рук біскупаў пры абрадзе каранацыі кароль атрымліваў сімвалы сваёй

годнасці і ўлады: карону, скіпетр, дзяржаву і меч [16, с. 24, 139].

Ва Усходнерымскай імперыі, а потым і ў Візантыі свецкая ўлада імператара лічылася вышэйшай за ўладу канстанцінопальскага патрыярха. Магчыма, менавіта гэта схіліла ўладалюбівага Уладзіміра пры выбары ім веры на карысць Канстанцінопаля. Тым не менш пісьмовыя крыніцы ўтрымліваюць звесткі, якія сведчаць аб тым, што ў Кіеўскай Русі (у складзе якой знаходзілася большая частка тэрыторыі Беларусі, за выключэннем Полацкай зямлі), свецкая (княская) улада (нават вярхоўная) знаходзілася калі не ў залежнасці, то пад моцным уплывам царкоўных іерархаў. Нават калі князя на той ці іншы прастол запрашала веча, узаемныя абавязацельствы («рад») абодвух бакоў замацоўваліся абрадам «крыжацалавання», які падразумяваў прысутнасць і ўдзел прадстаўнікоў царквы. Таму можна з упэўненасцю казаць, што ўплыў царквы на свецкую (княскую) уладу быў значным менавіта ў землях і гарадах з моцным вечавым ладам, такіх, як Ноўгарад і Полацк. Пісьмовыя крыніцы апавядаюць пра адпаведнасць вялікага кіеўскага князя Уладзіміра пасля прыняцця ім хрышчэння ідэалам хрысціянскага правіцеля. Так, «Аповесць мінулых гадоў» расказвае пра будаўніцтва ім храмаў і клопат пра абарону краіны ад знешніх ворагаў, пра падтымку міра з суседнімі краінамі і клопаты аб хворых, нямоглых і жабраках, якім падчас княскіх піроў ён загадваў не толькі раздаваць харчы, але і развозіць іх па горадзе для тых, хто не ў стане сам прыйсці на княскі двор. Паколькі князь пад уплывам новай веры зрабіўся залішне мяккім і не караў смерцю, гэта прывяло да павелічэння ў краіне разбояў. У 996 г. епіскапы вымушаны былі тлумачыць князю, што ён «поставленъ еси от бога на казнь злымъ, а добрымъ на милованье. Достоить ти казнити разбойника, но со испытомъ». Пазней яны ж прапанавалі князю замяніць смяротную кару вірамі (штрафам) [10, с. 86–87]. Усё гэта дазваляе меркаваць, што і ва ўсходнеславянскіх краінах, як і ў заходнееўрапейскіх, пасля прыняцця хрысціянства свецкая ўлада ў пэўнай ступені адчувала ўплыў царквы і царкоўных уладаў.

Следует отметить, что в связи с унификацией методических требований к полевым исследованиям в СССР, изложенных в учебниках и различных методических пособиях [1, 23, 24], существенной разницы в методике раскопок упомянутых выше археологов не имелось, а некоторые расхождения в применяемой в том или ином случае методике, объясняются скорее условиями работ и личными качествами археологов. Информацию о курганах, раскопанных по половинам, с одной поперечной бровкой, находим в отчетах и публикациях Г. В. Штыхова и отчетах К. В. Павловой, которая при раскопках могильника у д. Сулятичи делала поперечный разрез только для могильной ямы [27; 40, мал. 39, 41, 73, 78]. К сожалению, даже в публикациях, написанных на материалах курганных могильников, не всегда их авторы приводят сведения о методике своих полевых изысканий. Поэтому данную информацию можно почерпнуть из опубликованных чертежей раскопанных курганов, а также из отчетов о раскопках.

Наиболее распространенным способом исследования средневековых курганов, во второй половине XX – начале XXI в. была разборка насыпи по четвертям с оставлением двух крестообразных бровок. Именно таким способом изучалось большинство средневековых курганов на территории Беларуси. Близок к нему был метод, предложенный ленинградским археологом Н. И. Артамоновым и заключающийся в том, что насыпь разбивалась на сектора и вначале разрабатывались два параллельных сектора (I и III или II и IV, при нумерации по часовой стрелке). Вертикально зачищенные стенки временно не тронутых секторов позволяют более удобно и точно осуществить графическую фиксацию структуры насыпи, чем при оставлении крестообразных бровок. Такой метод раскопок курганов в Беларуси с 1980 г. применяет Ю. А. Заяц.

В последние годы имели место попытки перенести на Беларусь новые методы полевых исследований курганных могильников, применяющихся в российской археологии, а именно исследование могильника раскопом [29]. Впрочем, такая попытка не оказалась плодотворной.

В конце XX – начале XXI в., применяя новые методы анализа и интерпретации археологических материалов, археологи Беларуси на основе материалов раскопок курганных могильников решают вопросы этнической и социально-экономической истории [7, 10–12, 16].

Одним из важнейших направлений археологических исследований является выявление и регистрация и учет памятников. Этим видом работ практически занимались во все времена все археологи. Также почти неизменными оставались и методы археологического поиска, только в различные периоды разным было соотношение между применяемыми методами. Так, в XIX – начале XX в. метод личного обследования территорий сочетался с письменными запросами местным органам власти об известных населению памятниках. В 1920-е годы осуществлялись планомерные обследования территорий (преимущественно вдоль рек) экспедициями с участием краеведов и рассылка «Опросных листов» по районам и сельским советам. В дальнейшем сбор данных путем опросных писем, рассылаемых по сельским советам определенных территорий, занималась только Л. В. Дучиц с целью выявления культовых камней и валунов и А. В. Квятковская, рассылавшая по сельским советам письма-анкеты с целью сбора данных о каменных могильниках. До 1917 г. составлялись так называемые Археологические карты по губерниям, во второй половине XX в. по всей территории Беларуси с разделением по областям и районам. Впрочем, содержащиеся в них данные о памятниках не были полными и достоверными, что показала работа по подготовке «Збора помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», подразумевавшая сплошное археологическое обследование всех административных районов республики. Но и это издание грешит неполнотой сведений и неточностями привязок археологических памятников. Несмотря на, казалось бы, тщательное обследование территории Беларуси в период подготовки «Збора помнікаў…», в последующие после его издания годы при археологических разведках продолжают выявлять все новые и новые археологические памятники, в том числе и по периоду средневековья (в частности и могильники). Не удовлетворенные качеством привязок археологических памятников к местности в вышеупомянутых изданиях, археологи создают компьютерную базу данных «Памятники археологии Беларуси» с привязкой памятников по системе координат на картах-двухкилометровках.

Методика изучения средневековых грунтовых могильников. К грунтовым средневековым могильникам здесь отнесены следующие погребальные памятники: так называемые раннесредневековые грунтовые могильники, предшествующие возникновению обычая захоронения в курганах, каменные могилы, христианские кладбища, известные пока только в некоторых городах, а также захоронения на территории монастырей в оградах храмов и внутри культовых сооружений, в том числе и в криптах.

Изучение раннесредневековых грунтовых могильников началось только в начале XX в., когда в 1904 г. Е. Р. Романов открыл грунтовый могильник в Новом Быхове и исследовал в нем шесть погребений. В 1927 г. изучение могильника продолжили С. А. Шутов и И. А. Сербов. Во второй половине XX в. раннесредневековые грунтовые могильники на территории Беларуси изучали Ю. А. Кухаренко, А. Г. Митрофанов, Л. Д. Поболь и Ю. А. Заяц. Количество подобных могильников известных и изучавшихся на территории Беларуси невелико, возможно по причине того, что они не имеют внешних признаков. Следует подчеркнуть, что в публикациях и даже в археологической литературе почти ничего не говориться о методике поисков и раскопок таких могильников. Большинство известных бескурганных раннесредневековых могильников выявлены в процессе раскопок поселений, которым они предшествовали, либо часть которых заняли позднее, либо обнаружены на пашнях, в виде россыпи кальцинированных костей из поврежденных при вспахивании вследствие небольшой глубины их могил. В первом случае погребения таких могильников изучались в процессе разборки культурного слоя поселений, зачистки и выборки материковых ям, во втором – преимущественно методом разработки раскопов, шурфов и траншей.

Весьма существенными факторами в изучении грунтовых раннесредневековых могильников являются их культурная атрибуция и датировка. В решении данных проблем преобладает метод аналогий. Но если для культурной атрибуции он полностью оправдан, то для датировки его явно недостаточно. Так, например А. Г. Митрофанов, выявивший и частично изучивший грунтовый могильник на территории селища в урочище Василиха у д. Ревячка (точнее, на оставленной обитателями части селища), датировал погребения V–VI вв., исходя из близости погребального обряда Акатовскому могильнику на территории Смоленской области [25, с. 31], тогда как, исходя из соотношения поселения и могильника нижней датой захоронений, совершенных на поселении, логично было бы взять верхнюю дату культурного слоя.

Изучение каменных могил началось на территории белорусского Понеманья в последние десятилетия XIX в. и активно продолжалось в начале XX в. Хотя методика их исследования подробно не описана, из публикаций видно, что исследователи большое внимание уделяли деталям погребального обряда, фиксируя устройство каменной обкладки, форму, глубину и заполнение могильных ям, наличие

гробов и т. п., положению костяков и пр. Анализируя материалы этих раскопок, Ф. Д. Гуревич отметила, что многие находки из них оказались депаспортизированными, впрочем, она не исключает, что это может быть результатом небрежного их хранения в Виленском музее и поспешной передачи его коллекции в Государственный Эрмитаж [3, с. 122]. Рассмотрев находки из каменных могил (правда не по комплексам вследствие их депаспортизации), Ф. Д. Гуревич, не исключая появление таких могильников в XII в., пришла к заключению, что наиболее ранние каменные могилы следует отнести к XIII–XIV вв. [3, с. 130]. Судя по отрывочным и разрозненным сведениям, каменные могильники исследовались методом археологических траншей (обычно там, где внешние признаки могил не сохранялись) и вскрытием отдельных могил. Последний метод был применен в 1928 г. И. А. Сербовым при изучении каменного могильника у оз. Комаровское (Уклейна) в Ушацком районе [36, с. 208–211]. Во второй половине XX в. при изучении этого вида могильников использовался метод вскрытия его части небольшими (до 60 м^2) раскопками и шурфами, совпадающие размерами с площадью могилы [13, с. 23].

Исследование средневековых городских грунтовых могильников началось в связи с проведением широкомасштабных археологических раскопок городов. Размещавшиеся за пределами городов грунтовые могильники с развитием городской территории вошли в ее черту. Они, за редким исключением, обнаруживаются, обычно, случайно, в ходе раскопок или земляных работ. Локализовать их, хотя бы приблизительно, можно изучая картографический материал или городскую топонимику. Некоторые грунтовые могильники основывались на временно покинутой жителями по разным причинам городской территории, впоследствии вновь занимаемой застройкой. При исследовании грунтовых могильников применяется общепринятая методика [23, с. 53–55], но в городах Беларуси они обычно изучались не траншеями, а раскопками, что позволяло достоверно определять размеры и контуры могильных ям и систему расположения могил, а уровень залегания погребений в культурных отложениях и относительно друг друга при точной фиксации дает возможность решать вопрос о времени функционирования могильника более надежно, чем по погребальному инвентарю, в таких могильниках чрезвычайно бедному и имеющему, как правило, широкие хронологические рамки. Обнаружив в раскопе захоронения, относящиеся к городскому грунтовому могильнику, одни исследователи ограничиваются их изучением, другие с помощью дополнительных раскопов стремились определить границы и размеры могильника [8, с. 53–55; 28; 33].

В некоторых белорусских городах XI–XIII вв. зафиксирован обычай совершать погребения в недостроенных по каким-то причинам либо частично разрушенных храмах (Минск, Гродно). Методика их раскопок, как у обычных могил, но главным является решение вопросов о причинах превращения этих мест в городской могильник и о социальном статусе погребенных [9, с. 193, 256].

В местечках (бывших малых городах), где на старых кладбищах имеются могилы XVI–XVII вв. (Лукомль), последние исследовались шурфами, размеры которых слегка превышали внешние параметры могилы.

О. Н. Левко, изучавшая городские некрополи в северо-восточной Беларуси, выделила ряд признаков светских погребений на монастырских кладбищах и в храмах, а также признаки обряда, позволяющие устанавливать конфессиональную принадлежность погребенных [15, с. 172–173, 178–179], однако предложенное ею объяснение причин сравнительно небольшого количества ранних захоронений в городском грунтовом могильнике г. Витебска [15, с. 179], не представляется нам убедительным.

При исследовании погребений, совершенных в склепах под храмами, для их датировки весьма существенное значение имеет изучение строительных материалов и техники строительства склепов и ниш, дающее иногда более узкую и точную дату, чем инвентарь захоронений.

Литература

1. Авдусин, Д. А. Полевая археология СССР / Д. А. Авдусин. – 2-е изд. – М., 1980.

2. Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск : Беларус. навука, 1996.

3. Гуревич, Ф. Д. Древности белорусского Понеманья / Ф. Д. Гуревич. – М. ; Л., 1962.

4. Дубінскі, С. А. Дадатковыя раскопкі курганоў у Заслаўі / С. А. Дубінскі // Зап. аддз. гуманіт. навук. – Кн. 5 : Працы катэдры археолёгіі. – Т. 1. – Мінск, 1928. – С. 253–255.

5. Дучыц, Л. У. Браслаўскае Паазер'е ў IX–XIV стст. : гіст.-археал. нарыс / Л. У. Дучыц. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991.

6. Завитневич, В. З. Формы погребального обряда в могильных курганах Минской губернии / В. З. Завитневич // Тр. IX Археолог. съезда в Вильне в 1983 г. – М., 1895. – Т. 1. – С. 221–235.

7. Заяц, Ю. А. Социальные группы населения Изяславля на стадии формирования и раннем этапе развития города (X–XI вв.) : по материалам Заславского курганного могильника / Ю. А. Заяц // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 1996. – № 8. – С. 129–147.

8. Заяц, Ю. А. Заславль в эпоху феодализма / Ю. А. Заяц. – Минск : Наука и техника, 1995.

9. Загорульский, Э. М. Возникновение Минска / Э. М. Загорульский. – Минск : Изд-во БГУ, 1982.

10. Зверуго, Я. Г. Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. / Я. Г. Зверуго. – Минск, 1980.

11. Звяруга, Я. Г. Беларускае Павілле ў жалезным веку і раннім сярэдневякоўі / Я. Г. Звяруга. – Мінск, 2005.

12. Каробушкіна, Т. М. Насельніцтва Беларускага Пабужжа X–XIII стст. / Т. М. Каробушкіна. – Мінск : Беларус. навука, 1999.

13. Квятковская, А. В. Ятвяжские могильники Беларуси (канец XI в. – XVII в.) / А. В. Квятковская. – Вильнюс, 1998.

14. Коробушкина, Т. К. Курганы Белорусского Побужья X–XIII вв. / Т. К. Коробушкина. – Минск : Наука и техника, 1993.

15. Левко, О. Н. Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси. Формирование и развитие / О. Н. Левко. – Минск : Беларус. навука, 2004.

16. Лысенко, П. Ф. Дреговичи / П. Ф. Лысенко. – Минск : Наука и техника, 1991.

17. Ляўданскі, А. Н. Археолёгічныя раскопкі ў м. Заслаўі Менскай акругі / А. Н. Ляўданскі // Зап. аддз. гуманіт. навук. – Кн. 5 : Працы катэдры археолёгіі. – Т. 1. – Менск, 1928. – С. 1–95.

18. Ляўданскі, А. Н. Археолёгічныя досьледы ў Аршанскай акрузе / А. Н. Ляўданскі // Зап. аддз. гуманіт. навук. – Кн. 11 : Працы археалёгічнай камісіі. – Т. 2. – Мінск, 1930. – С. 31–45.

19. Ляўданскі, А. М. Курганны могільнік каля в. Чаркасава Аршанскай акругі / А. М. Ляўданскі // Зап. аддз. гуманіт. навук. – Кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. – Т. 2. – Мінск, 1930. – С. 57–70.

20. Ляўданскі, А. М. Археолёгічныя досьледы ў Віцебскай акрузе / А. М. Ляўданскі // Зап. аддз. гуманіт. навук. – Кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. – Т. 2. – Мінск, 1930. – С. 93–104.

21. Ляўданскі, А. М. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе / А. М. Ляўданскі // Зап. аддз. гуманіт. навук. – Кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. – Т. 2. – Мінск, 1930. – С. 157–198.

22. Ляўданскі, А. Н. Археолёгічныя досьледы ў вадазборах р. Сажа, Дняпра і Касплі ў Смаленскай губэрніі / А. Н. Ляўданскі // Зап. аддз. гуманіт. навук. – Кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. – Т. 2. – Мінск, 1930. – С. 269–338.

23. Мартынов, А. И. Методы археологического исследования / А. И. Мартынов, Я. А. Шер. – М. : Высш. шк., 1989.

24. Методические рекомендации по исследованию курганных памятников : для студентов исторического факультета. – Киев : КГУ, 1986.

25. Митрофанов, А. Г. Отчет об археологических исследованиях группы по изучению древностей восточных балтов на территории Белоруссии в 1973 г. / А. Г. Митрофанов // ААНД ГНУ, Ин-т истории НАН Беларуси. – Арх. № 432.

26. Павлова, К. В. Отчет о раскопках могильника у д. Городиловка Новогрудского района Гродненской области БССР / К. В. Павлова // ААНД ГНУ, Ин-т истории НАН Беларуси. – Арх. № 371.

27. Павлова, К. В. Отчет о раскопках могильников у дд. Мольничи и Сулятичи Новогрудского района Гродненской области в 1971 г. / К. В. Павлова // ААНД ГНУ, Ин-т истории НАН Беларуси. – Арх. № 382.

28. Павлова, К. В. Могильник на территории окольного города древнего Новогрудка / К. В. Павлова // Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Института археологии. – Вып. 110 : Славяно-русские древности. – М., 1967. – С. 36–39.

29. Плавінскі, М. Справаздача па археалагічным даследаванні ў Браслаўскім раёне Віцебскай вобласці ў 2005 г. / М. Плавінскі // ААНД ДНУ, Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Арх. № 2279.

30. Покровский, Ф. П. Курганы на современной границе Литвы и Белоруссии / Ф. П. Покровский // Тр. IX Археолог. съезда в Вильне в 1893 г. – М., 1895. – Т. 1. – С. 166–220.

31. Романов, Е. Р. Раскопки в Могилевской губернии в 1888 г. / Е. Р. Романов // Древности. Труды Московского Императорского археологического общества. – М., 1889. – Т. 1, вып. 3. – С. 129–153.

31. Самоквасов, Д. Я. Раскопки древних могил и описание, хранение и издание могильных древностей / Д. Я. Самоквасов. – М., 1906.

32. Самоквасов, Д. Я. Северянские курганы и их значение для истории / Д. Я. Самоквасов // Тр. III Археолог. съезда в России, бывшего в Киеве в августе 1874 г. – Т. 1. – Киев, 1878. – С. 185–224.

33. Семянчук, Г. Раннесярэднявечны грунтовы могільнік Дрысвяты – Пашавічы / Г. Семянчук // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2002. – № 17. – С. 191–195.

34. Семянчук, Г. Папярэднія вынікі даследваньня сярэднявечнага могільніка ў г. Ваўкавыску Гродзенскай вобласці / Г. Семянчук // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2006. – № 21. – С. 202–204.

35. Сербаў, І. А. Археолёгічныя раскопкі ў аколіцах Менску ў 1925 г. (Пятроўшчына і Рылаўшчына) / І. А. Сербаў // Гіст.-археолёг. зб. – Мінск, 1925. – № 1. (Даклады і рэфераты 1926–1927 гг.). – С. 193–223.

36. Сербаў, І. А. Археолёгічныя помнікі Вушацкага раёну, Полацкае акругі (з матэр'ялаў, сабраных экспедыцыяй краязнаўчага таварыства Беларускага Дзяржаўнага Універсітэту ў 1928 г.) / І. А. Сербаў // Зап. аддз. гуманіт. навук. – К. 11. – Т. 2 : Працы археолёгічнай камісіі. – Мінск, 1930. – С. 199–211.

37. Спицин, А. А. Обозрение некоторых губерний и областей России в археологическом отношении / А. А. Спицин // Зап. Росс. императорского археолог. общества. – Т. 8, вып. 1–2. – Т. 9, вып. 1–2. – СПб., 1899.

38. Труды девятого Археологического съезда в Вильне в 1893 г. – М., 1895. – Т. 2.

39. Тышкевич, К. О курганах на Литве и Западной Руси (археологические исследования) / К. Тышкевич. – Вильна : Типография А. К. Киркора, 1865.

40. Штыхаў, Г. В. Крывічы : па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі / Г. В. Штыхаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992.

41. Штыхаў, Г. В. Культура ранніх доўгіх курганоў (V–VI стст.) / Г. В. Штыхаў // Археалогія Беларусі : у 4 т. – Мінск, 19999. – Т. 2 : Жалезны век і ранняе сярэднявечча. – С. 376–384.

Рэзюмэ

Ю. А. Заяц

Характарыстыка методык і напрамкаў вывучэння сярэдневяковых могільнікаў

Разгледжана праблема методыкі даследавання сярэдневяковых могільнікаў. Асобна высветлены храналагічныя межы, тэрыторыя, тыпы могільнікаў, а таксама грамадзянства даследчыкаў і іх датыкальнасць да розных навуковых устаноў. Разглядаецца станаўленне і развіццё методыкі вывучэння курганоў, пачынаючы з XVIII ст. і заканчваючы нашымі сучаснікамі. Акрамя вывучэння курганоў асобнымі аспектамі дано вывучэнне раннесярэдневяковых грунтовых могільнікаў, каменных магіл і сярэдневяковых гарадскіх грунтовых могільнікаў.

Summary

Y. Zayatc

Describing of methodology of investigations of medieval burial grounds

In this publication author examines the problem of methodology of archaeological investigations of medieval burial grounds. He considers severally chronological borders, territories, types of burial grounds, and even citizenship of researchers and their membership in various scientific organizations. Becoming and development of methodology of investigations of medieval burial grounds (from 18th century to our contemporaries) is taken up.

Besides studying of burial mounds author considers Early Medieval burial grounds, «stone tombs» and city burial grounds.

Поступила 20.01.2012

УДК 94(476)«11»:94(47)026

С. П. Віцязь, *кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (г. Мінск)*

Прусы ў кантэксце палітычных падзей Старажытнай Русі першай паловы XI ст.

Палітычнае становішча Старажытнай Русі першай паловы XI ст. адметнае імклівым ўзрастанем ролі Полацкага княства. Асабліва вылучаюцца рашучыя дзеянні Полацка ў небывалых да таго агульнарускіх маштабах, сярод якіх найперш значны ваенны паход 1021 г. полацкага князя Брачыслава на Ноўгарад, паўночны цэнтр Русі.

Звесткі аб паходзе ўпершыню былі выкладзены ў даўнейшай старажытнарускай летапіснай крыніцы – «Аповесці мінулых гадоў» (пачатак XII ст.) [57, с. 202]. У пазнейшых паведамленнях (летапісы Васкрасенскі, Лаўрэнцеўскі, Патрыяршы (Ніканаўскі), Сафійскі і інш.) былі прадстаўлены дадатковыя каментарыі па асобных аспектах той падзеі. Ёсць меркаванне, што пэўныя сведчанні на гэты конт меліся ў Полацкім летапісе, які, як вядома, не захаваўся, але быў фрагментарна пераказаны В. Тацішчавым [14, с. 96]. Таксама асобныя заўвагі аб паходзе прыводзіў Я. Длугаш. Але нават у агульным спалучэнні акрэсленыя звесткі не складаюць паслядоўнага, цэласнага апісання падзеі. І гэта не дзіўна. Як вядома, перыяд ранняга сярэдневякоўя Беларусі ў цэлым надзвычай стрымана асвятляецца ў пісьмовых крыніцах. Сведчанні аб паходзе Брачыслава і яго часе (перыяд княжання 1003–1044 гг.) таксама нельга прызнаць паўнаважкімі. Між тым, на агульным сціплым гістарыяграфічным фоне яны быццам бы дэманструюць адносную насычанасць характарыстыкі (акрэсленыя час, месца, кірункі паходу, пэўныя абставіны, некаторыя наступствы).

Абагульнены змест паходу Брачыслава. Па звестках узгаданых летапісаў, князь полацкі здзейсніў паспяховы ваенны напад на Ноўгарад, захапіў там хабар і палонных, з якімі вяртаўся ў Полацк. Але яшчэ непадалёк ад Ноўгарада (на р. Судоме, прытоку р. Шэлонь) Брачыслава сустрэў князь кіеўскі (і ўсея Русі) Яраслаў (Мудры). У тым сутыкненні перамог Яраслаў, адабраў захопленае і палонных вярнуў дадому. Істотна, што Яраслаў не стаў знішчаць супраціўнікаў, але дазволіў Брачыславу (свайму пляменніку) вярнуцца ў Полацк. Далей Яраслаў перадаў Полацку ў кіраванне гарады Віцебск і Усвят, прапанаваўшы Брачыславу саюзную дамову, якую князь полацкі прыняў і няўхільна выконваў.

Магчыма заўважыць у летапісных паведамленнях рысы адрывачнасці, фрагментарнасці. У прыватнасці, засталіся неасветленымі мэты, змястоўныя абставіны, вынікі паходу, гэта значыць яго дзяржаўны кантэкст, па сутнасці – галоўная характарыстыка. Больш за тое, супастаўленне вядомых сёння звестак дэманструе сутнасныя супярэчлівасці ў ацэнцы названых пытанняў. Побач з тым вышэйузгаданая крыніцазнаўчая адметнасць перыяду ранняга сярэдневякоўя мае вынікам выключна стрыманыя і асцярожныя ацэнкі падзей навукоўцамі, а таксама тую спецыфіку, што гістарычную рэканструкцыю выконваюць пераважна не гісторыкі, але археолагі, з улікам адпаведных, дадатковых крыніц. Прапануецца акрэсліць некаторыя гістарыяграфічныя пазіцыі па разглядаемым пытанні.

Мэты паходу Брачыслава. С. М. Салаўёў (1851) і за ім І. Д. Бяляеў (1872) адзначалі, што палачане незнарок напалі на Ноўгарад. А. В. Турчыновіч (1857) бачыў у тым паходзе памкненні Полацка да незалежнасці ад Кіева. М. Каяловіч (1864) меркаваў, што полацкія князі, пачынаючы з Брачыслава, здзяйснялі захопы палонных дзеля засялення імі сваёй краіны. Д. Ілавайскі (1876) і П. М. Бацюшкаў (1890) выказвалі, што Брачыслаў наўмысна дамагаўся Наўгародскіх зямель. М. В. Доўнар-Запольскі (1891) заўважаў, што Брачыслаў заявіў патрабаванні на Рускую зямлю ў цэлым, але задаволіўся ўладаннем двух названых гарадоў, паколькі з імі палачане «трымалі ў сваіх руках шляхі Верхняга Падзвіння і самую важную частку вялікага воднага шляху з Варагаў у Грэкі – волакі між Дзвіной і Дняпром». Апошнюю тэзу развіў А. М. Насонаў (1951), які падкрэсліваў эканамічны кантэкст дзеянняў Брачыслава, і лічыў іх скіраванымі на Дзвінскі маршрут гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі». М. І. Ермаловіч (1990) бачыў у сціслых каментарыях Я. Длугаша і В. Тацішчава сведчанні імкненняў Полацка да заваявання Ноўгарада [4, с. 97]. Гэткую ж мэту прызнаваў В. Я. Пятрухін (1995). Э. М. Загарульскі (1998) вылучаў «нічым не прыхаваны разбойніцкі характар кампаніі», але таксама падкрэсліваў яе скіраванасць на авалоданне менавіта двума ўзгаданымі гарадамі на гандлёвым шляху. М. Б. Свярдлоў (2003) лічыў дамінуючымі рабаўніцкія, а не палітычныя імкненні Брачыслава. На сёння пераважнае прызнанне атрымала пазіцыя А. М. Насонава, якую падтрымалі Л. В. Аляксееў (1966), Г. В. Штыхаў (1975, 2002), П. П. Талоч-

ка (1987), І. Я. Фраянаў і А. Ю. Дварнічэнка (1988), М. В. Клімаў (2000), Д. У. Дук (2003), В. М. Ляўко (2004), Я. У. Новікаў (2007).

Роля і вынікі паходу Брачыслава. Пасля сутыкнення паміж князямі Кіеўскім і Полацкім Яраслаў адпусціў дадому Брачыслава – захаваў яму жыццё, не прадставіў эканамічных ці палітычных санкцый. Насупраць, Яраслаў перадаў Полацку ў кіраванне гарады Віцебск і Усвят (да таго яны падпарадкоўваліся Ноўгараду). Гэта не простая тэрытарыяльная саступка. Тыя гарады выконвалі функцыі вузлавых пунктаў паміж Дзвінскім і Волхаўскім маршрутамі Дняпроўскага гандлёвага шляху. Звыш таго Яраслаў прапанаваў Брачыславу дамову: «будь са мною адзіны», што агучвала палітычнае прызнанне фактычнай роўнасці князёў. «І былі яны разам ва ўсе дні жыцця свайго» (гэта значыць, амаль да сярэдзіны XI ст.) – красамоўна заключаў летапіс [48, с. 77].

Выкладзеныя факты сведчаць на карысць таго, што пераможцам у разглядаемым паходзе выступіў Брачыслаў, а не Яраслаў. Але ніводная з пісьмовых крыніц гэтага прама не сцвярджае, што схіляе да меркавання аб наўмысным замоўчванні, ці верагодным скажэнні аўтарамі крыніц пэўных акалічнасцей паходу Брачыслава. Так, напрыклад, М. І. Ермаловіч (1990) называў вынікі паходу Брачыслава нечаканымі. Э. М. Загарульскі (1998) адзначаў рэакцыю пераможцы, Яраслава, як дзіўную [1, с. 60]. В. М. Ляўко (2004) меркавала, што прычынай саступак з боку Яраслава на карысць Брачыслава магла быць складанасць у кантраляванні абшырных тэрыторый Русі, што прымушала Яраслава шукаць саюзнікаў [47, с. 61]. Гэта тэза, па сутнасці, прадстаўляецца абгрунтаванай. Сугучныя погляды выказваў яшчэ С. М. Салаўёў (1851) і пазней П. П. Талочка (1987), Л. В. Аляксееў (2006) у сэнсе, што Яраслаў «выкупіў мірныя адносіны» у Брачыслава. Але ў тым кірунку застаецца пытанне – ці заваяваў Брачыслаў сваім паходам на Ноўгарад статус саюзніка, ці насупраць, выклікаў недавер. Між іншым Э. М. Загарульскі (1998) адзначаў, што «Брачыслаў аказаўся моцным князем» і «менавіта ў сувязі з гэтымі падзеямі ён і стаў нам вядомы». В. Е. Данілевіч (1896) ацэньваў дзеянні Брачыслава як выток векавога супрацьстаяння полацкіх і кіеўскіх князёў. Г. В. Штыхаў (2002) вылучаў у крокаў полацкага князя «імкненне да адасобленасці», у выніку чаго ў другой палове XI ст. Полацк «зрабіўся асноўным саперніка Кіева». В. М. Ляўко (2004) бачыла ў разглядаемым паходзе «адлюстраванне барацьбы паміж Кіевам і Полацкам за ўмацаванне палітычнай улады шляхам пашырэння дзяржаўнай тэрыторыі» [47, с. 61]. Л. В. Аляксееў (2007) падкрэсліваў сэнс паходу, як вызначальнай падзеі ў супрацьстаянні Полацка з Ноўгарадам, а не з Кіевам, дзе Кіеў урэшце прыняў бок Полацка, і даверыў яму вузлавыя пункты гандлёвых шляхоў.

Навукоўцы аднадушны ў вызначэнні паходу Брачыслава як падзеі надзвычай высокага маштабу. Розначытанні ў ацэнцы вынікаў паходу, тым не менеі, яднаюцца ў вылучэнні яго палітычнай значнасці. Галоўным кірункам, у рэчышчы якога аналізуюцца і ўзважваюцца абставіны паходу, абраны эканамічны кірунак, звязаны з дзейнасцю галоўнага гандлёвага шляху Старажытнай Русі – шляху «з варагаў у грэкі». Як бачна, ацэнкі даследчыкаў выяўляюць сістэмны характар мэт і вынікаў паходу. Мяркуецца, што гэта была не аднамомантная акцыя, не сітуатыўны выбух актыўнасці, але састаўны элемент доўгатэрміновых, наперад пралічаных і прагматычна падрыхтаваных геапалітычных працэсаў.

Паход 1021 г. – падзея выключнага ўзроўню: і па змесце, і па выніку. Падобнага на гэта не адзначалася як у Полацку, так і наогул па тэрыторыі Беларусі. Уражваюць нават фармальныя параметры – паход болей за 500 км супраць выдатнага цэнтра Старажытнай Русі. Каб адважыцца на такое, трэба было добра валодаць палітычнай сітуацыяй на той момант, быць упэўненым у сваіх сілах, дакладна разлічыць магчымыя дывідэнды ад рызыковай акцыі. У сувязі з гэтым паўстае пытанне аб дружыне князя полацкага ў гэтым надзвычайным дзеянні.

Змястоўныя абставіны паходу Брачыслава. Пытанне аб дружыне Брачыслава ў разглядаемым паходзе з'яўляецца прынцыповым. Ваенны паход сутнасна адрозніваецца ад абарончых дзеянняў сярэдневякоўя, дзе асноўную функцыю выконвала грамадзянскае апалчэнне – жыхары мясцовай акругі. Паход, актыўная падзея, здзяйсняўся намаганнямі прафесійных ваяроў – баявой дружыны. Для тагачаснай Русі (канец I – пачатак II тысячагоддзя н. э.), сельскагаспадарчага краю, утрыманне дружыны было няпростай, невідавочнай справай. Больш за тое, сам інстытут дружыны успрымаўся крытычна ў шырокіх колах старажытнарускага грамадства, што ў прыватнасці адлюстравана ў мясцовай фальклорнай спадчыне (найперш, былінныя сюжэты пра Мікулу, Вальгу). Невыпадкова, што нават прэтэндэнты на вярхоўную уладу ў Старажытнай Русі звярталіся ў праблемных сітуацыях за вонкавай ваеннай дапамогай – да вікінгаў «за морам», да печанегаў, да палякаў. Напрыклад, толькі Яраслаў Мудры за перыяд 1015–1043 гг. не меней шасці разоў запрашаў варагаў «з-за мора» [50, с. 80].

У дадзеным выпадку выказваліся меркаванні (А. І. Ляшчанка, Н. Н. Ільін і інш.) аб тым, што названы паход быў здзейснены сіламі скандынаўскай дружыны, якая быццам бы да 1021 г. перайшла на службу ад Яраслава Кіеўскага да Брачыслава Полацкага [22, с. 52; 49]. Падставай для такога меркавання лічыцца паведамленне так званай «Сагі (больш дакладна – «Пасмы») аб Эймундзе» (твор

запісаны ў канцы XIV ст. Й. Тордарсан і М. Торхальсан) [59, 60]. Паведамленні саг, апавядальных крыніц вуснага паходжання, надзвычай складана інтэрпрэтаваць. Менавіта дадзены твор (апавяданне аб гераічных шляхах нарвежскага конунга Эймунда) спалучае як арыгінальныя сведчанні, так і недакладнасці, скажэнні [9, с. 500–502]. Між тым «скандынаўскую» версію падтрымліваў яшчэ Я. Длугаш («Брачыслаў… сабраў войска са сваіх палачанаў і варагаў»); насцярожана, але прымалі А. М. Насонаў (1951), Э. М. Загарульскі (1998); падтрымлівалі Л. В. Аляксееў (1966), С. Д. Дзярновіч (1998), М. В. Клімаў (2000).

У гэтым кірунку магчыма адзначыць важную акалічнасць: колькасныя паказчыкі. Так, Эймунд прыбыў на Русь з дружынай у 600 ваяроў [59, с. 109], што пасля службы ў Яраслава, мяркуецца, паменшылася ў некалькі разоў. Такі невялікі атрад наўрад ці меў бы вызначальную ролю падчас паходу на Ноўгарад. Гэты аспект, а таксама іншыя змястоўныя абставіны і верагодную храналогію падзей вылучыў даследчык Мінскага рэгіёна Ю. А. Заяц, які крытычна прааналізаваў звесткі «Пасмы аб Эймундзе» [19]. Навуковец зрабіў асноватворную выснову, што пераход вікінгаў на службу ад Яраслава да Брачыслава мог адбыцца не раней за 1024 г., гэта значыць пасля паходу апошняга на Ноўгарад [19, с. 8–9]. Сапраўды, сама «Пасма...» адзначае толькі пераход Эймунда на службу да Брачыслава, але менавіта пра Наўгародскі паход нічога не гаворыць, што было немагчымым для гераічнага твору [59]. Нарэшце, археалагічныя матэрыялы ў Полацку і яго наваколлі не прэзентуюць адзнак прысутнасці скандынаўскай дружыны, што адзначаў Г. В. Штыхаў (1982), і засведчылі ў навейшай працы вядучыя даследчыкі Паўночнай Беларусі перыяду ранняга сярэдневякоўя (Г. В. Штыхаў, В. М. Ляўко, Д. В. Дук): «прысутнасць варагаў (скандынаваў) на полацкім гарадзішчы і паселішчах, што складалі тэрыторыю старажытнага горада, па рэчаваму комплексу практычна не прасочваецца» [13, с. 79] (наогул, на тэрыторыі Беларусі вядомы адзіны скандынаўскі могільнік, у Верхнім Панямонні [65, с. 76]). Такім чынам, версія аб скандынаўскай дружыне ў паходзе Брачыслава не сцвярджаецца.

Магчыма паставіць пытанне аб наяўнасці ў тагачасным Полацку ўласнай (крывіцкай) дружыны. Але археалагічныя матэрыялы папярэдняга да паходу перыяду (X – пачатак XI ст.) не прэзентуюць сведчанняў укладання ў Полацку маштабных ваенных прафесійных фарміраванняў (вядомы толькі адзінкавыя знаходкі прафесійнай зброі, пры тым дружынныя могільнікі не выяўлены). Таксама адсутнічаюць даныя аб тагачаснай ваеннай актыўнасці Полацка ў пісьмовых крыніцах. А. М. Кірпічнікаў выканаў аналіз працэсаў станаўлення старажытнарускай дружыны на падставе тыпалагічнай і статыстычнай характарыстыкі знаходак узбраення ў пахавальных помніках [24, с. 41–54]. Навуковец вылучыў пранікненне дружынных традыцый ў грамадстве ў X ст., іх замацаванне – у XI–XII стст. (сярэднеўзважаная ваенізацыя грамадства ў XI ст. зменьшылася ў 2–3 разы ў параўнанні з X ст., што сведчыць, на думку даследчыка, аб тэндэнцыі змяншэння ролі апалчэння) [24, с. 46, 48]. Пры тым А. М. Кірпічнікаў адзначаў высокую ступень ваеннай кансерватыўнасці (працяглае захаванне апалчэння) насельніцтва беларускіх зямель на агульнарускім фоне. Да сугучных высноў прыйшлі Я. У. Новікаў (2007) і М. А. Плавінскі (2012) у спецыяльных працах, складзеных з улікам археалагічных даных [52, 55]. М. А. Плавінскі заўважыў, што «найбольш шматлікай па колькасці часткай полацкага войска было апалчэнне» [55, с. 16]. Гаворачы менавіта пра дружыну, даследчык прызнаваў, што гэта «маглі быць варагі» [55, с. 17–18], канстатаваў складанасць пытання аб дакладнай колькасці полацкіх войскаў, і зрабіў адметную выснову: «магчыма меркаваць, што княжацкая дружына была нешматлікай» [55, с. 20–23].

У выніку, трэба шукаць іншую крыніцу атрымання полацкім князем ваеннага кантынгенту. У сувязі з гэтым падкрэслім сімптаматычную заўвагу, якую прывёў М. А. Плавінскі ва ўзгаданай працы: «яшчэ адной крыніцай папаўнення войска былі падуладныя Полацку балцкія плямёны» [55, с. 18]. Тая заўвага, пакуль не распрацаваная на фактычнам матэрыяле, тым не меней, вартая ўвагі ў метадалагічным плане, паколькі закранае новы кірунак асэнсавання праблемы. Больш за тое, гэта тэза прама суадносіцца з наступным палажэннем, вартым абмеркавання ў рэчышчы разглядаемай тэмы. Так, прадстаўляецца абгрунтаваным, што ваенны атрад для Брачыслава мог пакінуць Нёманскі гандлёвы шлях.

Нёманскі гандлёвы шлях (гл. малюнак) ацэньваецца, як адно з адгалінаванняў узгаданага транс'еўрапейскага шляху «з варагаў у грэкі». Гэта своеасаблівае арганізацыйнае (тэрытарыяльнае ваенна-эканамічнае) утварэнне спалучала бераг Балтыйскага мора (землі прусаў) з Рускім Кіевам (і далей – кірункі на поўдзень і ўсход), праз рэкі Нёман, Прыпяць, Днепр [23, 29]. Паўночным полюсам і кіруючым цэнтрам Нёманскага шляху быў гандлёва-рамеслены цэнтр Каўп (Віскаўтэн, Махавое), які месціўся ў прускіх землях на паўвостраве Самбія, на ўзбрэжжы Куршскага заліва, побач з дэльтай Нёмана. Каўп існаваў у перыяд з пачатку VIII ст. да пачатку XI ст.

Строга кажучы, Каўп – гэта не адзіны пункт, а функцыянальны тэрытарыяльны комплекс, які уключае селішча, ахоўна-умацаваныя збудаванні, шэраг могільнікаў, ахоўна-назіральных пунктаў, гавань з прыстанню, асобныя рамесленыя майстэрні,

Геапалітычная сітуацыя ва Ўсходняй Еўропе ў пачатку XI ст. Маршруты Нёманскага гандлёвага шляху: ——— – у пачатковай фазе (IX ст.); – – – – – – – у развітой фазе (X–XI ст.) (прамежкавыя маршруты паміж вылучанымі кірункамі і знешнія адгалінаванні не паказаны); ■ – гандлёвыя цэнтры (*1* – Каўп, *2* – Гарадзішча на Менцы), гарады (*3* – Полацк, *4* – Тураў, *5* – Бярэсце); – · – · – · – · – мяжа арэала яцвягаў у XI ст.

сакральныя аб'екты [25, 29, 33, 39]. Акрамя таго, акруга Каўпа ўключала кола дружынных пасяленняў і могільнікаў з пруска-скандынаўскімі рысамі (Варгенава, Ірзекапініс, Шульштайн, Бледаў) [32, с. 134]. У розныя часы на Каўпе дамінавалі скандынавы – з востава Готланд, з паўднёвай Швецыі, з Даніі (побач з археалагічнымі сведчаннямі захаваўся таксама комплекс скандынаўскай тапаніміі ў рэгіёне) [28; 33, с. 97–98]. Але Каўп не з'яўляўся незалежнай скандынаўскай аўтаноміяй, таксама асяродкам механічна змешанага пруска-скандынаўскага насельніцтва: ён не быў прама інкарпараваны ў прускае грамадства. Каўп меў своеасаблівы статус, які магчыма вызначыць, як знешні анклаў. Так, Каўп месціўся літаральна на ўскрайку прускіх зямель, непасрэдна межаваў з імі, але быў аддзелены ад племянных тэрыторый прусаў свеасаблівай «паласой бяспекі» – ланцугом свяцілішчаў [31, с. 137; 32, с. 212]. Гэта сведчыць, што сацыяльны клімат Каўпа (дружынны, гандлёвы) істотна адрозніваўся ад традыцыйнага укладу прусаў (родаабшчыннага). Побач з тым мела месца пастаянная, шматузроўневая сувязь прусаў з Каўпам: там пастаянна знаходзіліся пэўныя прадстаўнікі прускага грамадства – дружыннікі, прафесійныя ваяры, гандляры, рамеснікі [27–30; 32, с. 212–213; 40], іншымі словамі – прускія вікінгі [32, с. 134]. У археалагічных матэрыялах прасочваюцца сувязі Каўпа ад Куршскага заліва (гарадзішча Карален-Берг), праз Ніжні Нёман (гарадзішча Жардэ, могільнікі Лінкунэн (Ржэўскае), Вэшвіле) да Сярэдняга Панямоння (група могільнікаў каля г. Каўнас: Марвеле, Вершвай, Эйгуляй і інш.). На ўзгаданых могільніках сустракаюцца прускія і скандынаўскія пахаванні, рытуальна суадносныя з пахаваннямі на Каўпе. Верхняе Панямонне таксама змяшчае рознатыповыя адзнакі дзейнасці Нёманскага шляху, у тым ліку інфраструктуру (сетку гарадзішчаў – дружынных станаў; гандлёва-рамесленых цэнтраў; гарадоў), рознатыповыя імпарты (таварныя індыкатары гандлёвай дзейнасці: масавыя знаходкі, знаходкі адносна абмежаванага ўжытку; індыкатары сацыяльных змен: знаходкі абмежаванага ўжытку, прадметы раскошы, адзнакі дзейнасці ваеннай дружыны; індыкатары акцэнтаваных інаэтнічных уздзеянняў: скандынаўскіх і балцкіх; індыкатары тэхналагічных сувязяў з рэгіёнамі – вытворцамі спецыфічнай сыравіны для рамесленай вытворчасці; індыкатары прафесійнай гандлёвай дзейнасці: знаходкі каштоўнага інвентару, прафесійны рыштунак гандляра) [2, 4, 5, 23].

Ацэнка скандынаўскай прысутнасці ў Верхнім Панямонні выяўляе спецыфічныя рысы (у параўнанні з арэаламі іншых напрамкаў шляху «з варагаў у грэкі» – р. Волхаў, Заходняя Дзвіна, Днепр). У прыватнасці, Верхняе Панямонне змяшчае толькі асобныя адзнакі ўдзелу скандынаваў (пераважна, рознага роду прадметы матэрыяльнай культуры), і прытым не мае рыс варажскіх уплываў [10–12]. Так, ніводны з мастацкіх стыляў вікінгаў, альбо тыповых вырабаў скандынаваў не быў успрыняты ці рэтранслірараваны ў мясцовай рамесленай вытворчасці ў Верхнім Панямонні (і наогул, на тэрыторыі Беларусі). Самі скандынаўскія знаходкі па маршруце шляху – разнастайныя, але колькасна нешматлікія, не ўтвараюць комплексаў, альбо серый, не дэманструюць пунктаў канцэнтрацыі, якія магчыма было б ідэнтыфікаваць з месцамі ўстойлівага месцазнаходжання вікінгаў. Найбольш рэпрэзентатыўныя прыклады вырабаў – прафесійная зброя, менавіта мячы і коп'і. Але, натуральна, распаўсюджванне скандынаўскіх вырабаў зброі яшчэ не ўказвае на распаўсюджванне саміх скандынаваў. Гэта агульнаеўрапейская рэчаіснасць, якая сведчыць аб распаўсюджванні новых сацыяльных рэалій, аб складанні і дзейнасці дружынных фарміраванняў [12, с. 9–15; 56, с. 33]. Адметна, што для значнай часткі мячоў і наканечнікаў похваў мяча адзначаюцца балцкія тыпалагічныя рысы ці ўплывы [12, с. 22–24; 56, с. 29–33, 44–45]. Іншыя скандынаўскія вырабы (прадметы побыту, вопраткі, упрыгажэнні) рассеяны па даволі абшырнай тэрыторыі, але без прыкмет канцэнтрацыі [10–12]. Прытым магчыма ўдакладніць некаторыя этнічныя аспекты адносін са скандынавамі. Матэрыялы ўзгаданага скандынаўскага пахавання ў Верхнім Панямонні (Гарадзілава) і большасці знаходак суадносяцца з Паўднёвай Швецыяй. Заўважым, што гэта карэліруе са складам дамінуючага скандынаўскага кантынгента на Каўпе. Выкладзенае сведчыць аб тым, што непасрэдная прысутнасць варагаў у Верхнім Панямонні была абмежаванай, верагодна насіла транзітны характар. Трансляцыя ўздзеяння скандынаваў у рэгіёне адбывалася, відавочна, праз пэўнага роду пасрэдніцтва. Папярэдне магчыма выказаць меркаванне, што гэта было заходнебалцкае пасрэдніцтва (прусы, яцвягі).

Нёманскі гандлёвы шлях увасабляе адметную акалічнасць, важную для асэнсавання разглядаемага пытання. Раней абгрунтоўвалася палажэнне аб тым, што Нёманскі шлях паслужыў арганізацыйнай і эканамічнай асновай для прускага рассялення ў кірунку Верхняга Панямоння, вынікам чаго стала афармленне яцвягаў як раннесярэдневяковага адгалінавання прусаў [6, 7]. Прадстаўленасць прускай прысутнасці і уплываў у Верхнім Панямонні нашмат больш выразная за скандынаўскую. Гэта – пахавальныя помнікі яцвягаў (каменныя курганы і каменныя магілы), каменныя гарадзішчы і сакральныя помнікі прусаў, прускія этна- і сацыявызначальныя пахаванні з канём, афармленне гарадской культуры вершнікаў, пруска-яцвяжская тапаніміка, распаўсюджванне агульнабалцкай традыцыі ўжывання падковападобных фібул у складзе вопраткі,

іншыя традыцыйныя знаходкі, у тым ліку бурштын [2, 4, 6, 8, 21, 23].

Важным элементам дзейнасці прусаў на Нёманскім шляху былі палітычныя зносіны. Яны былі скіраваны на ўстойлівыя, саюзныя дачыненні з насельніцтвам транзітных тэрыторый (найперш, дрыгавічы), а таксама з паўднёвым полюсам шляху – Кіевам. Сярод іншага вылучаецца стратэгічны саюз прусаў з князем Русі Уладзімірам (Святым). Так, напрыканцы X ст. прусы дапамаглі Уладзіміру (у складзе атрада варагаў «з-за мора») авалодаць Кіевам і прыняць у кіраванне Рускую дзяржаву [3, 30, 35, 37, 38].

У сувязі з выказаным варты ўвагі наступны сюжэт, які выклаў Адам Брэменскі ў схоліі (устаўцы) да каментарыя падзей 1014–1016 гг. у творы «Дзеянні архіепіскапаў Гамбургскай царквы»: «Канут аддаў сваю сястру замуж за сына караля Русі» [44, с. 131, 138; 51, с. 476]. Нагадаем, што Канут у перыяд 1016–1028 гг. заваяваў уладу і стаў каралём Англіі, Даніі, Нарвегіі, Шатландыі, Швецыі, атрымаў у кіраванне Шлезвіг і Памеранію, і стаў звацца «Канут Вялікі». Калі асоба «сястры Канута», Эстрыд, у даследчыкаў не выклікае сумненняў, то «сын караля Русі» дакладна не вызначаны дагэтуль. Навукоўцы аднадушныя ў меркаванні, што той саюз быў нядоўгім (вядома, што ў 1020 г. Эстрыд абрала шлюб з нарманскім герцагам Ульвам) [51, с. 477; 61, с. 83–85]. На думку М. Б. Свярдлова, гэта быў шлюб з «нейкім з сыноў» Уладзіміра Святога, у 1014–1015 гг. [61, с. 83–85]. А. В. Назаранка вылучаў больш шырокі перыяд 1014–1035 гг. [51, с. 477]. К. Маўрэр, А. Кэмпбэл і іншыя навукоўцы, прымалі пазнейшую дату, з 1025 г. (пасля забойства Ульва). Між тым, зыход вышэй 1016 г. відавочна супярэчыць датаванню схоліі, а таксама і рэаліям Старажытнай Русі. Таму падчас вызначэння «сын караля Русі» найперш абмяркоўваліся кандыдатуры сыноў Уладзіміра – Усевалада (князь Валынскі) (Л. М. Сухоцін, М. Б. Свярдлоў), і «іншых» (М. Б. Свярдлоў, А. В. Назаранка). На думку А. В. Назаранкі, найбольш верагодная асоба – Глеб Уладзіміравіч [51, с. 477–478].

Аднак сам даследчык адмаўляе гэту выснову на той падставе, што «не видно конкретных причин, которые могли бы привести в указанные годы к такому политическому союзу», а таксама «сближение с далёким Киевом… явно не сулило Кнуту тогда никакой пользы» і зрабіў адметнае крыніцазнаўчае вызначэнне: «этот неутешительный вывод свидетельствует либо о недостоверности информации, содержащейся в 39-й схолии хроники Адама Бременского, либо о том, что не все возможности ее объяснения были изучены» [51, с. 479]. Таксама А. В. Назаранка выканаў тэксталагічны аналіз схоліі і прыйшоў да высновы, што яна належыць менавіта Адаму Брэменскаму [51, с. 479–480]. Даследчык адзначае, што па сведчанні самога Адама Брэменскага, «адным з яго галоўных інфармантаў у скандынаўскіх справах быў Свен Эстрыдсэн» (кароль Даніі, сын узгаданай Эстрыд), «які трымаў у памяці ўсю гісторыю варвараў, быццам запісаную» [51, с. 480]. Такім чынам, крыніцазнаўчыя аргументы сведчаць на карысць сапраўднасці паведамлення аб шлюбу, менавіта ў перыяд схоліі 1014–1016 гг. На тое ж указваюць даныя нумізматыкі, якія вылучыў У. М. Поцін – аб выбухападобным распаўсюджванні на Русі ў пачатку XI ст. англійскіх манет Канута і Этэльрэда II (папярэдніка Канута) [58, с. 101–122]. Дэталёвая характарыстыка той з'явы ўключае наступныя параметры. Колькасць знаходак на Русі манет апошняй чаканкі (1009–1017 гг., тып А «Апошні малы крыж») Этэльрэда II (278 манет) блізкая да агульнай колькасці знаходак манет усіх яго папярэдніх 10 чаканак за 30 гадоў іх выканання (358 манет). Колькасць знаходак на Русі манет першай чаканкі (1017–1023 гг., тып Е «Чатырохліснік») Канута (296 манет) перавышае колькасць знаходак манет яго наступных 3 чаканак за 12 год (246 манет) [58, с. 110]. Агульная колькасць узгаданых двух чаканак манет перавышае агульную колькасць усіх іншых знаходак англійскіх манет на Русі. Таксама, тыя дзве чаканкі вылучаюцца высокай колькасцю імітацый. Прытым імітацыі да манет Этэльрэда II болей распаўсюджаныя на землях Усходняй Балтыкі (Эстонія), а імітацыі манет Канута – на Русі [58, с. 119], што ўскосна характарызуе кірунак і дынаміку развіцця гандлёвых і палітычных кантактаў у рэгіёне, у тым ліку адносіны Русі з рэгіёнам Паўднёвай Балтыкі [58, с. 119–121]. На падставе гэтых даных У. М. Поцін выказваў меркаванне аб існаванні ў пачатку XI ст. нейкіх прамых дацка-рускіх адносін [58, с. 101–122]. А. В. Назаранка прызнаваў таксама існаванне такіх адносін, але не бачыў іх у перыяд, вызначаны схоліяй, і таму прапанаваў гіпатэтычнае меркаванне, што Эстрыд атрымала шлюб з сынам Яраслава Іллёй у 1019 г. Даследчык выклаў падрабязнае абгрунтаванне на гэты конт, якое сам прызнаў «грувасткім» [51, с. 484–499]. Але галоўнае, што яно не з'яўляецца паўнаважкім і пераканаўчым. Пра Іллю невядома амаль нічога, у тым ліку і дата яго нараджэння. Калі ж прыняць меркаванні М. П. Пагодзіна і А. І. Ляшчанкі аб даце нараджэння Іллі ў 1018 г. [49, с. 1071], то натуральна, яго шлюб з Эстрыд у 1019 г. быў немагчымы.

Прадстаўляецца абгрунтаваным, што вузлавым пунктам для разумення ўзгаданага паведамлення Адама Брэменскага з'яўляецца дзейнасць Нёманскага гандлёвага шляху. Такі канцэптуальны падыход дакладна вызначае палітычную ролю, якую меў саюз з прусамі/яцвягамі для Уладзіміра, і прадстаўляе неабходны грунт (які справядліва вышукваў для даты схоліі 1014–1016 гг. А. В. Назаранка) для асэнсавання наступных саюзаў – асабістага («сястра Канута»–«сын караля Русі») і міждзяржаўнага (Данія–

Русь). Натуральна, іх стварэнне мела выключную значнасць для Нёманскага шляху, кіруючы цэнтр якога, Каўп, меў відавочныя кантакты з Даніяй. На тое ўказваюць археалагічныя матэрыялы (дацкія імпарты, адзнакі непасрэднай прысутнасці дацкіх вікінгаў), а таксама паведамленні сярэдневяковых хронік (Саксо Граматык, «Аналы Рыда») аб прыбыцці да прусаў шэрагу атрадаў дацкіх конунгаў (Рагнар Ладброк, сярэдзіна IX ст.; Латэкнут, пачатак X ст.; Хакан Харальдсан, другая палова X ст.) [66, S. 398; 67, S. 4–5; 68, p. 257, 274]. Па вызначэнні У. І. Кулакова, тыя паведамленні маюць карэліруючыя археалагічныя матэрыялы на Каўпе [28, 33, 39, 42]. Такім чынам, саюз Канута з Уладзімірам праз Каўп і Нёманскі шлях быў перадумоўлены працяглым перыядам гандлёвага супрацоўніцтва Каўпа з датчанамі праз Балтыку. Такое разуменне становішча асвятляе не толькі абмеркаваны фрагмент Адама Брэменскага, але і іншыя эпізоды гісторыі Старажытнай Русі.

Геапалітычная сітуацыя ва Усходняй Еўропе напярэдадні паходу Брачыслава. Калі прыняць шлюб Эстрыд з сынам Уладзіміра, Глебам, і суадносны з ім руска-дацкі саюз 1014 г., то адчыняецца новая пазіцыя на разуменне наступных падзей у гісторыі Русі. Найперш, гэта адначасовыя бунты ў тым жа 1014 г. двух старэйшых сыноў Уладзіміра – Святаполка, князя Тураўскага, і Яраслава, князя Наўгародскага. У разглядаемым кантэксце дзейнасці гандлёвых шляхоў – першы сын кантраліраваў зыходны маршрут Нёманскага шляху (праз левыя прытокі Прыпяці да Нёмана) і Бужскі шлях; другі – Волхаўскі шлях. Такая адмоўная рэакцыя сыноў Уладзіміра сведчыць аб іх палітычных розначытаннях. У выніку Святаполк быў заняволены ў Кіеве, а супраць Яраслава Уладзімір пачаў збірацца ў ваенны паход. Высвятляецца, што супрацьстаянне Уладзіміра і яго сыноў не было аднамомантнай з'явай, але выспявала працяглы час. Дынастычны саюз паміж Уладзімірам і Канутам толькі праявіў тыя рэаліі.

Заўважым дарэчы, што ўзгаданы саюз 1014 г. не з'яўляўся нечым надзвычайным. Так, Г. С. Лебедзеў вызначаў 1016 г. як памежны ў руска-скандынаўскіх адносінах (пераход ад III да IV перыяду) [46, с. 590–592], сярод адметных рысаў якога – развіццё палітычных, дынастычных сувязей – гэта значыць пошук шляхоў умацавання дагаварных адносін на новым узроўні (тыя змены характарызавалі таксама Е. А. Мельнікава, А. В. Назаранка, інш.). У гэтым рэчышчы адзначым шлюб Святаполка з дачкой польскага князя Баляслава Харобрага (мяркуецца, з 1013 па 1014 г.), прымусовы шлюб самога Баляслава (1018 г.) з сястрой Яраслава Прадславай, шлюб Яраслава (1019 г.) з дачкой шведскага караля Олафа Шоткануна (якой князь дараваў Ладагу, вызначыўшы адпаведна ролю Ноўгарада).

Уладзімір не паспеў здзейсніць паход на Ноўгарад супраць Яраслава. У 1015 г. Уладзімір адышоў з жыцця, што радыкальна змяніла сітуацыю на Русі. Святаполк вызваліўся з палону ў Кіеве, але не здолеў затрымацца ва ўладзе, і зыйшоў з Кіева ў 1016 г. Тады ж быў забіты Глеб, што зафіксавала разбурэнне неўзабаве створанага руска-дацкага саюзу. У тым жа 1016 г. Канут знішчыў Каўп і пазней стаў звацца «каралём Самбіі» [67, S. 3–5]. Святаполк звярнуўся за падтрымкай да свайго цесця, князя польскага Балеслава Харобрага, і з яго дапамогай у 1018 г. выступіў супраць брата Яраслава, прыбыў у Кіеў, але таксама не затрымаўся, і звярнуўся за дапамогай да печанегаў. У 1019 г. Святаполк прадпрыняў трэцюю і апошную спробу авалодаць Кіевам, але Яраслаў ізноў перамог.

У гэтай чарадзе дынастычных супрацьстаянняў Рурыкавічаў варта звярнуць увагу, што ваенныя канфлікты не спрыялі надзейнасці гандлёвых зносін. Канфлікты завяршыліся замацаваннем ва ўладзе князя Яраслава, які быў скіраваны да змены палітычнага курсу Уладзіміра, што ўказвае на наступныя верагодныя змены ў дзейнасці Нёманскага гандлёвага шляху. Сярод магчымых вектароў тых змен вылучаюцца наступныя: падпарадкаванне новаму уладару – Яраславу; супрацьстаянне Яраславу і новыя спробы змясціць яго.

У выніку дзеянняў па згодзе, па першым вектары, варта чакаць, што наступны перыяд атрымае характар павольнай эвалюцыі, без радыкальных змен сітуацыі. Дзеянні па другім, канфліктным вектары, несумненна, павінны былі прадставіць новыя палітычныя рашэнні. У гэтым выпадку паход 1021 г. князя Полацкага Брачыслава на Ноўгарад з'яўляецца відавочным адлюстраваннем дзеянняў па другім вектары. Такі сцэнарый адлюстроўвае супадзенне пазіцый Полацка і прускага персаналу Нёманскага гандлёвага шляху.

3. Магалінскі, І. У. Шпількі «пус епі» з тэрыторыі Полацка : класіфікацыя, храналогія і праблема паходжання / І. У. Магалінскі // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : у 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 1. – С. 78–83.

4. Кошман, В. И. Изделия с перегородчатой эмалью на территории Беларуси / В. И. Кошман // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск : Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2001. – Вып. 16. – С. 130–137.

5. Гурын, М. Ф. Гандлёвыя сувязі Полацкай зямлі / М. Ф. Гурын, Ш. І. Бекцінееў // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск : Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 1997. – Вып. 12. – С. 66–76.

6. Ганецкая, І. У. Імпарт у Полацку X–XIII стст. па археалагічных матэрыялах / І. У. Ганецкая // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы IV Міжнар. навук. канф. – Полацк : НПГКМЗ, 2003. – С. 50–58.

7. Дук, Д. У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 180 с.

8. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк IX–XIII вв. / Г. В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 136 с.

9. Штыхов, Г. В. Отчет о работах в 1979 г. в окрестностях Минска и в других местах Полоцкой земли / Г. В. Штыхов // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – № 635.

10. Зоценко, В. Н. Скандинавский импорт бронзы в Южную Русь / В. Н. Зоценко // Тверской археолог. сб. – Тверь : Изд-во «Триада», 2007. – Т. II, вып. 6. – С. 228–231.

11. Еремеев, И. И. Полоцкая земля / И. И. Еремеев // Русь в IX–Хвв. : археологическая панорама / Ин-т археологии РАН ; отв. ред. Н. А. Макаров. – М. ; Вологда : Древности Севера, 2012. – С. 274–299.

12. Магалінскі, І. У. Вырабы з каляровых металаў гаспадарчага і бытавога прызначэння з тэрыторыі Полацка / І. У. Магалінскі // Полацкі музейны штогоднік : зб. навук. артыкулаў за 2011 г. / уклад. Т. А. Джумантаева, А. У. Шумовіч. – Полацк : НПГКМЗ, 2012. – С. 64–76.

13. Асташова, Н. И. Химико-технологическое изучение древнерусских рельефных энколпионов из археологического собрания Государственного исторического музея / Н. И. Асташова, Т. Г. Сарачева // Славяно-русское ювелирное дело и его истоки : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. 100-летию со дня рождения Г. Ф. Корзухиной, Санкт-Петербург, 10–16 апр. 2006 г. – СПб. : Нестор-История, 2010. – С. 317–329.

14. Ениосова, Н. В. Химический состав ювелирного сырья эпохи средневековья и пути его поступления на территорию Древней Руси / Н. В. Ениосова, Р. А. Митоян, Т. Г. Сарачева // Цветные и драгоценные металлы и их сплавы на территории Восточной Европы в эпоху средневековья. – М. : Вост. лит., 2008. – С. 107–188.

15. Коновалов, А. А. Цветной металл (медь и сплавы) в изделиях Новгорода X–XV вв. / А. А. Коновалов // Цветные и драгоценные металлы и их сплавы на территории Восточной Европы в эпоху средневековья. – М. : Вост. лит., 2008. – С. 7–106.

16. Корзухина, Г. Ф. О памятниках «корсунского дела» на Руси (по материалам медного литья) / Г. Ф. Корзухина // Византийский временник. – М. : Изд-во АН СССР, 1958. Т. XIV. – С. 129–137.

17. Николаева, Т. В. Древнерусские амулеты-змеевики / Т. В. Николаева, А. В. Чернецов. – М. : Наука, 1991. – 124 с. : ил.

18. Дук, Д. У. Выратавальныя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Вялікага пасада Полацка ў 2005 годзе / Д. У. Дук // Весн. «ПДУ». – 2007. – № 1. Сер. А, Гуманіт. навукі. – С. 5–23.

19. Клімаў, М. В. Асобныя аспекты развіцця паўночнай часткі Вялікага пасада г. Полацка (па выніках археалагічных даследаванняў 2009 г. на вул. Ф. Скарыны) / М. В. Клімаў // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : у 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 1. – С. 55–64.

20. Рябцева, С. С. Древнерусские ювелирный убор (основные тенденции формирования) / С. С. Рябцева. – СПб. : Нестор-История, 2005. – 384 с.

21. Магалінскі, І. У. Ювелірныя ўпрыгажэнні старажытнага Полацка (X–XVII стст.) / І. У. Магалінскі // Вестн. ПГУ. – 2012. – № 9. – Сер. А, Гуманит. науки. История. – С. 16–27.

22. Козлова, А. В. Металлические украшения и предметы быта восточной традиции X–XV веков из раскопок в Пскове / А. В. Козлова // Археология и история Пскова и Псковской земли. – Псков : Ин-т археологии РАН, 2007. – С. 125–143.

23. Svetikas, E. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės christianizacija XIV a. pab. – XV a. : archeologiniai radiniaisukrikščioniškais simboliais / E. Svetikas. – Vilnius : Diemedžioleidykla, 2009. – T. 1 – 659 p. : iliustr., žml.

24. Митрофанов, А. Г. Древний Полоцк (по археологическим данным) / А. Г. Митрофанов, Г. В. Штыхов, В. Р. Тарасенко // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – № 124.

25. Бреполь, Э. Теория и практика ювелирного дела / Э. Бреполь. – Л. : Машиностроение, 1982. – 384 с.

26. Latvijas PSR archeologija. – Riga : Zinātne, 1974. – 368 p.

27. Daiga, J. Krāsainometalu ķīmiskais sastāvs Latvijā / J. Daiga // Archeologijaun Etnografija. – Riga : Zinātne, 1962. – T. IV. – P. 47–65.

28. Королёва, Э. В. Результаты спектрального анализа ювелирных изделий средневекового Пскова / Э. В. Королёва // Археологическое изучение Пскова. Раскопки в древней части Среднего города (1967–1991 гг.). – Псков : ГП «Невельская типография», 1996. – Том 1, вып. 3. – С. 229–300.

29. Мальм, В. А. Подковообразные и кольцевидные застежки-фибулы / В. А. Мальм // Труды ГИМ. – М. : Советская Россия, 1967. – Вып. 43 : Очерки по истории русской деревни (X–XIII вв.). – С. 149–190.

30. Тарасаў, С. В. Сядзіба полацкіх ювеліраў XII–XIII стст. / С. В. Тарасаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы IV Міжнар. навук. канф. – Полацк : НПГКМЗ, 2003. – С. 267–272.

Резюме

И. В. Магалинский

Изделия из цветных металлов в контексте культурно-экономических контактов Полоцка в X–XVII вв.

В статье изделия из цветных металлов рассматриваются в качестве важного источника для изучения основных направлений культурно-экономических связей Полоцка в X–XVII вв. Для установления происхождения определенных групп вещей автор предлагает совмещать традиционный типологический метод с данными спектрального анализа химического состава металла. В результате делается вывод, что большое влияние на характер ювелирного убора и материальную культуру древнего населения Полоцка на правах соседей оказывали прибалтийский земли и города Северо-Западной Руси. В зависимости от геополитических условий на ассортимент изделий из цветных металлов влияли и иные территории (страны Востока, Южная Русь, Византия, Скандинавия). С XIII в. важным направлением в культурно-экономических контактах Полоцка стало западноевропейское, которое актуализировалось через посредничество Риги.

Summary

I. Mahalinski

Products made from non-ferrous metals in connection with cultural and economic communications of Polotsk in 10th–17th centuries

In this article products made from non-ferrous metals are regarded as the important source of study the main tendencies of cultural and economic communications of Polotsk in 10th–17th centuries. The author combines traditional typological method with the results of the spectral analysis of metal's chemistry in order to define the origin of some groups of things. The author concludes that Baltic lands and some towns of north-west Rus had a great influence upon the jewelry structure and material culture of Polotsk ancient population. Subject to geopolitical conditions, some territories (Eastern Countries, South Rus, Byzantine Empire, and Scandinavia) influenced the range of products made from non-ferrous metals. Since XIIIth century west-European tendency became one of the important ones in cultural and economic communications of Polotsk.

Пастуніў 15.04.2012

УДК 903(476.4)«9/14»

І. А. Марзалюк, *Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, доктар гістарычных навук, прафесар (г. Магілёў)*

Культурны слой Магілёўскага замчышча як гістарычная крыніца

Магілёўскае замчышча (зараз Парк імя М. Горкага) размешчана на мысе высокага правага берага Дняпра, паблізу р. Дубравенка. З захаду пляцоўка дзядзінца узвышалася на 20 м над далінай Дубравенкі, з поўдня – на 25 м над далінай Дняпра, з усходу вышыня схілу дасягала 14 м, з поўдня была ўмацавана шырокім і глыбокім ровам. Сучасная плошча помніка – 30 342 м^2 (мал. 1).

Старажытнарускае мінулае Магілёва доўгі час заставалася белай плямай у савецкай і постсавецкай археалогіі і медыявістыцы. Сістэмных даследаванняў на тэрыторыі магілёўскага гарадзішча «Магіла» да пачатку 1990-х гадоў не праводзілася. Аднак яшчэ ў 1972 г. студэнтам Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута І. Г. Іонэ падчас археалагічных разведак у перыяд з 1969 г. па 1972 г. быў атрыманы наступны археалагічны матэрыял:

а) старажытнаруская жалезная сякера XI–XII стст.;

б) каса-гарбуша XI–XII стст.;

в) жалезны нож XI–XII стст.;

г) бранзалет бронзавы лентачны са спіральнападобнымі канцамі X–XI стст.;

д) некалькі фрагментаў кругавой керамікі з высокімі шыйкамі і адвогнутымі вонкі венчыкамі, са скошанымі або закруглёнымі краямі, з тыпова лінейна-хвалістым славянскім арнаментам па плечуках сасудаў, якія датуюцца XI–XII стст. Астатняя кераміка адносілася да больш позніх часоў (XIII–XV стст.);

е) праселкі шыферныя, біканічныя, оўручскага тыпу XI–XIII стст. [8].

У 1983 г. археалагічныя даследаванні ў Магілёве праводзіў Міхаіл Аляксандравіч Ткачоў. Ім упершыню былі праведзены невялікія археалагічныя раскопкі (раскоп плошчай 48 м^2) на тэрыторыі Замчышча (мал. 1). У межах раскопа вучоны зафіксаваў два жаночых пахавання XII–XIII стст. Гэтага аказалася дастаткова для таго, каб даследчык зрабіў выснову аб тым, што сярэдневяковаму магілёўскаму замку папярэднічала не старажытнае гарадзішча, а грунтовы могільнік XII–XIII стст. На падставе сваіх даследаванняў М. А. Ткачоў зрабіў выснову, што «*археалагічныя матэрыялы сведчаць аб малаінтэнсіўным жыцці на берагах Дняпра і Дубравенкі да XIV–XV стст.*» [30, с. 73–74]. Артыкул І. Г. Іонэ з матэрыяламі старажытнарускага часу М. А. Ткачовым не згадваўся і не каментаваўся.

З 1993 г. археалагічныя даследаванні помніка праводзіць аўтар дадзенага тэксту. Сёння на тэрыторыі помніка намі вывучана 626 м^2 (мал. 1). Вынікі буйнамаштабных даследаванняў магілёўскага замка не дазваляюць пагадзіцца з высновамі М. А. Ткачова аб адсутнасці на гэтай тэрыторыі старажытнарускага ўмацаванага паселішча.

Неабходна адразу звярнуць увагу на тую акалічнасць, што першы этап у асваенні тэрыторыі гістарычнага цэнтра Магілёва ўсходнеславянскім насельніцтвам звязаны з IX–XI стст. Аб гэтым сведчаць матэрыялы курганнай групы, што знаходзілася побач з замкам, у міжрэччы Дняпра і Дубравенкі. Курганы былі распаханы ў 1880-х гадах. У раскапаных курганах былі знойдзены срэбраныя пярсцёнкі, шкляныя залачоныя пацеркі, кераміка. У некалькіх насыпах былі адшуканы арабскія дзірхамы пачатку VIII–IX ст. Адна манета была амейядскай (704 г.), а пяць – абасідскімі, выбітымі ў Басры ў 752 г., Балсе ў 803 г., Аране, Багдадзе ў 807 г., Маадэне-Баджынесе ў 810 г. Вельмі каштоўнай і важнай для разумення эвалюцыі і статуса паселішча на гары «Магіла» з'яўляецца і знаходка ўражваючага манетнага скарбу, знойдзенага каля замку, на правым беразе р. Днепр у 1820-х гадах. Гэты скарб налічваў 1300 цэлых і некалькі соцен палавінак і чацвярцінак куфічных дзірхамаў. Манеты датаваліся ў храналагічным дыяпазоне ад 699 да 802 г. [12, с. 179; 14; 15, с. 16; 24, с. 25–26].

У выніку работ аўтара 1993–2007 гг. (мал. 1–9) быў выяўлены старажытнарускі культурны слой, прасочаны рэшткі старажытнарускіх умацаванняў гарадзішча «Магіла». Упершыню культурны слой Магілёва XII–XIII стст. быў адкрыты намі ў ходзе даследаванняў 1993 г. Раскопкі 1994–1996 гг. далі даволі рэпрэзентатыўны матэрыял старажытнарускага часу [12; 14; 15, с. 16–20; 16–18].

Пры вывучэнні матэрыялаў геалагічных свідравін з тэрыторыі замка намі была звернута ўвага на тую акалічнасць, што спачатку плошча пляцоўкі замчышча была значна меншай – на адлегласці 51–69 м ад заходняга краю пляцоўкі, амаль пасярэдзіне сучаснай плошчы помніка ў геалагічных свідравінах магутнасць штучных напластаванняў вагаецца ў межах ад 7,8 да 15,0 м. Усё гэта дазволіла выказаць меркаванне, што менавіта тут праходзіла ўсходняя мяжа першапачатковага гарадзішча (мал. 1).



Мал. 1. Сітуацыйны план даследаванняў. Парк імя М. Горкага. Магілёў

Пасля археалагічнага сезона 1996 г. сумненняў у справядлівасці гэтай думкі не засталося. У паўночна-ўсходняй частцы помніка быў вывучаны раскоп № 5 плошчай 32 м^2. Нам пашанцавала натрапіць на рэшткі вонкавага схілу першапачатковага вала і вызначыць час яго нівеліроўкі з мэтай павелічэння пляцоўкі гарадзішча. Насып вонкавага схілу вала складаецца з зямлі чорнага колеру. У яго верхняй частцы на глыбіні 2,4 м ад дзённай паверхні ў кв. 1 быў зафіксаваны фрагмент венца гаршка канца XV – пачатку XVI ст. Характар рэчавага матэрыялу рэзка змяняецца, калі пачынаюць сустракацца праслойкі вугалю значных памераў і таўшчыні – тут зафіксаваны два венцы з прафіліроўкай, характэрнай для рэчаў канца XII – XIII ст., фрагмент шкляного старажытнарускага бранзалета, які мае на сабе сляды тэрмічнай апрацоўкі, а таксама абламанае зубіла. Але самая цікавая знаходка чакала нас наперадзе. На глыбіні 3,7 м ад дзённай паверхні быў знойдзены наканечнік мангольскай стралы XIII ст. – зрэзень [15, с. 18, 188; 18].

Магутны нівеліровачны слой гліны, які прасочваўся на ўсіх профілях раскопу, трэба адносіць да 1526 г., калі пры будаўніцтве новага замка «было принято много горы Могилы», першапачатковы вал знівеліраваны, роў засыпаны, а познасярэдневяковая фартэцыя ахапіла амаль у два разы большую плошчу.

Раскоп 2004 г. (катлаван пад царкву), нягледзячы на свае памеры, быў малаінфарматыўны. На яго плошчы культурны слой амаль цалкам знішчаны і пераадкладзены ў ходзе будаўнічых работ 1960-х гадоў, калі тут быў пабудаваны летні тэатр. У ходзе даследаванняў на плошчы гэтага раскопу былі зафіксаваны толькі невялікія лінзы культурнага слою XII–XIII стст. (мал. 1).

Надзвычай важныя матэрыялы па гісторыі старажытнарускіх умацаванняў былі атрыманы ў ходзе вывучэння *траншэі № 5 2005 г.,* разбітай ў паўночнай частцы помніка, амаль на краі пляцоўкі замчышча. Плошча траншэі – 8 м^2 (мал. 1; 2, *д*).

Пасля гумусіраванага слою урадлівай глебы (магутнасць 0,15–0,20 м) пачынае прасочвацца перакоп, які складаецца з *будаўнічага друзу шэрага колеру* з артэфактамі савецкага часу. У гэтых напластаваннях былі зафіксаваны як фрагменты керамікі эпохі Кіеўскай Русі, так і XIV–XVIII стст. Яго магутнасць знаходзіцца ў межах 0,5 м, у паўночна-заходняй частцы кв. 2 перакоп з будаўнічага друзу прасочваецца амаль да мацерыка. Узнікненне гэтых напластаванняў звязана з будаўнічай дзейнасцю 1960-х гадоў, калі на тэрыторыі замчышча быў пабудаваны летні тэатр. Фрагмент рэшткаў яго бетаніраванага падмурка чытаецца на ўсходнім профілі траншэі ў кв. 2 (мал. 3, *а*).



Мал. 2. Разгортка профіляў траншэі № 5 (*а–г*) і план мацерыка (*д*). Замчышча. Магілеў. 2005 г.



Мал. 3. Разгортка профіляў раскопу № 7: *а* – паўдневы профіль; *б* – заходні профіль. Замчышча. Магілеў. 2006 г. Умоўныя адзнакі тыя ж, што і да мал. 2

Будаўнічы друз у непашкоджанай перакопам частцы траншэі змяняюць *напластаванні шэрага колеру* магутнасцю 0,6–0,8 м з украпінамі бітай цэглы-пальчаткі і керамічнымі матэрыяламі XVI–XVIII стст. (мал. 2).

Пасля іх сустракаецца *пласт абпаленай да цэгла-падобнага стану гліны* ярка-чырвонага колеру магутнасцю 0,401 м. У паўднёва-заходняй частцы кв. 1 пласт гліны змяняецца *гліністай супессю* магутнасцю да 0,6 м. Гліністая супесь стратыграфічна звязана з пластам абпаленай гліны, з'яўляецца своеасаблівым яго працягам (мал. 2). На глыбіні 1,65 м ад дзённай паверхні пры распрацоўцы пласта гліны была зафіксавана шпора з рэпейкай. Падобны тып вырабаў характэрны для старажытнасцей XVI ст.

Пласт абпаленай гліны ёсць усе падставы адносіць да рэшткаў будаўнічых канструкцый магілёўскага замка 1526 г. Цікава, што пры распрацоўцы гэтага пласта былі зафіксаваны рэшткі будаўнічай ахвяры – ля падэшвы гліны на глыбіні 1,16–1,22 м ад дзённай паверхні знойдзены фрагменты двух непаліваных гаршкоў XVI ст. з рэшткамі стравы, косткамі жывёл і рыбінай лускай (мал. 2, *в*). Акрамя гэтага ў межах кв. 1 на глыбіні 1,31 м ад дзённай паверхні выразна чыталася яма-канаўка, запоўненая пасечанымі косткамі жывёл (мал. 2, *г*).

Пасля гліны прасочваецца *супесь светла-шэрага колеру,* насычаная шматлікімі ўкрапінамі вугалю. Яе сярэдняя магутнасць – 0,7 м. Гэта і ёсць ядро магілёўскага вала. Пры распрацоўцы гэтых на-



Мал. 4. Разгортка профіляў раскопу № 7: *а* – паўночны профіль; *б* – усходні профіль. Замчышча. Магілеў. 2006 г. Умоўныя адзнакі тыя ж, што і да мал. 2

пластаванняў сабрана шматлікая калекцыя керамікі, шкляных бранзалетаў, побытавых рэчаў і зброі. На глыбіні 2,4 м ад дзённай паверхні насып вала змяняецца *мацерыковым суглінкам* белага колеру.

Першапачатковы схіл насыпу вала выразна чытаецца на паўднёвым профілі (мал. 2, *г*). На профілі і зачышчаным мацерыку траншэі вельмі добра відаць рэшткі двух радоў спарахнела драўлянага частаколу, які быў пастаўлены па краі вала (мал. 2, *д*).

Характар размяшчэння у насыпе керамічнага матэрыялу і іншых рэчаў дазваляе вызначыць як прыкладны час узвядзення першапачатковых умацаванняў, так і пазнейшыя этапы, звязаныя з узнаўленнем і падсыпкай вала.

У прадмацерыковай праслойцы светла-шэрай супесі (пл. 12), якая аддзелена ад астатняй часткі насыпа вала праслойкай цёмна-шэрага колеру з украпінамі вугалю, былі зафіксаваны фрагменты керамікі з адвогнутым вонкі элементарным венцам і венцы з карнізікам, характэрныя для канца X – XI ст. (мал. 10: *3–6, 8*) [3, с. 75; 4, с. 84–85; 5, с. 75]. На мяжы пластоў 11 і 12 была знойдзена ляпная кераміка з расчосамі III–V стст. (мал. 10: *1, 2*).

Вышэй гэтага узроўню (пл. 10, 11) у насыпе сустракаліся шкляныя бранзалеты разам з керамікай,



Мал. 5. План мацерыковых ям раскопу № 7. Разрэзы і іх запаўненне. Замчышча. Магілеў. 2006 г. Умоўныя адзнакі тыя ж, што і да мал. 2



Мал. 6. Разгортка профіляў траншэі № 5: *а* – паўночны профіль; *б* – усходні профіль; *в* – паўднёвы профіль; *г* – заходні профіль; *д* – план мацерыковых ям. Замчышча. Магілеў. 2006 г. Умоўныя адзнакі тыя ж, што і да мал. 2



Мал. 7. Разгортка профіляў траншэі № 6: *а* – заходні профіль; *б* – паўночны профіль; *в* – усходні профіль; *г* – паўднёвы профіль; *д* – план мацерыка.
Замчышча. Магілеў. 2006 г. Умоўныя адзнакі тыя ж, што і да мал. 2



Мал. 8. Разгортка профіляў шурфа № 1: *а* – паўднёвы профіль; *б* – заходні профіль; *в* – паўночны профіль; *г* – усходні профіль; *д* – план мацерыка. Замчышча. Магілеў. 2006 г. Умоўныя адзнакі тыя ж, што і да мал. 2



Мал. 9. Разгортка профіляў раскопу № 8: *а* – паўднёвы профіль; *б* – заходні профіль; *в* – паўночны профіль; *г* – усходні профіль; *д* – план мацерыка; *ж* – запаўненне ямы А-I; *з* – запаўненне ямы А-II. Замчышча. Магілеў. 2007 г. Умоўныя адзнакі тыя ж, што і да мал. 2

прафіліроўка венцаў якой з'яўляецца характэрнай для XII – першай паловы XIII ст. (мал. 10: *9, 10*). Менавіта на гэтыя пласты прыпадае максімальная колькасць бранзалетаў. Сярод іх шмат паліхромных асобнікаў. Пераважаюць кручаныя бранзалеты, гладкіх амаль няма.

Сенсацыйнай для Магілёва з'яўляецца і знаходка фрагмента цамянкі, якая была зафіксавана таксама ў пл. 11. Акрамя цамянкі ў пл. 10 і 11 у насыпе вала было знойдзена шмат іншых будаўнічых матэрыялаў: фрагменты глінянай абмазкі, кавалкі пракаленага пяску, кавалкі цаглянай пліткі і плінфы.

У верхняй частцы насыпу знойдзены фрагменты гаршкоў, характэрныя для сярэдзіны XIII – пачатку XIV ст. Рэзка змяншаецца колькасць бранзалетаў, усе знойдзеныя ў гэтым пласце асобнікі аднатыпныя, гладкія, чорна-зялёнага колеру. У гэтым жа пласце знойдзена дужка ад спружыннага замка (мал. 11: *7*).



Мал. 10. Гаршкі (фрагменты): *1, 2* – III–V стст.; *3–8* – канец X – першая палова XI ст.; *9, 10* – XII–XIII стст.; *1–6, 8–10* – 2005 г.; *7* – 2006 г. Магілёў

Надзвычай важную інфармацыю мы атрымалі ў выніку разборкі запаўнення мацерыковай ямы амаль авальнай формы (фундамента драўлянай вежы). Яе абрысы пачалі «чытацца» з глыбіні 1,89 м ад дзённай паверхні на ўзмежжы кв. 1, 2 (мал. 2, *д*). Верхняя частка ямы перакрыта магутным пластом пажарышча. Пры распрацоўцы запаўнення ямы быў знойдзены цэлы шэраг артэфактаў, які дазваляе датаваць слой пажарышча часам не раней (але і не пазней) за сярэдзіну XIII ст. У запаўненні ямы зафіксаваны: характэрны для мангольскіх старажытнасцей наканечнік стралы – зрэзень; бранябойны наканечнік стралы; уток кап'я; фрагмент нажа, выкананага ў тэхніцы трохзварачнага пакета; два гаршкі, адзін з іх мае выразнае рабро на плечуку, на яго донцы змешчана кляймо ў выглядзе княскага трызуба; філігранны бранзалет лімоннага шкла з залатой, эліпсоіднай формы, ніткай пасярэдзіне; два палі-хромных кручаных шкляных бранзалета (мал. 11: *2, 3, 6;* 12; 13).

Як вядома, філігранныя бранзалеты такога тыпу ўвайшлі ў ужытак у канцы XII ст. і былі распаўсюджаны да сярэдзіны XIII ст. Адзіным месцам, дзе іх выраблялі ва Усходняй Еўропе, быў Кіеў[1]. Пасля знішчэння Кіева туменамі Бату-хана вытворчасць такіх бранзалетаў спынілася [29]. Такім чынам, у Магілёў падобная рэч магла патрапіць не пазней за 1240 г. Уявіць, каб бранзалет мог насіцца 60 гадоў

[1] «Найноўшыя» даследаванні аб адсутнасці ўласнага шкларобства ў Кіеўскай Русі мы лічым навукова не абгрунтаванымі і бяздоказнымі.



Мал. 11. Металічныя вырабы (*1–8*). XIII–XVI стст.

пасля вырабу, проста не магчыма. Кераміка, знойдзеная ў запаўненні ямы, таксама паказвае на тое, што пажар, рэшткі якога прасочваюцца ў насыпе вала, палыхаў як раз у сярэдзіне XIII ст. Не пярэчаць падобнаму датаванню і знаходкі зброі.

Траншэя № 5 2006 г. з'яўляецца працягам траншэі 2005 г. Плошча вывучанай у 2006 г. траншэі – 10 м^2. Траншэя разбіта на квадраты плошчай 2 × 2 м кожны (мал. 1, 6). У сувязі з тым, што пры мінулагодніх даследаваннях у кв. 1 траншэі выразна фіксаваўся край вала і часткова чытаўся абрыс вежы, было вырашана, для лепшай графічнай і фотафіксацыі, раскрыць гэты квадрат яшчэ раз. З улікам гэтага квадрата плошча траншэі складае 12 м^2.

Стратыграфічная сітуацыя ў траншэі амаль ідэнтычная з траншэяй 2005 г. Пасля *гумусіраванага пласта урадлівай глебы* (магутнасць 0,07–0,09 м) пачынае прасочвацца *будаўнічы друз XX ст.*, яго змяняюць *напластаванні шэрага колеру* магутнасцю ад 0,3 да 0,8 м з украпінамі бітай цэглы-пальчаткі. У паўночнай частцы кв. 3 і 4 іх падсцілае праслойка цёмна-шэрага колеру (0,05–0,18) (мал. 6, *а–г*).

Пасля гэтага прасочваецца *пласт абпаленай да цэглападобнага стану гліны* ярка-чырвонага колеру магутнасцю 0,28–0,58 м. У межах кв. 2–4 на глыбіні 1,6–1,8 м ад дзённай паверхні пласт гліны змяняецца *суглінкам* магутнасцю ад 0,26 да 0,6 м. У межах кв. 1 на глыбіні 1,7 м ад дзённай паверхні выразна



Мал. 12. Бранзалеты (*1–36*). Шкло. XII–XIII стст. Раскоп № 7. Магілёў. 2006 г.



Мал. 13. Ганчарныя клеймы (*1–6*). Гліна. Канец X – XIII ст.



Мал. 14. Металічныя (*1, 2, 4*) і каменныя (*3*) вырабы: *1* – бранзалет XII – першай паловы XIII ст.; *2* – лязо нажа (фрагмент) канца XII – сярэдзіны XIII ст.; *3* – асялок; *4* – варган XII–XIII стст.; *1–3* – 2006 г.; *4* – 2007 г. Магілёў

чыталася яма-канаўка, запоўненая пасечанымі косткамі жывёл (мал. 6, *а–г*).

Пасля гліны прасочваецца культурны слой *цёмна-шэрага колеру,* насычаны шматлікімі ўкрапінамі вугалю. Яго сярэдняя магутнасць – 0,49 м, мінімальная – 0,2, максімальная – 0,78 м. Пры распрацоўцы гэтых напластаванняў сабрана кераміка і шкляныя бранзалеты, характэрныя для XII–XIII стст. (мал. 6, *а–г*).

Надзвычай каштоўнымі знаходкамі з'яўляюцца зафіксаваныя пры распрацоўцы пл. 12 кв. 2 металічнага бранзалета з кірылічным надпісам-кляймом майстра на ўнутраным баку, фрагмента кручанага шклянога бранзалета чырвонага колеру, бронзавага жаночага пярсцёнка і свінцовай «рыбкі» амулета (?) (мал. 14) [23, мал. 66: *8, 9, 14*]. У пл. 12 кв. 2 быў таксама знойдзены даволі вялікі кавалак плінфы.

На глыбіні 2,3–2,5 м ад дзённай паверхні насып вала змяняецца *мацерыковым суглінкам* белага колеру. У межах кв. 1, 2 выразна чытаецца абрыс вежы, фундамент якой па краях быў умацаваны камянямі (мал. 6, *д*). Запаўненне вежы па лініі А1 утрымоўвае ў сябе спарахнелую драўніну, шмат вугалю.

Надзвычай каштоўныя матэрыялы атрыманы ў выніку распрацоўцы гаспадарчай ямы (*яма AV*) ў межах кв. 3 і 4 (мал. 6, *д*). Запаўненне ямы – цёмна-шэры слой з украпленнямі вугалю, костак і спарахнелай драўніны. У запаўненні ямы быў знойдзены ключ тыпу В варыянт 2, зламанае цясло, 3 фрагменты шкляных бранзалетаў, кераміка, у тым ліку донца з выявай княскага знаку аналагічнае знойдзенаму ў траншэі № 5 на гаршчку сярэдзіны XIII ст. (мал. 13: *5*; 15). Як вядома, замкі тыпу В датуюцца другой паловай XII – першай паловай XV ст. [9, с. 160–163]. Характар рэчавага комплексу дазваляе датаваць гэтую гаспадарчую яму сярэдзінай XIII ст.

Першапачатковы схіл насыпу вала выразна чытаецца на паўднёвым профілі, а яго «хвост» на паўночным. На паўднёвым профілі траншэі вельмі добра відаць рэшткі двух спарахнелых слупоў, якія былі пастаўлены па краі вала (мал. 6: *а, в*).

Знаходка ў насыпу вала кавалка цамянкі, фрагментаў цаглянай пліткі і плінфы дае права выказаць гіпатэтычнае меркаванне аб магчымасці існавання ў Магілёве ўжо ў XII–XIII стст. мураванага храма. Калі гэта так, то яго ўзнікненне хутчэй за ўсё магло мець места толькі ў XII ст. Уявіць сабе, каб мураванае культавае будаўніцтва магло адбывацца ў Магілёве ў першай палове XIII ст., калі яно прыпынілася ў найважнейшых гарадскіх цэнтрах Беларусі, наўрад ці магчыма.

Траншэя № 6 2006 г. была разбіта ў паўднёвай частцы помніка, амаль на краі пляцоўкі гарадзішча з мэтай вывучэння старажытных умацаванняў. Плошча траншэі – 8 м^2 (мал. 1, 7).

Пасля *гумусіраванага слою урадлівай* глебы (магутнасць – 0,09–0,13 м) па ўсёй плошчы траншэі пачынае ісці *пласт зямлі цёмна-шэрага колеру.* Мі-

німальная магутнасць – 0,15–0,16 м, максімальная – 1,35 м. Пласт насычаны знаходкамі канца XVI – XX ст.

З глыбіні 0,3–0,6 м на непашкоджаных частках квадратаў траншэі пачынаецца *гліна светла-чырвонага колеру*. У пласце гліны зафіксаваны фрагменты цэглы-пальчаткі. У межах паўночна-усходняй частцы кв. 2 да глыбіні 1,5 м працягваецца перакоп цёмна-шэрага колеру.

Напластаванні гліны светла-чырвонага колеру змяняюцца *пластом светлага суглінку* з украпінамі гліны светла-чырвонага колеру. На непашкоджаных участках траншэі яго магутнасць вагаецца у межах 0,60–1,12 м. З глыбіні 1,1–1,4 м ад дзённай паверхні суглінак змяняюць *напластаванні супесі шэрага колеру* і *гліны ярка чырвонага колеру*.

Да глыбіні 2,30–2,35 м ад дзённай паверхні на паўднёвым профілі траншэі чытаецца *перакоп* пад каналізацыю з рэшткамі цэментнай трубы XX ст. На заходнім профілі траншэі ў межах кв. 2 і часткова кв. 1 з глыбіні 2,1 м прасочваецца *пласт спарахнелай драўніны* магутнасцю ад 0,25 да 0,55 м.

У межах траншэі нам пашанцавала патрапіць на рэшткі старажытнага вала. На схіле марэннай мацерыковай гліны выразна чытаецца слой вугалю, які з'яўляецца рэшткамі рытуальнага ачышчальнага вогнішча (мал. 7, *а, в, г*). Адразу пад праслойкай вугалю, на мяжы пласта спарахнелай драўніны і светлага суглінку, на глыбіні 2,39 м побач з заходнім профілем кв. 1 быў зафіксаваны фрагмент венца керамікі так званага полацкага тыпу [23, мал. 68: *2*]. Як вядома, такая кераміка з'яўляецца ў XI ст. і працягвае шырока скарыстоўвацца на працягу XII–XIII стст. [5, с. 77]. Сёння ў Магілёве гэта адзінкавая знаходка венца з такой прафіліроўкай. Пры далейшай распрацоўцы слою у гэтым жа квадраце на глыбіні 2,58 м ад дзённай паверхні, на мяжы праслойкі вугалю і слою светлага суглінку, быў зафіксаваны фрагмент венчыка з масіўным карнізікам, характэрным для канца X – XI ст. [3, с. 93; 4, с. 85; 5, с. 76; 23, мал. 68: *1*].

Каштоўныя матэрыялы па стратыграфіі помніка даў **раскоп № 7 2006 г.** (4 × 6 м) (мал. 1, 3, 4).

Верхні гарызонт складаецца з баласта XX ст. Пасля *гумусіраванага слою урадлівай глебы* (максімальная магутнасць – 0,12 м, мінімальная – 0,04, сярэдняя – 0,08–0,09 м) у межах кв. 1, 3, 5, 6 пачынае ісці *будаўнічы друз шэрага колеру савецкага часу* (максімальная магутнасць – 1,78 м, мінімальная – 0,72, сярэдняя – 1,25 м).

На непашкоджанных частках раскопу з глыбіні 1,1–1,2 м ад дзённай паверхні прасочваецца *пласт гліны светла-чырвонага колеру*, абпаленай да цэглападобнага стану (мал. 3, 4) (максімальная магутнасць – 0,9 м, сярэдняя – ад 0,28 да 0,65 м). Пры яго распрацоўцы ў межах кв. 1 на глыбіні 1,3 м ад



Мал. 15. Гаршчок. Гліна. Сярэдзіна XIII ст.: *а* – від збоку; *б* – від знізу. Магілёў. 2005 г.

дзённай паверхні зафіксаваны фрагмент гаршковай кафлі [23, мал. 48: *1*].

Пласт гліны змяняецца *сугліністай супессю шэрага колеру* (максімальная магутнасць – 1,0 м, мінімальная 0,23–0,30, сярэдняя – 0,5–0,6 м; пл. 9–11, у межах кв. 1 пл. 8–13) (мал. 3, *а, б*; 4, *а*).

Пасля яе па ўсёй непашкоджанай плошчы раскопу ішоў *слой цёмна-шэрага колеру* (мал. 3, 4) (максімальная магутнасць – 0,4–0,5 м, мінімальная – 0,1 м, сярэдняя – 0,29 м, пл. 11–13) насычаны керамікай, шклянымі бранзалетамі, металічнымі вырабамі XII–XIII стст.

Бліжэй да краю пляцоўкі пасля слою цёмна-шэрага колеру выразна чытаецца *сугліністая супесь шэрага колеру* (пл. 13–14) з праслойкамі вугалю (мал. 3, *а, б*; 4, *а*).

З глыбіні 2,4–2,6 м ад дзённай паверхні па ўсёй плошчы раскопу пачынае ісці *белы мацерыковы суглінак*.

Пры яго зачыстцы зафіксавана некалькі ям (мал. 5). Найбольш позняй з'яўляецца *яма А I*. Яна з'яўляецца рэшткамі асвятляльнага драўлянага слупа, пастаўленага побач з тратуарам у савецкі час.

Астатнія ямы адносяцца да старажытнарускага часу. Яны падзяляюцца на дзве групы – ямы, насычаныя спарахнелай драўнінай і керамікай канца X – XI ст. і гаспадарчыя ямы, характар запаўнення якіх дазваляе датаваць іх XII–XIII стст.

Яма А II – максімальная шырыня 0,75 м. Запаўненне – спарахнелая драўніна, вугольчыкі, цёмна-шэрая зямля і два фрагменты раннекругавой керамікі, падпраўленай на ручным ганчарным крузе X–XI стст. [3, с. 93; 4, с. 85; 5, с. 76; 23, мал. 5; мал. 32: *2–4*]

Яма А III – максімальная шырыня – 0,33–0,34 м. Запаўненне – спарахнелая драўніна, вугольчыкі, цёмна-шэрая зямля, два фрагменты ляпной керамікі (сценкі) і адзін фрагмент раннекругавой керамікі X–XI стст. з элементарным, адвогнутым вонкі венцам, падпраўлены на ручным ганчарным крузе [3, с. 93; 4, с. 85; 5, с. 76; 23, мал. 5; мал. 31: *4, 5*; мал. 32: *1*].

Яма А IV – максімальная шырыня – 0,37–0,38 м. Запаўненне – спарахнелая драўніна, вугольчыкі, цёмна-шэрая зямля. У запаўненні знойдзены тры фрагменты венцаў і адна сценка раннекругавой керамікі. Два венцы – з карнізікам, адно – элементарнае, адвогнутае вонкі. Датуюцца X–XI стст. [3, с. 75, 93; 4, с. 84–85; 5, с. 75–76; 23, мал. 5; мал. 31: *1–3, 6*].

Яма А V – максімальная шырыня – 0,50–0,51 м. Запаўненне – спарахнелая драўніна, вугольчыкі, цёмна-шэрая зямля. У запаўненні ямы зафіксавана паясная спражка [23, мал. 5; мал. 53: *9*].

Яма А VI – максімальная шырыня – 2,17 м. Запаўненне ямы: супесь светла-шэрага колеру з дамешкамі зямлі цёмна-шэрага колеру і праслойкамі вугалю. Паводле матэрыялу яма датуецца канцом XII – XIII ст. Пры яе распрацоўцы зафіксавана вялікая колькасць керамікі, шкляных бранзалетаў (мал. 12). Сярод шкляных бранзалетаў знойдзены паліхромныя, зялёныя, чорныя асобнікі. Акрамя гэтага ў яме знойдзены філігранныя бранзалеты, выкананыя з лімонна-жоўтага шкла з залатымі ніткамі па цэнтру сячэння, два фрагменты сценак лімонна-жоўтага шкла і аплаўленая пацерка. У гэтай жа яме зафіксаваны каменны асялок і нож, выкананы ў тэхніцы зварачнага пакета (мал. 14: *2, 3*). Пры разборцы ямы быў знойдзены перапаленае зерне гароха, бабоў, рэшткі стручкоў (вызначэнне кандыдата біялагічных навук, вядучага навуковага супрацоўніка Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі Д. І. Траццякова), шмат костак жывёльнага паходжання.

Яма А VII – максімальная шырыня – 1,55 м. Запаўненне – спарахнелая драўніна, вугольчыкі. Рэчавага матэрыялу не знойдзена. На заходнім профілі кв. 2 у межах ямы А VII выразна чыталіся дзве плямы з запаўненнем шэрага колеру, якія нагадваюць па форме рэшткі слупоў.

Яма А VIII – максімальная шырыня – 0,30 м. Запаўненне – спарахнелая драўніна, вугольчыкі, слой цёмна-шэрага колеру. Пры распрацоўцы запаўнення знойдзены фрагмент сценкі і фрагмент венца з карнізікам. Такая кераміка датуецца канцом X – XI ст. [3, с. 93; 4, с. 85; 5, с. 76; 23, мал. 5; мал. 31: *7*; мал. 32: *3*].

Яма А IX – максімальная шырыня – 0,25 м. Запаўненне – спарахнелая драўніна, вугольчыкі, слой цёмна-шэрага колеру.

Яма А X – максімальная шырыня – 0,60 м. Перакоп XX ст. Запаўненне – зямля шэрага колеру з цвікамі і шыферам савецкай вытворчасці.

Такім чынам, ямы А II, А III, А IV, А VII, А VIII, А IX можна інтэрпрэтаваць як рэшткі першай, самай старажытнай, лініі ўмацаванняў гарадзішча. Ямы А V і А VI з'яўляюцца гаспадарчымі. Характар іх запаўнення дазваляе датаваць іх канцом XII – XIII ст.

Вельмі цікавая інфармацыя была атрымана і ў ходзе распрацоўкі **шурфа № 1 2006 г.** (2 × 2 м), разбітага ў паўднёвай частцы помніка. Плошча шурфа – 4 м^2. Шурф знаходзіцца на адлегласці 2 м ад заходняга профілю раскопу Міхася Ткачова (мал. 1, 8).

Стратыграфія шурфа (мал. 8, *а–г*) наступная.

Гумусіраваны пласт глебы магутнасцю 0,08–0,12 м. Утрымоўвае знаходкі XX ст. – фрагменты бітага шыферу, бутэлечнае шкло савецкай вытворчасці.

Пласт зямлі цёмна-шэрага колеру. Яго максімальная магутнасць – 0,40 м, мінімальная – 0,15 м. Знаходкі – тры фрагменты бутэлечнага шкла савецкага часу, фрагмент шыфера, цвік фабрычнай вытворчасці**.**

Праслойка светлага суглінку. Максімальная магутнасць – 0,20 м, мінімальная – 0,03 м. Знаходкі адсутнічаюць.

Гліна светла-чырвонага колеру. Максімальная магутнасць – 1,45 м, мінімальная – 0,81 м. Пры распрацоўцы гліны зафіксавана: медная расійская манета 1 капейка 1828 г. (пл. 4), фрагменты цэглы-пальчаткі (пл. 6–8), фрагмент паліхромнай рэльефнай кафлі, пакрытай кобальтавай глазурай XVIII ст. (пл. 8).

Светлы суглінак. Максімальная магутнасць – 0,85 м, мінімальная – 0,06 м. Знаходак не ўтрымоўваў.

Пласт пахаванай глебы, які складаецца з сугліністай супесі светла карычневага колеру. Выразна чытаецца ў паўднёва-заходнім паўднёвага і паўднёва-усходнім куце ўсходняга профіляў шурфа. Максімальная магутнасць – 0,32 м, мінімальная – 0,04 м. У гэтым пласце было зафіксавана старажытнае пахаванне па абраду інгумацыі ў грунтовай магіле.

У паўночна-заходнім куце шурфа знаходзіўся чэрап нябожчыка і пяць вялікіх костак шкілета (мал. 8, *д*). Абрыс пахавальнай ямы і магільнага грудка (гумусіраваная праслойка дзённай паверхні часоў пахавання) выразна чытаюцца на плане і профілях шурфа (мал. 8). Пры зачыстцы пахавання былі знойдзены: кавалак крамянёвай пласцінкі і два фрагменты кругавой керамікі (сценка і фрагмент венца з абламаным верхнім краем, аздобленным рыфленнем па плечуку). Цеста сценак добра прамешанае, з невялікі дамешкамі дробнай жарствы і пяску. Падобная тэхніка апрацоўкі характэрна для керамікі XII–XIII стст. з культурнага слою замка. Такім чынам, у шурфе намі зафіксаваны працяг старажытнага грунтовага могільніка, які ўпершыню быў адкрыты М. Ткачовым пры яго раскопках у гэтай частцы замка. Улічваючы той факт, што ў непасрэднай блізкасці ад гэтага месца знаходзілася праваслаўная Васкрасенская царква, аб якой інвентар магілёўскага замка 1604 г. лаканічна паведамляе, што яна «вельмі опадла», то можна меркваць, што тут, побач з храмам, знаходзіўся самы старажытны магілёўскі грунтовы хрысціянскі могільнік. Знаходкі плінфы дазваляюць выказаць меркаванне аб існаванні тут царквы ўжо ў XII ст.

Высновы. Самыя раннія матэрыялы на тэрыторыі помніка былі зафіксаваны пры зачыстцы мацерыка – ляпная гладкасценная з расчосамі і падштрыхоўкай кераміка, характэрная для старажытнасцей кіеўскай культуры III–V стст.

Зыходнай фазай усходнеславянскага засялення тэрыторыі Замчышча трэба лічыць канец X – XI ст. Аднак выразнага стратыграфічнага гарызонту гэтага часу на помніку не прасочваецца. Культурны слой XII–XIII стст. выразны, добра вылучаецца стратыграфічна. Улічваючы характар рэчавага матэрыялу, яго больш карэктна датаваць другой паловай XII – сярэдзінай XIII ст. Напластаванні XVI–XVIII стст. амаль цалкам пераадкладзены ў ходзе будаўнічых прац XX ст.

У выніку археалагічных даследаванняў 1992–2007 гг. на тэрыторыі магілёўскага замка (гара «Магіла») даказаны факт існавання на гэтай тэрыторыі ўмацаванага старажытнарускага паселішча з канца X – XI ст., росквіт якога прыпадае на канец XII – сярэдзіну XIII ст. Гэтым часам датуецца багаты культурны пласт (рэшткі зброі, ювелірных і шкляных упрыгажэнняў, апрацаваных касцей, керамікі).

Найбольш раннія ўсходнеславянскія матэрыялы – кераміка канца X–XI ст. з элементарнымі адвогнутымі вонкі венцамі і венцы з манжэтамі-«карнізікамі». Акрамя гэтага знойдзена некалькі ляпных керамічных сценак. Усе знаходкі гэтага часу паходзяць з прадмацерыковага слою і запаўнення мацерыковых ям ад слупоў умацаванняў.

Пры раскопках знойдзена шмат посуду з клеймамі ў выглядзе княскага знака – трызубца. Яны падзяляюцца на тры групы. Найбольш раннія знакі суадносяцца з сімволікай Уладзіміра Святаславіча, Хрысціцеля Русі (мал. 13: *3*) [12, с. 183; 15, с. 19]. Цікавую атрыбуцыю другой групы знакаў ранніх магілёўскіх трызубцаў (мал. 13: *1*) прапанаваў пецербургскі даследчык С. В. Бялецкі [2, с. 85–90, 95]. Княскія знакі з культурнага слою XII–XIII стст. маюць прамыя аналагі ў матэрыялах археалагічных раскопак старажытнага Друцка [15, с. 20]. Апошняя акалічнасць падмацоўвае слушнасць тых даследчыкаў (М. К. Любаўскі, В. Л. Насевіч), якія на падставе аналізу пісьмовых крыніц XI–XV стст. прыйшлі да высновы аб адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці Магілёва ў старажытнарускі час да Друцкага удзела Полацкай зямлі [26, с. 51, 57, 62; 27, с. 89].

Раскопкамі 2005 і 2006 г. устаноўлена, што ў канцы X – XI ст. на гары «Магіла» былі ўзведзены першыя ўмацаванні. Перад іх будаўніцтвам было распалена рытуальнае вогнішча, вугальная праслойка ад якога выразна прасочвалася ў прадмацерыковым пласце. З напольнага боку паўночная частка гарадзішча першапачаткова была ўмацавана двума радамі драўляных гародняў. З поўдня ў гэты жа час быў насыпаны вал з чырвонай гліны.

У сярэдзіне XIII ст. умацаванні былі спаленыя. У заходняй частцы помніка, у межах вала, зафіксаваны рэшткі драўлянай вежы, якая, мяркуючы па яе запаўненні, таксама згарэла ў сярэдзіне XIII ст.

З упэўненнасцю можна сцвярджаць, што на тэрыторыі замчышча знаходзіліся прафесійныя воіны-дружыннікі. Пра гэта сведчаць не толькі знаходкі ўзбраення, але і знойдзеная мініяцюрная рытуальная сякерка-амулет XII–XIII стст. тыпу 1, паводле класіфікацыі М. Макарава [10, с. 42; 15, с. 103]. М. Макараў, скурпулёзна вывучыўшы вялікую колькасць падобных матэрыялаў з розных рэгіёнаў Кіеўскай Русі, прыйшоў да думкі аб сувязі гэтых прадметаў з вайсковым асяродкам і спецыфічнымі для яго вераваннямі і абрадамі. У сякерках-амулетах трэба бачыць своеасаблівыя знакі прыналежнасці да вайсковага стану, які давалі сынам дружыннікаў пры пастрыгах – абрадах, што суправаджалі першае абразанне валасоў у дзіцяці. Верагодна, калі хлопчык станавіўся малодшым дружыннікам, «отроком», сякерка-амулет адыгрывала ролю ахоўніка, які захоўваў жыццё свайму ўладальніку ў паходах і на полі бою [10, с. 51].

Надзвычай каштоўнымі з'яўляюцца знаходкі фрагмента металічнага бранзалета з кірылічным надпісам-кляймом майстра на ўнутраным баку (мал. 14: *1*), фрагмент кручанага шклянога бранзалета чырвонага колеру візантыйскай вытворчасці

і свінцовай «рыбкі»-амулета. Паводле меркавання І. Калечыц найбольш верагоднае чытанне слова на нашым бранзалеце як ЖЕОД – кірылічны варыянт напісання грэчаскага слова geoid, geoides – «земляны», «земляпадобны» [8, с. 68].

Акрамя гэтага быў знойдзены даволі вялікі кавалак плінфы (10 × 10 см; таўшчыня – 3,2 см) з рэшткамі рошчыны. Знаходкі дазваляюць выказаць меркаванне аб наяўнасці ў Магілёве мураванай царквы ўжо ў XII ст. Аб наяўнасці хрысціянізаванага насельніцтва ў XII–XIII стст. сведчаць знаходкі энкалпіёнаў [1; 13; 15, с. 45, 57, 105, 243; 21–24]. Будзе дарэчы ў сувязі з гэтым прывесці меркаванне аб прычыне ўзнікнення Магілёва, выказанае ў свой час Ю. А. Заяцам: «Верагодна, што некаторыя гарады, былі заснаваны ў XI–XII стст. як асяродкі распаўсюджвання хрысціянства (Барысаў, Браслаў, Лагойск і, магчыма, Магілёў)» [6, с. 44].

У выніку праведзеных прац на помніку сабрана надзвычай рэпрэзэнтатыўная калекцыя керамікі XII–XIII стст., больш за 200 фрагментаў шкляных бранзалетаў гэтага часу (маюцца філігранныя асобнікі). Пры распрацоўцы гаспадарчых ям канца XII – XIII ст. знойдзены перапаленае зерне гароху і бабоў, рэшткі стручкоў гэтых культур, каменны асялок, нож, зроблены ў тэхніцы зварачнага пакета, ключ тыпу «В», зламанае цясло. Вельмі цікавай знаходкай, што паходзіць з напластаванняў XII–XIII стст., з'яўляецца музычны інструмент – варган (мал. 14: *4*) [24, мал. 54].

У той жа час на тэрыторыі будучых Пакроўскага («Падміколле») і Задубровенскага пасадаў існавалі неўмацаваныя паселішчы, сінхронныя магілёўскаму гарадзішчу на тэрыторыі гары «Магіла» [13, 14].

У сярэдзіне XIII ст. Магілёў быў знішчаны – наяўнасць у культурным слоі гэтага часу слядоў магутнага пажару, знаходкі мангольскіх наканечнікаў стрэл – зрэзняў, пасечаных рубячай зброяй чалавечых касцей паказваюць на тое, што жыхары Магілёва зведалі чорны лёс Гомеля, Вішчына, гарадзішча Свіслач на дняпроўскай Бярэзіне, якія былі спалены туменамі Бату-хана.

У XIV ст. жыццё на Падняпроўскіх кручах пачынае аднаўляцца – аб гэтым сведчаць і археалагічныя матэрыялы, і першая дакументаваная згадка горада ў пісьмовых крыніцах. У канцы XIV ст. Магілёў згадваецца ў «Списке русских городов дальних и ближних», які быў змешчаны ў археаграфічным спісе Наўгародскага Першага летапісу малодшага ізвода. У гэтым спісе Магілёў аднесены да гарадоў кіеўскіх «А се киевские гроди… Чечерск, Тетерин, Попова Гора, Пропошеск, Речица, Могилев, Быхов, Лучин» [28, с. 476]. У канцы XIV ст. «град Могилев» ужо быў адміністрацыйным асяродкам воласці і належаў каралеве Ядвізе.

Літаратура

1. Алексеев, Л. В. Мелкое художественное литье из некоторых западно-русских земель / Л. В. Алексеев // Советская археология. – 1974. – № 3. – С. 204–219.

2. Белецкий, С. В. Знаки Рюриковичей / С. В. Белецкий. – СПб., 2000. – Вып. 2, ч. 1: X–XI вв. Исследования и музеефикация древностей Севера-Запада.

3. Бубенько, Т. С. Стратиграфия и хронология нижнего слоя Витебска / Т. С. Бубенько, О. Н. Левко // Ранние славяне Белорусского Поднепровья и Подвинья. – Минск, 2003.

4. Бубенько, Т. С. Средневековый Витебск / Т. С. Бубенько. – Витебск, 2004.

5. Заяц, Ю. А. Заславль в эпоху феодализма / Ю. А. Заяц. – Минск, 1995.

6. Заяц, Ю. А. Да праблемы распаўсюджвання хрысціянства на Беларусі / Ю. А. Заяц // Религия и общество : актуальные проблемы современнного религоведнеия : сб. науч. трудов. – Могилев, 2006. – С. 43–46.

7. Ионе, И. Г. К вопросу о первоначальной дате г. Могилева (по материалам археологических разведок) / И. Г. Ионе // Материалы пятой регион. археолог. студенческой конф. вузов Северо-Запада и центральных областей СССР. – Могилев, 1975. – С. 71–72.

8. Калечыц, І. Л. Эпіграфіка Беларусі X–XIV стст. / І. Л. Калечыц. – Мінск, 2011.

9. Колчин, Б. А. Хронология новгородских древностей / Б. А. Колчин // Новгородский сборник 50 лет раскопок Новгорода. – М., 1982. – С. 156–177.

10. Макаров, Н. А. Древнерусские амулеты-топорки / Н. А Макаров // Российская археология. – М., 1992. – № 2. – С. 41–56.

11. Марзалюк, І. А. Вынікі археалагічных даследаванняў ў гістарычным цэнтры і ваколіцах Магілёва / І. А. Марзалюк // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск : ІГ НАН Беларусі. – 2007. – № 23. – С. 254–255.

12. Марзалюк, І. А. Да пытання аб адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці і сацыяльным статусе Магілёва ў XII–XIII стст. Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі / І. А. Марзалюк // Матэрыялы III Міжнар. навук. канф. – Полацк : Полацкі гіст.-культ. музей-запаведнік, ПГУ, 1998. – С. 178–185. : іл.

13. Марзалюк, И. А. «ЖООД» Когда и как возник Могилев на Днепре? / И. А. Марзалюк // Родина – Москва. – 2007. – № 9. – С. 27–28.

14. Марзалюк, І. А. Культурны слой Магілёва, як крыніца па гісторыі развіцця горада ў эпоху Сярэднявечча / І. А. Марзалюк // Труды VI Междунар. конгр. славянской археологии. – М. 1997. – Т. 2 : Славянский средневековый город. – С. 231–242.

15. Марзалюк, І. А. Магілёў у XII–XVIII стагоддзях: людзі і рэчы : манаграфія / І. А. Марзалюк. – Мінск : Выд-ва «Веды», 1998. – 260 с.

16. Марзалюк, І. А. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у гістарычнай частцы г. Магілёва (Замчышча, Пакроўскі пасад) у маі–ліпені 1993 г. / І. А. Марзалюк. –

Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 1475. – Магілёў : Магілёўскі дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова. – Тэкст 34 с., кал. воп. 6 с., фота 18 с., 20 арк.

17. Марзалюк, І. А. Справаздача аб археалагічных раскопках на тэрыторыі Магілёўскага замчышча (Парк М. Горкага) ў 1994 г. / І. А. Марзалюк. – Архіў Інстытута Гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 1535. – Магілёў : Магілёўскі дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова. – Тэкст 14 с., кал. воп. 3 с., іл. 15 с.

18. Марзалюк, І. А. Справаздача аб правядзенні археалагічных даследаванняў у чэрвені 1996 г. у горадзе Магілёве на тэрыторыі Замчышча (парк імя М. Горкага) / І. А. Марзалюк. – Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 1638. – Магілёў : Магілёўскі дзярж. ўніверсітэт імя А. А. Куляшова. – Тэкст 6 с., кал. воп. 2 с., іл. 6 с.

19. Марзалюк, І. А. Справаздача аб археалагічных раскопках у Магілёве у 1998 г. (тэрыторыя Магілёўскага замчышча) / І. А. Марзалюк. – Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 1778. – Магілёў : Магілёўскі дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова. – Тэкст с. 3–9, кал. воп. с. 10, іл. с. 11–32.

20. Марзалюк, І. А. Справаздача аб археалагічных раскопках у Магілёве ў 1999 г. (тэрыторыя Магілёўскага замчышча) / І. А. Марзалюк. – Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 1826. – Магілёў : Магілёўскі дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова. – Тэкст с. 3–7, кал. воп. с. 8–9, іл. с. 10–29.

21. Марзалюк, І. А. Справаздача аб археалагічных раскопках Магілёўскага замчышча ў 2004 г. / І. А. Марзалюк. – Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 2035. – Магілёў : Магілёўскі дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова. – Тэкст с. 3–6, кал. воп. с. 7, ум. абазн. с. 8, мал. с. 9–23.

22. Марзалюк, І. А. Справаздача аб археалагічных раскопках на Магілёўскім замчышчы (парк імя М. Горкага) і Пакроўскім пасадзе (Падміколле, Магілёў) у 2005 г. / І. А. Марзалюк. – Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 2304. – Магілёў : Магілёўскі дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова. – Тэкст с. 3–19, кал. воп. с. 20–30, спіс умоўн. пазнач. с. 31, мал. с. 32–110, даведка с. 111.

23. Марзалюк, І. А. Справаздача аб археалагічных раскопках на Магілёўскім замчышчы (парк імя М. Горкага) у 2006 г. / І. А. Марзалюк. – Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 2399. – Магілёў : Магілёўскі дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова. – Тэкст с. 3–27, кал. воп. с. 28–41, мал. с. 42–106, даведка с. 107.

24. Марзалюк, І. А. Справаздача аб археалагічных раскопках на Магілёўскім замчышчы (парк імя М. Горкага) у 2007 г. / І. А. Марзалюк. – Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 2521. – Магілёў : Магілёўскі дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова. – Тэкст с. 3–10, кал. воп. с. 11–13, спіс. с. 14, іл. с. 15–27, даведка.

25. Марков, А. Топография кладов восточных монет (сасанидских и куфических) / А. Марков. – СПб., 1910.

26. Насевіч, В. Л. Друцкае княства і князі друцкія / В. Л. Насевіч // Друцк старажытны. – Мінск, 2000. – С. 49–76.

27. Насевіч, В. Л. Род князёў друцкіх у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага (XIV–XV стст.) / В. Л. Насевіч // Старонкі гісторыі Беларусі. – Мінск, 1992. – С. 81–104.

28. Новгородская первая летопись. – М., 1950.

29. Скрыпчанка, Т. С. Філігранныя бранзалеты / Т. С. Скрыпчанка // ПГКБ. – 1980. – № 4. – С. 27–28.

30. Ткачев, М. А. Замки Белоруссии / М. А. Ткачев. – М. : «Полымя», 1987.

31. Янин, В. Л. Новгород и Литва. Пограничные ситуации XIII–XV веков / В. Л. Янин. – М., 1998.

Резюме

И. А. Марзалюк

Культурный слой могилевского замчища как исторический источник

Статья посвящена истории археологического изучения детинца древнего Могилева – могилевского замчища (гора Могила, современный Парк имени М. Горького). Большинство материалов получены в ходе исследований автора и впервые вводятся в научный оборот. В результате археологических исследований 1992–2007 гг. доказан факт существования на этой территории укрепленного древнерусского поселения с конца X – XI в., а расцвет его материальной культуры приходится на конец XII – середину XIII в.

Summary

I. Marzaluk

The cultural layer of Mogilev castle as a historical source

The article is dedicated to the history of the archeological studies of the basis of ancient Mogilev – Mogilev castle (Mount Mogila, the place of where M. Gorky park is now situated). The majority of the materials have been received as a result of the author's investigations and are being introduced into scientific turnover for the first time. As a result of the archeological studies conducted in 1992–2007, the fact of the existence of a fortified ancient Russian settlement of the end of the 10th–11th centuries has been proved, and its material culture prosperity took place at the end of the 12th – the middle of the 13th century.

Паступіў 10.02.2012

УДК 903.2«16»

***С. Е. Рассадин**, Белорусский государственный технологический университет, доктор исторических наук, профессор (г. Минск)*

Челенга из Казимира

Основная масса находок – керамика эпохи неолита. Был извлечен и графически восстановлен высокий широкогорлый сосуд со сведенным внутрь венчиком, высокой конической нижней частью и острым дном (общее число фрагментов – 113) (рис. 1). Размеры горшка составили: диаметр венчика – 34 см, полная высота – 54 см. В тесте есть минеральная примесь (дресва) и в меньшей мере органическая примесь. При изготовлении сосуда использовалась техника косоторцового налепа.

Сосуд ангобирован и хорошо заглажен с двух сторон. Внешняя поверхность имеет бордовый цвет, внутренняя – темно-серый.

Вся поверхность горшка покрыта орнаментом, состоящим из неглубоких вдавлений по внутренней стороне среза венчика (слегка волнистый край), ряда ямок под венчиком, горизонтальных рядов гребенчатого штампа из трех зубьев в верхней части сосуда, диагональных рядов, объединенных в зигзаг, в средней части сосуда, вертикальных поясов в нижней части (рис. 1).

На горшке прослеживаются следы ремонтажа – четыре просверленных отверстия в разных частях сосуда.

Подобные сосуды были найдены В. Ф. Исаенко на памятниках типа Литвин и И. Н. Язепенко на памятниках Сосновка-1, Прорва-2 [1, с. 48–138; 6, с. 10–26; 7, с. 161–169].



Рис. 1. Реконструкция неолитического сосуда. д. Сосонка

[1] Выражаю благодарность А. Г. Тимофеенко за любезно предоставленную возможность работы с археологическим материалом.



Рис. 2. Реконструкция неолитического сосуда. д. Осовцы

Помимо указанного развала в коллекции имеется 15 фрагментов сосудов эпохи неолита орнаментированных гребенчатым штампом и наколами [5, с. 28].

Второе местонахождение неолитической керамики локализируется на песчаной гряде в 0,9 км юго-западнее *д. Осовцы* (Давыдовский с/с).

На данный момент памятник практически полностью разрушен в ходе разработки песчаных карьеров [5, с. 22]. О поселениях неолита и бронзового века на правом берегу р. Сож на берегу озера-старицы к юго-западу от деревни известно с конца XIX в. Их обследовали А. Лоначевский, Е. Р. Романов, К. М. Поликарпович, Е. Г. Калечиц [3, с. 138–139; 4, с. 64]. Карьеры, заложенные лет десять назад на юго-восточном конце песчаной гряды между левым берегом р. Уза и правым берегом р. Мильча (Случь), разрабатываются и сегодня. Местность возвышается над уровнем воды на несколько метров. В бортах карьеров, примерно до уровня 0,2–0,4 м от дерна, а также в песчаных отвалах и осыпях были собраны материалы эпохи неолита [5, с. 24].

Особый интерес представляет развал горшка (77 фрагментов), восстановленный графически и представляющий собой высокий широкогорлый сосуд со сведенными вверху стенками и ребром в нижней трети высоты (рис. 2). Размеры восстановленного сосуда: диаметр венчика – 32 см, высота от венчика до ребра – 27, высота реконструированной части – 36 см. В тесте содержится минеральная (разнозернистая дресва) и органическая примесь. В изломе хорошо видны пустоты, образовавшиеся в результате выгорания стеблей травы. Изготовлен сосуд при помощи косоторцевого налепа, ширина лент – 3,5 см.

По внешней стороне сосуд ангобирован и хорошо заглажен, по внутренней – подштрихован. Цвет черепков кремовый. На поверхности видны участки более темные и более светлые – результат костро-вого обжига. В изломе хорошо прослеживается темная полоса.

При орнаментации использовались четыре вида орнаментиров: гребенчатый штамп («гребенка»), палочка с прямоугольным основанием, сужающимся к концу («наколы 1»), полая палочка («наколы 2») и палочка, обмотанная веревкой («лапка»). Орнамент на сосуде располагался зонально – горизонтальные ряды сменяли друг друга, объединяясь диагональными рядами.

Подобные сосуды были найдены В. Ф. Исаенко на памятниках типа Литвин и И. Н. Езепенко на памятниках Могилевско-Рогочевского Поднепровья [1, с. 48–138; 6, с. 10–26; 7, с. 161–169].

Кроме того, на памятнике были собраны и другие фрагменты лепных сосудов эпохи неолита – венчик с орнаментом из четырех горизонтальных параллельных линий веревочных оттисков, ряда круглых вдавлений по ним и трех косых линий гребенчатого штампа, примыкающих к верхним под острым углом (рис. 3: *1*); венчик с орнаментом из четырех горизонтальных параллельных линий наколов ромбической формы на внешней и штриховкой на внутренней поверхностях (рис. 3: *2*); стенки сосуда с орнаментом из параллельных рядов косых насечек (рис. 3: *3–5*); стенки сосуда с орнаментом из параллельных линий частых круглых наколов, пересекающихся под прямыми и острыми углами на



Рис. 3. Керамика эпохи неолита (фрагменты) с различным орнаментом (*1–8*). д. Осовцы

внешней и штриховкой на внутренней поверхности (рис. 3: *6–8*) и др. [5, с. 24].

Добрушский район. Третье местонахождение неолитической керамики расположено возле *г. Добруш* в 1,5 км на восток от города на краю низкой надпойменной террасы левого берега р. Ипуть. Высота над поймой – 3,0–3,5 м, вглубь террасы высота повышается еще примерно на 1 м. Склон пологий, примыкающий участок поймы заболочен, местность задернована. От края террасы начинается сосновый лес, заболоченный край которого порос кустарником [5, с. 38]. В этом лесу находится курганный могильник среднеднепровской культуры.

В ходе несанкционированных раскопок у подножья одного из курганов В. Д. Приходько был выявлен развал лепного неолитического сосуда (302 фрагмента). Графическая реконструкция позволила восстановить высокий сосуд со сведенным внутрь венчиком, легким расширением в центре и высокой конической нижней частью (рис. 4). Размеры сосуда: диаметр венчика – 22 см, почти полная восстановленная высота (без донной части) – 34 см. В качестве примеси в тесте использован шамот, песок и органика. Горшок изготовлен при помощи косоторцевого налепа.

Орнаментирован сосуд косыми наколами гребня по срезу венчика, кругообразными и волнообразными расчесами гребня (многорядным орнаментом) по средней части, тремя параллельными рядами наколов гребнем из семи зубьев под венчиком и более чем восемью параллельными рядами гребня по нижней части. Орнамент имеется и на внутренней поверхности горшка – вертикальные ряды продолговатых ямок покрывают внутреннюю поверхность днища.

Следы ремонтажа представлены шестью отверстиями в разных частях сосуда.

Подобный сосуд был найден И. Н. Езепенко на памятнике Толстыки-1 (Жлобинский район Могилевская область) [7, с. 161–169].

Кроме указанного развала в коллекции есть фрагменты сосуда с орнаментом из рядов косых параллельных наколов гребенкой, чередования рядов расчесов гребенкой и косых наколов и подлощения ангобированной внешней поверхности и подштриховкой внутренней поверхности; неполный развал сосуда с жемчужным орнаментом на венчике из параллельных рядов наколов гребня, расположенных под углом друг к другу на внешней поверхности,



Рис. 4. Реконструкция неолитического сосуда. г. Добруш

обе поверхности хорошо заглажены (подлощены); стенка сосуда с подлощеной красноватой внешней поверхностью и штрихованной внутренней и сквозным отверстием [5, с. 39].

Таким образом, выявленная на территории Гомельского и Добрушского районов керамика эпохи неолита по своей технологии, морфологии и орнаментации сходна с керамикой нижней Припяти (памятники типа Литвин) [1, с. 48–138; 2], нижней Березины (Толстыки-1, Василевичи-3) и Могилевско-Рогачевского Поднепровья (Сосонка-1 и др.) [6, с. 10–26; 7, с. 161–169]. Это позволяет отнести рассматриваемые горшки к поздним этапам восточно-полесского варианта днепро-донецкой культуры и датировать их поздним неолитом (2500–2300 – 1800–1700 гг. до н. э. – некалиброванная хронология по В. Ф. Исаенко), (5290–3900 BP (4002–1970 cal BC) по И. Н. Езепенко).

Литература

1. Исаенко, В. Ф. Неолитические памятники типа Литвин на нижней Припяти / В. Ф. Исаенко // Белорусские древности : доклады конф. – Минск : Наука и техника, 1967. – С. 48–138.

2. Исаенко, В. Ф. Неолит Припятского Полесья / В. Ф. Исаенко. – Минск : Наука и техника, 1976. – 128 с.

3. Калечиц, Е. Г. Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии / Е. Г. Калечиц. – Минск : Наука и техника, 1987. – 160 с.

4. Лоначевский, А. Археологические находки в Гомельском уезде Могилевской губернии / А. Лоначевский // Киевская старина. – Киев, 1885. – Т. IX. – С. 573–577.

5. Тимофеенко, А. Г. Отчет об археологических работах, проведенных на территории Ветковского, Гомельского и Добрушского районов Гомельской области в 2011 г. / А. Г. Тимофеенко // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – 165 с.

6. Язэпенка, І. М. Да пытання аб інтэрпрэтацыі матэрыялаў неалітычных паселішчаў Беларускага Падняпроўя / І. М. Язэпенка // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск : Беларус. навука, 1994. – Вып. 3. – С. 10–26.

7. Язепенко, И. Н. Новые результаты исследований днепро-донецкой культуры в междуречье Березины и Днепра / И. Н. Язепенко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – Вып. 18.– С. 161–169.

8. Язэпенка, І. М. Храналогія і перыядызацыя днепраданецкай культуры ў Падняпроўі Беларусі / І. М. Язэпенка // Na rubieży kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesną epoką brązu. – Białystok, 2011. – С. 103–108.

Рэзюмэ

М. І. Ткачова

Выпадковыя знаходкі неалітычнай керамікі з тэрыторыі Гомельскага і Добрушскага раёнаў

Прадстаўлены новыя знаходкі неалітычнай керамікі з тэрыторыі Гомельскага і Добрушскага раёнаў. Кераміка мае аналогіі з неалітычным матэрыялам ніжняй Прыпяці, ніжняй Бярэзіны и Магілёўска-Рагачоўскага Падняпроўя і адносіцца да ўсходнепалескага варыянта днепра-данецкай культуры.

Summary

M. Tkachova

Casual finds of Neolithic pottery from the territory of Gomel and Dobrush regions

The article is devoted to the new finds of Neolithic pottery from Gomel and Dobrush regions. This pottery have analogies in Neolithic materials of lower parts of Prypiac and Berezina rivers, Dnieper river basin in its Magilev and Rogachev parts and belong to the eastern Palessie variant of the Dnieper-Donets culture.

Поступила 27.09.2012

ПАЛЯВЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ (2009–2011 гг.)

Першабытны перыяд

УДК 902.21(476.7)«2011»

***В. Г. Белявец**, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск)*

Археалагічныя разведкі ў Бярозаўскім раёне ў 2011 г.

Разведкі на тэрыторыі Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобласці праводзіліся ў чэрвені і кастрычніку 2011 г. Працы вяліся сумесна з аспірантамі ІГ НАН Беларусі А. Ф. Касюк і А. Ю. Ткачовым. Задачай гэтых работ з'яўлялася, перадусім, абследаванні ў правабярэжжы р. Ясельда, – на тэрыторыі Загароддзя, – дзе мэтанакіраваныя разведкі помнікаў археалогіі пачаліся толькі ў апошнія гады. Працы 2011 г. былі сканцэнтраваны ў ніжнім цячэнні р. Вінец – правага прытока р. Ясельда. Разведкі праводзіліся на ўчастку прыкладна 14 км па абодвух берагах ракі. У іх ходзе былі выяўлены і абследаваны 10 археалагічных помнікаў і месцазнаходжанняў (мал. 1).

Сабалі-1 (мал. 1: *1*). Месцазнаходжанне матэрыялаў каменнага веку, верагодна, мезаліту. Адкрыта на паўднёвай частцы ўзвышша, якое займае вёска, па правым беразе р. Вінец, каля 20–40 м на паўночны захад ад пабудоў жывёлагадоўчай фермы. У агаленнях грунту і на дарозе знойдзены: нуклеус ад адшчэпаў і пласціністых адшчэпаў са зменнай арыентацыяй; фрагмент пласціны – праксімальная частка, з ужытковай рэтушшу (?) па краях; абломак крэменю нуклеападобны.

Марывіль-1 (мал. 1: *2*). Месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага веку. Па правым беразе р. Вінец на паўднёва-ўсходнім схіле марэннага ўзвышша, размешчанага каля 1 км на поўдзень ад ракі паміж вёскамі Сабалі і Марывіль. Тут на разараным полі былі знойдзены: крамянёвы серпападобны нож (мал. 4: *1*) на падскарыністай пласціне, дыстальны канец нарыхтоўкі абламаны, краі апрацаваны стромкай і паўстромкай рэгулярнай рэтушшу; адшчэп крамянёвы; дробны фрагмент шыйкі ляпной (?) пасудзіны.

Марывіль-2 (мал. 1: *3*). Месцазнаходжанне з матэрыяламі эпохі каменю–бронзы, жалезнага веку і ранняга сярэдневякоўя (?). Знаходзіцца на адлегласці каля 1,0–1,2 км на паўночны захад ад в. Марывіль, на марэнным ўзвышшы, якое цягнецца на 1,2 км па-над правым берагам р. Вінец. Ва ўсходняй яго частцы на разаранай паверхні і агаленнях глебы знойдзены: крамянёвы скрабок канцавы і бакавы на пласціне; тры крамянёвыя адшчэпы; дробны фрагмент сценкі ляпной пасудзіны са штрыхоўкай па вонкавай паверхні; два абломкі сценак, верагодна, ад раннеганчарных пасудзін.

Зарэчча (Сігневіцкі с/с) (мал. 1: *4*). Месцазнаходжанне з матэрыяламі эпохі каменю–бронзы, жалезнага веку і позняга сярэдневякоўя. Помнік знаходзіцца ў 150–200 м на поўнач ад вёскі, размешчаны на ўзгорках у пойме па правым беразе р. Вінец. На ім былі знойдзены: высокая рабрыстая крамянёвая пласціна (мал. 4: *3*); крамянёвы адшчэп; фрагменты сценак ад пасудзін жалезнага веку – 7 грубаляпных і 1 лошчаны; а таксама 7 абломкаў сценак позняганчарных пасудзін XIV–XVIII стст.

Машковічы, хутар (мал. 1: *5*). Месцазнаходжанне матэрыялаў эпохі каменю–бронзы, жалезнага веку і позняга сярэдневякоўя. Сляды помніка выяўлены на ворным полі, якое прымыкае з поўдня да хутара Машковічы, на ўзвышанай частцы тэрасы правага берага р. Вінец. Матэрыялы выступалі на ўчастку прыкладна 250 × 70 м уздоўж ракі. Знаходкі каменнага веку ў зборах прадстаўленыя дзвюма крамянёвымі пласцінамі, адна з якіх, верагодна, належыць да фінальнага палеаліту, і крамянёвым адшчэпам. Да жалезнага веку належаць 12 фрагментаў ляпных пасудзін. З іх 9 паходзяць ад грубаляпных пасудзін з не апрацаванай дадаткова паверхняй, 2 маюць лошчаную знешнюю паверхню, 1 пакрыты штрыхоўкай. Апошні паходзіць ад гаршка рабрыстай формы (мал. 2: *11*) з парнымі гарызантальнымі зашчыпамі па рабру, ніжэй якога паверхня пакрытая гарызантальнай штрыхоўкай. У цесце прасочваюцца дамешкі жарствы да 3 мм у папярочніку. Асноўная маса сабраных на помніку матэрыялаў належыць да эпохі позняга сярэдневякоўя: тут знойдзена звыш 50 фрагментаў позняганчарнага посуду XV–XVII стст. (мал. 2: *12–18*).

Сігневічы-1 (мал. 1: *7*). Месцазнаходжанне матэрыялаў эпохі каменю–бронзы, жалезнага веку і позняга сярэдневякоўя. Выяўлена каля 1 км на паўднёвы захад ад в. Сігневічы, каля 500 м на паўднёвы ўсход ад хутара Гаёк, 400–450 м на поўнач ад моста праз р. Вінец. Помнік месціцца на схіле высокай тэрасы левага берага ракі. На грунтовай дарозе і агаленнях глебы паабапал яе тут выяўлены сляды апрацоўкі крэменю: рабрыстая крамянёвая пласціна, медыяль-



Мал. 1. Карта маршрута разведкі и абследавання зоны: *1* – месцазнаходжанне Сабалі; *2* – месцазнаходжанне Марывіль-1; *3* – месцазнаходжанне Марывіль-2; *4* – месцазнаходжанне Зарэчча; *5* – месцазнаходжанне хутара Машковічы; *6* – паселішча Сігневічы-2; *7* – месцазнаходжанне Сігневічы-1; *8* – паселішча Рэвяцічы; *9* – месцазнаходжанне Свадзьбічы-1; *10* – месцазнаходжанне Свадзьбічы-2; *11* – стаянка Зарэчча-4; *12* – стаянка Левашкі. Бярозаўскі раён. 2011 г.



Мал. 2. Ляпны (*1–11*) і ганчарны (*12–18*) гліняны посуд (фрагменты) з паселішча Рэвяцічы (*1–10*) і хутара Машковічы (*11–18*). Малюнкі В. Г. Беляўца

ная частка другой пласціны, крамянёвы адшчэп, а таксама дробны фрагмент сценкі ляпной пасудзіны, верагодна жалезнага веку, са штрыхоўкай на вонкавым баку.

Сігневічы-2 (мал. 1: *6*). Паселішча з матэрыяламі эпохі каменю–бронзы і жалезнага веку. Помнік знаходзіцца на ўсходняй ускраіне вёскі, за жывёлагадоўчай фермай. Займае вяршыню і паўднёвы схіл выступу тэрасы па левым беразе р. Вінец. З усходу да тэрасы ў гэтым месцы некалі падыходзіла ручаіна – прыток р. Вінец, якая абазначана тут на карце канца XIX ст. Матэрыялы выступалі ў палосе прыкладна 400 × 150 м.

Эпоха каменнага веку прадстаўлена ў зборах наступнымі знаходкамі.

1/ Фрагмент, лязовая частка, свідраванай сякеры (мал. 3: *2*) са шліфаванага каменю шэрага колеру.

2/ Шліфаванае долата з крэменю шэрага колеру (мал. 3: *3*). Вастрыё і абушок са сколамі, на паверхні назіраюцца сляды тэрмічнага ўздзеяння.

3/ Фрагмент шліфавальнай пліты (мал. 3: *4*) з каменю пячоначна-чырвонага колеру, перапалены. Адна з паверхняў зашліфаваная, на ёй выразна бачны сляды спрацаванасці.

4/ Камень шліфавальны, шэрага колеру, паўкруглай формы, пляскаты, са слядамі спрацаванасці.

5/ Крамянёвая долатападобная прылада (?) на пласціне.

6/ Нуклеус крамянёвы двухпляцовачны монафрантальны ад пласцін, з апрацоўкай бакоў і контрфронту (мал. 3: *1*).

7/ Нуклеус ад пласцін двухпляцовачны (?) монафрантальны, моцна спрацаваны, перапалены.

8/ Нуклеус ад пласцін двухпляцовачны монафрантальны, з апрацоўкай бакоў і контрфронту.

9–12/ 4 пласціны крамянёвыя.

13–16/ 4 фрагменты пласцін крамянёвых.

17–31/ 15 адшчэпаў крамянёвых, у тым ліку 4 з участкамі рэтушы.

32, 33/ 2 сколы з нуклеусаў крамянёвых.

34–36/ 3 абломкі крэменю.

У дадзеных матэрыялах выразна вылучаюцца два храналагічных гарызонта: фінальнага палеаліту (свідэрскай культуры) і позняга неаліту, якія могуць



Мал. 3. Археалагічныя знаходкі: *1, 3* – крэмень; *2, 4* – камень; *5–19* – ляпны гліняны посуд (фрагменты). Паселішча Сігневічы-2. Малюнкі А. Ю. Ткачова (*1*), М. М. Крывальцэвіча (*2–4*), В. Г. Беляўца (*5–19*)

быць аднесены да кола культур шнуравой керамікі і/альбо культуры шарападобных амфар.

Наступны этап выкарыстання помніка звязаны з жалезным векам. Да яго належаць 124 фрагменты ляпнога посуду, якія па спосабах апрацоўкі паверхні падзяляюцца на наступныя групы: 1) з не апрацаванай дадаткова паверхняй – 86; 2) лошчаны посуд – 16; 3) з храпаватай паверхняй – 14; 4) са штрыхоўкай – 4 і расчэсамі – 4. Абломкі з не апрацаванай дадаткова паверхняй паходзяць пераважна ад таўстасценных (да 1,6 см) пасудзін, верагодна гаршкоў. Па складзе цеста вылучаюцца ў дзве групы – з перавагай жарствы (да 4 мм у папярочніку) у глінянай масе, і тая, што ўтрымлівае дамешкі ша-

моту. Фрагменты адна- і двухслойныя ў зломе. Знешняя паверхня розных адценняў карычневага колеру – ад пясочнага да цёмна-карычневага і рудаватага. Найбольш масіўныя абломкі двухслойныя ў зломе, з унутранай паверхняй цёмна-шэрага альбо чорнага колеру. На вонкавай паверхні двух фрагментаў бачны сляды загладжвання шчапой (мал. 3: *13*). У асобных выпадках вонкавы бок арнаментаваўся: на двух абломках выступаюць ўчасткі геаметрычных кампазіцый, якія былі ўтвораныя лініямі кропкавых наколаў (мал. 3: *19*); на адным з фрагментаў па сырой паверхні пракрэслены арнамент у выглядзе косай сеткі (мал. 3: *16*). Шыйкі маюць плаўны S-падобны выгін (мал. 3: *7*), прамыя вертыкальныя (мал. 3: *5, 6*), альбо нахіленыя ўнутр (мал. 3: *8*). Венчык аднаго з гашкоў быў упрыгожаны па рабры пальцавымі ўціскамі (мал. 3: *6*).

Па характарыстыках цеста і абпалу посуд са штрыхоўкай і расчэсамі аналагічны грубаляпному без дадатковай апрацоўкі паверхні, мае дамешкі жарствы ў цесце. Штрыхоўка неглыбокая шчыльная, наносілася на знешні бок пасудзін (мал. 3: *9*), у тым ліку па шыйцы (мал. 3: *5*). Расчэсы выкананы грабеньчатымі штампамі з рознай шырынёй і формай зубчыкаў (мал. 3: *10–12*).

У пасудзін з храпаватай паверхняй унутраны бок больш альбо менш старанна загладжаны, на вонкавы ж нанесены слой ангобу, як правіла з утрыманнем пяску і дробнай жарствы. У шэрагу выпадкаў у цесце прасочваецца дамешка шамоту (тоўчанай керамікі). На адным з абломкаў на момант нанясення ангоб быў вадкім і ўтварыў характэрную, з падцёкамі, паверхню (мал. 3: *14*).

У групе лошчанага посуду большасць, 9 фрагментаў, чорнаглянцаваныя, ад адносна тонкасценнага, верагодна сталовага посуду. Адзін з фрагментаў паходзіць ад пасудзіны з загнутым унутр венцам, верагодна гаршка яйкападобнай формы (мал. 3: *15*).

У паўднёва-заходняй частцы помніка праведзена шурфоўка на плошчы 4 м^2. Выяўлена наступная стратыграфія. Ворны пласт складае 0,30–0,32 см, утвораны гумусіраванай глебай шэра-карычневага колеру. Ніжэй месцамі на глыбіню да 0,42 м ад паверхні захаваўся культурны пласт – пясок светла-карычневага колеру, які падсцілаў жоўты мацерыковы пясок. У шурфе знойдзена 17 абломкаў сценак ляпнога посуду: 13 грубаляпных, 2 лошчаныя, 2 са штрыхоўкай. У паўночна-ўсходнім куце расчышчаны ўчастак аб'екта, які быў запоўнены слаба гумусіраваным пяском карычневага колеру. Даўжыня ямы па ўсходняй сценцы складала каля 1,40 м, па паўночнай сценцы – 0,45 м, мела глыбіню каля 0,63–0,65 см ад дзённай паверхні. Сценкі плаўна закругляліся да няроўнага, у западзінах, дна. У запаўненні аб'екта знойдзены: крамянёвы аднапляцовачны монафрантальны нуклеус з участкамі мелавой коркі, а таксама 3 абломкі сценак ляпнога посуду – 1 храпаваты і 2 гладкасценныя, адзін з якіх мае псеўдавушка (мал. 3: *17*).

У керамічным матэрыяле жалезнага веку, які атрыманы на помніку, выразна вылучаюцца дзве групы. Адна з іх звязана з традыцыямі ўсходнееўрапейскай лясной зоны. Гэта грубаляпны посуд без дадатковай апрацоўкі паверхні, загладжаны шчапой альбо пакрыты штрыхоўкай, арнаментаваны ямкавымі ўціскамі па венчыку і расчэсамі на тулаве (мал. 3: *5–13*). Па наяўнасці фрагментаў посуду з расчэсамі гэтыя матэрыялы датуюцца ў межах I–III/IV стст. і павінны звязвацца з познезарубінецкакіеўскім культурным колам. Да другой групы, традыцый цэнтральнаеўрапейскіх культур, трэба аднесці фрагменты храпаватага посуду, абломак гаршка яйкападобнай формы, фрагмент сценкі з псеўдавушкам (мал. 3: *14, 15, 17, 18*). Спосаб нанясення храпаватасці – слоем малой таўшчыні, з дамешкамі пяску, блізкі да прынятага ў вельбарскай культуры. У аздабленні посуду апошняй таксама выкарыстоўваліся псеўдавушкі.

Рэвяцічы (мал. 1: *8*). Селішча з матэрыяламі жалезнага веку. Помнік знаходзіцца ў 2 км на паўднёвы захад ад в. Рэвяцічы і ў 0,7 км на поўнач ад в. Сабалі, пры шашы М1 Брэст–Масква, на поўнач ад моста праз р. Вінец. Размешчана на ўзвышаным, да 1,5 м над узроўнем мясцовасці, участку тэрасы левага берагу ракі. Матэрыялы выступалі на ўчастку памерам каля 450 × 100 м. Сабраны 61 фрагмент ляпнога посуду жалезнага веку. З іх 3 фрагменты другасна абпаленыя. Рэшта па спосабе апрацоўкі паверхні падзяляецца на: фрагменты грубаляпнога посуду без дадатковай апрацоўкі паверхні – 31; са штрыхоўкай – 15; з расчэсамі – 4; лошчаныя – 5 (з іх 2 чорнаглянцаваныя); храпаватыя – 3.

Грубаляпны посуд вельмі блізкі па характарыстыках керамічнай масы і абпалу да апісанага вышэй посуду з паселішча Сігневічы-2. Штрыхоўка розная па спосабе выканання: ад хаатычнай неглыбокай (мал. 2: *3*) да выразнай рэгулярнай (мал. 2: *4*). На адным з фрагментаў яна нанесена з абодвух бакоў (мал. 2: *3*). Грабеньчатыя расчэсы (мал. 2: *5, 7*) наносіліся на вонкавы бок посуду і на адным з фрагментаў спалучаюцца са штрыхоўкай (мал. 2: *6*). З марфалагічна выразных можна адзначыць абломак грубаляпной пасудзіны з прамой нахіленай унутр шыйкай (мал. 2: 2).

Фрагменты храпаватага і лошчанага посуду больш мяккія ў дотыку, верагодна ўтрымліваюць дамешкі шамоту (молатай керамікі). Гэты посуд меў старанна загладжаную ці падглянцаваную ўнутраную паверхню. Слой ангобу тонкі, без падцёкаў (мал. 2: *8*). На адным з фрагментаў храпаватасць дасягнута вельмі шчыльным рознанакіраваным прадрапваннем сырой паверхні і спалучаецца з праглян-

цаваным участкам (мал. 2: *10*). Сярод фрагментаў чорнаглянцаванага посуду прысутнічае абломак пасудзіны сярэдніх памераў, верагодна міскі, шыйка якой была нахілена ўнутр, мела плаўны S-падобны выгін (мал. 2: *1*).

У сэнсе культурнай прыналежнасці грубаляпныя абломкі посуду са штрыхоўкай і расчэсамі пакідаюць уражанне культурнай і храналагічнай аднароднасці, павінны датавацца ў межах I–III/IV стст. і звязвацца з познезарубінецкакіеўскім культурным колам. Фрагменты храпаватай і лошчанай керамікі блізкія па характарыстыках да посуду вельбарскай культуры.

Свадзьбічы-1 (мал. 1: *9*). Месцазнаходжанне матэрыялаў эпохі каменю–бронзы і жалезнага веку. Выяўлена каля дарогі з в. Рэвяцічы на Свадзьбічы, каля 0,7 км на ўсход ад апошняй, на найбольш высокай кропцы гэтай часткі карэннага левага берага р. Вінец. На разаранай паверхні ў радыусе каля 50 м знойдзены крамянёвы адшчэп і 3 дробныя абломкі сценак ляпнога посуду жалезнага веку: 1 гладкасценны, 1 з апрацаванай шчапой вонкавай паверхняй і 1 са штрыхоўкай па вонкавай паверхні.

Свадзьбічы-2 (мал. 1: *10*). Месцазнаходжанне матэрыялаў эпохі каменю–бронзы і ранняга сярэдневякоўя. Знаходзіцца прыкладна ў 800 м на поўдзень ад в. Свадзьбічы, на заходнім краі ўзвышанай часткі тэрасы па левым беразе р. Вінец. На момант агляду большая частка ўзгорка была задзірванелая. На разараным ўчастку памерамі 30 × 50 м знойдзены:

1) нуклеус крамянёвы ад пласцін аднапляцовачны; пляцоўка падрыхтавана адным сколам, без слядоў падпраўкі, з падрыхтоўкай бакоў і контрфронта (мал. 4: *2*);

2) нуклеус крамянёвы ад пласцін двухпляцовачны (?) монафрантальны, моцна спрацаваны, перапалены;

3) перапалены фрагмент шліфавальнай пліты з каменю пячоначна-чырвонага колеру.

Нуклеусы належаць да фінальнага палеаліту, верагодна свідэрскай культуры. Абломак шліфавальнай пліты ўказвае на выкарыстанне помніка ў перыяд позняга неаліту–бронзавага веку.

Сабрана таксама 3 абломкі шыек і 15 сценак ад ганчарнага посуду XI–XII стст.

Акрамя абследаванняў па Вянцу, у 2011 г. таксама былі праведзены кропкавыя разведкі па цячэнні р. Ясельда, каля вёсак Зарэчча і Левашкі.

Зарэчча-2 (Бярозаўскі с/с) (мал. 1: *11*). Стаянка каменнага веку. Адкрыта ў 2011 г. Знаходзіцца па левым беразе р. Ясельда каля 1 км на поўнач ад в. Зарэчча і 1 км на ўсход ад г. Бяроза, каля 550 м на поўнач ад шашы М1 Брэст–Масква і моста праз раку. Помнік размешчаны на ўзвышанай частцы рачной тэрасы ўздоўж старарэчча Ясельды. Засаджаны сасновым лесам. Матэрыялы былі сабраны ў двух пунктах: А – на просецы ўздоўж лініі электраперадачы і Б – каля 250 м на поўнач на ўскраіне лесапасадкі, дзе ў дадзены час вядзецца будаўніцтва прыватных дамоў.

У пункце 5/А па просецы былі знойдзеныя: 2 крамянёвыя нуклеусы – двухпляцовачныя монафрантальныя ад пласцін (мал. 4: *4, 5*); скрабок крамянёвы на адшчэпе (мал. 4: *6*); 2 крамянёвыя пласціны, дыстальныя часткі, адна з іх абпаленая; 2 адшчэпы падскарыністыя. Характарыстыкі нуклеусаў дазваляюць аднесці помнік да эпохі фінальнага палеаліту і звязваць яго са свідэрскай культурай.

У пункце 5/Б у катлаванах пад будаўніцтва катэджаў і вакол іх была знойдзена крамянёвая пласціна і 6 адшчэпаў.

Лявошкі (мал. 1: *12*). Стаянка эпохі каменю–бронзавага і жалезнага вякоў. Адкрыта ў 1999 г. школьнікамі з г. Бяроза А. Белавешкіным і М. Пашкевічам. У 2002 г. помнік абследаваўся А. Г. Калечыц і аўтарам. Матэрыялы жалезнага веку, выяўленыя на помніку, звязаны з насельніцтвам кола культур усходнееўрапейскай лясной зоны ранняга жалезнага веку і постзарубінецкакіеўскага культурнага кола [2, с. 103, мал. 8/Б].

Помнік знаходзіцца каля 400 м на поўнач ад паўднёвага краю в. Куроўшчына і блізу 800 м на паўночны захад ад в. Лявошкі. Размешчаны на вялікім марэнным узвышшы ў пойме р. Ясельда – авальнай формы, каля 600 × 350 м, які мае вышыню да 4 м над узроўнем мясцовасці. Узвышша засаджана сасновым лесам, заходні і паўночна-заходні краі знішчаныя кар'ерамі. Матэрыялы выступалі перадусім у паўночнай, больш блізкім да Ясельды, частцы ўзвышша. У агаленнях грунту і на пашкоджаных кар'ерамі ўчастках тут было сабрана 58 фрагментаў апрацаванага крэменю: крамянёвы скрабок (мал. 4: *12*); скол падпраўкі нуклеуса; 14 пласцін (мал. 4: *7–9*) і 1 мікрапласціна; 29 адшчэпаў (мал. 4: *10, 11*); 8 лусак; 2 сколы; 2 абломкі крэменю. Знойдзены фрагмент сценкі ляпной пасудзіны, верагодна, жалезнага веку.

Заключэнне. Прадстаўленыя вынікі разведак 2011 г. сведчаць аб трываласці і шчыльнасці пасяленчых структур у парэччы р. Вянец на працягу ўсяго перыяду засялення Заходняга Палесся. На серыі помнікаў атрыманы матэрыялы свідэрскай культуры эпохі фінальнага палеаліту: ў Зарэччы-2, Сігневічах-2, Свадзьбічах. Мезалітычныя матэрыялы выяўлены ў Сабалях. Прадстаўнічы комплекс знаходак неаліту–бронзавага веку сабраны на селішчы Сігневічы-2. Эпоха сярэдневякоўя выразна прадстаўлена ў зборах з паселішчаў ля хутара Машковічы і ў Свадзьбічах.

На 7 з 10 помнікаў, адкрытых па р. Вінец, прысутнічае гарызонт жалезнага веку. На фоне культурна-роднасных помнікаў, выяўленых А. Ф. Касюк на тэрыторыі Драгічынскага і Іванаўскага раёнаў [3],



Мал. 4. Знаходкі вырабаў з крэменю: *1* – Марывіль-1; *2* – Свадзьбічы-2; *3* – Зарэчча; *4–6* – Зарэчча-2; *7–12* – Левашкі. Бярозаўскі раён. Малюнак А. Ю. Ткачова

прадстаўленыя вышэй матэрыялы з'яўляюцца новым сведчаннем шырокага распаўсюджвання на Загароддзі помнікаў жалезнага веку, адметнай рысай керамічнага комплексу якіх з'яўляецца грубаляпны посуд са штрыхоўкай і расчэсамі. Верагодна, такія помнікі ўтвараюць у гэтым рэгіёне некалькі храналагічных гарызонтаў. Фрагменты грубаляпнога посуду з грабеньчатымі расчэсамі, выяўленыя на селішчах у Рэвяцічах і Сігневічах-2, датуюць позні гарызонт помнікаў гэтай традыцыі на Загароддзі ў агульных межах I–IV стст. і ўказваюць на прыналежнасць іх насельніцтва да познезарубінецкакіеўскага культурнага кола. На абодвух згаданых помніках таксама выяўлены фрагменты посуду цэнтральнаеўрапейскага кола культур, якія могуць суадносіцца з паморскай культурай ранняга жалезнага веку і/альбо вельбарскай культурай познерымскага часу. Прысутнасць у гэтым рэгіёне насельніцтва падклёшава-паморскай культуры ў IV ст. да н. э. пасведчаная матэрыяламі грунтовага могільніка каля станцыі Драгічын [4, с. 197, рис. 3: *2, 5*]. Яркім сведчаннем існавання кантактаў паміж мясцовым насельніцтвам і носьбітамі вельбарскай культуры, альбо прасоўвання апошніх па р. Ясельда ў накірунку Цэнтральнага Палесся, з'яўляецца манетны скарб з Малеча [1, с. 221, рис. 3: *1*]. Сучасны стан даследаванняў не дазваляе казаць аб характары і формах ўзаемадзеяння насельніцтва розных культурных традыцый на тэрыторыі Загароддзя ў жалезным веку.

Літаратура

1. Белевец, В. Г. Контакты населения вельбарской культуры и носителей традиций лесной зоны в Беларуси : постановка проблемы / В. Г. Белевец // Лесная и лесостепная зоны Восточной Европы в эпохи римских влияний и Великого переселения народов : сб. ст. / И. Р. Ахмедов [и др.] ; под. ред. А. Н. Наумова. – Тула, 2008. – Вып. 1. – С. 209–237.

2. Белявец, В. Курадава I – шматслойнае паселішча з Цэнтральнага Палесся / В. Белявец, В. Вяргей // Матэрыялы па археалогіі Беларусі : навук. зб. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2002. – № 5. – С. 5–24.

3. Касюк, А. Ф. Археалагічныя разведкі ў Брэсцкай вобласці ў 2010 г. / А. Ф. Касюк // Матэрыялы па археалогіі Беларусі : навук. зб. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2012. – № 23. – С. 208–213.

4. Никитина, В. Б. Памятники поморской культуры в Белоруссии и на Украине / В. Б. Никитина // Советская археология. – М., 1965. – № 1. – С. 194–205.

Резюме

В. Г. Белевец

Археологические разведки в Березовском районе в 2011 г.

Представлены результаты разведок 2011 г. в нижнем течении р. Винец – правого притока р. Ясельда. В их ходе открыто 10 памятников, материалы которых свидетельствуют об устойчивом характере поселенческих структур в этой, еще не обследовавшейся, части Западного Полесья: от эпохи финального палеолита до средневековья. На семи из них выявлены материалы железного века. Обломки керамики с расчесами, выявленные на селищах Ревятичи и Сигневичи-2, позволяют выделить на них горизонт I–IV вв., связанный с населением позднезарубинецкого и киевского культурного круга. На этих памятниках также выявлена керамика центральноевропейской культурной традиции, которую следует относить к поморской и вельбарской культурам.

Zusammenfassung

V. Beljavec

Archäologische Erforschung im Jahre 2011 in Bezirk Berëza

In Artikel sind die Ergebnisse der Archäologische Erforschung in den Unterlauf des Flusses Vinec – rechter Nebenfluss Jaselda präsentiert. In ihrem Verlauf geöffnet man 10 archäologisches Denkmale. Erhaltene auf diesen Materialien sind ein Beweis kontinuierliches Charakter des Siedlungsstruktures in diesem, noch nicht erhoben, Region den Westen Polesie aus der abschließende Altsteinzeit bis ins Mittelalter. Am 7 von dieser Dekmellern sind einige Materialien aus der Eisenzeit identifiziert. Aufgrund die Fragmenten des Töpfers mit Rasčesy-Verzierung, die auf Siedlungen Revjatyčy und Signevičy-2 stammen, kann man hier ein Horizont I–IV Jhrhunderts unterscheiden, der mit der Bevölkerung des Post-Zarubincy–Kiever Kulturkreises verbundet ist. Hier fand man auch Keramik mitteleuropäischen Kulturtraditions, die den Glockengraber- und Wielbark-Kulturen zugeschrieben werden sollte.

УДК 902/904(476)«2011»

А. М. Вашанаў, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, аспірант (г. Мінск)*

Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Бялыніцкага і Івацэвіцкага раёнаў у 2011 г.

У 2011 г. аўтарам артыкула праводзіліся археалагічныя раскопкі на стаянцы Бялынічы-1А ў Бялыніцкім раёне, а таксама разведкі на тэрыторыі Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці і Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці [3].

Стаянка Бялынічы-1А размешчана на паўднёва-заходняй ускраіне г. п. Бялынічы ў 0,97 км на поўдзень ад в. Рагач на падтрохкутным мысападобным выступе карэннага берага ракі ва ўрочышчы Салатопка (геаграфічныя каардынаты: 54º00´34.53´´ пн. ш, 29º41´30.11´´ у. д.)[1] (мал. 1, *А: 1*). Помнік выяўлены ў 1982 г. Э. М. Зайкоўскім [4, с. 10; 5, с. 86–87], даследаваўся аўтарам у 2009 г. [1] і 2010 г. [2].

У 2011 г. на помніку побач з шурфамі 2010 г. [2], былі закладзены два раскопы агульнай плошчай 22 м^2. Даследаванне вялося ўмоўнымі механічнымі пластамі па 10 см. Пры фіксацыі знаходак кожны квадрат быў падзелены на чатыры сектары (а, б, в, г). Грунт прасейваўся праз сіта з вочкамі памерамі 0,5 см.

Раскоп 1 (10 м^2) даследаваны да глыбіні 90 см, знаходкі сустракаліся да глыбіні 80 см. Яго стратыграфія: а) шэры бесструктурны пясок магутнасцю 16–30 см; б) шчыльны дробназярністы бесструктурны пясок попельна-белаватага колеру з прапласткамі торфу (14–26 см); в) шчыльны бесструктурны пясок буравата-жоўтага колеру (8–26 см); г) белы дробназярністы бесструктурны пясок з ардзандамі (30–40 см). Мацерыковая паверхня – суглінак бялёсага адцення, які падсцілаецца дробназярністым белым пяском.

Раскоп 2 (12 м^2) даследаваны да глыбіні 40 см. Адразу пад ледзь заўважным дзёрнам ішоў ворны слой цёмна-шэрага колеру магутнасцю да 36 см, у якім і канцэнтраваліся знаходкі. Яго падсцілаў мацярык – слой светла-жоўтага пяску. У заходняй частцы раскопу ў кв. 28в была зафіксавана зольная пляма, палова якой зыходзіла ў заходнюю сценку. Памеры даследаванай часткі – 52 × 32 см, глыбіня – 30 см. У запаўненні аб'екта знаходак не выяўлена.

Атрыманая калекцыя налічвае 1990 артэфактаў, сярод якіх 1959 крамянёвых вырабаў (98,4%), 2 дробныя фрагменты ляпной керамікі эпохі позняга неаліту (0,1%)[2], 13 сценак кругавой керамікі (0,6%), 2 фрагменты каменных неазначальных вырабаў (0,1%), фрагмент сучаснай меднай трубкі (0,05%), 13 фрагментаў дробных перапаленых костак (0,6%) (гл. табліцу).

Археалагічны матэрыял, атрыманы ў выніку археалагічных раскопак на помніку Бялынічы-1А, 2011 г.

Матэрыял	1/2011 г. (10 м^2)	2/2011 г. (12 м^2)	Пав. зб. 2011 г.	Разам
Крэмень	1746	204	9	1959
Кераміка ляпная	2	–	–	2
Кераміка ганчарная	–	13	–	13
Камень	2	–	–	2
Метал		1	–	1
Костка	12	1	–	13
Усяго:	1762	219	9	1990

Сярод знойдзеных артэфактаў найбольшую цікавасць выклікаюць знаходкі наканечнікаў стрэл (мал. 2: *11, 12*), групы мікралітаў і адходаў ад іх вытворчасці (мал. 2: *1–10*), а таксама скрабкоў (мал. 2: *13–15*) і разцоў (мал. 2: *16–18*). Аналіз крамянёвага матэрыялу дазваляе вылучыць на помніку некалькі культурна-храналагічных кампанентаў. Фінальны палеаліт/ранні мезаліт – тэхнакомплекс з лістападобнымі наканечнікамі стрэл, грэнская культура; ранні мезаліт – кудлаеўска-каморніцкі тэхнакомплекс, кундская/бутаўская культура; позні мезаліт – яніславіцкая культура.

Археалагічныя разведкі ў Бялыніцкім раёне Магілёўскай вобласці працягваліся ў 2011 г. на левым беразе р. Друць, на паўночны захад ад г. п. Бялынічы, а таксама па берагах ракі і возера Няропля.

Бялынічы-2В (мал. 1, *А: 2*). Паселішча з матэрыяламі эпохі неаліта–бронзавага веку, позняга сярэдневякоўя і новага часу, выяўлена ў 2009 г. аўтарам [1], абследавана ў 2010 г. [2]. Размешчана на паўднёва-заходнім ускрайку пясчанага ўзвышша праз 0,13 км на паўночны ўсход ад моста праз р. Друць і за 0,08 км на паўночны ўсход ад русла ракі (геаграфічныя каардынаты: 53º59´50.88´´ пн. ш., 29º41´56.52´´ у. д.). У 2011 г. на паверхні было знойдзена 20 крамянёвых вырабаў (мал. 3: *1–4*), фрагмент ляпной і 10 фрагментаў кругавой керамікі, а таксама былі закладзены 2 шурфы памерамі 1 × 1 м: шурф 1 на паўднёва-заходнім краі ўзвышша ў 2 м на ўсход ад дарогі на месцы, вызваленым ад лесапасадкі, і шурф 2 на паўднёвым краі ўзвышша, на яго схіле, праз 19 м на паўднёвы ўсход ад шурфа 1, за 5 м на паўночны захад ад металічнай трубы, укапанай на склоне ўзвышша. Стратыграфія шурфа 1: тонкі дзірван, шэры дробназярністы пясок (18–20 см), светлаоўты дробназярністы пясок з цёмнымі ўкрапінамі (12–18 см), светла-жоўты дробназярністы пясок да глыбіні 50 см,

[1] Каардынаты пададзены згодна сістэме Google Earth.

[2] Вызначэнне ляпной керамікі зроблена М. І. Ткачовай і З. А. Харытановіч.



Мал. 1. Лакалізацыя помнікаў: *А* – Бялыніцкі раён: *1* – Бялынічы-1А; *2* – Бялынічы-2В; *3* – Бялынічы-3; *4* – Бялынічы-5; *5* – Бялынічы-6А; *6* – Бялынічы-6Б; *7* – Бялынічы-6В; *8* – Бялынічы-6Г; *9* – Няропля-1; *10* – Няропля-3; *11* – Няропля-4; *12* – Няропля-5; *13* – Няропля-6; *14* – Няропля-7; *15* – Няропля-2; *16* – Міхалоў-2; *17* – Міхалоў-1; *Б* – Івацэвіцкі раён: *1* – Бабровічы-1; *2* – Бабровічы-2; *3* – Бабровічы-10; *4* – Бабровічы-11; *5* – Бабровічы-3А; *6* – Бабровічы-8; *7* – Бабровічы-4В; *8* – Бабровічы-16. 2011 г.



Мал. 2. Крамянёвыя вырабы: *1–10* – мікраліты і адходы ад іх вытворчасці; *11, 12* – наканечнікі стрэл; *13–15* – скрабкі; *16–18* – разцы. Бялынічы-1А. Малюнак А. М. Вашанава

да якой і сустракаліся знаходкі. У шурфе былі знойдзены 17 крамянёвых вырабаў і 24 фрагменты кругавой керамікі. Шурф 2: пад дзірванам ішоў слой перавеянага пяску светла-карычневага колеру таўшчынёй 12–14 см, ніжэй – слой дробназярністага пяску светла-жоўта-шэрага колеру з дробнымі ўкрапінамі светла-шэрага колеру (14–30 см), пад ім – слой цёмна-шэрага гумусіраванага пяску (28–50 см), мацярык – дробназярністы чырванаваты пясок. Знаходкі сустракаліся да глыбіні 78 см. У шурфе было знойдзена 16 крамянёвых вырабаў і 24 фрагменты керамікі позняга сярэдневякоўя–новага часу[1].

Бялынічы-3 (мал. 1, *А: 3*) – месцазнаходжанне расшчапаных крамянёў, выяўлена ў 2009 г. аўтарам [1], знаходзіцца на левым беразе р. Друць праз 0,67 км на поўдзень ад г. п. Бялынічы, праз 0,53 км на паўднёвы ўсход ад шашы М4 (Мінск–Магілёў) і за 0,87 км на паўночны ўсход ад моста праз р. Друць на

[1] Вызначэнне кругавой керамікі тут і далей зроблена Г. Р. Цімафеенка.

паўднёва-ўсходнім краі выцягнутай па лініі паўночны ўсход–паўднёвы захад дзюны (геаграфічныя каардынаты: 53º58′43.10′′ пн. ш., 29º42′43.22′′ у. д.). Паверхня месцазнаходжання моцна пашкоджана сіласнымі ямамі. На помніку быў закладзены шурф памерамі 1 × 1 м, які аказаўся без знаходак. Ён размяшчаўся на паўднёва-ўсходнім краі дзюны праз 0,2 км на паўднёвы-ўсход ад месца збора пад'ёмнага матэрыялу ў 2009 г. Стратыграфія шурфа: 1) навеяны пясок светла-жоўтага колеру (6–22 см); 2) слой супеску бялёсага колеру (19–20 см); 3) слой чырванаватажоўтага пяску (да 22 см).

Бялынічы-5 (мал. 1, *А: 4*) – месцазнаходжанне матэрыялаў каменнага–бронзавага вякоў выяўлена на левым беразе р. Друць, праз 0,22 км на паўночны захад ад паўночна-заходняй ускраіны г. п. Бялынічы, праз 1,06 км на паўднёвы захад ад в. Рагач, на пясчанай дзюне (геаграфічныя каардынаты: 54º00′45.12′′ пн. ш., 29º40′46.74′′ у. д.). Меліярацыйны канал перарэзаў помнік на дзве часткі. На пясчаных агаленнях канала былі знойдзены скарыністы адшчэп і фрагмент неазначальнага сколу.

Бялынічы-6А (мал. 1, *А: 5*) – месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага–броназавага вякоў адкрыта на левым беразе р. Друць, праз 2,26 км на паўночны захад ад г. п. Бялынічы і праз 1,72 км на паўднёвы-захад ад паўднёвай ускраіны в. Рагач, на краі першай надпоймавай тэрасы (геаграфічныя каардынаты: 54º01′07.08′′ пн. ш., 29º35′53.75′′ у. д.). На ўскрайку тэрасы, на мяжы з лесапасадкай, былі знойдзены адшчэп звычайны, луска і 2 дробныя абломкі неазначальныя.

Бялынічы-6Б (мал. 1, *А: 6*) – месцазнаходжанне каменнага-бронзавага вякоў, існуе верагоднасць, што гэта помнік, які ў 1982 г. адкрыў Э. М. Зайкоўскі (Пасека-2) [4, 5], размяшчаецца на левым беразе р. Друць, праз 2,54 км на паўночны захад ад г. п. Бялынічы, праз 1,9 км на захад ад паўднёвай ускраіны в. Рагач, за 0,25 км на паўночны захад ад месцазнаходжання Бялынічы-6А, на краі першай надпоймавай тэрасы (геаграфічныя каардынаты: 54º01′14.28′′ пн. ш., 29º39′49.78′′ у. д.). На ўскрайку тэрасы, на мяжы з лесапасадкай, знойдзены дробны абломак неазначальны.

Бялынічы-6В (мал. 1, *А: 7*) – месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў, можа з'яўляцца помнікам, адкрытым у 1982 г. Э. М. Зайкоўскім (Пасека-1) [4, 5], размешчана на левым беразе р. Друць, праз 2,74 км на паўночны захад ад г. п. Бялынічы, праз 2 км на паўночны захад ад паўднёвай ускраіны в. Рагач і за 0,24 км на паўночны захад ад месцазнаходжання Бялынічы-6Б, на краі першай надпоймавай тэрасы (геаграфічныя каардынаты: 54º01′23.04′′ пн. ш., 29º39′47.11′′ у. д.). На мысападобным выступе тэрасы, на мяжы з лесапасадкай, знойдзены праксімальны фрагмент пласціны і фрагмент скола неазначальнага.

Бялынічы-6Г, «урочышча Лысая Гара» (мал. 1, *А: 8*). Стаянка з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў, адкрыта ў 1932 г. А. Дз. Каваленяй пад назвай Лысая Гара [7]. У 1982 г. помнік абследаваўся Э. М. Зайкоўскім [4]. Каб у далейшым пазбегнуць блытаніны з назвамі помнікаў, яму быў надзены парадкавы нумар 6Г. Размяшчаецца на левым беразе р. Друць, праз 2,88 км на паўночны захад ад г. п. Бялынічы, праз 2,04 км на паўночны захад ад паўднёвай ускраіны в. Рагач і за 0,24 км на паўночны захад ад месцазнаходжання Бялынічы-6В, на краі высокага крутога берага р. Друць (геаграфічныя каардынаты: 54º01′30.03′′ пн. ш., 29º39′48.05′′ у. д.). У абсыпцы грунту былі сабраны фрагмент перапаленай косткі, 2 дробныя неазначальныя крамянёвыя абломкі, луска, 3 адшчэпы звычайныя, скрабок на скарыністым адшчэпе.

Міхалоў-1 (мал. 1, *А: 17*). Месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага–бронзавага веку. Адкрыта аўтарам ў 2010 г. [2], размяшчаецца на левым беразе р. Няропля, праз 2,9 км на паўночны ўсход ад могілак, на заходняй ускраіне г. п. Бялынічы, праз 0,6 км на паўночны ўсход ад вёскі Міхалоў на краі першай надпоймавай тэрасы (геаграфічныя каардынаты: 54º00′12.36′′ пн.ш., 29º46′05.38′′ у.д.). На дарозе, што цягнецца па краі тэрасы, былі знойдзены 2 адшчэпы звычайныя, 2 лускі, фрагмент адшчэпа, 7 дробных абломкаў неазначальных.

Міхалоў-2 (мал. 1, *А: 18*) – месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў выяўлена на левым беразе р. Няропля праз 0,14 км на паўночны ўсход ад месцазнаходжання Міхалоў-1, праз 0,8 км на паўночны ўсход ад в. Міхалоў, за 0,17 км на ўсход ад русла ракі (геаграфічныя каардынаты: 54º00′19.59′′ пн. ш., 29º46′10.72′′ у. д.). Апрацаваныя крэмені трапляліся на дарозе, што цягнецца па краі тэрасы ўздоўж лесу. У гэтым месцы выяўлены фрагмент сценкі ляпной керамікі, 4 лускі, 2 адшчэпы звычайныя.

Няропля-1 (мал. 1, *А: 9*) – стаянка з матэрыяламі позняга неаліту–бронзавага веку адкрыта на правым беразе р. Няропля, праз 0,5 км на поўдзень ад воз. Няропля і праз 1,2 км на паўночны ўсход ад будынка дома састарэлых на паўночна-ўсходняй ускраіне г. п. Бялынічы, праз 1,37 км ад в. Навасёлкі (геаграфічныя каардынаты: 54º00′51.54′′ пн. ш., 29º44′40.29′′у. д.) на мысападобным выступе пясчанага ўзвышша, які моцна ўрэзваецца ў затарфаваны поплаў. Для праверкі магутнасці культурных напластаванняў у паўночна-заходняй частцы мысападобнага выступу быў закладзены шурф (1 × 2 м). Стратыграфія шурфа: дзёран (5–6 см), ворны слой цёмна-шэрага колеру (22–28 см), светла-жоўты пясок (12–22 см). Знаходкі трапляліся да глыбіні 50 см. У шурфе было знойдзена 207 артэфактаў, пераважную большасць якіх складаюць крамянёвыя вырабы (190 экзэмпляраў (мал. 3: *5, 6*)), а таксама 10 фраг-



Мал. 3. Крамянёвыя вырабы: *1–4* – Бялынічы-2В; *5, 6* – Няропля-1; *7–10* – Няропля-4; *11* – Бабровічы-1; *12* – Бабровічы-4В. Малюнак А. М. Вашанава

ментаў ляпной керамікі, 6 фрагментаў кальцынiраваных костак, фрагмент каменнага вырабу неазначальнага.

Няропля-2 (мал. 1, *А: 15*) – помнік эпохі мезаліту (?), неаліту, позняй бронзы і позняга сярэдневякоўя, выяўлены на левым беразе р. Няропля на паўднёва-заходнім ускрайку пясчанага ўзвышша, праз 1,74 км на паўднёвы ўсход ад в. Навасёлкі, праз 2 км на паўднёвы захад ад в. Пачапок, за 0,14 км на поўнач ад русла ракі (геаграфічныя каардынаты: 54º00′59.07′′ пн. ш., 29º45′08.97′′у. д.). Паверхня стаянкі добра задзірванелая, дзе-нідзе парасла маладой хвояй. Шурф (1 × 2 м) быў разбіты прыблізна ў 30 м на поўдзень ад дарогі, што цягнецца ўздоўж лесу. У шурфе выяўлена наступная стратыграфія: слой дзірвану (4–6 см), ворны пласт цёмна-шэрага колеру (20–34 см), слой жоўта-шэрага пяску да глыбіні 50 см, да якой сустракаліся знаходкі. Мацярык – дробназярністы пясок светла-жоўтага колеру. У шурфе былі знойдзены 82 вырабы з крэменю, 3 фрагменты аб-

мазкі, фрагмент глінянага грузіка, 25 фрагментаў ляпной керамікі, фрагмент каменнага вырабу неазначальнага (фрагмент каменнай шліфаванай сякеры ?), 38 дробных фрагментаў неазначальнай керамікі, 42 фрагменты кругавой керамікі, 4 дробныя фрагменты кальцыніраваных костак.

Няропля-3 (мал. 1, *А: 10*) – месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў. Помнік выяўлены на паўднёва-заходнім беразе воз. Няропля, праз 1,6 км на ўсход ад в. Навасёлкі, праз 0,9 км на паўднёвы-ўсход ад в. Атверніца, за 0,18 км ад берагавой лініі, на заходнім ускрайку ўзвышша (геаграфічныя каардынаты: 54º01′09.51′′ пн. ш., 29º45′00.64′′у. д.). Нешматлікія знаходкі сустракаліся на дарозе, што цягнецца ўздоўж лесу, дзе знойдзена 12 вырабаў з крэменю: 7 дробных абломкаў неазначальных, 2 адшчэпы звычайныя, 3 лускі, дробны фрагмент скола неазначальнага.

Няропля-4 (мал. 1, *А: 11*) – стаянка эпохі мезаліту (?), неаліту. Выяўлена на ўсходнім беразе воз. Няропля, праз 0,7 км на паўднёвы ўсход ад в. Атверніца, праз 1,65 км на захад ад паўднёвай ускраіны в. Пачапок, за 0,33 км ад берагавой лініі, на паўночным краі ўзвышша (геаграфічныя каардынаты: 54º01′22.47′′ пн. ш., 29º45′12.80′′у. д.). На помніку была праведзена шурфоўка. Шурф (1 × 2 м) быў закладзены з правага боку ад дарогі, што цягнецца ўздоўж лесу ва ўсходнім накірунку, на ўчастку, вольным ад лесапасадкі. Стратыграфія: слой дзірвану таўшчынёй (2–4 см), ворны слой цёмна-шэрага колеру (14–26 см), слой пяску жоўта-шэрага колеру (да глыбіні 40 см). Мацярык – светла-жоўты пясок. У шурфе было знойдзена: 144 крамянёвых вырабаў (мал. 3: *7–10*), каменны адбойнік, 6 фрагментаў ляпной і фрагмент кругавой керамікі, 4 фрагменты перапаленых костак.

Няропля-5 (мал. 1, *А: 12*) – помнік з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў, выяўлены за 0,6 км на ўсход ад воз. Няропля, праз 1 км на паўднёвы ўсход ад в. Атверніца і праз 1,5 км на захад ад паўднёвай ўскраіны в. Пачапок, на ўсходнім краі ўзвышша (геаграфічныя каардынаты: 54º01′18.41′′ пн. ш., 29º45′27.42′′у. д.). Паверхня помніка задзірванела і месцамі парасла маладымі елкамі. Для высвятлення культурна-храналагічнай прыналежнасці матэрыялаў на помніку была праведзена шурфоўка. Шурф (1 × 1 м) быў закладзены з левага боку ад дарогі, што цягнецца ў паўднёвым накірунку ўздоўж лесу. Стратыграфія: дзірван (4–6 см), ворны пласт цёмна-шэрага колеру, у якім і трапляліся знаходкі (21–28 см), слой жоўтага пяску з цёмнымі ўкрапінамі (6–12 см). У шурфе знойдзены: адшчэп звычайны і фрагмент гільзы ад паляўнічага патрона, на вонкавым баку якога прасочваецца надпіс «USSR».

Няропля-6 (мал. 1, *А: 13*) – месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў. Выяўлены на левым беразе р. Няропля праз 1,75 км на паўднёвы ўсход ад в. Адверніца і праз 1,40 км на паўднёвы захад ад паўднёвай ускраіны в. Пачапок, за 0,20 км на поўнач ад русла ракі, на паўднёва-ўсходнім ускрайку ўзвышша (геаграфічныя каардынаты: 54º00′59.54′′ пн. ш., 29º45′41.65′′у. д.). На дарозе, што цягнецца ўздоўж леса былі знойдзены: адшчэп скарыністы, 3 адшчэпы звычайныя, дробны фрагмент сколу неазначальнага.

Няропля-7 (мал. 1, *А: 14*) – месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў. Адкрыта на левым беразе р. Няропля, праз 1,5 км на паўднёвы захад ад в. Атверніца і праз 1,7 км на паўднёвы захад ад паўднёвай ускраіны в. Пачапок, за 0,14 км на поўнач ад русла ракі (геаграфічныя каардынаты: 54º00′59.21′′ пн. ш., 29º45′25.87′′у.д.). Нешматлікія крамянёвыя артэфакты трапляліся на дарозе, што цягнецца ўздоўж лесу (падскарыністы адшчэп і 2 дробныя абломкі неазначальныя).

У ліпені 2011 г. былі праведзены археалагічныя разведкі на тэрыторыі **Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці.** Галоўнай мэтай працы стала высвятленне сучаснага стану помнікаў каменнага веку, сканцэнтраваных у раёне воз. Бабровіцкае (Бабровіцкі мікрарэгіён), а таксама вызначэнне найбольш перспектыўных аб’ектаў, для правядзення стацыянарных археалагічных раскопак[1].

Бабровічы-1 (мал. 1, *Б: 1*). Помнік выяўлены ў 1963 г. У. Ф. Ісаенка [6]. Абследаваўся у 1971 г. У. Ф. Ісаенка, у 1979 г. Н. У. Шаблюк [9], у 2002 г. Э. А. Ляшкевіч, А. Г. Калечыц, В. Л. Лакізам, В. С. Абухоўскім [9].

Размяшчаецца на паўночна-ўсходнім беразе воз. Бабровіцкае ва ўрочышчы Востраў, на марэнным мысападобным узвышэнні, даўжыня якога складае 0,99 км, шырыня – 0,6 км (геаграфічныя каардынаты: 52º38′36.15′′ пн. ш., 25º47′31.15′′ у. д.). Вышыня над узроўнем вады – каля 3–4 м. На момант абследавання, летам 2011 г., паверхня стаянкі была амаль цалкам пакрыта хваёвым лесам, невялікія прагаліны назіраліся ў яе цэнтральнай, найбольш высокай, частцы, дзе ўсталяваны трыангуляцыйны знак. У гэтым месцы, на незадзірванелых участках, былі знойдзены: аднапляцовачны монафрантальны нуклеус ад пласцін і адшчэпаў (мал. 3: *11*) без дадатковай апрацоўкі бакоў і контрфронта, фрагмент масіўнага скарыністага адшчэпа, натуральны абломак з негатывамі асобных сколаў, 2 натуральныя абломкі без апрацоўкі.

[1] На помніках Бабровічы-3А (мал. 1, *Б: 5*), Бабровічы-8 (мал. 1, *Б: 6*), Бабровічы-10 (мал. 1, *Б: 3*), Бабровічы-16 (мал. 1, *Б: 8*) артэфактаў выяўлена не было, таму вынікі іх абследавання ў артыкуле не прыводзяцца.

Крамянёвыя артэфакты папярэдне датуюцца каменным–бронзавым векам. Аднапляцовачны нуклеус, знойдзены на помніку, можа адносіцца да эпохі мезаліту.

Бабровічы-2 (мал. 1, *Б: 2*). Помнік быў выяўлены ў 1963 г. У. Ф. Ісаенка [6]. Абследаваўся ў 1971 г. У. Ф. Ісаенка, у 1979 г. Н. У. Шаблюк [8], у 2002 г. Э. А. Ляшкевіч, А. Г. Калечыц, В. Л. Лакізам, В. С. Абухоўскім [9]. На працягу 1990–2010 гг. зборам матэрыялаў на помніку займаўся В. М. Бычкоўскі.

Помнік размешчаны на паўночна-заходнім беразе воз. Бабровіцкае ва ўрочышчах Вяда і Тупічыцы (геаграфічныя каардынаты: 52º38´50.00´´ пн. ш., 25º46´11.48´´ у. д.), на месцы існаваўшых тут у даваенны час вёсак з аднайменнымі назвамі (вёскі спалены нямецкімі войскамі 15 верасня 1942 г.). На момант даследавання паверхня помніка падвяргалася моцнаму ўздзеянню ветравой эрозіі. У межах развейваемых пяскоў былі вылучаны чатыры месцы з выразна акрэсленымі канцэнтрацыямі крамянёвага і керамічнага матэрыялу, якія былі названыя зонамі збору 1A, 1B, 1C і 1D адпаведна**.**

Зона збору-1A. На плошчы 35 × 30 м было знойдзена: 37 крамянёвых вырабаў, а таксама фрагменты кругавой керамікі. Крамянёвы матэрыял папярэдне датуецца каменным–бронзавым векам, асобныя артэфакты адносяцца да эпохі мезаліту. Кругавая кераміка датуецца XVIII–XIX стст.

Зона збору-1B. На ўчастку плошчай 30 × 30 м было знойдзена: 35 крамянёвых артэфактаў і фрагменты кругавой керамікі. Храналогія крамянёвага матэрыялу вызначаецца ў шырокіх рамках: каменны–бронзавы век. Асобныя крамянёвыя артэфакты датуюцца эпохай фінальнага палеаліту і мезаліту. Кругавая кераміка адносіцца да XVIII–XIX стст.

Зона збору-1C. На плошчы 40 × 30 м знойдзена: 134 крамянёвыя вырабы і фрагменты кругавой керамікі. Большасць крамянёвых артэфактаў папярэдне датуецца каменным–бронзавым векам, некаторыя адносяцца да фінальнага палеаліту і мезаліту. Керамічны матэрыял датуецца XVIII–XIX стст.

Зона збору-1D. На тэрыторыі плошчай 50 × 30 м былі сабраны: 43 крамянёвыя артэфакты, фрагмент ляпной і шматлікія фрагменты кругавой керамікі. Большасць вырабаў з крэменю папярэдне датуецца каменным–бронзавым векам, частка – фінальным палеалітам–мезалітам, фрагмент сценкі ляпной керамікі – перыядам ранняга жалезнага веку. Кругавая кераміка адносіцца да XVIII–XIX стст.

Бабровічы-4B (мал. 1, *Б: 7*). Помнік выяўлены У. Ф. Ісаенка, даследаваўся шурфоўкай у 2001 г. А. Г. Калечыц, В. Л. Лакізам, В. С. Абухоўскім [9]. Размешчаны праз 0,50 км на поўнач ад цэнтра в. Бабровічы, з паўднёва-заходняга боку ад вясковых могілак (геаграфічныя каардынаты: 52º36´51.95´´ пн. ш., 25º46´32.53´´ у. д.). Помнік пашкоджаны невялікім кар'ерам. Паверхня паступова зарастае хмызняком. Тут знойдзены фрагмент серпападобнага нажа (мал. 3: *12*), які датаваны неалітам–бронзавым векам.

Бабровічы-11 (мал. 1, *Б: 4*). Помнік выяўлены і даследаваны ў 2002 г. Э. А. Ляшкевіч [9]. Лакалізаваны на дне воз. Бабровіцкае, праз 40 м на ўсход ад стаянкі Бабровічы-10 (геаграфічныя каардынаты: 52º37´08.28´´ пн. ш., 25º46´22.70´´ у. д.). Летам 2011 г. на дне возера знойдзена 7 крамянёвых артэфактаў: праксімальная частка рэгулярнай пласціны; 2 дробныя абломкі неазначальныя; скол аднаўлення пляцоўкі нуклеуса; адшчэп падскарыністы; 2 фрагменты адшчэпаў. Па сваіх тэхніка-марфалагічных рысах яны адносяцца да яніславіцкай культуры і датуюцца познім мезалітам.

Вынікі абследавання 2011 г. сведчаць, што помнікі Бабровіцкага мікрарэгіёна маюць досыць розную ступень захаванасці, некаторыя пашкоджаны антрапагенным уздзеяннем. Найбольш перспектыўнымі для даследавання з'яўляюцца помнікі Бабровічы-1, -2, -10, -11, -3A.

Літаратура

1. Вашанаў, А. М. Справаздача аб разведках на тэрыторыі Бялыніцкага раёна ў 2009 годзе / А. М. Вашанаў // ААНД ІГ НАН Беларусі.

2. Вашанаў, А. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Бялыніцкага раёна ў 2010 г. / А. М. Вашанаў // ААНД ІГ НАН Беларусі.

3. Вашанаў, А. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці і Бялыніцкім раёне Магілёўскай вобласці ў 2011 годзе / А. М. Вашанаў // ААНД ІГ НАН Беларусі.

4. Зайкоўскі, Э. М. Справаздача аб палявых даследаваннях у 1982 годзе / Э. М. Зайкоўскі // ААНД ІГ НАН Беларусі. – Спр. № 794.

5. Зайкоўскі, Э. М. Разведкі на Друці / Э. М. Зайкоўскі // Гістарычныя лёсы Верхняга Падняпроўя. Магілёў. – 1995. Ч. І. – С. 86–90.

6. Исаенко, В. Ф. Отчет о полевых исследованиях 1963 года / В. Ф. Ісаенко// ААНД ІГ НАН Беларусі. – Спр. № 160.

7. Каваленя, А. Зьм. Археолёгічныя росшукі ў вярхоўях рэк Друці, Усяж-Бук, Лукомкі / А. Зьм. Каваленя // Працы сэкцыі археолёгіі. – Менск, 1932. – Т. 3. – С. 187–195.

8. Шаблюк, Н. В. Отчет о полевых исследованиях 1989 года / Н. В. Шаблюк // ААНД ІГ НАН Беларусі. – Спр. № 1140.

9. Этапы засялення бабровіцкага мікрарэгіёна ў фінальным палеаліце–бронзавым веку / В. С. Абухоўскі [і інш.] // Гіст.-археалаг. зб. – 2003. – № 18.

Резюме

А. М. Вашанов

Археологические исследования на территории Белыничского и Ивацевичского районов в 2011 г.

Отражены результаты археологических исследований 2011 г. в верховьях р. Друть (восточная Беларусь) и в районе озера Бобровичи (юго-западная Беларусь). В результате было обследовано 25 памятников, из которых 10 ранее не были известны. Были проведены археологические раскопки на стоянке Белыничи-1А. На памятнике было выявлено 1990 артефактов. Большинство находок относится к эпохам финального палеолита–мезолита (гренская культура), раннего мезолита (кундская культура, кудлаевская культура), позднего мезолита (янославицкая культура). Отдельные находки относятся к концу неолита.

Summary

A. Vashanov

The archaeological investigations on the territory of Belynichsky and Ivazevichsky districts in 2011

The paper presents the results of the archaeological researches in 2011 in the upper part of the Druć river (eastern Belarus) and Lake Babrovi district (south-western Belarus). As a result, 25 sites were surveyed, 10 of which were previously unknown. Excavations were carried out at the Bialynichy-1A site. At this site 1990 artifacts were found. The majority of the artifacts belong to the final periods of the Paleolithic–Mesolithic (Grensk culture), Early Mesolithic (Kunda culture, Kudlaevska culture), the Late Mesolithic (Yanislavitskaya culture) eras. Several finds are dated to the end of the Neolithic era.

УДК 903.4(476.6)«2011»

А. У. Зуева, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, старшы выкладчык, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск)*

Вынікі археалагічных раскопак паселішча Краснасельскі-8 у 2011 г.

У палявым сезоне 2011 г. на падставе Дазволу № 2290 па форме № 1, які быў выдадзены Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, былі праведзены археалагічныя раскопкі помніка Краснасельскі-8 Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці. Даследаванні адбываліся ў межах правядзення археалагічнай практыкі студэнтаў гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Помнік Краснасельскі-8 знаходзіцца ў правабярэжжы р. Рось праз 1,2 км на поўдзень ад пас. Краснасельскі і праз 1 км на паўночны захад ад в. Мачуліна (Краснасельскі п/с). Паселішча размяшчаецца на краі тэрасы, вышыня якой над узроўнем поплава дасягае 3 м.

Помнік быў выяўлены аўтаркай сумесна з Ш. Каліцкім у 2008 г. У тым жа годзе былі закладзены два шурфы агульнай плошчай 18 м^2. У атрыманых матэрыялах вылучаны комплексы фінальнага палеаліту, лысагорскага этапу нёманскай культуры, кола культуры шнуравой керамікі, жалезнага веку і сярэдневякоўя [2, с. 237–239].

У 2011 г. на помніку быў закладзены раскоп плошчай 45 м^2. Раскопкі вяліся натуральнымі і ўмоўнымі пластамі, выбарка культурнага слою ажыццяўлялася саўкамі.

У раскопе, які даследаваўся на глыбіню да 0,9 м, была прасочана наступная стратыграфія: 1) пласт дзёрну і глебавага покрыва магутнасцю 0,2–0,35 м; 2) слой наноснага светла-жоўтага пяску таўшчынёй да 0,25–0,30 м; 3) чорны гумусіраваны супесак магутнасцю 0,08–0,22 м; 4) пясок жоўта-рудага колеру, які на глыбіні каля 0,8 м ад узроўню выяўлення падсцілаўся шчыльным белым пяском.

Пачынаючы з пласта 4 фіксаваліся аб'екты. Некаторыя з іх мелі працяг да мацерыковага пяску і заглыбляліся ў яго, некаторыя ўдалося прасачыць толькі на ўзроўні мацерыка. Усяго ў раскопе было выяўлена 15 розначасовых аб'ектаў, пераважная большасць якіх – разнастайныя па памерах, глыбіні і прызначэнні ямы. Асаблівай увагі заслуговаюць два аб'екты.

Аб'ект 12. Падчас выбаркі пласта 3 у квадраце 5 была зафіксавана канцэнтрацыя крамянёвых артэфактаў. Пачынаючы з узроўню пласта 4, канцэнтрацыя разбіралася як аб'ект. Дыяметр найбольшага нагрувашчання артэфактаў дасягаў 0,55 м, глыбіня залягання крэменяў – 0,25 м ад узроўню фіксацыі. У запаўненні аб'екта было выяўлена 1549 крамянёвых артэфактаў (з іх 6 вырабаў з другаснай апрацоўкай) і 8 фрагментаў ляпнога посуду. Культурна і храналагічна вызначальнымі знаходкамі з'яўляюцца яніславіцкае вастрыё (мал. 1, *А: 7*) і кераміка (5 фрагментаў посуду кола культуры шнуравой керамікі і 3 фрагменты познанеалітычнай керамікі неакрэсленай культурнай прыналежнасці). У выніку праведзеных рэмантажных прац быў атрыманы шэраг складальнікаў, што дазволіла інтэрпрэтаваць аб'ект 12 як працоўнае месца майстра па першаснай апрацоўцы сыравіны (так званы тачок). Вызначэнне культурнай прыналежнасці аб'екта выклікае цяжкасці. У сумежных з аб'ектам 12 квадратах адзначалася канцэнтрацыя артэфактаў з другаснай апрацоўкай яніславіцкай культуры (мал. 1, *Б*), а таксама назіралася скапленне познанеалітычнай керамікі. Фрагменты «шнуравога» посуду размеркаваныя па ўсёй плошчы раскопу (мал. 2, *Б: 2*). Такім чынам, для вырашэння пастаўленага пытання даныя планіграфічнага аналізу павінны быць удакладнены вынікамі тэхналагічнага аналізу прадуктаў дэбітажу, атрыманых у запаўненні аб'екта.

Аб'ект 14. У паўднёва-ўсходняй частцы раскопу на ўзроўні пласта 3 была выяўлена аморфная пляма гумусіраванага шэра-рудага супеску, у якім заўважаліся адзінкавыя дробныя вугольчыкі. Фіксацыя і выбарка аб'екта пачаліся на ўзроўні мацерыковай паверхні. Аб'ект, які паўднёвай часткай уваходзіў у профіль, меў аморфныя абрысы. Яго памеры дасягалі 1,94 × 1,84–1,95 м, глыбіня ад ўзроўню фіксацыі вагалася ад 0,13 да 0,34 м. Запаўненне аб'екта складалася з гумусіраванага шэра-рудага супеску. У цэнтры даследаванай часткі знаходзілася нагрувашчанне камянёў. Усяго ў запаўненні аб'екта было выяўлена 13 крамянёвых артэфактаў, 9 фрагментаў «шнуравой» керамікі, 5 фрагментаў керамікі жалезнага веку. Мяркуючы па стратыграфіі і характары запаўнення, аб'ект 14, функцыянальнае прызначэнне якога засталося нявызначаным, адносіўся да перыяду засялення тэрыторыі помніка ў I–V ст. н. э.

Падчас раскопак былі атрыманы 4702 знаходкі: 3728 крамянёвых артэфактаў, 856 фрагментаў керамікі, 13 фрагментаў глінянай абмазкі, 4 фрагменты нявызначаных металічных вырабаў, 2 кавалкі шлаку, 88 фрагментаў кальцыніраваных костак, 1 створка ракавінкі.

Крамянёвыя артэфакты сустракаліся адразу пад дзёрнам і распаўсюджваліся да мацерыковага ўзроўню, аднак асноўная частка калекцыі была атрымана ў пластах 3 і 4. Колькасць знаходак на квадрат вагалася ад 1 да 164 адзінак, у сярэднім – 46 адзінак.



Мал. 1. Краснасельскі-8: *А* – крамянёвы інвентар: *1* – нуклеус ад пласцін; *2* – рэтушаваны скол падпраўкі плоскасці сколвання; *3, 6* – скрабкі; *4, 5* – трапецыі; *7, 8* – яніславіцкія вастрыі; *9, 10* – скрабачы; *11, 12* – пласціны са скошаным рэтушшу канцом; *13, 15* – разцы на зломе пласцін; 14 – мікраразец; *16, 17* – фрагменты пласцін з рэтушшу; *18, 19* – пласціны, зламаныя ў месцы выемкі; *Б* – паквадратная планіграфія крамянёвых вырабаў яніславіцкай культуры. 2011 г.

Для вырабу прылад працы выкарыстоўваўся балтыйскі крэйдавы крэмень так званай выкапнёвай разнавіднасці, а таксама мясцовы марэнны крэмень. 308 артэфактаў (8,4%) абпаленыя.

Агульная тэхніка-марфалагічная структура крамянёвага інвентару адлюстравана ў табліцы. Калекцыя, атрыманая на помніку, змешаная. Культурна-храналагічная інтэрпрэтацыя артэфактаў была ўскладнена недастатковай ступенню вывучанасці крамянёвага інвентару тых культур, якія існавалі на Панямонні ў неаліце–бронзавым веку. Таму на падставе тэхніка-марфалагічнага аналізу матэрыялаў у калекцыі крамянёвых артэфактаў быў вылучаны толькі адзін комплекс – яніславіцкай культуры. Да яго аднесены: аднапляцовачны нуклеус ад рэгулярных пласцін (мал. 1, *А*: *1*), тэхнічна вызначальныя сколы,

звязаныя з рознымі этапамі эксплуатацыі нуклеусаў гэтага тыпу, і вырабы на такіх сколах (мал. 1, *А*: *2*); яніславіцкія вастрыі (мал. 1, *А*: *7, 8*); трапецыі (мал. 1, *А*: *4, 5*); скрабкі на рэгулярных пласцінах (мал. 1, *А: 3, 6*); скрабачы (мал. 1, *А: 9, 10*); разцы на зломе пласцін (мал. 1, *А*: *13, 15*); рэгулярныя пласціны са скошаным рэтушшу канцом (мал. 1, *А: 11, 12*); мікраразцы (мал. 1, *А*: *14*); серыя рэгулярных пласцін і іх фрагментаў, неапрацаваных і з апрацоўкай (мал. 1, *А: 16–19*).

Нуклеус і артэфакты з другаснай апрацоўкай, аднесеныя да яніславіцкай культуры, сканцэнтраваны ва ўсходняй і паўднёвай частках даследаванай плошчы (мал. 1: *Б*). Мезалітычны этап засялення тэрыторыі помніка Краснасельскі-8 датуецца шырокім адрэзкам часу – ад канца барэальнага перыяду (часу з'яўлення яніславіцкай культуры) да пачатку атлантычнага перыяду (часу распаўсюджвання трапецый) (параўн.: [7, s. 297–298; 1, с. 137–138]).

Агульная тэхніка-марфалагічная структура крамянёвага інвентару. Краснасельскі-8. 2011 г.

Марфалагічная група*	Катэгорыя	Колькасць	Усяго ў групе
I	Крамянёвыя канкрэцыі і іх фрагменты	17	628
	Крамянёвыя абломкі	611	
II	Нуклеусы ад пласцін	2	21
	Нуклеусы ад адшчэпаў	6	
	Фрагменты нуклеусаў	5	
	Крамянёвыя абломкі з негатывамі адзінкавых сколаў	8	
III	Пласціны і іх фрагменты	315	2977
	Адшчэпы і іх фрагменты	1154	
	Лускі крамянёвыя	716	
	Неазначальныя фрагменты сколаў	792	
IV	Рабрыстыя пласціны	9	25
	Сколы падпраўкі і пераафармлення ўдарнай пляцоўкі	4	
	Сколы пераафармлення паверхні сколвання	3	
	Скол з захлыстам	1	
	Бугарковыя лускі (рус. – *скол изъянца*, пол. – *łuska sęczkowa,* англ. – *secondary flake, parasitical flake, eraillure flake*)	8	
V	Скрабкі	10	77
	Скрабачы	3	
	Разцы	2	
	Праколкі	2	
	Мікраліты	5	
	Біфацыяльныя вырабы і іх нарыхтоўкі	4	
	Выемчатая прылада	2	
	Пласціны са скошаным рэтушшу канцом	4	
	Рэтушаваныя пласціны	18	
	Рэтушаваныя адшчэпы	16	
	Рэтушаваная бугарковая луска	1	
	Рэтушаваны скол падпраўкі плоскасці сколвання	1	
	Крамянёвыя абломкі з рэтушшу	3	
	Фрагмент нявызначанага вырабу	1	
	Мікраразцы	2	
	Пласціны, зламаныя ў месцы выемкі	3	
	Усяго:	3728	3728

* I – сыравіна; II – нуклеусы і нуклеусападобныя абломкі; III – прадукты дэбітажу; IV – тэхнічна вызначальныя формы; V – артэфакты з другаснай апрацоўкай і адходы вытворчасці.

Кераміка. З 856 фрагментаў керамікі, атрыманых на помніку, каля 630 з'яўляліся прыдатнымі для культурна-храналагічнай ідэнтыфікацыі.

Кераміка нёманскай культуры прадстаўлена 12 арнаментаванымі і 8 неарнаментаванымі фрагментамі сценак, якія паходзілі ад адной пасудзіны (мал. 2, *А*: *1*). Кераміка залягала ў пластах 4 і 5, пры гэтым асноўная колькасць фрагментаў прыпадала на пласт 4. Фрагменты посуду былі сканцэнтраваны ў паўночна-заходняй частцы раскопу (мал. 2, *Б*: *1*). Кераміка гладкасценная; таўшчыня сценак дасягала 8–9 мм. У глінянае цеста былі дададзены розназярністая жарства і невялікая колькасць раслінных дамешак. Арнамент, нанесены ў «адступаючай» манеры зубчастым штампам, утварае гарызантальныя паясы вертыкальных адбіткаў. Кераміка адпавядае прык-



Мал. 2. Краснасельскі-8: *А* – ляпны посуд: *1* – кераміка лысагорскага этапу нёманскай культуры; *2* – кераміка тыпу Бершты-Русакова кола культуры шнуравой керамікі; *3, 4* – кераміка жалезнага веку, група 2; *Б* – паквадратная планіграфія фрагментаў посуду: *1* – кераміка лысагорскага этапу нёманскай культуры; *2* – кераміка тыпу Бершты-Русакова кола культуры шнуравой керамікі; *3* – кераміка жалезнага веку, група 1; *4* – кераміка жалезнага веку, група 2. 2011 г.

метам посуду лысагорскага этапу нёманскай культуры, які датуецца сярэдзінай IV – першай паловай III тысячагоддзя да н. э. [6, с. 107–109].

Керамiка кола культуры шнуравой керамікі прадстаўлена 8 фрагментамі арнаментаваных венцаў, 7 фрагментамі арнаментаваных сценак (14 з якіх паходзяць ад адной пасудзіны; мал. 2, *А*: *2*) і 401 фрагментам неарнаментаваных сценак. Керамiка сустракалася на ўсіх узроўнях, аднак найбольшая колькасць абломкаў посуду была выяўлена ў пластах 3 і 4. Керамiка размеркавана па ўсёй плошчы раскопу (мал. 2, *Б*: *2*). Усе фрагменты паходзяць ад пасудзін, у цеста якіх была дададзена вялікая колькасць розназярністай жарствы. Таўшчыня сценак вагалася ў межах 4–6 мм. Пераважная большасць фрагментаў керамікі захоўвае сляды рэльефнай гарызантальнай штрыхоўкі абедзьвюх паверхняў. Посуд быў арнаментаваны гарызантальнымі шнуравымі адбіткамі. Керамiка адпавядае прыкметам посуду тыпу Бершты-Русакова і датуецца другой чвэрцю III – першай чвэрцю II тысячагоддзя да н. э. [4, с. 147–150].

Да позняга бронзавага веку аднесены 2 фрагменты неарнаментаваных сценак. Керамiка гладкасценная, таўшчыня сценак дасягала 7–8 мм. У цеста была дададзена вялікая колькасць буйназярністай жарствы.

Керамiка жалезнага веку, у залежнасці ад тэхналагічных асаблівасцей, падзелена на дзве групы. Керамiка, аднесеная да першай групы, сустракалася ў пластах 1–4, найбольшая колькасць фрагментаў была выяўлена ў пласце 3. Асноўная канцэнтрацыя керамікі заўважалася ў цэнтральнай частцы раскопу (мал. 2, *Б*: *3*). Керамiка, аднесеная да другой групы, сустракалася ў пластах 3–5, пераважная большасць была выяўлена ў пласце 3. Яе канцэнтрацыя назіралася ў паўднёва-заходняй частцы раскопу (мал. 2, *Б*: *4*). Да першай групы аднесены 2 дробныя фрагменты венцаў, фрагмент донца, 88 фрагментаў неарнаментаваных сценак гладкасценнага посуду. Таўшчыня сценак вагалася ў межах 7–15 мм. У якасці дамешкі выкарыстоўвалася розназярністая жарства. Да другой групы аднесены 8 фрагментаў неарнаментаваных венцаў (4 фрагменты паходзяць ад адной пасудзіны; мал. 2, *А*: 3, *4*), 2 фрагменты донцаў, фрагмент арнаментаванай сценкі, 28 фрагментаў неарнаментаваных сценак посуду з бугрыстымі паверхнямі, на якіх прасочваюцца гарызантальна ці дыяганальна накіраваныя сляды штрыхоўкі. Таўшчыня сценак вагалася ў межах 5–10 мм. У якасці дамешкі выкарыстоўвалася розназярністая жарства. Была рэканструявана верхняя частка гаршка, які меў прамыя высокія і кароткія плаўна адагнутыя вонкі шыйкі (мал. 2, *А*: *4*). Акрамя таго, у раскопе выяўлены фрагмент аблітой керамікі і 5 абпаленых фрагментаў посуду. Уся керамiка, па вызначэнні А. М. Мядзведзева і З. А. Харытановіч, датавана I–V ст. н. э.

Керамiка ранняга сярэдневякоўя прадстаўлена 3 фрагментамі неарнаментаваных венцаў, 4 фрагментамі арнаментаваных і 5 фрагментамі неарнаментаваных сценак. Керамiка сустракалася ў пластах 2–4, яе канцэнтрацыя назіралася ў паўднёвай частцы даследаванай плошчы. Уся керамiка ляпная, падпраўленая на ганчарным крузе. Пасудзіны мелі невысокія, адагнутыя вонкі шыйкі. Для аздаблення керамікі выкарыстоўваўся пракрэслены хвалісты арнамент. Керамiка датавана IX–X ст. н. э.

Такім чынам, у выніку археалагічных раскопак 2011 г. на помніку Краснасельскі-8 вылучаны наступныя комплексы: яніславіцкая культура (канец барэальнага перыяду–пачатак атлантычнага перыяду); лысагорскі этап нёманскай культуры (сярэдзіна IV – першая палова III тысячагоддзя да н. э.); тып Бершты-Русакова кола культуры шнуравой керамікі (другая чвэрць III–першая чвэрць II тысячагоддзя да н. э.); позні бронзавы век; жалезны век (I–V ст. н. э.); ранняе сярэдневякоўе (IX–X ст. н. э.).

Даследаванні дазволілі атрымаць першы для Краснасельскага мікрарэгіёна выразны комплекс яніславіцкай культуры, якая дагэтуль была прадстаўлена месцазнаходжаннямі адзінкавых культурнавызначальных артэфактаў – Краснасельскі «Цэментны завод»-1, 2 [8, s. 38], Подрась-3 [3, с. 192, мал. 2: *5*].

Значную ўвагу выклікае такі аб'ект, як працоўнае месца майстра па першаснай апрацоўцы сыравіны. Яго наяўнасць дае падставы аднесці паселішча Краснасельскі-8 да тыпу стаянак-майстэрань. Да гэтага ж тыпу помнікаў адносяцца ўсе буйныя паселішчы, якія былі размешчаны ў правабярэжжы р. Рось – Краснасельскі-5, -6, -7 [5, с. 56–69]. Такім чынам, далейшае вывучэнне помніка Краснасельскі-8 дазволіць удакладніць наяўныя ўяўленні аб характары крэмнеапрацоўчай дзейнасці насельніцтва Краснасельскага мікрэрэгіёна ў каменным–бронзавым вяках.

Літаратура

1. Залізняк, Л. Л. Мезоліт заходу Східної Європи / Л. Л. Залізняк // Кам'яна доба України. – 2009. – Вип. 12. – 278 с.

2. Зуева, А. Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Ваўкавыскага раёна ў 2008 г. / А. Зуева, Ш. Каліцкі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2011. – Вып. 20 : Археалагічныя даследаванні на Беларусі ў 2008 г. – С. 236–242.

3. Зуева, А. Вынікі археалагічных даследаванняў 2009 года ў Краснасельскім мікрарэгіёне / А. У. Зуева, Ш. Каліцкі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2012. – Вып. 23 : Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі ў 2009–2010 гадах. – С. 190–193.

4. Лакіза, В. Л. Старажытнасці позняга неаліту і ранняга перыяду бронзавага веку Беларускага Панямоння / В. Л. Лакіза. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 343 с.

5. Чарняўскі, М. М. Старажытныя шахцёры на Росі / М. М. Чарняўскі, В. Я. Кудрашоў, В. Л. Ліпніцкая; пад. рэд. У. Ф. Ісаенкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1996. – 144 с.

6. Чарняўскі, М. Неаліт Беларусі: праблемы перыядызацыі і храналогіі / М. Чарняўскі // Wspólnota dziedzictwa kulturowego ziem Białorusi i Polski. red. tomu A. Kośko. – Warszawa : Ośrodek ochrony Dziedzictwa Archeologicznego, 2004. – S. 99–118.

7. Galiński, T. Społeczeństwa mezolityczne. Osadnictwo, gospodarka, kultura ludów łowieckich w VIII–IV tys. p. n. e. na terenie Europy / T. Galiński. – Szczecin : Museum Narodowe w Szczecinie, 2002. – 406 s.

8. Obuchowski, W. Materiały paleolityczne i mezolityczne z Zachodniej Białorusi / W. Obuchowski. – Warszawa : IA UW, 2009. – 296 s.

Резюме

А. В. Зуева

Результаты археологических раскопок поселения Красносельский-8 в 2011 г.

Отражены основные результаты археологических раскопок многокультурного поселения Красносельский-8 (Среднее Пороссье). На памятике было зафиксировано 15 объектов и выявлено свыше 4500 артефактов. Полученный материал отражает шесть этапов заселения территории памятника, которые охватывают период от позднего мезолита до раннего средневековья.

Summary

A. Zuyeva

The Results of Archaeological Excavation of the Site Krasnaselsky-8 in 2011

The article deals with the results of archaeological investigation of the multicultural site Krasnaselsky-8 (Ros river basin). The excavation led to discovering 15 objects and finding more than 4500 artefacts. The settlement was attributed to 6 stages of habitation from the Late Mesolithic till the Early Mediaval Age.

УДК 902.21(476)«2009»

Е. Г. Калечиц, *Институт истории НАН Беларуси, главный научный сотрудник отдела археологии первобытного общества, доктор исторических наук, профессор (г. Минск)*

Археологические разведки на территории Берестовицкого и Пружанского районов в 2009 г.

Исследования на территории Берестовицкого района. Весенняя практика студентов III и IV курса исторического факультета Белгосуниверситета проводилась в 2009 г. на территории Берестовицкого района Гродненской области под руководством автора. В исследованиях на территории Берестовицкого района приняли участие научный сотрудник Института истории НАН Беларуси В. Г. Белевец и студентка V курса исторического факультета БГУ А. С. Арабей. Поскольку рамки нашего исследования были весьма ограничены во времени, а территория довольно большая и слабо изученная в плане археологических наблюдений, мы осмотрели несколько пунктов, которые интересовали сотрудников Берестовицкого музея для пополнения его фондов коллекциями.

Попытки найти остатки городища, о котором упоминал еще Ф. В. Покровский в XIX в., предпринимала К. Т. Ковальская в 1955 г., а затем Я. Г. Зверуго. В его отчете № 522 по результатам обследования в 1973–1975 гг. четырех районов Гродненской области, в том числе Берестовицкого, отмечено, что городище (местное название Альщина), которого по данным К. Т. Ковальской не существует, на самом деле сохранилось. Я. Г. Зверуго приводит точное описание его конфигурации и размеров [1, с. 113–114]. Это позволило нам довольно быстро найти остатки этого памятника. Едва приметные в траве четырехугольные выступы частично уцелели в двух случаях. Сохранились оплывшие контуры бывших оборонительных сооружений типа вала и рва, которыми была обнесена площадка четырехугольной формы. На площадке есть несколько развеянных пятен, места современных огнищ, где были найдены единичные кусочки посуды и несколько кремневых артефактов. Повсюду множество ям, которые оставили после себя «черные копатели». Множество легенд о невероятных находках привлекают сюда вновь и вновь новых грабителей.

Усилия следующих двух дней были направлены на исследование огромного поля, которое начинается приблизительно в 0,2 км на юго-восток от городища сразу за «зверинцем» и тянется на продолжении нескольких километров в сторону д. Жукевичи. Тут, по сведениям местных жителей, находят необычные вещи (рис. 1). Поле целиком вспахано. Оно имеет небольшой наклон на юг. На наиболее углубленной части сохранились остатки бывшего огромного водоема, который в жаркую пору года, кажется, полностью пересыхает. Чем ближе к воде, тем меньше, а то и вообще нет находок. В целом это осушенный со временем приледниковый водоем. На его более высоком и сухом северном склоне были стоянки людей. Об этом свидетельствуют находки из камня, кремня, металла, глины, которые были собраны на большой площади.

Некоторая концентрация артефактов была замечена около дороги на д. Жукевичи, около бывшего хутора и кладбища. Их можно рассматривать как места существования трех селищ феодальной поры. Многие находки были разграблены во время неоднократного распахивания территории. Абсолютное большинство керамики – осколки гончарной посуды. Индивидуальные находки собраны на поверхности пашни или происходят из шурфа, заложенного около дороги. При этом единичные находки были собраны в границах нижнего пласта (рис. 2). Ниже были найдены два пятна, которые отличались более темным цветом, но не содержали артефактов.

Попытки отыскать культурный пласт в трех шурфах и других местах концентрации артефактов остались безуспешными. Другим местом внимательного осмотра был тот кусок поля, где, по сведениям П. Кеньки в 2008 г. были найдены две стеклянные бусины римского времени. Это место размещается в поле на расстоянии примерно 450 м на северо-восток–восток от «зверинца», напротив девятого по счету от него столба линии электропередач.

Последний день раскопок был посвящен посещению других мест района, из которых стало известно о некоторых археологических находках: валуне с антропоморфными изображениями, топорах, которые находятся в школе д. Эйсмонты и музее технического училища д. Малая Берестовица.

Исследования у д. Ровбицк (центр с/с) Пружанского района проводились силами студентов I курса истфака Белгосуниверситета под руководством автора с участием В. Г. Белевца.

Окрестности д. Ровбицк были обследованы в 2007 г. В. Белевцом, В. Лакизой и Е. Калечиц при составлении каталога памятников археологии, выявленных на территории Беловежской пущи. Историческая справка о находках в этих местах древностей свидетельствует о том, что в 1970 г. северо-западнее д. Ровбицк была найдена монета Римской империи – денарий императора Трояна. В 1972 г., в ходе разведки, проведенной Л. Д. Поболем в месте находки монеты, были выявлены следы селища железного



Рис. 1. Археологические находки: *1*, *3* – из цветного металла; *2* – из глины. Берестовицкий район

века [2, с. 115]. В 1997 г. данные об этом памятнике были подтверждены А. В. Квятковской, собравшей дополнительные сведения местных жителей о находках, сделанных в указанном месте. Среди прочих сообщается о находках в урочище каменных топоров и стеклянных бус. Сказанное может свидетельствовать о многоразовом заселении данной территории – его использовании в эпоху неолита и бронзового века, железного века и, возможно, в раннем средневековье.

Разведки 2007 г. показали, что огромный песчаный останец (по данным местных жителей ранее он назывался «Каплюш») исчез с лица земли благодаря длительной эксплуатации участка как источника песка. На месте былых песчаных гор (Горы – так еще называют это урочище) осталась огромная вогнутая песчаная поверхность, которую засадили лесом. Тогда нами были выделены три скопления археологических материалов, свидетельствовавших о наличии здесь в былые времена памятников каменного, бронзового и железного веков. Они расположены на ближнем и дальнем от деревни (по мере продвижения на запад) участках и получили названия Ровбицк-1, -2. Пункт Ровбицк-3 был локализован между ними, на одной из полян среди леса.

Поверхностные сборы 2009 г. порадовали находками обгорелых кремней, костей, отщепов, пластин, единичных орудий труда, мелких фрагментов стенок гончарных и лепных сосудов. Дальнейшие усилия были направлены на поиск материалов железного века, которые изредка встречались на раздернованной поверхности песков в виде фрагментов посуды.

После осмотра участка на западной окраине останца (пункта Ровбицк-2) на одной из полянок было решено заложить шурф. Первый шурф площадью 16 м^2 был ориентирован по сторонам света и разобран квадратами со стороной 2 м. Сняли едва сформировавшийся дерн, представляющий собой иглисто-моховую подстилку, мощность которой не превышала 0,05 м. В ней и было найдено несколько фрагментов керамики, в том числе железного века. Под этой иглистой массой начинался песок мелкозернистый однородный, желтого цвета без включений. В западной половине шурфа на квадратах 1 и 3 была хорошо заметна широкая полоса – след борозды от лесопосадки. В содержимом верхнего слоя были встречены редкие отщепы, пластины, осколки кремня без обработки и со следами обработки, кремни, побывавшие в огне, 2 двухплощадочных нуклеуса, скол оживления и мелкие фрагменты стенок гончарной посуды. Этот пятисантиметровый слой и последующие 10 см песка мы назвали пластом 1, а ниже, в пределах последующих 10 см (пласт 2) находок не было.

Впритык к этому шурфу с юга был прирезан шурф 2, такой же площади и аналогичной стратиграфии. Здесь находок оказалось еще меньше. Квадраты 2 и 4 оказались без находок, а на квадратах 1 и 3 они были представлены 7 кремневыми артефактами и 3 фрагментами стенок гончарных сосудов. На квадрате 2 был найден камень диаметром до 0,3 м, очевидно, побывавший в огне. При прикосновении он распался на осколки. Никаких признаков кострища, связанных с ним, не найдено. Очевидно, камень был сдвинут со своего места и попал на площадь нашего шурфа в результате работы тяжелой техники.

Шурф 3 был заложен примерно в 100 м к востоку от предыдущих, на поляне среди леса. Тут же были собраны мелкие неопределимые кальцинированные косточки. По рассказам местных жителей раньше их было так много, что во время непогоды, ветер поднимал над урочищем настоящее белое облако пыли. Первоначальную площадь шурфа 3 (16 м^2) позже пришлось расширить, прирезав к квадрату 4 с востока еще 1 м^2 – квадрат 5. Это было вызвано находкой в квадрате 4 небольшого гумусированного пятна – ямы. В ее заполнении был найден маленький фрагмент венчика сосуда железного века и мелкие кусочки шлака. На остальной площади шурфа были найдены обгорелые кремни и косточки, отходы кремниевого производства, единичные орудия труда (скобель, осколки кремня с участками ретуши), мелкие фрагменты стенок гончарных и лепных сосудов, кусочки шлака. В шурфе 3 было вскрыто 2 слоя по 10 см песка желтого разнозернистого. Кропотливые поиски на поверхности и единичные находки в шурфах позволили В. Г. Белевцу сделать вывод о несомненном заселении урочища в эпоху железа. К большому сожалению, разрушение урочища карьерами привело к почти полной утрате информации.

Исследования у д. Боровики (Рудницкий с/с) Пружанского района. В издании «Археологическая карта Белоруссии. Вып. 1. Памятники каменного века» В. Ф. Исаенко упоминает о наличии памятника каменного века у д. Боровики Рудницкого сельсовета Пружанского района [3]. Речь идет о большом песчаном останце, на котором В. Ф. Исаенко во второй половине XX в. собрал с поверхности разновременные материалы.

На мелиорированной пойме правобережья Ясельды, примерно в 1 км к востоку от северной оконечности деревни хорошо виден повышенный участок, занятый густыми лесопосадками. Территория слабо задернована, но чрезвычайно густо залесена и абсолютно лишена находок. Артефакты в виде преимущественно кремниевых изделий встречаются лишь на опушках леса, тропинках или традиционных местах проезда гужевого транспорта. Наибольшие сборы



Рис. 2. Археологические находки: *1–4* – лепная посуда (фрагменты); *5*, *6* – каменные изделия. Берестовицкий район

получены при тщательном осмотре поля, распаханного к востоку от лесочка и засеянного кормовыми травами. Здесь, на периферийной части поселения, и удалось собрать коллекцию, состоящую из кремниевых изделий и мелких фрагментов лепной и гончарной посуды. Керамика представлена мелкими фрагментами очень поздней тонкостенной гончарной посуды и единичными фрагментами лепных сосудов железного века (определения В. Г. Белевца).

Кремниевый материал разновременный и может относиться ко всем периодам каменного века (преобладают изделия неолитического облика). При этом есть несомненные признаки мезолита (трапеция и микропластины). Единственным наиболее ярким индикатором, который не оставляет сомнения в культурном аспекте, является находка нуклеуса, типичного для свидерской культуры. Среди находок: пластины без ретуши и с ретушью, пластины ребристые и подребристые, единичные пластинчатые отщепы. Количественно преобладающие отщепы без ретуши, осколки кремня со следами обработки, чешуйки. Собраны сколы оживления нуклеусов, одно-

площадочные, двухплощадочные и аморфные нуклеусы, нуклевидные кремни, скребки, резцы, скобели, обломки рубящих орудий, мелкие обломки стенок и венчиков гончарных сосудов, стенок лепных сосудов, кусочки шлака. Среди находок есть орудия неясного назначения, индивидуальные изделия, как, например, массивное орудие со следами употребления и единичными сколами. Многие кремни побывали в огне.

С целью выявления культурного слоя на одной из маленьких полянок среди густого ельника был заложен шурф размерами 4 × 4 м^2 (общая площадь 16 м^2), который дал несколько находок. Это скобель на пластине, скребок на ретушированном по периметру отщепе с меловой коркой на спинке, одноплощадочный нуклеус от пластин, несколько пластин, в том числе с ретушью основания и заострением. Был вскрыт один слой мощностью 20 см, который содержал указанные находки лишь в верхней части. Они соответствовали тому же уровню, на котором собирали артефакты на всей поверхности урочища, а ниже их не было найдено. Дерна практически не было, как не было и никаких признаков объектов. Никаких изменений в окраске слоя также не замечено. Однородный чистый желтый мелкозернистый песок глубже был полностью лишен находок. Можно констатировать, что культурный слой некогда большого поселения полностью разрушен, а дальнейшие сборы с поверхности можно производить с интервалом в несколько лет, когда сформируются новые раздувы.

Разведки в окрестностях д. Белый Лесок (Никарское лесничество) были практически безрезультатными. Возможно, это связано с работами в июле, еще до начала жатвы. Редко где можно увидеть такое изобилие кремниевого сырья. Огромный бывший водоем (теперь – мелиорированное болото Никар) – одно из самых больших по площади. При этом озеро было мелководным. Такое стечение обстоятельств весьма привлекало для обустройства поселений человека первобытной эпохи. Однако никаких следов пребывания людей не найдено. Все склоны к Никарскому болоту засеяны кормовыми злаками (подкормка для обитателей Пущи), сильно задернованы, залесены, что сильно осложнило поиски древних стоянок. однако в любой проталине можно увидеть множество кремниевого сырья, что ставит перед нами задачу продолжения поисков в более подходящее для раскопок время года.

Литература

1. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць. – Минск : БелСЭ, 1986. – С. 113–114.

2. Поболь, Л. Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век / Л. Д. Поболь. – Минск : Наука и техника, 1983.

3. Исаенко, В. Ф. Археологическая карта Белоруссии. – Вып. 1 : Памятники каменного века / В. Ф. Исаенко. – Минск : Полымя, 1968.

Рэзюмэ

А. Г. Калечыц

Археалагічныя разведкі на тэрыторыі Бераставіцкага і Пружанскага раёнаў у 2009 г.

Артыкул прысвечаны работам на тэрыторыі Бераставіцкага раёна, які мала даследаваны ў археалагічным плане. Былі агледжаны некалькі пунктаў, якія цікавілі супрацоўнікаў Бераставіцкага музея для папаўнення фондаў калекцыямі. Былі знойдзены рэшткі гарадзішча Альшчына, канцэнтрацыя артэфактаў была заўважана каля дарогі на в. Жукевічы. Каля весак Роўбіцк і Баровікі былі праведзены паверхневыя зборы.

Summary

E. Kalechits

The archaeological investigations on the territory of Berestovitsky and Pruzhany districts in 2009

Article dedicated to the works in Berestovitsky district. He is a little studied in archaeological terms. Was inspected several items that interested employees Berestovitsky museum collections for replenishment. Were found remains of the city Alschina. Concentration of artifacts was spotted near the road to the village Zhukevich. Near villages and Boletus Rovbitsk held surface charges.

УДК 902.21(476.7)«2011»

Е. Г. Калечиц, *Институт истории НАН Беларуси, главный научный сотрудник отдела археологии первобытного общества, доктор исторических наук, профессор (г. Минск)*

Археологические разведки в междуречье Ясельды и Пины в 2011 г.

Несмотря на многолетние работы нескольких поколений археологов, в процессе ежегодных разведок удается находить все новые памятники археологии. Почти двадцатилетние поиски и сборы артефактов на территории Мотольского микрорегиона и близлежащих территорий позволили выявить ряд новых поселений.

Целью работы 2011 г. было обследование таких мест на территории Ивановского, Пинского, Ивацевичского и Березовского районов. Работы проводились на основании Разрешения № 2237 от 27.04.2011 г. Моими спутниками в разведках по Полесью были аспирант А. Вашанов (Пинский, Ивацевичский район) и выпускница V курса истфака Брестского университета имени А. С. Пушкина, жительница д. Мотоль Е. Романович. Сотрудничество было взаимовыгодным, так как А. Вашанов попутно искал материалы для диссертации, а Е. Романович знакомилась с методикой проведения полевых работ.

Разведки на территории Ивановского района. Обследования памятников Мотольского микрорегиона до 2011 г. были ограничены окрестностями д. Мотоль, берегами водохранилища Джидинье, р. Ясельда в районе д. Тышковичи и междуречья Ясельды и Пины к югу от Днепро-Бугского канала.

При этом отдельные участки Загородья никогда мной не посещались. В 2011 г. я решила посетить именно эту территорию. В процессе разведок мы осмотрели следующие участки.

В первую очередь мы посетили стоянку Мотоль-13 (урочище Качатник), на территории которой ежегодно проводились обширные поверхностные сборы и раскопки. Материалы, полученные на памятнике, дают представление о многократном заселении урочища во все периоды каменного и бронзового веков. Посещение урочища в 2011 г. показало, что никакого антропогенного воздействия за прошедший год памятник не претерпел и угрозы разрушения нет.

К северу от д. Мотоль, справа от асфальтной дороги на Джидинье, примерно в 0,3 км от насосной станции, я неоднократно подбирала артефакты, привязывая их памятнику Мотоль-7, как ранее назвал его В. Ф. Исаенко. Мы увидели, что в данный момент здесь начато строительство обводного канала. Это вызвало опасения за судьбу памятника и мы тщательнейшим образом осмотрели русло канала. В разрезе стенки канала хорошо видна стратиграфия: типичные пойменные отложения перемежаются с торфянистыми прослойками. Артефакты не найдены. Возможно, здесь было скопление памятников, которые в годы мелиорации были уничтожены и растянуты по полю. До отъезда из деревни Мотоль стройка не закончилась, а лишь разворачивалась.

Все работы предыдущих лет велись справа от дороги к Джидинью, поэтому мы решили внимательно осмотреть окрестности правобережной поймы р. Ясельда слева от дороги. Был продолжен маршрут на северо-запад по восточной окраине былой д. Панцевичи, которая ныне является частью д. Мотоль. Это заболоченные участки, которые перемежаются песчаными гривами, ежегодно затопливаемые водой и потому безлюдные в древности. Лишь достигнув западной окраины Панцевич и повернув в сторону дороги Хомск–Мотоль мы вышли к урочищу с названием Каменная Гора. Само название предполагало здесь наличие большого скопления валунов, в том числе, и кремня. Поскольку вся гора была густо засеяна, удалось поднять лишь несколько отщепов, которые позволяют предположить наличие памятника, обследование которого стоит продолжить ранней весной или поздней осенью.

Далее мы вышли на пойму левого берега р. Ясельда для сбора находок в ранее открытых урочищах (Мотоль-23–Мотоль-28), а также для того, чтобы проверить состояние этих памятников. Разведки показали, что стоянка в урочище Бутьманов хутор обнаруженная ранее, которая была выявлена на песчаном всхолмлении к северо-востоку от д. Мотоль справа от дороги на Тышковичи приблизительно в километре от моста, ныне полностью заросла. На всхолмлении расположено старое кладбище. Возможно, погребений было больше, сейчас их сохранилось 2-3. Если раньше на раздувах находились десятки артефактов, теперь не найдено ничего. Старые груши и дикие яблони свидетельствуют о наличии здесь хутора. По свидетельству местных жителей, хуторяне были расстреляны в годы войны.

Посещения урочища Гора (Мотоль-1), памятников Мотоль-11, Мотоль-5 и даже Мотоль-13 новых материалов не принесли. Из-за частых ливней все заросло травой, из-за которой артефакты обнаружить не удалось.

Поход в сторону деревень Молодово–Бусса. Последняя стала широко известна всей стране из-за трагедии, разыгравшейся в 1950-е годы в сельском клубе. Практически все взрослое население и часть детей сгорели во время пожара, так как из-за давки

люди не успели покинуть помещение. На месте пожарища в центре деревни стоит обелиск. В самой деревне находок костей крупных животных, топоров, кремневых изделий не найдено.

В 0,3 км от въезда в деревню Бусса, за мостом через малую речку на ее левом берегу, есть всхолмление, которое знают все местные жители. Оно называется «Торжище». Такое название урочище получило из-за того, что в древности здесь проводились ежегодные торги, на них съезжались купцы из всех уголков. Там, безусловно, можно найти артефакты – свидетельства тех далеких дней и событий. Деревня расположена в бассейне р. Ясельда, вокруг ранее были болота, а участок, где проводились торги, ранее не заселялся. В самой деревне Бусса и ее окрестностях, в связи с ее удаленностью от р. Ясельда, памятники не выявлены.

Из деревни Буссы мы переместились в Молодово, деревню с богатой и очень интересной историей. Это большой населенный пункт, в нем есть средняя школа, две церкви, сельский совет. Здесь также находится памятник, охраняемый государством – остатки ротонды Скирмунтов. Сохранилось фото внутреннего интерьера. По свидетельству местных жителей фрагменты фундамента дворца и служебных помещений Скирмунтов существовали еще недавно, но потом их растащили на свои нужды местные крестьяне. На кладбище находится расколотая могильная плита с надписью «Скирмунт». В школьном музее д. Молодово начисто отсутствует память об интереснейших событиях минувших эпох. В экспозиции музея отражены в основном события военных лет и представлены единичные артефакты, которые попали в музей случайно, путем обмена этих предметов на топоры. В этих местах подобные обмены «черные» археологи проводили неоднократно. Свидетельств о Скирмунтах и их деятельности в музее не содержится.

Практически безрезультатными были наши походы вглубь района. В Вороцевичах введен в эксплуатацию музей Наполеона Орды и строится новое здание бывшего дома, которое восстанавливается на руинах в строгом соответствии с имеющимися материалами. Его фундамент изучил В. Соболь. При этом артефакты более раннего времени не выявлены.

Поездку на юг района к оз. Песчаное (д. Одрижин) пришлось отменить, так как эта территория вошла в погранзону и на ее посещение необходим специальный пропуск.

Посещение д. Вулька оказалось безрезультатным. Населенный пункт обезлюдел. Собрать артефакты, как это было ранее, не удалось. Вместо раздува мы застали абсолютно заросший травой бугор, на котором построена подстанция. Та же судьба постигла урочища Глинно-1, -2, Озерище-1, -2.

Разведки на территории Ивацевичского района. Поездка в Ивацевичский район была связана с необходимостью осмотра ранее выявленных памятников археологии и их сохранности, а также для ознакомления прибывшего в д. Бобровичи аспиранта А. Н. Вашанова с памятниками данного региона. На протяжении нескольких дней мы посетили эти места. Был обнаружен карьер в урочище Селище, где рядом со старинным кладбищем начали брать песок. Сообщение в сельский исполком и землеустроителю позволили прекратить дальнейшее разрушение памятника. В урочище Вядо удалось собрать ряд артефактов.

На территории Пинского и Березовского районов была проведена паспортизация памятников археологии, внесенных в Государственный реестр охраняемых объектов. Помимо паспортов и учетных карточек были определены границы охранных зон.

Рэзюмэ

А. Р. Калечыц

Археалагічныя разведкі ў міжрэччы Ясельды і Піны ў 2011 г.

Артыкул распавядае аб археалагічных даследаваннях, праведзеных у міжрэччы Ясельды і Піны з мэтай высвятлення стану раней вядомых і пошуку новых помнікаў каменнага веку. Дадаткова да гэтага былі складзены пашпарты, уліковыя карткі і ахоўныя зоны 28 помнікаў.

Summary

E. Kalechits

Archeological exploration in the area between Yaselda and Pina in 2011

The article is devoted to the results of the archaeological research in the area between Yaselda and Pina. The purpose of research was the study of the state of the known monuments of the Stone Age and the search for the new ones. For the 28 sites are written passports, registration cards and projects of protected areas.

УДК 903.4(476.6)

[1] Папярэдняе датаванне ганчарнай керамікі праведзена малодшым навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі Г. Р. Цімафеенка.

гутнасцю ад 0,3–0,6 м да 0,8 м. Раскоп меў складаную канфігурацыю, якая, на нашу думку, дазваляла ахапіць даследаваннямі найбольшую тэрыторыю помніка і пры выяўленні цікавых аб'ектаў і вялікай колькасці артэфактаў пашырыць плошчу раскопак у любым напрамку: па лініі поўнач–поўдзень раскоп быў выцягнуты на 34 м, а па лініі захад–усход – на 26 м (мал. 4, *Б*).

Усяго знойдзены 474 рухомых артэфактаў (3,39 знаходкі на 1 м^2). Пэўнай залежнасці ў размеркаванні знаходак па плошчы раскопу не заўважана. Усе яны выяўлены ў межах 1-га пласта (геалагічны пласт,



Мал. 4. Крамянёвыя вырабы з помнікаў Дарошавічы-1-ГЭС (*А: 1–9*) і Дарошавічы-3-ГЭС (*В: 10–17*); план раскопу на помніку Дарошавічы-1-ГЭС (*Б*). 2010 г.

які прыпадаў на ворны пласт і дасягаў глыбіні ад 0,3 да 0,7 м) і ў запаўненні аб'екта (12 экз.)

Асноўная колькасць артэфактаў – 211 экз. – гэта фрагменты ляпнога і ганчарнага посуду. У калекцыі таксама маюцца 4 фрагменты кафлі, фрагмент неазначальнага керамічнага вырабу, фрагмент неазначальнага шкляного вырабу, 72 дробныя фрагменты цэглы, 20 фрагментаў неазначальных пашкоджаных жалезных вырабаў, 4 жалезныя цвікі, 2 каменныя вырабы (у тым ліку фрагмент шліфавальнай пліткі), фрагмент косткі і 12 зубоў. Астатнія знаходкі – крамянёвыя вырабы – 146 экз.

Большасць з крамянёвых знаходак – 131 экз. – прадукты першаснага расшчаплення: абломкі, луска, адшчэпы, пласціны. З іх 11 экз. абпаленыя. У калекцыі маецца крамянёвая канкрэцыя з адзінкавымі сколамі, 2 лушчні, 2 нуклеусы, 3 адшчэпы, 2 абломкі і 2 пласціны з участкамі рэтушы, фрагмент пашкоджанай неазначальнай прылады і нарыхтоўка прылады, мезалітычны трохвугольнік і скрабач на адшчэпе (мал. 4, *А: 1–9*).

Сярод керамікі маецца 7 дробных фрагментаў ляпнога посуду. На жаль, моцная фрагментаванасць, пашкоджанасць, адсутнасць венчыкаў і арнаментаваных сценак, не дазваляюць гаварыць аб яго дакладнай культурнай прыналежнасці і храналогіі. Пераважная колькасць ганчарнай керамікі – таксама дробныя, пашкоджаныя фрагменты (198 экз.). Сярод іх маюцца 165 дробных ганчарных сценак, 24 дробныя венчыкі, 7 фрагментаў плоскіх дноў, 2 фрагменты ручак. Толькі на адзінкавых фрагментах сценак захаваліся сляды арнаментавання – пракрэсленыя гарызантальныя лініі. Такі посуд мог выкарыстоўвацца на працягу позняга сярэдневякоўя і ранняга новага часу (XVI–XVIII стст.).

У 2011 г. аўтар паўторна абследаваў шматкультурны помнік Дарошавічы-1-ГЭС [3]. Устаноўлена, што земляными работамі па будаўніцтве вадасховішча Гродзенскай ГЭС тэрыторыя стаянкі і селішча практычна не закранута. У будучым будзе падмывацца толькі яго прырэчны ўсходні край. Для помніка складзена навуковая і ўліковая дакументацыя, праект зон аховы.

Дарошавічы-3-ГЭС размешчана на правабярэжных тэрасах р. Нёман, праз 0,3 км на поўдзень і праз 0,3–0,4 км на паўднёвы ўсход ад паўднёвай ўскраіны в. Дарошавічы Гродзенскага раёна, праз 0,2 км на поўдзень ад стаянкі і селішча Дарошавічы-2-ГЭС (мал. 1). Займае ўчасткі верхняй і ніжняй (надпоймавай) тэрас. Верхні абмежаваны з поўначы ярам. Ніжні прыпадае на своеасаблівае ўзвышэнне тэрасы і пачынаецца ад палявой дарогі адразу за помнікам Дарошавічы-2-ГЭС і працягваецца на ўсходзе да русла ракі, а на поўдні цягнецца ўздоўж цячэння да 250–300 м. Прыкладныя памеры – каля 400 м на 250 м.

Упершыню крамянёвыя вырабы і фрагменты посуду культуры шнуравой керамікі выявіла Н. М. Гурына праз 1 км ніжэй цагельні і вышэй вёскі на невысокім пясчаным узвышшы левага берагу р. Нёман ў сярэдзіне XX ст. Непасрэдна помнік Дарошавічы-3-ГЭС лакалізавалі на мясцовасці ў 2003 г. На паверхні, якая разворвалася, на плошчы каля 300 м на 80 м была знойдзена шматлікая калекцыя крамянёвых вырабаў, пераважна фінальна-палеалітычнага часу [1, с. 272–273].

У 2010 г. аўтар правёў на ніжнім участку помніка археалагічныя раскопкі на плошчы 140 м^2: раскоп № 1 плошчай 80 м^2 і шурфы № 1–3 плошчай па 20 м^2 [2]. Як і на шэрагу іншых помнікаў, методыка раскопак вызначалася фінансавымі магчымасцямі і жаданнем ахапіць даследаваннямі найбольшую тэрыторыю помніка, а пры выяўленні аб'ектаў і значнай колькасці артэфактаў пашырыць плошчу раскопак у любым напрамку: па лініі поўнач–поўдзень зона даследаванняў ахапіла 58 м, а па лініі захад–усход – 22 м.

Культурны пласт меў магутнасць ад 0,3–0,5 м і складаўся з аднароднага гумусу (ворны пласт) шэракарычневага колеру са слядамі разворвання. Ніжэй пачынаўся светла-жоўты, жоўта-шэры дробназярністы пясок (мацярык). Мяжа паміж імі выразная. На даследаванай раскопкамі плошчы помніка аб'ектаў не зафіксавана.

Усяго знойдзена 250 рухомых артэфактаў (мал. 4, *В*). Пэўнай залежнасці ў размеркаванні знаходак па плошчы раскопу не заўважана. Пераважная іх большасць выяўлена ў межах пласта 1 (102 экз.), які прыпадаў на верхнюю частку ворнага пласта. У другім пласце знаходак было значна менш (61 экз.), у трэцім – толькі адзінкавыя артэфакты (9 экз.) (1,79 знаходкі на 1 м^2).

Асноўная колькасць артэфактаў – 157 экз. – гэта разнастайныя крамянёвыя вырабы. У калекцыі таксама маюцца 2 фрагменты неазначальных бронзавых вырабаў, жалезная падкова, 2 жалезныя цвікі, 4 фрагменты неазначальных пашкоджаных жалезных вырабаў, дробны фрагмент цэглы, 17 фрагментаў костак. Астатнія знаходкі – фрагменты ганчарнага посуду – 66 экз.

Большасць з крамянёвых знаходак – 112 экз. – прадукты першаснага расшчаплення: абломкі, луска, сколы, адшчэпы, пласціны. Пры гэтым заўважана колькасная перавага адшчэпаў (12 экз.) над пласцінамі (5 экз.) і значнае дамінаванне разнастайных абломкаў (87 экз.). У калекцыі маецца крамянёвы разцовы скол, 12 невялікіх канкрэцый з адзінкавымі сколамі, 6 лушчняў, 5 адшчэпаў і 6 абломкаў з участкамі рэтушы, прылада з выемкай, 4 фрагменты пашкоджаных дрэнна азначальных прылад і 2 нарыхтоўкі прылад, у тым ліку біфацыяльнай прылады, праколка, цясло, укладыш, 3 скрабачы, 2 скрабкі (мал. 4, *В: 10–17*).

Уся знойдзеная кераміка – гэта фрагменты ганчарнага посуду. Пераважная колькасць яе – дроб-

ныя, пашкоджаныя сценкі (50 экз.), сярод якіх маюцца арнаментаваныя пракрэсленымі гарызантальнымі і хвалістымі лініямі, а таксама 12 венчыкаў, 4 фрагменты плоскіх дноў. Такі посуд мог выкарыстоўвацца на працягу позняга сярэдневякоўя і ранняга новага часу – ад XV да XVIII ст.

Аўтар у 2011 г. паўторна абследаваў помнік, прырэчная частка якога трапіла ў зону земляных работ па добраўпарадкаванні вадасховішча ГЭС. Устаноўлена, што земляными работамі закранута і пашкоджана толькі ніжняя частка помніка, якая ў далейшым будзе затоплена вадасховішчам [3]. Складзена ўліковая і навуковая дакументацыя, падрыхтаваны праект зон аховы.

У 2011 г. археалагічныя даследаванні ў зоне Гродзенскай ГЭС на р. Нёман былі працягнуты [3]. Адной з галоўных іх задач стаў археалагічны нагляд за будаўніцтвам у ахоўных межах помнікаў археалогіі, а таксама за правядзеннем работ па ўмацаванні схілаў пагорка, на якім размяшчаецца стаянка, селішча і могільнік ***Коматава 5-ГЭС*** (даследаваўся ў 2010 г.). Да добраўпарадкавання тэрыторыі гэтага ўнікальнага помніка акрамя будаўнічай арганізацыі былі падключаны студэнты ГрДУ імя Янкі Купалы пад кіраўніцтвам Ю. В. Юркавец. У выніку было вырашана агарадзіць камянямі плошчу раскопу 2010 г. і ўстанавіць над перазахаванымі парэшткамі памерлых і пахаваных на могільніку людзей каменныя надмагіллі з крыжамі (мал. 5). Паралельна, на паўднёвым участку помніка, у месцы найбольшага пашкоджання дзённай паверхні (грунт быў часткова зняты бульдозерам) было раскапана 84 м^2 (Ю. В. Юркавец).

Археалагічны нагляд ажыццяўляўся таксама на Коматава-1-ГЭС, Коматава-2-ГЭС, Дарошавічы-2-ГЭС, Дарошавічы-3-ГЭС. Рабіліся зачысткі, пошукі пад'ёмнага матэрыялу, фота- і графічныя фіксацыі асаблівасцей культурных напластаванняў, вызначаліся іх дакладныя межы.

На ***Коматава-2-ГЭС*** праведзены дадатковыя даследаванні (асноўныя раскопкі ажыццяўляліся ў 2009 г.) [3]. Для гэтага былі закладзены 3 шурфы (9 м^2). Прасочаны і ўдакладнены асаблівасці культурных напластаванняў, насычанасці іх артэфактамі, выяўлены новыя матэрыялы каменнага веку і сярэдневякоўя.



Мал. 5. Выгляд помніка Коматава 5-ГЭС пасля правядзення добраўпарадкавання яго плошчы ў 2011 г:
А, Б – месца правядзення раскопак 2010 г.

У выніку земляных работ 2011 г. пасля змен першапачатковага праекта па будаўніцтве ложа вадасховішча ***Коматава-1-ГЭС*** (даследаваўся ў 2009 г.) пацярпеў найбольш [3]. Рэшткі культурных напластаванняў аказаліся канчаткова разбуранымі, знівеліраванымі ці перакрытымі пяском. На працягу мая–жніўня 2011 г. на помніку ажыццяўляўся перыядычны нагляд, пры неабходнасці рабіліся зачысткі, вяліся пошукі і зборы пад'ёмнага матэрыялу. На вялікі жаль, з-за моцнай пашкоджанасці помніка, выявіць на паверхні прадстаўнічую калекцыю артэфактаў не ўдалося. Сабрана толькі 23 знаходкі, сярод якіх 18 крамянёвых вырабаў і 5 фрагментаў ганчарнага посуду (сценкі і плоскае дно): 2 фрагменты крамянёвых нуклеусаў, 13 адшчэпаў, 2 пласціны, фрагмент прылады. Пасля будаўніцтва Гродзенскай ГЭС і запаўнення вадасховішча помнік Коматава 1-ГЭС будзе цалкам затоплены. Было прынята рашэнне аб выключэнні помніка Коматава-1 ГЭС з «Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь».



Мал. 6. Крамянёвыя вырабы (*1–11*). Помнік Пужычы-2-ГЭС. 2011 г.

Значныя работы ў 2011 г. былі праведзены на помніку ***Пужычы-2-ГЭС*** (часткова даследаваўся ў 2009 г.) [3]. У сувязі са зменамі праекта па будаўніцтве вадасховішча ГЭС паселішча аказалася цалкам разбурана земляными работамі. На ўсёй плошчы помніка былі высечаны і выкарчаваны дрэвы, карані ад іх закопаны, а дзённая паверхня знівеліравана бульдозерамі (разам з культурным пластом і рухомымі артэфактамі). Зруйнаванымі аказаліся нават высокія ўчасткі тэрасы р. Нёман, якія, па нашым меркаванні, не будуць затапліваца вадасховішчам ГЭС. Аднак, у адрозненні ад помніка Коматава-1-ГЭС, на паверхні стаянкі Пужычы-2-ГЭС засталася дастакова вялікая колькасць крамянёвых артэфактаў, верагодна, рэшткі крэмнеапрацоўчых майстэрань [3]. Сярод выяўленых у 2011 г. знаходак маюцца крамянёвы адбойнік, серыя разнастайных крамянёвых нуклеусаў, скрабкоў, ножападобных пласцін, у тым ліку серпападобны нож, крамянёвая пашкоджаная ў лёзавай частцы сякера, разец (мал. 6: *1–11*). Папоўнілася, хоць і нязначна, калекцыя ляпной керамікі, у тым ліку адным фрагментам з выразнай штрыхоўкай паверхні (верагодна, жалезнага веку).

На жаль, помнік Пужычы-2-ГЭС цалкам пашкоджаны. Пасля запаўнення вадасховішча Гродзенскай ГЭС яго паверхня будзе практычна цалкам затоплена. Таму было прынята рашэнне аб выключэнні помніка Пужычы 2-ГЭС з «Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь».

У 2011 г. была звернута ўвага і на тыя ўчасткі зоны будаўніцтва Гродзенскай ГЭС, якія раней, па розных прычынах, аказаліся не абследаванымі на прадмет выяўлення новых аб'ектаў археалогіі. Напрыклад, былі абследаваны ўзбярэжжы р. Котра каля в. Плавы і праведзены археалагічны нагляд за земляными работамі. Адметна, што ў выніку даследаванняў новых помнікаў археалогіі тут не выяўлена, а значыць у дадзеным месцы будаўніцтва Гродзенскай ГЭС не нанесла шкоды гісторыка-культурным каштоўнасцям Рэспублікі Беларусь.

Літаратура

1. Археалагічнае абследаванне ўзбярэжжаў Нёмана ў зоне будаўніцтва Гродзенскай ГЭС / В. С. Абухоўскі [і інш.] // Гіст.-археалаг. зб. – № 19. – Мінск, 2004. – С. 272–273.

2. Лакіза, В. Л. Раскопкі на помніках Мігова 1-ГЭС, Селюкі 1-ГЭС, Дарошавічы 1-ГЭС, Дарошавічы 3-ГЭС Гродзенскага раёна, Навасёлкі 1-ГЭС Мастоўскага раёна. Раздзел 1–5 // Справаздача № 4 аб выкананні навуковых археалагічных даследаванняў на помніках археалогіі Мігова 1-ГЭС, Селюкі 1-ГЭС, Дарошавічы 1-ГЭС, Дарошавічы 3-ГЭС, Навасёлкі 1-ГЭС, Дарошавічы 2-ГЭС, Глядавічы 1-ГЭС, Коматава 5-ГЭС у зоне будаўніцтва Гродзенскай ГЭС на р. Нёман у 2010 годзе / В. Л. Лакіза // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2787. – Мінск, 2011. – 281 с.

3. Лакіза, В. Л. Справаздача № 5 аб выкананні навуковых археалагічных даследаванняў на помніках археалогіі ў зоне будаўніцтва Гродзенскай ГЭС на р. Нёман у 2011 годзе (частка 1) / В. Л. Лакіза // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2860. – Мінск, 2012. – 225 с.

4. Лакіза, В. Л. Папярэднія вынікі даследавання шматкультурнага паселішча Навасёлкі 1-ГЭС (Мастоўскі раён, 2010 г.) / В. Л. Лакіза, М. А. Плавінскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – Вып. 23 : Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі ў 2009–2010 гадах. – С. 74–85.

5. Плавінскі, М. А. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на паселішчы Дарошавічы-2-ГЭС у 2010 г. // Справаздача № 4 аб выкананні навуковых археалагічных даследаванняў на помніках археалогіі Мігова 1-ГЭС, Селюкі 1-ГЭС, Дарошавічы 1-ГЭС, Дарошавічы 3-ГЭС, Навасёлкі 1-ГЭС, Дарошавічы 2-ГЭС, Глядавічы 1-ГЭС, Коматава 5-ГЭС у зоне будаўніцтва Гродзенскай ГЭС на р. Нёман у 2010 годзе / М. А. Плавінскі // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Мінск, 2011.

6. Харытановіч, З. А. Археалагічныя даследаванні на помніку Глядавічы-1-ГЭС у 2010 г. / З. А. Харытановіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – Вып. 23 : Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі ў 2009–2010 гадах. – С. 374–378.

Резюме

В. Л. Лакиза

Археологические исследования в зоне строительства Гродненской ГЭС на р. Нёман в 2010–2011 гг.

Введены в научный оборот предварительные результаты исследований археологических памятников в зоне строительства Гродненской ГЭС на р. Нёман в 2010–2011 гг. В 2010 г. автором проведены раскопки на Мигово-1-ГЭС (113 м^2), Селюки-1-ГЭС (224 м^2), Новоселки-1-ГЭС (305 м^2), Дорошевичи-1-ГЭС (140 м^2) и Дорошевичи-3-ГЭС (140 м^2). Также изучены Дорошевичи-2-ГЭС (80 м^2; Н. А. Плавинский), Гледовичи-1-ГЭС (104 м^2; З. А. Харитонович), Комотово-5-ГЭС (448 м^2; Ю. В. Юрковец). Общая площадь раскопок в 2010 г. составила 1554 м^2. В 2011 г. автором повторно обследованы все памятники. На них составлена учетная документация, научные паспорта, определены охранные зоны, проведена дополнительная шурфовка Комотово-2-ГЭС, сборы подъемного материала и наблюдения на Комотово-1-ГЭС, Комотово-5-ГЭС, Пужичи-2-ГЭС, Дорошевичи-2-ГЭС и Дорошевичи-3-ГЭС.

Summary

V. Lakiza

Archaeological research in Grodno Hydropower plant area on the river Neman in 2010–2011

The article introduces into scientific circulation the preliminary results of research on the archaeological monuments in the construction zone of Grodno HPP on the river Neman in 2010–2011. In 2010 the author conducted excavations on the following settlements: Migava-1-HPP (113 m^2), Selyuki-1-HPP (224 m^2), Navaselki-1-HPP (305 m^2), Daroshavichy-1-HPP (140 m^2) and Daroshavichy-3-HPP (140 m^2). Also we cannot but mention the investigations carried out on Daroshavichy-2-HPP (80 m^2; N. Plavinsky), Gledovichy-1-HPP (104 m^2; Z. Kharitanovich), Komatava-5-HPP (448 m^2; Y. Yurkavets). The total area of excavations in 2010 made 1554 m^2. In 2011 the author examined all the monuments again. We prepared accounting documentation, research passports of objects, determined reservation zones, performed additional pit sampling works on Komatava-2-HPP, gathering of surface material and observations on Komatava-1-HPP, Komatava-5-HPP, Puzhichy-2-HPP, Daroshavichy-2-HPP and Daroshavichy-3-HPP.

УДК 902/904(476-15)«2011»

В. Л. Лакіза, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, загадчык аддзела археалогіі першабытнага грамадства, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Мінск)*

Папярэднія вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 2011 г.

Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі шасці заходніх раёнаў Беларусі (мал. 1) у 2011 г. праводзіліся аўтарам па наступных асноўных накірунках: 1) пошук і вывучэнне помнікаў археалогіі для пашырэння крыніцазнаўчай базы па неаліту і бронзаваму веку (разведкі, раскопкі); 2) правядзенне ахоўных археалагічных мерапрыемстваў у зонах новабудоўляў; 3) інвентарызацыя розначасовых, у тым ліку першабытных помнікаў, уключаных у «Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь» (далей – ДзСГКК).

Першы накірунак фундаментальных даследаванняў адпавядаў у цэлым навуковай дзейнасці аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, якая ажыццяўляецца ў рамках Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі» («Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава») (кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя), падпраграмы 1 «Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа» (кіраўнікі – доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя, кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. В. Даніловіч), задання 1.1.01 «Археалагічныя помнікі першабытнай і сярэднявечнай эпох на тэрыторыі Беларусі: этнагенэз, дзяржаўнасць, матэрыяльная і духоўная культура» (кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар В. М. Ляўко, намеснік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. Л. Лакіза), раздзела 1.2. «Помнікі неаліту і бронзавага веку» (кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. Л. Лакіза), падраздзела 1.2.1. «Помнікі каменнага і бронзавага вякоў Паўночна-Заходняй Беларусі: новыя даследаванні і матэрыялы» (выканаўца – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. Л. Лакіза).

Раскопкі. На тэрыторыі Белавежскай пушчы ў ліпені 2011 г. з удзелам студэнтаў БрДУ імя А. С. Пушкіна праведзены раскопкі на паселішчы Камянюкі-6-Студэнцкая гара (Камянецкі раён). Яно размешчана праз 400–500 м на паўночны захад ад заходняй ускраіны в. Камянюкі на краі правабярэжнай тэрасы р. Лясная Правая ва ўрочышчы Студэнцкая гара. Прыблізныя памеры помніка – каля 80–90 м на 110–120 м. Яго плошча засаджана лесам, паверхня месцамі пашкоджана невялікімі ямамі-кар'ерамі і супрацьпажарнымі траншэямі, раней выкарыстоўвалася для размяшчэння летняга лагера падчас праходжання студэнцкай практыкі. Пры земляных работах студэнты ў адной з ям знайшлі каменную свідраваную сякеру. Яшчэ адну сякеру падабраў на краі ўзвышша мясцовы жыхар Алег Жарко. Лакалізаваў паселішча і даследаваў у 2007–2008 гг. на плошчы 65 м^2 аўтар артыкула [1, с. 39–41].

У 2011 г. быў даследаваны яшчэ 41 м^2 [5]. Асаблівасці стратыграфіі помніка былі адзначаны яшчэ ў мінулыя гады: культурны пласт у выніку прыродных уздзеянняў і гаспадарчай дзейнасці моцна пашкоджаны, развеяны, перамешаны. Верагодна, што толькі пасля засаджвання тэрасы лесам пачаў фарміравацца верхні шэры пласт з тонкім дзёрнам. Пад ім пачынаўся пласт з шэрага дробназярністага пяску таўшчынёй 0,22–0,25 м, які паступова пераходзіў у светла-шэры, жаўтавата-шэры пласт дробназярністага пяску са знаходкамі (разбіраўся на глыбіню да 0,69–0,73 м), затым мацярык, складзены з светла-жоўтага дробназярністага пяску.

У паўночнай частцы раскопу зафіксаваны *аб'ект № 1-1* – частка ямы, запоўненая цёмна-шэрым (шызаватым) гумусіраваным пяском з рэдкімі жаўтаватымі ўключэннямі дробназярністага пяску, святлейшая па перыметры і цямнейшая ў цэнтры (з-за вялікіх памераў даследаваны толькі часткова). У запаўненні выяўлены 124 артэфакты, сярод якіх крамянёвыя адшчэпы, пласціны, абломкі, 2 нуклеусы, 2 лушчні, 2 скрабкі (мал. 2: *2, 4–7*), 39 фрагментаў ляпной керамікі. Знойдзена таксама жалезнай шпора[1] з чатырохгранным пірамідападобным канцом і Z-падобным выгінам дужкі, якая адносіцца да тыпу III згодна класіфікацыі А. М. Кірпічнікава і датавана XII–XIII стст., што сведчыць аб познім паходжанні аб'екта [5, іл. 50].

Падчас раскопак выяўлены 505 рухомых артэфактаў (528 з іх – разам з пад'ёмным матэрыялам), якія стратыграфічна не падзяляліся, размяркоўваліся па плошчы раскопу амаль раўнамерна, былі сканцэнтраваны пераважна на глыбіні 0,2–0,4 м ад сучаснай дзённай паверхні.

У калекцыі налічваецца 171 фрагмент ляпнога посуду (мал. 2: *9–13*), пераважна дробных і пашкоджаных сценак з дамешкамі розназярністай жарствы. Сценкі злёгку заштрыхаваныя, загладжаныя, часам шурпаватыя на вобмацак. Колер іх светла-карыч-

[1] Вызначэнне шпоры зроблена кандыдатам гістарычных навук А. В. Вайцяховічам, камеральная апрацоўка і кансервацыя – малодшым навуковым супрацоўнікам Я. В. Уласаўцом.



Мал. 1. Рэгіёны на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у якіх у 2011 г. праводзіліся археалагічныя даследаванні:
1 – Гродзенскі раён; *2* – Карэліцкі раён; *3* – Дзятлаўскі раён; *4* – Слонімскі раён; *5* – Астравецкі раён; *6* – Камянецкі раён

невы, шэра-карычневы. Дакладна ідэнтыфікаваць знаходкі з той ці іншай культурай і храналагічным перыядам вельмі складана.

Упершыню для дадзенага помніка выяўлены фрагмент сценкі з арганічнымі дамешкамі, які атаясамліваецца з прыпяцка-нёманскай ранненеалітычнай культурай. Яго тэхналогія практычна не адрозніваецца ад тэхналогіі, якая характэрна для аналагічнай керамікі з асноўнага арэала культуры. Таксама, упершыню выяўлены керамічныя матэрыялы нёманскай неалітычнай культуры, якія знаходзяць аналогіі сярод старажытнасцей дабраборскага этапу культуры (мал: 2*: 9, 10*). Цэлая серыя фрагментаў керамікі, у тым ліку з арнаментам адбіткамі лінейнага (прамавугольнага) штампа, паходзіць ад некалькіх познанеалітычных пасудзін, якія маглі быць выраблены ў мясцовым неалітычным асяроддзі, але пад уплывам традыцый кола культуры шнуравой керамікі (мал. 2: *11*). Маецца кераміка са шнуравой арнаментацыяй (дугападобнымі адбіткамі) (мал. 2: *12*), прычым выяўлены венчык вылучаецца як сваёй марфалогіяй, так і тэхналогіяй (дамешкі буйнай жарствы, асаблівасці апрацоўкі паверхні), якія больш характэрны для керамікі «ляснога» неаліту. Заслугоўваюць увагі і фрагмент сценкі з арнаментам у выглядзе лукаткі з лінейных адбіткаў – ад посуду, верагодна, культуры шарападобных амфар [5, іл. 49: *3*], а таксама фрагмент сценкі з арнаментам у выглядзе «заштрыхаванага трохкутніка», аналогіі якому можна знайсці сярод старажытнасцей сярэднедняпроўскай культуры [5, іл. 49: *4*]. Упершыню выяўлены матэрыял тшцінецкага культурнага кола: фрагмент арнаментаванай пракрэслены лініямі сценкі (мал. 2: *13*) і фрагмент плоскага дна (?) з характэрнай для «тшцінца» тэхналогіяй. Новымі крыніцамі з'яўляюцца і фрагменты посуду з вялікай колькасцю буйнай жарствы ў злёгку падштрыхаваных сценках, якія адносяцца, верагодна, да ранняга перыяду жалезнага веку [5, іл. 48: *7, 8*].

Сярод 332 крамянёвых знаходак пераважная большасць – гэта прадукты першаснага расшчаплення: абломкі (73), адшчэпы (150), пласціны (25), у тым ліку некалькі правільных ножападобных, абпаленыя адшчэпы, пласціны і абломкі (41), канкрэцыі



Мал. 2. Археалагічныя знаходкі 2011 г. з помніка Камянюкі-6-Студэнцкая гара Камянецкага раёна:
1–8 – крамянёвыя вырабы; *9–13* – ляпная кераміка (фрагменты)

(3), лускавінкі (13). Заўважана колькасная перавага адшчэпаў над пласцінамі. Нуклеусаў і іх фрагментаў – 12 экз. (мал. 2: *1, 2*), якія ў асноўным аднапляцовачныя для адшчэпаў і пласцін, аморфныя, некаторыя моцна выкарыстаныя. Сярод крамянёвых знаходак вылучаецца серыя з 6 лушчняў, якія паказваюць некаторыя асаблівасці тэхнікі апрацоўкі сыравіны і вырабу прылад (мал. 2: *4, 5*), а таксама 2 адшчэпы, якія атрыманы ад крамянёвых прылад са шліфаванымі паверхнямі. Крамянёвых вырабаў з другаснай апрацоўкай выяўлена толькі 7 экз.: трохвугольны наканечнік стралы з увагнутай падставай, апрацаваны практычна па ўсім перыметры рэтушшу (мал. 2: *8*), 3 скрабкі (мал. 2: *6, 7*), 3 пласціны з участкамі рэтушавання (мал. 2: *3*).

Папярэдні аналіз наяўных матэрыялаў дае падставы сцвярджаць, што ўзвышша на р. Лясная Правая засялялася неаднаразова – у раннім неаліце

(прыпяцка-нёманская культура), у познім неаліце (нёманская культура і кола культуры шнуравой керамікі), раннім перыядзе бронзавага веку (тшцінецкае культурнае кола), раннім перыядзе жалезнага веку (верагодна, лужыцкая культура (?), а таксама культура, ідэнтыфікацыя якой пакуль застаецца дыскусійнай), сярэдневякоўі (наяўнасць аб'екта з жалезнай шпорай).

Разведкі. У 2011 г. былі праведзены разведкі ў асобных мікрарэгіёнах Беларускага Панямоння (мал. 1: *1, 2*) [4]. У сувязі з планамі будучага будаўніцтва яшчэ адной ГЭС на р. Нёман ніжэй Гродна (Нямноўская ГЭС) восенню абследаваны асобныя участкі 20 км адрэзка р. Нёман (лева- і правабярэжжа) ад в. Плебанскія, каля якой плануецца будаваць плаціну Нямноўскай ГЭС, амаль да самага г. Гродна (в. Пышкі і в. Ласосна), і, ад дачнага пасёлка, які размешчаны паміж в. Пальніца і в. Гожа да в. Астравок[1].

Практычна большая частка абследаванай тэрыторыі ў левабярэжжы Нёмана (з высокімі тэрасамі і даволі вузкай поймай) засаджана лесам, кустамі і хмызняком, моцна задзірванела. Вольных ад дрэў пляцовак, асабліва на ніжніх ўзроўнях разараных участкаў, практычна няма. Даволі цікавая сітуацыя для ніжніх левабярэжных тэрас каля в. Плебанскія. У месцы, запланаваным пад будаўніцтва плаціны, у лёгкім выгіне р. Нёман, выразна вылучаецца шырокая надпоймавая тэраса (90–100 м шырынёй і 900–1000 м даўжынёй). Яна моцна задзірванела. Магчыма, яна актыўна выкарыстоўвалася ў гаспадарчых мэтах, на яе плошчы маглі быць размешчаны хутары (засталіся ўчасткі са старымі садамі). Візуальна археалагічныя артэфакты не былі зафіксаваны (на 2012 г. была запланавана мэтанакіраваная шурфоўка мясцовасці). Перспектыўнымі для выяўлення помнікаў археалогіі падаваліся мясціны каля в. Беражены. Аднак папярэднія пошукі на ніжніх тэрасах не прынеслі вынікаў. Толькі на верхняй тэрасе на поўдзень ад вёскі пад ЛЭП і побач з ачышчальным калектарам знойдзена некалькі крамянёвых артэфактаў (мал. 3: *2*). Каля в. Баля Сольная размешчана некалькі помнікаў археалогіі (Баля Сольная-1, Баля Сольная-2), якія былі абследаваны (мал. 3: *3–6*). Устаноўлена, што часткова будзе падмывацца вадасховішчам будучай ГЭС толькі стаянка Баля Сольная-1.

Амаль падобная сітуацыя і з правабярэжжам р. Нёман, дзе таксама значная частка тэрыторыі (з высокімі тэрасамі і даволі вузкай поймай) засаджана лесам, парасла кустамі і хмызняком, моцна задзірванела. У месцы будаўніцтва плаціны тэраса вельмі высокая, надпоймавай тэрасы практычна не прасочваецца. Аднак вольных ад дрэў пляцовак, разараных участкаў трохі больш, асабліва каля в. Гожа (але тут практычна толькі высокія тэрасы з лакалізацыяй на іх помнікаў археалогіі Гожа-1 і Гожа-2 (мал. 3: *1*)), якія не будуць затаплівацца, а толькі больш інтэнсіўна размывацца. За Гожай, ад вусця р. Гажанка да в. Астравок (прыкладна каля 3,5 км) тэрасы цалкам засаджаны лесам, прычым на працягу каля 1,0–1,5 км маецца толькі верхняя тэраса з высокімі стромкімі схіламі, край якой спрэч перакапаны вайсковымі траншэямі і бліндажамі. Прыкладна праз 0,7–0,9 км на паўночны ўсход ад ніжняй ускраіны в. Астравок на надпоймавай тэрасе, засаджанай лесам і даволі моцна задзірванелай, быў закладзены разведачны шурф. Выразнага культурнага пласта ў ім не заўважана, аднак у ніжнім гарызонце знойдзены 3 крамянёвыя артэфакты: лускавінка і 2 адшчэпы. Дадзенае месца можа разглядацца як перспектыўнае для далейшых і больш грунтоўных пошукаў. Папярэдне для яго прынята назва Астравок-1.

Восенню 2011 г. праводзіліся разведкі і на тэрыторыі Карэліцкага раёна [4] (мал. 1: *2*). Іх вынікі ўжо знайшлі адлюстраванне ў асобным артыкуле аўтара [6, с. 39–41], у тым ліку папярэдняе ўвядзенне ў навуковы зварот новага археалагічнага помніка – стаянкі і селішча Турэц-1.

Ахоўныя археалагічныя даследаванні. У 2011 г. аўтарам былі праведзены мэтанакіраваныя ахоўныя даследаванні ў зонах новабудоўляў: на тэрыторыі будаўніцтва газаправода ад г. п. Астравец да Беларускай АЭС[2] (мал. 1: *5*), будаўніцтва невялікага ўчастка новай аўтадарогі каля вёсак Рацічы, Гінавічы і Польныя Багатыры Гродзенскага раёна[3] (мал. 1: *1*) [2], будаўніцтва Гродзенскай ГЭС на р. Нёман[4] [3].

Інвентарызацыя помнікаў археалогіі. Значная палявая праца была накіравана на інвентарызацыю ўжо вядомых помнікаў археалогіі на тэрыторыі Гродзенскага (мал. 1: *1*), Карэліцкага (мал. 1: *2*) [4], Слонімскага[5] (мал. 1: *4)*, Дзятлаўскага (мал. 1: *3*)

[1] Работы праводзілі без дадатковага фінансавання ў адпаведнасці з індывідуальнай планавай тэматыкай і ў сувязі з неазначальнасцю канчатковага тэрміну пачатку будаўніцтва, яго лёсу ў цэлым, адсутнасцю ў заказчыка вылучаных на перадпраектны этап фінансавых сродкаў, адсутнасцю ў першым варыянце «ОВОС» асобнага каштарыса на археалагічныя даследаванні. Выказваю шчырую ўдзячнасць Макс. М. і Міх. М. Чарняўскім, В. Г. Беляўцу, С. Б. Ліневічу за згоду на ўдзел у дадзенай экспедыцыі.

[2] Падчас абследавання 2011 г. выяўлены некалькі розначасовых помнікаў каля вёсак Газа, Загазь, Малі Астравецкага раёна, у тым ліку ўпершыню для дадзенага мікрарэгіёна стаянка Малі-1. Даследаванні працягнуты на 2012 г. Іх вынікі будуць прадстаўлены ў асобным артыкуле.

[3] Новых помнікаў археалогіі ў зоне новабудоўлі не выяўлена.

[4] Вынікам даследаванняў у зоне будаўніцтва Гродзенскай ГЭС у 2011 г. прысвечаны асобны артыкул аўтара ў дадзеным зборніку.

[5] Даследаванні працягнуты на 2012 г. Іх вынікі будуць прадстаўлены ў асобным артыкуле.



Мал. 3. Крамянёвыя вырабы 2011 г. з помнікаў Гожа-1 (*1*), Беражаны (*2*), Баля Сольная-2 (*3–6*) Гродзенскага раёна

раёнаў Гродзенскай вобласці (беларускае Панямонне). Абследаваўся сучасны стан іх захаванасці, удакладнялася лакалізацыя, вызначаліся ахоўныя зоны з нанясеннем на карты землекарыстання і спадарожнікаваныя здымкі. На кожны абследаваны помнік археалогіі, узяты на ўлік як гісторыка-культурная каштоўнасць, падрыхтавана ўліковая і навуковая дакументацыя, распрацаваны праекты зон аховы. Шэраг зніклых, разбураных помнікаў археалогіі прапанавана выключыць з ДзСГКК, а некаторыя новыя – ўключыць.

Так, на тэрыторыі Гродзенскага раёна ў 2011 г. было абследавана 46 гісторыка-культурных каштоўнасцей з уласнымі шыфрамі (гл. табліцу).

Пры гэтым агульная колькасць асобных першабытных помнікаў (стаянкі каменнага і бронзавага вякоў, селішчы, гарадзішчы ранняга жалезнага веку) склала 54 адзінкі. Праведзена іх падрабязная фотафіксацыя (мал. 4, 5), збор пад'ёмнага матэрыялу, як на стаянцы Кавальцы-1 (мал. 6: *1–5*), шурфоўка, вызначаны іх памеры, межы, ахоўныя зоны [3, 4]. Для асобных помнікаў падрыхтаваны

рэкамендацыі па практычным выкарыстанні, як па стаянцы Нямнова-1 на беразе Аўгустоўскага канала (мал. 5). Адзначым, што на гэтым помніку Гродзенскім райвыканкамам ўстаноўлены каляровы стэнд, на якім у сканцэнтраваным выглядзе адлюстравана інфармацыя аб гісторыі археалагічнага вывучэння помнікаў Аўгустоўскага канала, раскопках стаянкі Нямнова-1, аб выяўленых на ёй артэфактах.

Археалагічныя помнікі Гродзенскага раёна

Шыфр	Гісторыка-культурная каштоўнасць	Датаванне каштоўнасці	Катэгорыя каштоўнасці
413В000150	Стаянка і селішча Азёры-1	Перыяд неаліту, бронзавага веку, сярэдневякоўя	3
	Стаянка Азёры-2	Перыяд неаліту і бронзавага веку	3
	Стаянка і селішча Азёры-3	Перыяд мезаліту, неаліту, бронзавага веку, сярэдневякоўя	3
413В000153	Стаянка Баля Сольная-1	Перыяд каменнага і бронзавага вякоў	3
	Стаянка Баля Сольная-2	Перыяд каменнага і бронзавага вякоў	3
413В000154	Стаянка Берагавы-1	Перыяд каменнага і бронзавага вякоў, X–II тысячагоддзі да н. э.	3
413В000155	Стаянка і селішча Берагавы-1-ГЭС	Перыяд фінальнага палеаліту, мезаліту, неаліту, сярэдневякоўя	3
413В000161	Стаянка і селішча Гожа-1	Перыяд фінальнага палеаліту, сярэдневякоўя	3
	Стаянка Гожа-2	Перыяд фінальнага палеаліту, мезаліту і неаліту	3
413В000162	Стаянка і селішча Дарошавічы-1-ГЭС	Перыяд каменнага і бронзавага вякоў, сярэдневякоўя	–
413В000163	Селішча Дарошавічы-2-ГЭС	Перыяд сярэдневякоўя і новага часу	–
413В000164	Стаянка і селішча Дарошавічы-3-ГЭС	Перыяд каменнага і бронзавага веку, сярэдневякоўя і новага часу	–
413В000169	Стаянка Жылічы-1-ГЭС	Перыяд фінальнага палеаліту, мезаліту, неаліту, бронзавага веку	3
413В000170	Стаянка і селішча Жылічы-2-ГЭС	Перыяд фінальнага палеаліту, мезаліту, неаліту, сярэдневякоўя	3
413В000171	Стаянка Жылічы-3-ГЭС	Перыяд каменнага веку	3
413В000173	Стаянка Жылічы-5-ГЭС	Перыяд мезаліту, неаліту і бронзавага веку	3
413В000175	Стаянкі «востраў Запур'еўскі»	Перыяд каменнага і бронзавага вякоў	3
413Д000180	Стаянка і крэмнеапрацоўчая майстэрня Кавальцы-1	Перыяд фінальнага палеаліту	3
	Стаянка Кавальцы-2	Перыяд фінальнага палеаліту	3
	Стаянка Кавальцы-4	Перыяд фінальнага палеаліту, мезаліту, неаліту, бронзавага веку	3
413В000220	Стаянка і селішча Кавальцы-1-ГЭС	Перыяд мезаліту, неаліту, бронзавага і жалезнага вякоў	3
413В000221	Стаянка і селішча Кавальцы-2-ГЭС	Перыяд мезаліту, неаліту, бронзавага веку, сярэдневякоўя	3
413В000222	Стаянка і селішча Кавальцы-3-Турыст-ГЭС	Перыяд мезаліту, неаліту, бронзавага і жалезнага вякоў, сярэдневякоўя і новага часу	3
413В000223	Селішча Кавальцы-4-ГЭС	Перыяд сярэдневякоўя і новага часу	3
413В000184	Стаянка Кашэўнікі-1	Перыяд каменнага і бронзавага веку	3
413В000187	Стаянка і селішча Коматава-2-ГЭС	Перыяд мезаліту, неаліту, бронзавага веку, сярэдневякоўя	3
413В000189	Стаянка і селішча Коматава-4-ГЭС	Перыяд неаліту, бронзавага веку, сярэдневякоўя	3
413В000190	Стаянка, селішча, могільнік Коматава-5-ГЭС	Перыяд неаліту, жалезнага веку, сярэдневякоўя і новага часу	3
413В000191	Стаянка і селішча Коматава-6-ГЭС	Перыяд мезаліту, неаліту, бронзавага веку, сярэдневякоўя і новага часу	3
413В000194	Стаянкі «востраў Ліхацкі»	Перыяд каменнага і бронзавага вякоў	3
413В000198	Стаянка Нямнова-1-Мост	Перыяд мезаліту	3
413Г000199	Стаянка і селішча Пагараны-1	Перыяд фінальнага палеаліту, неаліту, сярэдневякоўя	3
413В000214	Стаянка і селішча Селюкі-1-ГЭС	Перыяд каменнага веку, сярэдневякоўя і новага часу	3

Окончание таблицы

Шыфр	Гісторыка-культурная каштоўнасць	Датаванне каштоўнасці	Катэгорыя каштоўнасці
413В000215	Стаянка і селішча Сіўкава-1	Перыяд фінальнага палеаліту, неаліту, бронзавага веку, сярэдневякоўя	–
	Стаянка і селішча Сіўкава-2	Перыяд каменнага веку, сярэдневякоўя	3
413В000224	Стаянка і селішча Славічы-1	Перыяд каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў, сярэдневякоўя	3
413В000225	Стаянка і селішча Славічы-1-ГЭС	Перыяд фінальнага палеаліту, мезаліту, неаліту, сярэдневякоўя	3
413В000226	Стаянка і селішча Славічы-2-ГЭС	Перыяд фінальнага палеаліту, мезаліту, неаліту, сярэдневякоўя	3
413В000228	Стаянка Старая Руда-1	Перыяд каменнага і бронзавага вякоў	3
	Стаянка Старая Руда-2	Перыяд каменнага і бронзавага вякоў	3
413В000230	Стаянка і селішча Шчачынова-1	Перыяд фінальнага палеаліту, неаліту, бронзавага веку, сярэдневякоўя і новага часу	3

Пасля палявых абследаванняў, грунтоўнага аналізу архіўных крыніц і новых атрыманых матэрыялаў з'явіліся падставы для больш дакладнай культурна-храналагічнай ідэнтыфікацыі практычна ўсіх гісторыка-культурных каштоўнасцей раёна. У іх назвы, храналогію, апісанне лакалізацыі ўнесены ўдакладненні і змены, інфармацыя аб чым была падрыхтавана для Міністэрства культуры ў спецыяльным «Акце». Акрамя таго было прапанавана васьмі розным помнікам археалогіі каля вёсак Азёры, Баля Сольная, Гожа, Славічы (Кавальцы), Сіўкава, Старая Руда, якія раней у ДзСГКК з'яўляліся складанай часткай адной гісторыка-культурнай каштоўнасці з адным шыфрам (напрыклад, Азёры-1, Азёры-2, Азёры-3), надаць самастойны характар і свае ўласныя шыфры рэгістрацыі (гл. табліцу). Установлены і факты разбурэння з наступным затапленнем вадасховішчам Гродзенскай ГЭС на р. Нёман 12 гісторыка-культурных каштоўнасцей (на іх на працягу 2008–2010 гг. праводзіліся раскопкі) [3]. Адзін пом-



Мал. 4. Выгляд археалагічнага помніка Кавальцы-1 Гродзенскага раёна. Чэрвень 2011 г.



Мал. 5. Выгляд археалагічнага помніка Нямнова-1 Гродзенскага раёна. Чэрвень 2011 г.



Мал. 6. Крамянёвыя вырабы 2011 г. з помніка Кавальцы-1 (*1–5*) Гродзенскага раёна



Мал. 7. Археалагічныя знаходкі 2011 г. з помніка Нясілавічы-12 Дзятлаўскага раёна: *1–3* – крамянёвыя вырабы; *4–9* – ляпная кераміка (фрагменты)

нік «гарадзішча» каля в. Жылічы не лакалізаваны на мясцовасці. У сувязі з гэтым у ДзСГКК унесены змены і 13 помнікаў археалогіі Гродзенскага раёна выключаны з яго складу.

У 2011 г. на тэрыторыі Карэліцкага раёна было абследавана 6 гісторыка-культурных каштоўнасцей, уключаных у ДзСГКК пад уласнымі шыфрамі (усяго 8 асобных помнікаў археалогіі) [4]. Устаноўлены факт разбурэння адной гісторыка-культурнай каштоўнасці каля в. Альшаны – каменнага могільніка (ён на дадзены момант ужо выключаны з ДзСГКК). У сувязі з існаваннем на тэрыторыі Карэліцкага раёна каля в. Варонча помніка археалогіі, вядомага яшчэ з мінулага стагоддзя, здавальняючым станам яго захавання, правядзеннем на ім археалагічных раскопак, гарадзішча жалезнага веку Варонча ўключана ў ДзСГКК. Для помнікаў археалогіі Карэліцкага раёна распрацаваны і ўжо зацверджаны праект зон аховы.

У Дзятлаўскім раёне ў 2011 г. неабходна было завяршыць інвентарызацыю, якая пачалася ў 2010 г., адшукаць на мясцовасці і дакладна прывязаць да картаў землекарыстання некаторыя розначасовыя помнікі, удакладніць іх лакалізацыю, межы, распрацаваць праект зон аховы. Сярод такіх помнікаў былі могільнікі каля вёсак Зарой, Карыца, курганы і гарадзішча каля в. Агароднікі, а таксама археалагічны комплекс каля в. Нясілавічы. На адным з паселішчаў Нясілавічы-12, якое размешчана праз 0,9–1,1 км на паўднёвы захад ад вёскі і асфальтавай шашы Дзятлава–Ліда на паўднёвым краі моцна развеянай дзюны на левым беразе р. Нёман сабрана новая калекцыя артэфактаў, сярод якіх маюцца нуклеусы, нарыхтоўка рубячай прылады (мал. 7: *1–3*), фрагмент ранненеалітычнага посуду з арганікай і элементамі арнаментацыі прыпяцка-нёманскай ранненеалітычнай культуры (мал. 7: *4–6*), фрагмент керамікі лысагорскага тыпу нёманскай неалітычнай культуры (мал. 7: *7*) і фрагмент посуду тшцінецкага культурнага кола, у тым ліку арнаментаваныя пракрэсленымі лініямі (мал. 7: *8, 9*). Для абследаваных помнікаў таксама падрыхтаваны неабходная ўліковая і навуковая дакументацыя, прапановы па ўнясенні змен у назвы, лакалізацыю, культурна-храналагічную ідэнтыфікацыю. Не лакалізаваны на мясцовасці і выключаны з ДзСГКК 4 гісторыка-культурныя каштоўнасці – курганы і курганныя могільнікі каля вёсак Войневічы, Колкі, Жыхі і Стараельня.



Мал. 8. Пашкоджаны ахоўны знак на археалагічным помніку Ярэмічы-3 Карэліцкага раёна. Май 2011 г.



Мал. 9. Разрабаванае «чорнымі капальнікамі» пахаванне на каменным могільніку ў в. Зарой Дзятлаўскага раёна. Кастрычнік 2011 г.

На жаль, падчас інвентарызацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей мы сутыкнуліся з шматлікімі фактамі пашкоджанняў помнікаў археалогіі «чорнымі капальнікамі». Вынікі рабавання нацыянальнай спадчыны, у тым ліку акты вандалізму ў адносінах да грунтовых, каменных і курганных могільнікаў, зафіксаваны ў кожным раёне. Знішчаюць і ахоўныя знакі, усталяваныя на помніках археалогіі мясцовымі ўладамі ў адпаведнасці з заканадаўствам (мал. 8). Не пазбеглі разбурэння нават могільнікі, якія размешчаны ў населеных пунктах (Коматава, Рудаўка, Зарой і інш.) (мал. 9). Таму сёння неабходна канстатаваць, што ў пачатку XXI ст. Рэспубліка Беларусь, як і суседнія краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, сутыкнулася з вельмі вострай і балючай праблемай – праблемай «чорных капальнікаў» і шырокага несанкцыянаванага (некантралюемага) выкарыстання металадэтэктараў. Гэта таксама асобная і вельмі складаная праблема, станоўчае вырашэнне якой залежыць ад цеснага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння вучоных, органаў дзяржаўнага кіравання і грамадства.

Літаратура

1. Белавежская пушча : вытокі запаведнасці, гісторыя і сучаснасць / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; В. Г. Белявец [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя (старш.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 455 с.

2. Лакіза, В. Л. Справаздача аб правядзенні археалагічных даследаванняў у зоне будаўніцтва аб'екта «Аўтадарога Н-6049 Рацічы–Гінавічы–Польныя Багатыры, км 0,000 – км 9,205», Гродзенскі раён, IV катэгорыя» / В. Л. Лакіза // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2857. – Мінск, 2011. – 68 с.

3. Лакіза, В. Л. Справаздача № 5 аб выкананні навуковых археалагічных даследаванняў на помніках археалогіі ў зоне будаўніцтва Гродзенскай ГЭС на р. Нёман у 2011 годзе (частка 1) / В. Л. Лакіза // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2860. – Мінск, 2012. – 225 с.

4. Лакіза, В. Л. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 2011 годзе / В. Л. Лакіза // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2856. – Мінск, 2012. – 138 с.

5. Лакіза, В. Л. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на паселішчы Камянюкі 6-Студэнцкая гара (Камянецкі раён Брэсцкай вобласці) у 2011 годзе / В. Л. Лакіза // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Мінск, 2012. – 51 с.

6. Лакіза, В. Л. Новыя археалагічныя помнікі і матэрыялы Карэліцкага раёна / В. Л. Лакіза // Карэліччына : людзі, падзеі, час : зб. навук. артыкулаў / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад.: А. А. Скеп'ян [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – С. 33–43.

Резюме

В. Л. Лакиза

Предварительные итоги археологических исследований на территории Западной Беларуси в 2011 г.

Введены в научный оборот предварительные результаты исследований 2011 г. разновременных археологических памятников в четырех районах Западной Беларуси. В Гродненском, Кореличском, Дятловском районах была проведена инвентаризация памятников археологии, включенных в «Государственный список историко-культурного наследия Республики Беларусь», обследованы их современное состояние, составлены учетные карточки и научные паспорта, подготовлены документы для проекта зон охраны, рекомендации по их дальнейшему сохранению и использованию. Зафиксированы значительные нарушения законодательства в области учета и охраны археологического наследия. Проведены сборы новых артефактов, шурфовка, обнаружены новые первобытные поселения. В Каменецком районе продолжены раскопки на поселении Каменюки-6-Студенческая гора. Исследовано 41 м^2. Выявлены новые артефакты неманской культуры, круга культуры шнуровой керамики, тштинецкого культурного круга, а также эпохи средневековья.

Summary

V. Lakiza

Preliminary results of archaeological research in the territory of Western Belarus in 2011

The article puts into scholarly circulation the preliminary results of research 2011 on archaeological monuments dated to different times and located in 4 districts of Western Belarus. In Grodna, Karelichy, Dyatlava districts we conducted the inventory of archaeological monuments included in «The State List of historical and cultural heritage of the Republic of Belarus», examined their current condition, made registration cards and scientific passports, prepared documents for a reservation zones project along with recommendation on their further preservation and usage. Considerable law violations regarding recordkeeping and archaeological heritage protection were fixed. We gathered new artefacts, conducted pit sampling, discovered new primitive settlements. In Kamenetz district we continued excavations on the settlement Kamenyuki-6-Student's mountain. The investigated area amounted to 41 sq. m. There were uncovered new artefacts of Neman Culture, Corded Ware Cultures Circle, Trzciniec Cultural Circle and also those dating to the Middle Ages.

УДК 902/904(476/7)

А. Ю. Ткачоў, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства (г. Мінск)*

Археалагічныя даследаванні на поўдні Белавежскай пушчы ў 2011 г.

Вясной–летам 2011 г. праводзіліся археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Асноўная ўвага была скіравана на вывучэнне помнікаў з матэрыяламі неаліту і бронзавага веку ў басейне р. Лясная Правая паміж вёскамі Селішча Малое і Камянюкі Камянецкага раёна.

Шышова-2 – паселішча з матэрыяламі каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў. Размешчана ў 1,5 км на ўсход ад вёскі ва ўрочышчы Іванькаўшчына, на ўзвышшы на правым беразе р. Лясная, непадалёку ад месца зліцця р. Правай Лясной і р. Левай Лясной. Помнік выявілі ў 1991 г. В. С. Вяргей, М. М. Крывальцэвіч, В. Я. Кудрашоў [1], ён быў абследаваны В. С. Вяргей ў 1993 г. [2], В. М. Сідаровічам у 2002 г. [6], А. Г. Калечыц у 2007 г. [3].

Падчас павярховых зборaў на помніку знойдзены: пласціна рабрыстая (1), праксімальные часткі пласцін (2), адшчэп (1), скол пласціністы (1).

Шышова-3 – паселішча з матэрыяламі каменнага (мезаліт – яніславіцкая культура; неаліт – нёманская культура), бронзавага (кола культур шнуравой керамікі, тшцінецкага культурнага кола), жалезнага вякоў і ранняга сярэдневякоўя. Размешчана праз 0,3 км на поўдзень ад пункта Шышова-2. Займае паўднёва-ўсходні канец выцягнутага з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход пясчанага ўзвышша на поплаве правага берага р. Лясная. Большая частка ўзвышша моцна пашкоджана ветравой эрозіяй. Помнік выявілі ў 1991 г. В. С. Вяргей, М. М. Крывальцэвіч, В. Я. Кудрашоў [1], паўторна ён быў абследаваны В. С. Вяргей у 1993 г. [2], В. М. Сідаровічам у 2002 г. [6] і А. Г. Калечыц у 2007 г. [3].

Падчас павярховых зборaў на помніку знойдзены: адшчэпы (6), адшчэп з мікрарэтушшу (1), пласціны і іх фрагменты (6), ляпная кераміка (4).

Селішча Малое-3 – паселішча каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў. Размешчана праз 450–500 м амаль на поўнач ад паўночна-заходняй ускраіны в. Селішча Малое і праз 140–160 м на паўночны захад ад паселішча Селішча Малое-2 на краі правабярэжнай тэрасы р. Лясная Правая. Помнік выявіў і даследаваў на плошчы 15 м^2 у 2007 г. В. Л. Лакіза [5]. У 2010 г. вывучэнне помніка працягнуў аўтар [8].

У сувязі з тым, што доўгі час плошчу помніка выкарыстоўвалі мясцовыя жыхары пад гаспадарчыя патрэбы, паўднёвая і ўсходняя часткі помніка моцна пашкоджаны ямамі рознага прызначэння. Цэнтральная і паўночная часткі помніка выглядаюць менш пашкоджанымі. Гэта дало падставу меркаваць, што там мог захавацца некрануты культурны пласт. Таму ў 2011 г. было вырашана праверыць гэтую гіпотэзу і закласці шурф у цэнтральнай частцы стаянкі.

Шурф памерам 3 × 3 м быў размешчаны на паўночны захад ад раскопу № 2 2010 г. Верхнія напластаванні шэрага колеру дасягнулі магутнасці да 0,2 м. Адразу пад ім быў прасочаны прапластак цёмна-шэрага колеру, які ў паўднёвай частцы шурфа нават выхадзіў на паверхню. Усё гэта падсцілалася жоўтым пяском. У шурфе былі выяўлены два аб'екты.

Аб'ект № 14. Памеры выяўленай часткі – 200 × 285 см. Запаўненне стракатае. Падчас разборкі былі знойдзены: нуклеус аднапляцовачны ад пласцін – 1, адшчэпы – 24, пласціны і іх фрагменты – 15, сколы – 3, абломкі крамянёвыя са слядамі апрацоўкі – 2, лускі – 16, фрагменты ляпной керамікі – 10, фрагменты ганчарнай керамікі – 6. Усяго 77 артэфактаў.

Аб'ект № 15. Падпрамакутная ў плане яма з запаўненнем брудна-жоўтага колеру. Памер перад разборкай – 65 × 150 см, глыбіня з моманту разборкі – 2 см. Знаходак не выяўлена.

Усяго ў шурфе 2011 г. была выяўлена 651 знаходка. З іх 595 апрацаваных крэменяў, у тым ліку 10 нуклеусаў, 9 прылад працы і зброі, 51 фрагмент ляпной керамікі (7 з іх арнаментаваны) (мал. 1: *5*), 4 фрагменты ганчарнай керамікі, фрагмент косткі і інш.

Нуклеусы ў асноўным аднапляцовачныя (8 экз.). Адзін шматпляцовачны са зменай арыентацыі сколвання і адзін двухпляцовачны. Прылады працы і зброя: 2 трохкутныя наканечнікі стрэл (мал. 1: *2, 3*) – рэтуш струменьчатая, двухбаковая. У абодвух наканечнікаў адламаны вастрыі; 2 скрабкі – адзін на адшчэпе (скрабніца аформлена паўстромкай рэтушшу), другі на скарыністым адшчэпе; 1 разец рэтушны адзінарны на рабрыстай пласціне; 2 праколкі – адна на сколе з захлыстам, другая на пласціне; 1 трохкутнік (мал. 1: *4*); 1 трапецыя (мал. 1: *1*).

Знаходкі 2011 г. падцвярджаюць даныя аб храналогіі помніка, якія былі атрыманы ў мінулыя гады даследаванняў. Першае насельніцтва з'явілася тут у эпоху мезаліту і адносіцца да яніславіцкай культуры. У неаліце на помніку пражывала насельніцтва нёманскай культуры, аб чым сведчаць знаходкі тыповай для гэтай культуры керамікі. Акрамя таго, на стаянцы прысутнічаюць матэрыялы, якія можна звязваць з насельніцтвам кола культур шнуравой керамікі. Верагодна, жыццё на помніку працягвалася і ў эпоху жалеза.

Селішча Вялікае-3. Стаянка з матэрыяламі эпохі неаліту і бронзавага веку размешчана праз 600–650 м практычна на поўнач ад усходняй ускраіны в. Се-



Мал. 1. Крамянёвыя вырабы (*1–4*) і ляпная кераміка (*5*) з помніка Селішча Малое-3

лішча Вялікае адразу ж за меліярацыйнымі каналамі праз 200 м на захад ад помніка Селішча Вялікае-2, на вялікім пясчаным узвышшы ў левабярэжным поплаве р. Лясная Правая. Помнік выявіў і візуальна абследаваў у 2007 г. В. Л. Лакіза [5].

Для высвятлення магутнасці культурнага пласта на помніку ў 2011 г. былі закладзены тры шурфы агульнай плошчай 10 м^2. Усяго на помніку было выяўлена 72 артэфакты, з іх 37 крамянёвых вырабаў, 32 вырабы з гліны, 3 фрагменты кальцыніраваных костак. Вырабы з крэменю не маюць другаснай апрацоўкі і адносяцца да прадуктаў першаснага расчаплення (адшчэпы – 17, фрагменты пласціны – 3) ці дэбітажу (абломкі крамянёвыя – 3, фрагмент сколу – 1, лускі – 13).



Мал. 2. Крамянёвыя вырабы (*1–4*) і ляпная кераміка (*5–9*) з помнікаў Плянта-2 (*1*), Камянюкі-9 (*2–8*), Селішча Вялікае-3 (*9*)

Большасць знаходак з помніка могуць быць датаваны ў вельмі шырокіх храналагічных межах, таму вялікую цікавасць выклікаюць знаходкі венчыка, які адносіцца да старажытнасцей тшцінецкага культурнага кола (мал. 2: *9*) і фрагмент сценкі чорнаглянцаватай пасудзіны, які можна звязваць з насельніцтвам жалезнага веку.

Плянта-2 – стаянка каменнага веку, размешчаная на левым беразе р. Лясная Правая праз 0,2 км на захад ад былой в. Плянта. Займае невысокую дзюну памерам 50 × 250 м, што выцягнута з поўначы на поўдзень уздоўж выпрастанай рачулкі, якая злучае возера з р. Лясная Правая. Помнік выяўлены ў 2010 г. аўтарам [7].

У 2011 г. было вырашана працягнуць даследаванні на помніку, каб вызначыць, ці перспектыўна праводзіць на ім стацыянарныя археалагічныя раскопкі, і даведацца межы стаянкі ў паўднёвым і ўсходнім накірунках. Усяго на помніку былі закладзены тры шурфы агульнай плошчай 24 м^2. Культурны пласт на помніку мае наступную стратыграфію: дзёран (да 0,08 м); сучасная глеба (0,16–0,22 м), якая падсцілаецца стракатым пластом з плямамі шэрага, белага, рудаватага колераў.

На помніку была знойдзена 71 знаходка. У асноўным гэта крамянёвыя вырабы – прадукты першаснага расчаплення (адшчэпы і іх фрагменты – 14, пласціны і іх фрагменты – 6, сколы нявызначаныя – 2), тэхнічныя сколы (скол падпраўкі пляцоўкі нуклеуса – 1), дэбітаж (луска – 14, абломкі са слядамі апрацоўкі – 2). У калекцыі маюцца: трапецыя – 1 (мал. 2: *1*), фрагмент скрабка – 1. Акрамя таго, скрабок і рэтушаваны адшчэп былі знойдзены падчас павярховых зборaў.

Вырабаў з гліны знойдзена 17. У асноўным гэта ганчарная кераміка (14 фр.). Частка з іх (4 фр.) з палівай зялёнага колеру ці рознакаляровай. Ляпная кераміка прадстаўлена толькі адным фрагментам. Па аднаму экзэмпляру знойдзены таксама дробны

фрагмент моцна пашкоджанай керамікі і глінянай абмазкі. Вырабы з металу прадстаўлены фрагментам нажа і двума цвікамі. Знойдзен адзін фрагмент косткі.

Папярэдне помнік можна датаваць мезалітам.

Камянюкі-9 – стаянка каменнага і бронзавага вякоў. Размешчана на паўднёва-ўсходняй ускраіне в. Камянюкі, праз 200 м на ўсход ад цаглянага будынка фермы на пясчаным узвышшы пасярод правабярэжнага поплава р. Лясная Правая. Плошча помніка часткова задзірванела, парасла кустамі ядлоўцу. Помнік выявіў у 2007 г. В. Л. Лакіза [5] і даследаваў у 2008 г. метадам шурфоўкі 5 м^2 [4].

На развеянай паверхні былі знойдзены і ўключаны ў калекцыю 10 артэфактаў: нуклеус двухпляцовачны ад пласцін з сустрэчным сколваннем, нуклеус аднапляцовачны ад пласцін, 3 пласціны, 3 пласціны і фрагменты з участкамі рэтушы, 2 сценкі ляпной керамікі.

У 2011 г. на помніку было даследавана 14 м^2. Была прасочана наступная стратыграфія: дзёран (0,08 м), сучасная глеба (ад 0,1 да 0,22 м), жоўты пясок (ад 0,28 да 0,5 м), які плаўна пераходзіў у стракаты слой, слаба насычаны дробным жвірам.

Шурф № 3 памерам 5 × 2 м быў размешчаны ў цэнтральнай частцы помніка. У шурфе знойдзена 759 артэфактаў: 495 вырабаў з крэменю, 262 – з керамікі, 2 – з жалеза.

Крамянёвыя артэфакты ў пераважнай большасці прадстаўлены першаснымі і тэхнічнымі сколамі, адходамі вытворчасці: 32 абломкі са слядамі апрацоўкі, 168 адшчэпаў і іх фрагменты, 84 пласціны і іх фрагменты, 23 скола, 2 разцовых скола, 167 лусак. Знойдзены 4 аднапляцовачныя нуклеусы. З другаснай апрацоўкай выяўлена: 2 вастрыі, мікраліт, трапецыя (мал. 2: *2*), 2 пласціны са скошанным рэтушшу краем, 3 пласціны з участкамі рэтушшы, нож (?), скол з захлыстам рэтушаваны (скобель), разец двайны на пласціне, 5 скрабкоў.

Ляпной керамікі знойдзена 90 фрагментаў: 4 венчыкі і 86 сценак. Ганчарная кераміка прадстаўлена 20 венчыкамі, 145 сценкамі і 7 донцамі. Усяго 172 адзінкі. Уся яна тонкасценная, высокай якасці вытворчасці. Датаваць яе можна XIX–XX стст.

Шурф № 4 памерам 2 × 2 м быў размешчаны на краі паўночна-заходняга схілу ўзвышша. У шурфе знойдзены 363 крамянёвыя артэфакты. У пераважнай большасці гэта першасныя, тэхнічныя сколы і адходы вытворчасці: 15 абломкаў са слядамі апрацоўкі, 114 адшчэпаў і іх фрагменты, 64 пласціны і іх фрагменты, 10 нявызначаных сколаў, 3 мікрасколы, 2 сколы падпраўкі пляцоўкі нуклеуса, 135 лусак. Нуклеусаў выяўлена 9 экзэмпляраў: 5 аднапляцовачных, 2 двухпляцовачных і 2 фрагменты.

З другаснай апрацоўкай знойдзены: адшчэп рэтушаваны (1), пласціна з выемкай (1), пласціна з рэтушшу утылізацыі – нож (?) (1), сегмент (1) (мал. 2: *3*), трохкутнік (1) (мал. 2: *4*), праколка (1), скобель (1), фрагменты скрабкоў (2), цясло (1), прылада долатападобная (1).

Ляпной керамікі знойдзена толькі 9 фрагментаў сценак. Фрагменты дробныя, з дамешкамі жарствы і пяску. Ганчарная кераміка прадстаўлена венчыкам, 23 сценкамі і 3 донцамі. Уся яна тонкасценная, высокай якасці. Датаваць яе можна XIX–XX стст. Акрамя таго, знойдзены 5 фрагментаў сценак, пра тэхналогію вытворчасці якіх цяжка казаць, 3 фрагменты абмазкі і 2 нявызначаныя гліняныя вырабы.

Да каморніцка-кудлаеўскага тэхнакомплексу можна аднесці знойдзеныя сегмент і трохкутнік. Адзін венчык ляпной керамікі (з дамешкамі пяску, шамота і жарствы) упрыгожаны адбіткамі лінейнага штампа (мал. 2: *5*) у традыцыях культуры шарападобных амфар. Да старажытнасцей тшцінецкага культурнага кола адносяцца два фрагменты венчыка (мал. 2: *7, 8*).

Камянюкі-10 – стаянка каменнага веку, якая размешчана за паўднёва-ўсходняй ускраінай в. Камянюкі ў 400–450 м на паўднёвы ўсход ад цаглянага будынка фермы і 150–200 м на паўднёвы ўсход ад стаянкі Камянюкі-9 на правабярэжнай тэрасе р. Лясная Правая. Помнік выявіў у 2007 г. В. Л. Лакіза [5].

На паверхні былі сабраны: адшчэпы – 3, пласціны і іх фрагменты – 7, сценка ляпной керамікі – 1, ганчарная кераміка – 9. Фрагмент ляпной керамікі, упрыгожаны пасам адступаючых наколаў, адносіцца да прыпяцка-нёманскай культуры.

Селішча Вялікае-2 – паселішча з матэрыяламі каменнага веку размешчана праз 0,7–0,8 м на паўночны-паўночны захад ад усходняй ускраіны в. Селішча Вялікае, на выцягнутым з усхода на захад пясчаным узвышшы (астанцы тэрасы ?) пасярод шырокага левабярэжнага поплава р. Лясная Правая. Паверхня помніка задзірванелая. На невялікіх развеяных участках былі сабраны двухпляцовачны нуклеус ад пласцін, адшчэп, пласціна, фрагмент сценкі ляпной керамікі.

Помнік выявыў В. Л. Лакіза у 2007 г. [5]. У 2010 г. на плошчы 1 м^2 правёў даследаванне аўтар [7]. Шурфоўка паказала, што культурны пласт не пашкоджаны, таму паселішча было абрана для правядзення стацыянарных раскопак.

Раскоп памерамі 4 × 10 м быў размешчаны ва ўсходняй частцы помніка і арыентаваны па баках свету (доўгім бокам па лініі захад–усход). Адразу пад дзёрнам, які дасягаў магутнасці 0,08 м, ішоў пласт шэрага пяску. Магутнасць яго павялічвалася ў заходнім накірунку (ад 0,10 м ва ўсходняй частцы раскопу да 0,20–0,23 м ў заходняй). Шэры пласт падсцілаўся жоўтым (цёмным на мяжы і светлым, часам бялесым, унізе) дробназярністыя пяском. Мяжа паміж слаямі была невыразная, расплывістая. У раскопе былі выяўлены два аб'екты.



Мал. 3. Крамянёвыя вырабы (*1–3, 5*) і ляпная кераміка (*4*) з помніка Селішча Вялікае-2

Аб'ект № 1 – яма падакруглай формы з запаўненнем светла-шэрага колеру. Памеры – 124 × 130 см, глыбіня з моманту фіксацыі – 32 см. У аб'екце знойдзены 2 адшчэпы.

Аб'ект № 2 – яма аморфнай формы з запаўненнем светла-шэрага колеру. Выяўлена часткова. Памеры выяўленай часткі – 195 × 232 см, глыбіня з моманту фіксацыі – 24 см. У аб'екце знойдзены адшчэп, фрагмент пласціны, пласціна рэтушаваная, скол з захлыстам, 2 лускі.

Усяго ў раскопе было выяўлена 1055 знаходак, у тым ліку 802 вырабы з крэменю, 241 выраб з гліны і інш.

Сярод нуклеусаў, якіх у раскопе выяўлены 21 экзэмпляр, пераважаюць аднапляцовачныя (18) (мал. 3: *5*), таксама знойдзены 2 двухпляцовачныя і 1 шматпляцовачны. Прылад працы знойдзена мала: 2 мікраліты (мал. 3: *1, 2*), 3 скрабкі (на адшчэпе (мал. 3: *3*), на пласціне, на пласціне фрагментаваны), праколка, фрагмент прылады з пільчатай рэтушшу.

Ляпной керамікі выяўлены 192 адзінкі. Абсалютная большасць з іх гэта фрагменты сценак (186), значна менш фрагментаў венцаў (5) і донцаў (1). Большую частку нельга дакладна аднесці да той ці іншай культуры. Тры фрагменты паходзяць ад гаршка прыпяцка-нёманскай ранненеалітычнай культуры (мал. 3: *4*). Зрэз венца ў гаршка рыфлёны. Адразу пад ім маецца пас скразных адтулін, пад якімі зроблены тонкія гарызантальныя пракрэсленыя лініі. З нёманскай культурай звязваюцца знаходкі тонкасценнага венчыка з рыфлёным зрэзам і адтулінай пад краем, фрагменты сценкі з рознымі наколамі. Адзін буйны фрагмент упрыгожаны вертыкальным пасам капытак і кампазіцыяй з адбіткаў лінейнага штампа. Да тшцінецкага культурнага кола належыць фрагмент сценкі з пракрэсленымі лініямі і, магчыма, фрагмент венчыка.

Знойдзена 47 фрагментаў ганчарнай керамікі, у тым ліку 4 венчыкі, 39 сценак, 4 донцы. Большая частка ганчарнай керамікі паходзіць з другога пласта. Акрамя таго, знойдзены фрагменты глінянага праселка, цэглы і керамікі, якая не паддаецца вызначэнню.

У храналогіі помніка можна вылучыць некалькі этапаў: мезаліт, неаліт (прыпяцка-нёманская і нёманская культуры), бронзавы век (тшцінецкае культурнае кола), жалезны век. У перспектыве на помніку неабходна працягнуць раскопкі.

Літаратура

1. Вяргей, В. С. Справаздача аб палявых даследаваннях у Камянецкім, Брэсцкім, Столінскім раёнах Брэсцкай вобласці, Жыткавіцкім і Петрыкаўскім раёнах Гомельскай вобласці / В. С. Вяргей, М. М. Крывальцэвіч // ААНД ІГ НАН Беларусі. – Спр. № 1392.

2. Вяргей, В. С. Справаздача аб палявых даследаваннях у Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці і Петрыкаўскім раёне Гомельскай вобласці ў 1993 годзе / В. С. Вергей // ААНД ІГ НАН Беларусі. – Спр. № 1477.

3. Калечиц, Е. Г. Отчет о полевых исследованиях 2007 года на территории Западного Полесья / Е. Г. Калечиц // ААНД ІГ НАН Беларусі. – Спр. № 2462.

4. Лакіза, В. Л. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у Белавежскай пушчы ў 2008 годзе / В. Л. Лакіза // ААНД ІГ НАН Беларусі. – Спр. № 2686.

5. Лакіза, В. Л. Вывучэнне помнікаў каменнага і бронзавага вякоў на тэрыторыі Белавежскай пушчы ў 2007 годзе / В. Л. Лакіза // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Вып. 17. – Мінск, 2009. – С. 143-150.

6. Сідаровіч, В. М. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці ў 2002 годзе / В. М. Сідаровіч // ААНД ІГ НАН Беларусі. – Спр. № 2017.

7. Ткачоў, А. Ю. Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Камянецкага і Пружанскага раёнаў Брэсцкай вобласці ў 2010 годзе / А. Ю. Ткачоў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Вып. 23. – Мінск, 2012. – С. 262–265.

8. Ткачоў, А. Ю. Раскопкі 2010 года на стаянцы каменнага веку Селішча Малое-3 у басейне р. Лясная Правая / А. Ю. Ткачоў, В. У. Ашэйчык // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Вып. 23. – Мінск, 2012. – С. 266–269.

Резюме

О. Ю. Ткачёв

Археологические исследования на юге Беловежской пущи в 2011 г.

Представлены предварительные итоги археологических исследований памятников каменного–бронзового веков на юге Беловежской пущи.

Summary

A. Tkachou

Archaeological research in the south of the Bialowieza Forest in 2011

The article is devoted to the preliminary results of the archaeological research of sites of Stone and Bronze Age in the south of the Bialowieza Forest.

УДК 903.4(476.5)«2011»

З. А. Харытановіч, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства (г. Мінск)*

Археалагічныя даследаванні гарадзішча Бірулі ў 2011 г.

У палявым сезоне 2011 г. на падставе Дазволу № 2294 па форме № 1, які быў выдадзены Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, былі праведзены раскопкі на гарадзішчы каля в. Бірулі Туміловіцкага сельсавета Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці. Гарадзішча Бірулі (мясцовая назва «Шведская гара») з'яўляецца часткай розначасовага археалагічнага комплексу, у які таксама ўваходзяць тры селішчы, два курганных могільніка і дзве стаянкі каменнага–бронзавага вякоў. Помнік размешчаны ў 1,5–2,0 км на поўдзень–паўднёвы захад ад вёскі, на стрэлцы доўгага пагорку ў лесе. Вышыня ад падножжа дасягае 10 м. Мае магутную сістэму ўмацаванняў, якая складаецца з унутранага вала і двух знешніх, падзеленых ровам. Унутраны вал, які мае дугападобную форму, насыпаны на паўночным краі пляцоўкі. Яго максімальная шырыня каля падножжа – 7 м, вышыня – 0,6–0,7 м. Яшчэ два валы ўмацоўваюць гарадзішча з паўночнага захаду і паўночнага ўсходу. Яны ўтвараюць своеасаблівы калідор, які верагодна служыў месцам уваходу. Шырыня валоў каля падножжа – 10–12 м, вышыня – 1,5–2,0 м. Паміж пляцоўкай і валамі выкапаны роў шырынёй да 12–13 м. Паўночна-ўсходні вал пераходзіць у тэрасу, якая ў паўднёвай частцы гарадзішча паступова пераходзіць у схіл. Шырыня тэрасы дасягае 3,0–3,5 м. Пляцоўка гарадзішча роўная, захавалася добра, моцна задзірванелая, парослая хмызняком і дрэвамі; у плане мае яйкападобную форму, даўжыня пляцоўкі – 56 м, шырыня – 48 м (мал. 1: *1*).

У 1971 г. А. Р. Мітрафанаў даў падрабязнае апісанне гарадзішча, склаў план, агледзеў агаленні культурнага пласта. Згодна яго звесткам пласт у цэнтры пляцоўкі складаў 0,3–0,4 м, а бліжэй да краёў – 1,0–1,3 м. Пры зачыстцы сценак адной з ям у паўднёвай частцы пляцоўкі былі знойдзены абломкі штрыхаванага посуду, кавалкі жалезнага жужалю, перапаленыя камяні. Даследчык аднёс гарадзішча да культуры штрыхаванай керамікі і датаваў перыядам II–III – V стст. н. э. [2].

Раскоп 2011 г. памерамі 32 м^2 быў размешчаны ў паўднёвай частцы пляцоўкі ў 6 м ад паўднёвага і ўсходняга краёў. Адразу пад дзёрнам ішоў культурны пласт у выглядзе цёмна-шэрага супеску, насычанага дробнымі каменчыкамі. У кв. 6 было зафіксавана некалькі невялікіх камянёў. Даўжыня іх не перавышала 25 см. Яшчэ адзін, больш буйны (35 см), быў размешчаны ў паўднёвай частцы квадрата.

Другі пласт прадстаўлены цёмна-шэрым супескам, у якім сустракаецца шмат вельмі дробных каменьчыкаў, дробныя кавалкі вугольля. У ім былі зафіксаваны 4 аб'екты. *Аб'ект 1* – пляма супеску чорнага колеру, якая абмежавана дугападобнай паласой жоўтага пяску ў паўднёва-заходнім куце квадрата. Памеры аб'екта па лініі поўнач–поўдзень – 1 м, захад–усход – 0,85 м. *Аб'ект 2* – выцягнутая па лініі захад–усход аморфная пляма буйназярністага пяску карычнева-жоўтага колеру. Размешчаны ў паўночнай палове кв. 8. Даўжыня – 1,3 м, шырыня максімальная – да 0,4 м. Пры разборцы высветлілася, што аб'ект з'яўляецца часткай мацерыковай паверхні, верагодна, рэшткі вала. *Аб'ект 3* – дугападобная выкладка камянёў, якая размешчана на мяжы кв. 7 і 8. Памеры – 1,0 × 0,5 м, памеры камянёў – да 20 см. Верагодна, да гэтага аб'екта адносіцца і нагрувашчанне камянёў каля паўднёвай сценкі раскопу ў кв. 8. *Аб'ект 4* – каменная выкладка, складзеная з буйных (25–30 см) валуноў. Размешчана ў паўночнай палове кв. 6 са змяшчэннем на ўсход. На поўнач і поўдзень ад аб'екта зафіксаваны асобныя камяні. Памеры аб'екта – 1,0 × 0,8 м.

У трэцім пласце характар слою не змяніўся. У паўночных квадратах на глыбіні 0,42 м адзначаецца выхад на мацярык. У астатняй часцы раскопу глыбіня культурнага пласта складае – 0,53–0,58 м. У пласце 3 зафіксаваны 2 аб'екты і яшчэ 2 – у мацерыковай паверхні. *Аб'ект 5* размешчаны ў цэнтральнай частцы кв. 7 і сыходзіць у заходнюю сценку раскопу. Уяўляе сабой аморфную пляму з светла-жоўтага пяску і чорнага супеску, насычанага вуголлем. У паўднёвай частцы плямы зафіксаваны 3 невялікія камяні, памерамі да 20 см па доўгай восі. Памеры плямы па лініі захад–усход – 1,4 м, поўнач–поўдзень – 0,9 м. *Аб'ект 6* – каменная выкладка, зафіксаваная ў кв. 4 уздоўж мяжы з кв. 3. Выцягнута па лініі поўнач–поўдзень, трохі выгнутая дугой. Памеры аб'екта – 1,6 × 1,2 м, памеры камянёў вагаюцца ад 10 да 35–40 см. Паміж вялікімі камянямі ў паўночнай частцы аб'екта зафіксаваны рэшткі перапаленага дрэва.

Мацярык у раскопе прадстаўлены шчыльным буйназярністым пяском са жвірам і дробнымі камянямі. У кв. 7–8 мацерыковая паверхня ўтварае невялікі астанец са жвіру і буйназярністага пяску з уключэннем дробных камянёў (рэшткі аб'ектаў 1 і 2). Пры зачыстцы мацерыка на ім зафіксаваны абрысы двух аб'ектаў. *Аб'ект 7* – паласа культурнага пласта чорнага колеру з уключэннем дробных вугольчыкаў, якая цягнецца ўпоперак раскопу праз кв. 5 і 6, захоплівае кв. 3, 4, 7, 8. Максімальная шырыня аб'екта – 3,76 м уздоўж усходняй сценкі. Максімальная глыбіня раскопу адзначана на мяжы кв. 5 і 7 у аб'екце

7 – 1 м. *Аб'ект 8* – мацерыковая яма на мяжы кв. 1 і 3. Памеры – 1,56 × 1,30 м. У сячэнні прасочваецца паглыбленне да 0,4 м ва ўсходняй частцы. Запаўненне – цёмна-шэры, амаль чорны супесак, знаходак няма.

Стратыграфія ў паўночнай частцы раскопу простая – аднастайны цёмна-шэры супесак. У цэнтральнай частцы зафіксавана паніжэнне мацерыковага ўзроўню да агульнай глыбіні 0,9–1,0 м (аб'ект 7), тут зафіксаваны таксама скапленні камянёў (па ўсходнім профілі), рэшткі перапаленага бярвення. Аб'ект 7 размешчаны ўздоўж мацерыковага астанца, які ідзе па дыяганалі праз кв. 8, уздоўж краю пляцоўкі. Магчыма, гэта рэшткі першапачатковых умацаванняў гарадзішча, вала і рова. Каменныя вымасткі (акрамя аб'екта 6) фіксуюцца над аб'ектам 7. Складаная стратыграфія прасочваецца толькі ў запаўненні аб'екта 1 па знешнім боку астанца. Тут зафіксаваны праслойкі пяску розных адценняў, перамешанага з культурным пластам. Прызначэнне аб'екта 1 невысветлена. Неабходна працягнуць даследаванне абарончых збудаванняў гарадзішча.

Усяго ў раскопе 1 знойдзена 16 індывідуальных знаходак, у тым ліку з жалеза – 8 вырабаў, з гліны – 2, з бронзы – 5 і са свінцова–алавяністага сплаву – 1 (мал. 1). Вырабы з жалеза прадстаўлены абломкам пінцэта, фрагментам ляза сякеры, галоўкай кіяпадобнай шпількі, нажом з абламаным вастрыём і чаранком, фіцільнай трубачкай. Таксама знойдзены 3 нявызначаныя вырабы: прамавугольная пласцінка з адтулінай, стрыжань з прамавугольным сячэннем і асколак снараду.

Пінцэт жалезны (мал. 1: *6*) адносіцца да тыпу IB па класіфікацыі А. Стробін, аналогіі пінцэтам такога тыпу вядомы на тэрыторыі Польшчы, датуюцца яны мяжой н. э. [4, s. 127–143].

Нож жалезны (мал. 1: *3*). Абламанае вастрыё і частка чаранка. Спінка роўная, аддзяляецца ад чаранка ўступамі з двух бакоў. Нажы такога тыпу сустракаюцца на помніках I тысячагоддзя н. э. Беларускага Падзвіння [3, Табл. 13: *II*].

Кіяпадобная шпілька жалезная (мал. 1: *2*). Абламаны стрыжань, засталася толькі галоўка кроплепадобнай формы з завітком. Шпількі такога тыпу датуюць вельмі шырока, на тэрыторыі Беларускага Паддзвіння сустракаюцца пераважна на помніках пачатку н. э. [3, табл. 3: *I*].

Трубачка для кноту жалезная (мал. 1: *10*) з пятлёй для падвешвання. Даўжыня – 9,2 см, дыяметр – 0,8, таўшчыня – 0,2 см. Аналагічныя вырабы вядомы на тэрыторыі Расіі (могільнік Мініна II, пахаванне з крэмацыяй) і датаваны мяжой X/XI стст. [1, с. 41–42].

Трапецападобная падвеска бронзавая (мал. 1: *8*), складаецца з двух абломкаў. Доўгая трапецападобная падвеска (для грыўны) з вушкам у вузкай частцы, двума выпуклымі палоскамі па баках і кропкавым пуансонным арнаментам. Частка з вушкам пагнутая, адзін край знізу адламаны. Даўжыня – 4,5 см, шырыня мінімальная – 1,1, шырыня максімальная – 3,1, таўшчыня – 0,5 см. Падвескі такога тыпу – вялікіх памераў, упрыгожаныя кропкавым штампаваным арнаментам – з'яўляюцца з VII–VIII стст. Ёсць аналогіі ў латгальскіх пахаваннях VIII–X стст., ва ўсходнелітоўскіх старажытнасцях другой паловы I тысячагоддзя н. э., старажытнасцях банцараўскай культуры. Трапецападобныя падвескі выкарыстоўвалі як элементы ўпрыгажэнняў жаночых галаўных венчыкаў, скроневых кольцаў і шыйных грыўняў [3, табл. 20: *25–26*]

Накладка паясная бронзавая з пазалотай (?) (мал. 1: *8*). Мае кроплепадобную форму, выраблена з бронзы з пазалотай і чарненнем (?), упрыгожана раслінным арнаментам, літая. Мацавалася на двух штырках, якія абламаны. Даўжыня – 1,6 см, шырыня – 1,0, таўшчыня – 0,15 см. Аналогіі такім накладкам вядомы на помніках старажытнарускага часу і датаваны другой паловай X ст. (вызначэнне П. М. Кенькі).

Таксама знойдзены прамавугольная бронзавая падвеска (мал. 1: *1*), якая выраблена з тонкай пласціны, фрагмент спіралепадобнай пранізкі, абломак невызначанага бронзавага вырабу, два фрагменты гліняных біканічных праселак, якія можна аднесці да першай паловы–сярэдзіны I тысячагоддзя н. э. [3, табл. 20: *30*].

Вырабы з гліны прадстаўленыя двума абломкамі праселак. Першае праселка біканічнае з шырокай адтулінай, паверхня заглянцаваная, па абедзвюх гранях аздоблена зігзагападобным арнаментам з пракрэсленых ліній (мал. 1: *5*). Захавалася часткова. Дыяметр – 2 см, дыяметр адтуліны – 1,2, вышыня – 1,2, таўшчыня сценкі – 0,5 см. Датавана другой–трэцяй чвэрцю I тысячагоддзя н. э. [3, табл. 17: *II: 10*]. Другое праселка таксама біканічнае, але адносіцца да іншага тыпу (мал. 1: *4*). Адна бакавая грань роўная, другая з выгінам. Верхняя і ніжняя грані з борцікам па знешнім краі. Паверхня загладжаная, трохі падглянцаваная. Дыяметр – 3,5 см, дыяметр адтуліны – 1,4, вышыня – 1,3, таўшчыня сценкі – 1,0 см. Датавана першымі стагоддзямі н. э. [3, табл. 26]

Такім чынам, комплекс індывідуальных знаходак з гарадзішча Бірулі можна аднесці да наступных перыядаў: 1) першыя стагоддзі н. э., так датаваны пінцэт, абломак кіяпадобнай шпількі, абломак сякеры (?) і, верагодна, адно з праселак; 2) сярэдзіна–трэцяя чвэрць I тысячагоддзя н. э. (бронзавыя падвескі, нож, арнаментаванае праселка); 3) X ст. н. э. (фіцільная трубачка і паясная накладка).

На помніку было знойдзена 455 адзінак масавага матэрыялу. Выдзяляюцца наступныя катэгорыі: рэшткі вытворчасці жалеза: жужаль і зліткі жалеза;



Мал. 1. План помніка і індывідуальныя знаходкі з раскопу 1: *I* – план гарадзішча (паводле А. Р. Мітрафанава); *1* – падвеска бронзавая; *2* – шпілька кіяпадобная жалезная; *3* – нож жалезны; *4, 5* – праселкі гліняныя; *6* – пінцэт жалезны; *7* – падвеска бронзавая трапецападобная; *8* – накладка бронзавая паясная; *9* – пранізка спіральная; *10* – трубачка жалезная для кноту. Гарадзішча Бірулі. 2011 г. Малюнак Т. Зінчанка

абломкі ляпной і кругавой керамікі, косткі, кавалак шкла.

Асноўную частку масавага матэрыялу складалі фрагменты керамікі – 151 адз. З іх 7 фрагментаў ад кругавой пасудзіны з палівай зялёнага колеру – развал донца. Ляпная кераміка прадстаўлена 144 адз.

Асноўным тыпам посуду на помніку была гладкасценная кераміка, якую можна аб'яднаць з бугрыстай, бо яны адрозніваліся толькі большай ці меншай ступенню загладжанасці паверхні. На другім месцы стаіць кераміка з падштрыхоўкай паверхні. Ад керамікі класічнай культуры штрыхаванай керамікі (КШК) яна адрозніваецца больш невыразнай штрыхоўкай і поўнай адсутнасцю рабрыстых форм. Па якасці цеста штрыхаваная і гладкасценная кераміка не адрозніваюцца. Хутчэй за ўсё штрыхоў-

ку на посуду гарадзішча Бірулі выкарыстоўвалі ў тэхналагічных мэтах для загладжвання паверхні посуду.

Па формах посуд выдзяляецца ў дзве групы. Да першай адносяцца пасудзіны прафіляванай формы, з выдзеленай шыйкай (лепельскі тып, аналогіі на гарадзішчах ДДК Лепельскага раёна), прафіляваным венцам і лёгкай падштрыхоўкай паверхні (мал. 2: *I*). Шыйка выдзялялася пракрэсленай лініяй, ці адмысловым загладжваннем. Другая група прадстаўлена фрагментамі керамікі банцараўскай культуры. Гэта пераважна слабапрафіляваныя, з кароткім, адагнутым вонкі венчыкам пасудзіны (мал. 2: *II*).

Такім чынам, паводле папярэдніх даных жыццё на помніку працягвалася ад мяжы I тысячагоддзя н. э. да трэцяй чвэрці I тысячагоддзя н. э. Верагодна, у больш позды час гарадзішча выкарыстоўвалі ў якасці сховішча.

Раскопкі на помніку варта працягваць. Так, досыць перспектыўнымі ўяўляюцца раскопкі ў паўночнай частцы пляцоўкі, а таксама прарэзка вала і схілу з мэтай вывучэння абарончых ўмацаванняў.



Мал. 2. Ляпная кераміка з раскопу 1: *I* – кераміка днепра-дзвінскай культуры; *II* – кераміка трэцяй чвэрці I тысячагоддзя н. э. Гарадзішча Бірулі. 2011 г.

Літаратура

1. Археология севернорусской деревни X–XШ веков : средневековые поселения и могильники на Кубенском озере : в 3 т. / отв. ред. Н. А. Макаров ; Ин–т археологии РАН. – М. : Наука, 2007 – Т. 2 : Материальная культура и хронология / [ред. С. Д. Захаров]. – 2008. – 365 с.

2. Митрофанов, А. Г. Отчет о полевых исследованиях в 1971 г. / А. Г. Митрофанов // Архив археологической научной документации ГНУ «Институт истории НАН Беларуси». – Арх. № 380.

3. Шадыра, В. І. Беларускае Падзвінне (I тысячагоддзе н. э.) / В. І. Шадыра ; навук. рэд. Г. В. Штыхаў – Мінск : ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2006. – 150 с. : іл.

4. Strobin, A. Pęsetka brązowa z cmentarzyska kultury oksywskiej w Wyczechowie, pow. Kartuski / A. Strobin // Wiadomości archeologiczne. – T. LVIII. – Warszawa, 2006. – C. 127–143.

Резюме

З. А. Харитонович

Археологические исследования городища Бирули в 2011 г.

В 2011 г. начались археологические исследование на городище Бирули Докшицкого района Витебской области. Был заложен раскоп размером 32 м^2. Получены материалы трех периодов: днепро-двинской культуры, третьей четверти I тысячелетия н. э., X в. н. э.; новые данные по оборонительной системе городища.

Summary

Z. Kharytanovich

Archaeological investigation of the Birulie hill-fort in 2011

Archaeological investigations of the Birulie hill-fort (Dokshitsy district, Vitebsk region) has began in 2011. The studied area of 32 sq. m. Materials of three periods has been excavated: the Dnieper-Dvina culture, the third quarter of the I millennium AD, 10th century AD. New data on the defense system of the hill-fort received.

УДК 902/904(476)«2011»

Макс. М. Чарняўскі, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск)*

Даследаванні на Беларускім Паазер'і ў 2011 г.

У 2011 г. аўтар праводзіў планавыя раскопкі на паселішчы Асавец-2 Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці, а таксама разведкі ў Мядзельскім раёне Мінскай, Лепельскім, Чашніцкім раёнах Віцебскай абласцей (мал. 1).

Раскопкі паселішча Асавец-2 («паўднёвы раскоп»). Лета 2011 г. адзначалася павышанай абсохласцю тарфяніка, як вынік культурны пласт паселішча быў амаль цалкам вышэй узроўню грунтовых водаў. Аднак такія ўмовы сталіся прычынай пажару тарфяніку непасрэдна побач з помнікам. На шчасце, узгаранне адбылося толькі буквальна за некалькі дзён да прыезду экспедыцыі, і ў першы ж дзень сіламі валанцёраў быў выкапаны невялікі роў, які спыняў распаўсюджванне агню ў кірунку паселішча. Праз дзень пажар быў цалкам затушаны мясцовым аддзелам МНС, які аператыўна зрэагаваў на наш зварот, за што выказваем ім вялікую падзяку.

З уласна раскопачных работ першапачаткова быў запланаваны працяг даследавання кв. 415–426, якое вялося з 2009 г. Аднак праз дастатковую колькасць валанцёраў, пазней было прынята рашэнне раскансерваваць таксама раскоп 2008 г. – кв. 400–414, у выніку атрымаўся адзін агульны раскоп плошчай 27 м^2. На кв. 415–426 былі ўскрыты 2 пласты (70–80, 80–90 см), на кв. 400–414 – 1 пласт (50–60 см).

Методыка даследавання не мянялася з мінулых гадоў – разборка культурнага пласта метровымі квадратамі пластамі па 10 см дробным інструментам. Увесь перабраны грунт дадаткова прасейваўся на пластыкавай сетцы з вочкамі у 5 мм. Выяўленыя ў квадратах артэфакты фіксаваліся на адзіным плане знаходак. Усе канструкцыі і асаблівасці культурнага пласта асобна фіксаваліся і замалёўваліся. Пасля кожнага пласта праводзілася дадатковая зачыстка і агульная фіксацыя характару культурнага пласта.

Культурны слой вельмі разнастайны, насычаны рэшткамі драўляных канструкцый, спрэсаванымі плямамі паўраскладзенай кары, пясчанымі і апясчаненымі прапласткамі, зольнікамі розных памераў, замешанага глінянага цеста. Вылучаецца вялікая колькасць рыбных костак і кары, якія хоць і сустракалася менш, чым ў сезоне 2010 г., аднак іх усё ж такі было дастаткова многа. Варта адзначыць канцэнтрацыі невялікіх каменьчыкаў і ракавінак перлаў, у тым ліку не падробленых і нават не паламаных на асобныя палавінкі.

Даследаваннямі выяўлена 175 артэфактаў з крэменю, бурштыну, косткі і рогу, гліны і дрэва, больш за 2,5 тысячы фрагментаў керамікі, а таксама шматлікі масавы матэрыял, які складаецца найперш з фрагментаваных костак, лясных арэхаў, чылімаў і іх шалупіння.

Калекцыя крамянёвых артэфактаў менш разнастайная, чым у папярэднія гады у вышэйшых пластах гэтага ж раскопу. Звяртае на сябе ўвагу значнае памяншэнне колькасці наканечнікаў стрэл (15 экзэмпляраў), і павелічэнне вырабаў нявызначанага прызначэння. Усяго выяўлена 78 артэфактаў, сярод іх скрабкі, вырабы невядомага прызначэння, наканечнікі стрэл, рэжучыя вырабы, пракруткі, свердзелы, скоблі, фрагмент мікрапласціны з пільчатай рэтушшу, камбінаваная пракрутка/скобля/скрабок, праколка, скол з нуклеуса, фрагмент сякеры (мал. 2).

Наканечнікі стрэл прадстаўлены пераважна лістападобнымі і рамбічнымі наканечнікамі стрэл (9 экзэмпляраў; мал. 2: *1–5*). Па адным выяўлены трохкутны чаранковы і трохкутны безчаранковы, са злёгку зведзенымі разам шыпамі. 4 артэфакты прадстаўлены ў неазначальных абломках.

Касцяныя і рагавыя вырабы налічваюць 91 артэфакт. Сярод прылад дамінуюць нявызначаныя фрагменты, выяўлены таксама праколкі, адціскальнікі, арнаменціры, долаты, шпатэль, фрагменты кінжалаў, наканечнікаў стрэл (мал. 3). Звяртае на сябе ўвагу моцная фрагментаванасць невялікіх прылад. Мастацкія і культавыя вырабы гэтага віду прадстаўлены падвескамі з косткі і зубоў жывёл, пацеркамі і іх нарыхтоўкамі (мал. 4: *4–25*).

З бурштынавых вырабаў выяўлены дзве пацеркі, пашкоджаны прамакутны гузік і дробны фрагмент падвескі (мал. 4: *1–3*).

Каменныя вырабы прадстаўлены дзвюма выруткамі ад свідраваных сякер і адбойнікам (мал. 2: *9, 10*).

Асаблівую ўвагу прыцягвае гліняны шарык з насечкамі ад пазногцяў (адна з іх, верагодна, ад вялікага пальца).

Драўляныя артэфакты ў пласце захоўваюцца даволі блага. Нягледзячы на гэта, у кв. 415 быў выяўлены развал драўлянай вершы. Асобныя лучынкі вельмі мяккія, ломкія, лёгка пашкоджваліся нават пры акуратнай апрацоўцы пэндзлем. Уся верша скіраваная з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад, з невялікім нахілам у гэтым кірунку. Максімальная зафіксаваная даўжыня лучынак – 54 см. Прасачыліся тры ўмоўныя пласты лучынак вершы. Першы ляжаў амаль адразу паверх наступнага, трэці пласт адступаў ад папярэдняга больш чым на 1 см. Пасля выбаркі лучынак выявілася «ложа»» з буйнейшых галінак і фрагментаў кары. Сярод іх спарадычна сустракаліся дробныя фрагменты лучынак. Гэтаксама яны зрэдку сустракаліся і ў кв. 416 і 419.











Мал. 1. Агульны план прац у 2011 г. (*А*): *1* – воз. Наўранскае; *2* – Прыгожая Верацея; *3* – Зорніца; *4* – Сялец; *5* – Асавец-2; план паселішча Асавец-2 з раскопам 2011 г. (*Б*); месцазнаходжанне паселішча Прыгожая Верацея (*В*), пункта Зорніца (*Г*), селішча Сялец (*Д*)

Акрамя вершы, быў выяўлены вельмі пашкоджаны, фрагментаваны берасцяны паплавок ад сеткі.

Керамічная калекцыя паселішча Асавец-2 («паўднёвы раскоп») 2011 г. налічвае 2810 фрагментаў. З іх 143 венцы, 1504 сценкі, 30 донцаў (пераважна плоскія), 1133 дробныя і нявызначаныя фрагменты. Сярод вызначаных 1627 адносяцца да паўночнабеларускай, 42 да усвяцкай, (яшчэ некалькі фрагментаў могуць быць аднесены да гібрыдных усвяцка-паўночнабеларускіх), 4 да сярэднедняпроўскай, 1 абляпны. Трэба адзначыць, што ў параўнанні з міну-



Мал. 2. Крамянёвыя (*1–8*) і каменыя (*9, 10*) вырабы: *1–5* – наканечнікі стрэл; *6* – пракрутка; *7* – скрабучы выраб; *8* – лёзавы фрагмент сякеры; *9* – выкруткі з каменных сякер. Паселішча Асавец-2 («паўднёвы раскоп»). 2011 г.

лымі гадамі колькасць буйных фрагментаў посуду значна павялічылася.

Калекцыя знойдзеных у культурным слое пладоў налічвае 2 ядры арэха ляснога, 817 фрагментаў шалупіння арэха ляснога, 544 чылімы, 872 фрагменты шалупіння чылімаў, 3 плады нявызначаныя. У раскопе таксама выяўлены 4 капраліты. Астэалагічная калекцыя налічвае больш 3000 костак млекакормячых, птушак і паўзуноў, а таксама каля 20 тысяч костак рыб.

Разведкі. ***Воз. Наўранскае, Мядзельскі раён Мінскай вобласці*** (сумесна з М. М. Чарняўскім). На паўднёвым беразе возера, на ўскрайку калгаснага поля, якое абмяжоўваецца дарогай да в. Наўры ад шашы Р-58, быў сабраны пад'ёмны крамянёвы матэрыял у колькасці 36 экзэмпляраў: нуклеусы і іх фрагменты, канкрэцыі і іх фрагменты, пласціны, адшчэпы, лускі, абломкі нявызначаныя і ўласна вырабы. Апошнія прадстаўлены скрабкамі (4), абломкамі (3), тронкавым наканечнікам стралы (1). Выяўлены матэрыял можа быць датаваны перыядам мезаліту, з пэўнымі элементамі фінальнага палеаліту. Месцазнаходжанне (вядома з 1970-х гадоў) разам з яшчэ двума на дадзеным возеры выяўлена Міхалам Чарняўскім.

Дадаткова былі знойдзены яшчэ некалькі дробных фрагментаў позняй кругавой керамікі, паўгрош Аляксандра Ягелончыка (1492–1506 гг.), 2 гільзы ад вінтоўкі,



Мал. 3. Касцяныя і рагавыя вырабы: *1* – адціскальнік; *2, 3* – долаты; *4* – праколка; *5* – мастыхін; *6* – сякера. Паселішча Асавец-2 («паўднёвы раскоп»). 2011 г.

гузік польскага мундзіра і манета вартасцю 2 грошы 1927 г. Аналіз даваенных картаў паказаў, што на ўсходнім ускрайку дадзенага поля пазначаны хутар.

Прыгожая Верацея, Лепельскі раён Віцебскай вобласці. Размешчана за 3 км на паўднёвы захад ад моста праз р. Бярэшча ў в. Верабкі, і за 800 м на паўднёва-паўднёвы усход ад стаянкі Бярэшча-1, на пагорку сярод забалочанага ляснога масіву (мал. 1: *В*). Выяўлена па інфармацыі жыхара в. Верабкі Васіля Хацкевіча.

Форма пагорка разам са схіламі нагадвае класічны трохкутнік, катэты якога з'арыентаваны на поўдзень і ўсход. Схілы парослыя лесам. Уласна пляцоўка, занятая стаянкай, уяўляе сабой авал нерэгулярных абрысаў, выцягнуты з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад, з «выпукласцямі» ў цэнтральнай і паўднёвай частках у заходнім кірунку. Памеры пагорка – 180 × 160 м (уласна пляцоўка – 150 × 70 м). Пад'ёмны матэрыял па кратавінах сустракаўся найбольш у цэнтральнай і паўднёвай частках пляцоўкі.

Шурф плошчай 2 м^2 закладзены за 40 м на поўнач ад паўднёвага краю пляцоўкі і 10 м на ўсход ад заходняга краю. Магутнасць культурнага пласта склала да 40–50 см. Артэфакты сустракаюцца па ўсёй магутнасці слою, найбольш у шэравата-карычневым пяску.

Знаходкі прадстаўлены фрагментамі керамікі грабеньчата-ямкавай, усвяцкай і паўночнабеларускай культур, крамянёвымі артэфактамі. Па сваім характары помнік набліжаецца да размешчанай непадалёку стаянкі Бярэшча-1.

Зорніца, Лепельскі раён Віцебскай вобласці. Помнік размешчаны на клінападобным мысе пры вытоку р. Вула з воз. Жэжліна, на правым беразе (мал. 1: *Г*).



Мал. 4. Бурштынавыя (*1–3*) і касцяныя (*4–25*) мастацкія і культавыя вырабы: *1, 2, 4–13* – пацеркі; *3* – гузік; *14* – ключападобная падвеска; *15–22* – падвескі з зубоў; *23* – падвеска з каленнай чашкі казулі; *24, 25* – лішкавыя часіткі майстравання пацерак. Паселішча Асавец-2 («паўднёвы раскоп»). 2011 г.

Мыс невялікі, каля 100 м даўжынёй, выцягнуты з поўдня на поўнач, залесены, часткова са слядамі свежай вырубкі. На адлегласці 75 м на поўдзень ад паўночнага заканчэння быў закладзены шурф у 1 м^2. Магутнасць культурнага пласта склала да 50 см.

У шурфе былі выяўлены 4 дробныя фрагменты ляпной керамікі з дамешкам буйнога пяску (культуры грабеньчата-ямачнай керамікі), адшчэп і мікрапласцінка.

Сялец, Чашніцкі раён Віцебскай вобласці. Размешчана за 1,3 км на поўдзень–паўднёвы усход ад в. Сялец, за 1 км у тым жа кірунку ад моста праз р. Вула да Іванска (мал. 1: *Д*). Займае разлеглы плаўны пагорак, які апускаецца ў луку ракі, абмежаваны з поўначы і поўдня невялікімі ярамі. З паўднёвага боку непасрэдна падступае да ракі, з заходняга і паўночна заходняга выходзіць на яе пойменны ўчастак.

Па ўсім заходнім схіле пагорка сустракаюцца фрагменты керамікі, паасобныя крэмені. Два шурфы памерамі 1 × 1 м (у цэнтральнай і паўднёвай частках пагорка) паказалі, што культурны пласт тут аднародны, развораны на ўсю глыбіню, складаецца з выразна карычневай гумусіраванай глебы, з уключэннямі мацерыковага жоўтага пяску, занесенага ў яго пры ворцы. Пад'ёмны матэрыял і матэрыялы шурфоў прадстаўлены кругавой і ляпной керамікай, крамянёвым адшчэпам і пласцінкай, металічнымі фрагментамі неідэнтыфікаваных вырабаў, жужалем, фрагментамі цэглы. Матэрыял датуецца позняй бронзай, жалезным векам, X–XIV стст., навейшым часам. Са слоў мясцовага краязнаўца В. Хацкевіча, у гэтым месцы ім быў выяўлены масіўны крамянёвы скрабок акруглай у плане формы, што дае мажлівасць меркаваць пра наяўнасць і матэрыялаў больш ранняга перыяду.

Резюме

Макс. М. Чернявский

Исследования в Белорусском Поозерье в 2011 г.

В 2011 г. автором продолжались раскопки на поселении Асавец-2 Бешенковичского района Витебской области, а также проводились разведки в Мядельском районе Минской, Лепельском, Чашникском районах Витебской областей, в результате которых были выявлены новые памятники каменного и бронзового веков Пригожая Вератея, Зорница, разновременное поселение Сялец.

Summary

Max. Charniauski

The researches in Belarusian Lakeland in 2011

In 2011, the author continued excavations at the settlement Asavec-2 (Beshankovichy district of Vicebsk region). New sites of the Stone and Bronze Ages (Prygozhaya Veraceya, Zornica), and multitemporal settlement Sialec were found during the explorations in Miadzel district of Minsk region, Lepel and Chashniki districts of Vitebsk region.

УДК 902/904(476)«2011»

Міх. М. Чарняўскі, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, дацэнт, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск)*

Даследаванні на Панямонні і Падзвінні ў 2011 г.

Даследаванні палявога сезона 2011 г. былі найперш звязаныя з археалагічнай практыкай студэнтаў гістфака Белдзяржуніверсітэта на тарфяніковай стаянцы Асавец-2. Акрамя таго вялося абследаванне некаторых помнікаў у Панямонні і Павіллі, а таксама, па просьбе аддзелаў культуры Мастоўскага і Стаўбцоўскага РВК, былі агледжаны археалагічныя аб'екты адпаведных раёнаў дзеля праверкі стану іх захаванасці, удакладнення тапаграфіі, прывязкі да картаў землекарыстання і ўстаноўкі ахоўных знакаў. У гэтай працы на Мастоўшчыне прымала ўдзел А. Зуева.

Мастоўскі раён.

Вёска Рыбакі, Зарудаеўскі сельсавет. На паўднёвы захад ад «Замчышча» участак лесу мае назву «Рынак». На пляцоўцы «Замчышча» – сучаснае язычніцкае капішча з драўляным стодам Перуна.

Вёска Азёркі Вялікія, Азёркаўскі сельсавет. На паўночны ўсход ад вёскі, за паўночна-ўсходнім канцом могільніка, на невысокім выступе пясчанага павышэння, на плошчы памерамі 50 × 20 м – расшчэпленыя крэмені і фрагмент ранняй штрыхаванай керамікі.

Вёска Азёркі Малыя, Азёркаўскі сельсавет. На ўсход ад паўднёвага краю вёскі (раней гэта ўскраіна называлася в. Каскоўшчына), каля паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа воз. Азёркаўскага – павышэнне, плошча якога складае 600 × 300 м. На яго паверхні, пераважна ў прыазёрнай частцы – нешматлікія крэмені мезалітычнга часу. У заходняй частцы павышэння, на спуску да ўпадаючай тут у возера рэчкі Сіпы – артэфакты са шляхецкай сядзібы.

Вёска Завозерна (зараз не існуе), Азёркаўскі сельсавет. На поўнач ад былой вёскі, паміж прыбярэжжам возера і поплавам, каля вытоку Сіпы – выступ пясчанага павышэння. На ім на ўчастку плошчай 150 × 100 м – адносна нешматлікія крамянёвыя артэфакты розных перыядаў каменнага і бронзавага вякоў.

Горад Масты. У фондах музея «Лес і чалавек» захоўваюцца: крамянёвая шліфаваная сякера, месцазнаходжанне невядома (гл. малюнак: *1*); каменная свідраваная матыка, месцазнаходжанне невядома (гл. малюнак: *2*); каменная свідраваная сякера, тарфянік каля в. Сухінічы (гл. малюнак: *3*).

Слонімскі раён.

Вёска Русакова, Жыровіцкі сельсавет. Праз 1,2 км на поўнач ад вёскі, 0,15 км на паўночны усход ад канала р. Пратва, 0,15 км на поўдзень ад Літоўскага груда – паўразвеяная дзюна папярэчнікам каля 50 м са знаходкамі расшчэпленых крэменяў. Помнік выяўлены разам з В. Беляўцом.

Вілейскі раён.

Вёска Цінцявічы, Любанскі сельсавет. Праз 2 км на паўночны захад ад вёскі, 0,4 км на поўнач ад цалкам зарослага воз. Ула – пясчаны бугрысты клін, які выступае на поўдзень у тарфяністае балота з лесам. У 2010 г. тут на месцы пясчанага кар'ера сустрэты адзінкавыя расшчэпленыя крэмені. У 2011 г. абследаванне мясцовасці працягнута.

Ад павышэння з кар'ерам ў паўднёвым напрамку цягнецца ланцуг з пяці дзюн рознага памеру, раздзеленых тарфяным балотам. На першай ад кар'ера дзюне памерам 65 × 55 м – культурны пласт з крамянёвымі артэфактамі мезалітычнага часу. На другой ад поўдня дзюне памерам 70 × 40 м у культурным пласце – расшчэпленыя крэмені. Рэшта дзюн пакуль не даследавана.

Мядзельскі раён.

Вёска Наўры, Сваткаўскі сельсавет. На паўднёвым і паўднёва-заходнім узбярэжжы воз. Наўранскае на двух помніках, выяўленых аўтарам у 1978 г., сабраны крамянёвы матэрыял мезалітычнага часу.

Вёска Азаркі Старыя, Мядзельскі пассавет. Насупраць усходняй ускраіны вёскі, на паўднёвым беразе воз. Баторына ў шурфе памерамі 1 × 1 м – бакавінка пасудзіны з заштрыхаванай паверхняй і ўмеранай дамешкай жарствы.

Вёска Круці, Мядзельскі пассавет. Праз 1 км на паўднёвы захад ад вёскі, на паўночна-усходнім узбярэжжы затокі Баторына, на поўнач ад ўпадзення канала Лук'янаўскай рэчкі, на малапрыкметным павышэнні над балотам у шурфе памерамі 1 × 1 м – да дзесятка расшчэпленых крэменяў без рэтушы.

Такім чынам, на тэрыторыі Мастоўшчыны, Слонімшчыны, Вілейшчыны і Мядзельшчыны было выяўлена 8 новых пунктаў з археалагічнымі матэрыяламі.

Бешанковіцкі раён.

Вёска Асавец, Вялікакрывінскі сельсавет. На тарфяніковым паселішчы Асавец-2 працягвалася абследаванне паўночнай часткі помніка. Асноўная частка студэнтаў-практыкантаў была задзейнічана ў раскопках, што рабілі супрацоўнікі Інстытута гісторыі НАН Беларусі (кіраўнік – Макс. Чарняўскі). Аўтар абмежаваўся шурфоўкай і свідраваннем культурнага пласта.

Шурф паўночна-усходні плошчай 1,2 × 0,5 м быў закладзены праз 77 м на поўнач ад калектарнай



Артэфакты: *1–3* – каменныя вырабы; *4* – драўляны наканечнік стралы. 2011 г.

канавы з бетонным мосцікам і праз 33 м на захад ад канавы, што ідзе з поўначы ад Аксінавага востраў. Культурны пласт дасягаў таўшчыні да 0,5 м і ўтрымліваў матэрыял, тыповы для усвяцкай і паўночна-беларускай культур. Усвяцкая кераміка з ніжніх пластоў мае на ўнутраных паверхнях расчэсы, як пераважытак папярэдняй нарвенскай культуры. Шурф паўночны плошчай 2 × 1 м, закладзены праз 60 м ад калектарнай канавы, выявіў культурны пласт таўшчынёй да 0,6 м. У ніжнім напластаванні з усвяцкай керамікай знойдзены плоскачаранковы драўляны наканечнік стралы (гл. малюнак: *4*).

Свідраванне паказала, што паселішча было размешчана на невялікім павышэнні паўвострава і працягвалася на поўнач ад калектарнай канавы на 80–90 м.

Стаўбцоўскі раён. У раёне паўторна абследавана частка першабытных помнікаў, размешчаных пераважна ў левабярэжжы р. Нёман і выяўленых у мінулыя гады [1–7].

Вёска Акіньчыцы (зараз мікрараён Стоўбцаў).

1. Праз 1,2 км на паўднёвы захад ад Акіньчыц, насупраць паўднёвай ускраіны вёскі Новы Свержань, праз 80 м ад правага берага р. Нёман, на пясчаным павышэнні захаваліся рэшткі земляного ўмацавання бастыённага тыпу – «Замак Чартарыйскага». На паўднёва-заходнім краі павышэння, непасрэдна каля бастыёнаў – рэшткі неалітычнага паселішча.

2. Праз 2,4 км на паўднёвы усход ад Акіньчыц, каля правага берага р. Нёман, насупраць цэнтральнай часткі в. Новы Свержань, ва ўрочышчы «Шыркоўская лука» – дзюна з пашкоджаным культурным пластом неаліту і бронзавага веку.

3. Праз 2 км на захад ад Акіньчыц і праз 0,8–0,9 км на поўнач–паўночны усход ад р. Нёман, на

правабярэжным поплаве гэтай ракі – дзюна памерамі 170 × 100 м. У культурным пласце – кераміка і крамянёвыя вырабы пераважна энеалітычнага часу.

Праз 1,2 км на паўднёвы захад ад Акіньчыц і праз 0,3 км на поўнач–паўночны ўсход ад помніка «Замак Чартарыйскага», за 0,6 км ад правага берага р. Нёман знаходзіцца вялікая дзюна даўжынёй да 300 м і шырынёй каля 100 м з трыма стаянкамі.

4. На павышэнні паўднёва-заходняй часткі дзюны – матэрыялы прыпяцка-нёманскай і нёманскай культур, а таксама культуры шнуравой керамікі.

4а. На паўночна-усходнім выступе дзюны з нязначным павышэннем і з пясчаным выдзьмухам – артэфакты бронзавага веку.

4б. На паўднёва-усходнім выступе дзюны – адзінкавыя расшчэпленыя крэмені.

5. На поўнач–паўночны усход ад цэнтральнай часткі Свержаня з бажніцамі і праз 1,2 км на паўднёвы захад ад Акіньчыц – доўгая дзюна з рэдкім хвойнікам. У заходняй частцы дзюны – нешматлікія расшчэпленыя крэмені.

Вёска Васілеўшчына, Літвянскі сельсавет. Праз 0,2 км на поўдзень ад вёскі, у правабярэжжы Сулы, на ўзгорку, абмежаваным з поўначы і поўдня ярападобнымі западзінамі – гарадзішча культуры штрыхаванай керамікі з авальнай пляцоўкай памерам 80 × 40 м. З паўночна-заходняга краю яшчэ 30 гадоў таму назад меўся вал, які па загадзе мясцовага старшыні калгаса быў ссунуты ў напольны роў.

Вёска Дразды, Навасвержанскі сельсавет.

1. Праз 0,7 км на усход ад Драздоў і 1,5 км на паўднёвы захад ад моста праз р. Нёман на старой шашы на Брэст, пры паўднёвым краі нізкага поплаву р. Залужанкі – авальны астанец высокага поплаву з падстанцыяй. На паўночным краі астанца – рэшткі стаянкі каменнага веку.

2. Праз 0,9–1,3 км на поўнач ад папярэдняга пункта, пасярод нізкага поплаву, – тры невялікія грады з дубняком, на якіх сустракаюцца адзінкавыя расшчэпленыя камяні і крэмені.

3. Праз 0,9 км амаль проста на ўсход ад вёскі, на невялікім выступе нізкай левабярэжнай нёманскай тэрасы – авальнае ледзь прыкметнае павышэнне памерам каля 90 × 40 м. На пераворанай паверхні – расшчэпленыя крэмені, сярод якіх і архаічныя формы.

Праз 1 км на поўнач–паўночны ўсход ад усходняй ускраіны Драздоў пры левым беразе р. Нёман, на ўсход ад каналізаванага прывусця Залужанкі, на шырокім поплаве – дзюнападобнае бугрыстае павышэнне «Сосны» папярэчнікам каля 350 м. Па яго перыметры – 4 старажытныя паселішчы.

4. Каля заходняга краю павышэння, на асобнай невялікай дзюне – нешматлікая ляпная кераміка банцараўскага тыпу і ганчарная сярэдневяковая кераміка.

5. Другі помнік размешчаны на паўночна-заходнім выступе павышэння «Сосны», на пясчанай дзюне памерам 60 × 40 м. У раскопе плошчай 10 м^2 – матэрыялы неаліту, бронзавага і жалезнага вякоў, сярэдневякоўя (нёманская культура, культура штрыхаванай керамікі, банцараўская культура, культура эпохі Полацкага княства і Вялікага Княства Літоўскага).

6. На паўночным краі павышэння «Сосны», на поўдзень ад невялікай старыцы левабярэжжа р. Нёман, на ўзроўні 1 м над поплавам – нешматлікія расшчэпленыя крэмені без рэтушы.

7. Чацвёртае паселішча знаходзіцца на дзюнападобным пясчаным утварэнні паўднёва-ўсходняга краю павышэння «Сосны» і мае памеры 90 × 40 м. У шурфе плошчай 8 м^2 – нешматлікі неалітычны матэрыял.

Праз 0,5 км на поўнач ад жывёлагадоўчага комплексу в. Дразды і 0,3 км на ўсход ад адпачынкавага асяродку, на краі лесапасадкі – тры выступы нізкай левабярэжнай надпоймавай тэрасы р. Нёман.

8. На першым, паўднёвым выступе вышынёй над поплавам да 2 м, пад лініяй электраперадачы, на плошчы 60 × 50 м – крамянёвыя артэфакты каменнага веку. Помнік выяўлены Л. Д. Побалем.

9. На другім, цэнтральным выступе (80 м ад паўднёвага, вышыня над поплавам – каля 1,5 м) – паселішча каменнага веку памерам каля 40 × 30 м. Выяўлена да дзесятка расшчэпленых крэменяў без рэтушы.

10. На трэцім, паўночным выступе тэрасы, каля заходняга берага старыцы, на палях колішняга хутара, зараз занятых лесам, у 1960 г. Л. Д. Побаль сабраў расшчэпленыя крэмені і кераміку жалезнага веку.

11. Клінаваты выступ гэтай жа тэрасы паміж правым берагам рэчкі з-пад в. Ператокі і левабярэжным поплавам р. Нёман утрымлівае расшчэпленыя крэмені.

12. На левабярэжным прывусці гэтай жа рэчкі і абрывістым левым берагам р. Нёман, на падмытым рэчкай і р. Нёман пясчаным грудзе – рэшткі паселішча з знаходкамі каменнага і бронзавага вякоў.

Вёска Ініца, Залужскі сельсавет.

1. Праз 1 км на паўночны усход ад вёскі, 0,5 км на поўнач–паўночны захад ад хутара Рудзіца і 1 км на паўднёвы усход ад вусця прытоку р. Нёман р. Ініцы ў поплаў р. Нёман выступае клін нізкай тэрасы. На паўночным краі кліна – крамянёвыя артэфакты, частка якіх адносіцца да мезаліту.

2. Праз 0,25 км на паўночны усход ад папярэдняга пункта, каля самага паўднёвага берага нёманскай лукі – пясчаны груд вышынёй да 2 м. На прырэчным агаленні – адзінкавыя фрагменты перапаленых камянёў.

Вёска Слабодка, Залужскі сельсавет.

1. Праз 0,9 км на поўнач ад вёскі, на ўзгорыстым мысе левабярэжнай нёманскай тэрасы, на захад ад невялікага прытока р. Нёман, праз 20 м ад ракі, на лесапасадцы – матэрыялы каменнага і бронзавага вякоў.

2. Праз 0,4 км на поўнач–паўночны ўсход ад вёскі – рэшткі значна пашкоджанага кар'ерамі дзюннага павышэння на поплаве (урочышча «Барок»). Яго першапачатковая плошча мае памеры 500 × 360 м. На самым усходнім краі павышэння – адзінкавыя крамянёвыя артэфакты. Бліжэй да вёскі, на астанцах, – шэры культурны пласт з чорнай ганчарнай керамікай.

3. Праз 0,7 км на поўнач–паўночны ўсход ад вёскі, каля берагу старыцы «Стульна» – авальны груд памерамі 60 × 80 м з рэшткамі селішча жалезнага веку.

4. Праз 0,15 км на паўнёвы ўсход ад вёскі, на дарозе між краем трохмятровай тэрасы і лесам, на працягу 100 м – нешматлікія расшчэпленыя крэмені.

5. Праз 0,7 км на паўднёвы усход ад вёскі, на выступе гэтай жа тэрасы, на плошчы памерамі 80 × 40 м – адносна шмат расшчэпленых крэменяў.

Горад Стоўбцы. Насупраць горада на шырокім левабярэжным поплаве р. Нёман – груд пад назвай «Гарадзішча» з рэшткамі стаянкі каменнага і бронзавага вякоў, а таксама сярэдневяковага паселішча. Помнік выявіў Л. Д. Побаль.

Вёска Суднікі, Залужскі сельсавет. Праз 1,2 км на паўночны ўсход ад вёскі, на паўночна-ўсходнім краі надпоймавага павышэння з дубняком – рэшткі паселішча бронзавага веку.

Вёска Сула, Літвенскі сельсавет. Праз 1 км на паўночны захад ад вёскі, у лесе, на выступе карэннага левага берага р. Сула, абмежаваным з поўначы клінам балоцістага поплаву, – гарадзішча. Авальная пляцоўка дыяметрам да 80 м абкружана ровам глыбінёй 1,0–1,5 м, а з усходняга боку дадаткова і валам. Помнік моцна зарос лесам і хмызняком. Адносіцца да культуры штрыхаванай керамікі. Вядомы з XIX ст.

Літаратура

1. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць.– Мінск, 1987.– Кн. 2. – С. 236–246.

2. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1979 г. / М. М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 633. – 45 с.

3. Чарняўскі, М. М. Справаздача Нёманскай неалітычнай групы аб даследаваннях археалагічных помнікаў у 1983 г. / М. М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 849. – 22 с.

4. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у Паўночна-Усходняй Беларусі ў 2003 годзе / М. М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2091. – 23 с.

5. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у басейнах Нёмана, Віліі і Дзвіны ў 2005 г. / М. М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2270. – 23 с.

6. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Стаўбцоўскага, Вілейскага, Мядзельскага і Бешанковіцкага раёнаў у 2006 г. / М. М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2387. – 19 с.

7. Чернявский, М. М. Отчет об археологических исследованиях в 1975 г. / М. М. Чернявский // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 513. – 45 с.

Резюме

Мих. М. Чернявский

Исследования на Понеманье и Подвинье в 2011 г.

Исследования полевого сезона были прежде всего связаны с археологической практикой студентов истфака Белгосуниверситета на торфяниковом поселении Асавец-2 в Бешенковичском районе. По просьбе отделов культуры Мостовского и Столбцовского РИК были осмотрены археологические памятники соответствующих районов ради проверки их сохранности и для установки охранных знаков. Кроме того у дер. Великие и Малые Азёрки Мостовского раёна выявлены три новые поселения каменного века и средневековое селище, у д. Русаково Слонимского района – неолитическое поселение, у д. Цинцевичи Вилейского района – две мезолитические стоянки. На поселении Асавец-2 проводились шурфовка и бурение северной части памятника. В результате получены новые материалы усвятской культуры и определено, что стоянка была заложена на небольшом песчаном всхолмлении у берега древнего озера.

Summary

Mich. Charniauski

The researches at Nioman and Dzvina regions in 2011

Field researches were related to the students' archeological practice (the Faculty of History of Belarusian State University) and took place at peat bog settlement Asavec-2 (Beshankovichy district). After the request of cultural departments of Masty and Staubcy REC archaeological sites of the areas were examined for proofing their safety and security before the installation of protective signs. Additionally three new settlements of the Stone Age and medieval settlement near the villages Great and Small Aziorki of Masty district, Neolithic site near village Rusakova of Slonim district, two Mesolithic sites near village Cincavichy of Vilejka district were found. At the Asavec-2 settlement trenching and drilling of the northern part of the site were carried out. As a result, we obtain new materials of Usviaty culture and determined that the site was locate on a little sandy hillocks near the shore of an ancient lake.

УДК 903.4«634»(476.2)

І. М. Язэпенка, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск);*
С. С. Юрэцкі, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, магістрант (г. Маладзечна)*

Раскопкі на паселішчы каменнага веку Ніжняя Алба-1 (урочышча Лукошыніца) ў нізоўі р. Бярэзіна ў 2011 г.

У жніўні 2011 г. археалагічная група Інстытута гісторыі НАН Беларусі пад кіраўніцтвам І. М. Язэпенкі праводзіла даследаванне на паселішчы каменнага веку Ніжняя Алба Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці, якое размешчана ў міжрэччы вусця р. Бярэзіна і сучаснага русла р. Днепр.

Паселішча займае астанец першай надпоймавай тэрасы р. Днепр, праз 1,1 км на паўднёвы ўсход ад фермы вёскі Ніжняя Алба Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці і праз 0,8 км на поўдзень ад сучаснага русла р. Днепр. Плошча паселішча складае каля 1,5 га, а вышыня яго вагаецца ад 4,5 да 5,0 м над поплавам паўночна-усходняй частцы і да 1,5–2,0 м у паўднёва-заходняй частцы (мал. 1).

Магчыма аб існаванні ў гэтым месцы паселішча каменнага веку згадваваў К. М. Палікарповіч, які адзначыў што ў 1925 г. ў ваколіцах в. Ніжняя Алба знойдзены крэмені [1, с. 267]. Але дакладнай прывязкі ні да самога населенага пункта, ні да ўрочышча ім не прыведзена.

Пазней, у 1977 г., У. П. Ксяндзовым былі выяўлены сляды паселішча ў межах тэрыторыі вёскі, на першай надпоймавай тэрасе р. Днепр, і яно было аднесена даследчыкам да перыяду бронзавага веку [2, с. 179]

У 2011 г. у 15–20 м ад паўднёвага краю паселішча, на ўзроўні 1,9 м над поплавам аўтарамі артыкула быў закладзены раскоп плошчай 32 м^2 (8 × 4 м) з арыентацыяй па даўжыні захад–усход.

Стратыграфічна вылучаюцца наступныя ўмоўныя гарызонты: 1) чорна-шэры, шэры дробназярністы пясок магутнасцю ад 0,35 да 0,45 м; 2) бурагоўты розназярністы пясок, які залягаў з глыбіні 0,40–0,45 м; 3) мацерыковы ўзровень, прадстаўлены дробназярністым пяском светла-жоўтага колеру і зафіксаваны, пачынаючы з глыбіні 0,43 м ад дзённай паверхні.



Мал. 1. Лакалізацыя помніка каменнага веку Ніжняя Алба (урочышча Лукошыніца). Жлобінскі раён. Гомельская вобласць. Жнівень 2011 г.

У паўночна-усходняй частцы раскопу на ўзроўні мацерыка быў выяўлены аб'ект (кв. В-Г, 1-3), які папярэдне інтэрпрэтуецца намі як жытло, якое зафіксавана на ўзроўні 0,53 м ад дзённай паверхні і ўяўляе сабой пляму чорна-шэрага колеру з абрысамі няправільна авальнай формы, арыентаваную па доўгай восі з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад (памеры – 1,58 × 2,06 м).

У паўднёва-заходняй частцы аб'екта вылучаецца канцэнтрыраваная пляма вогнішча памерамі 0,3 × 0,4 м светла-шэрага, палевага колеру, у межах якой зафіксаваны шчыльны прапластак да 0,4 м у глыбіню драўняных вугалёў. Акрамя гэтага ў запаўненні аб'екта, асабліва ў цэнтральнай яго частцы, што прылягала да вогнішча, былі знойдзены крамянёвыя вырабы з другаснай апрацоўкай і фрагменты развалаў неалітычных гаршкоў (мал. 2).

Самы ранні этап засялення паселішча – мезалітычны, прадстаўлены невялікай, але выразнай серыяй мікралітаў: асіметрычныя трапецыі, вастрыі і медыяльныя часткі пласцін. Сярод знаходак пераважае неалітычная кераміка. Зыходзячы з папярэдняга тыпалагічнага аналізу, у керамічным комплексе паселішча прысутнічаюць фрагменты пасудзін, якія могуць быць аднесены да ранненеалітычнай фазы.

Акрамя гэтага на помніку Ніжняя Алба (урочышча Лукошыніца) выяўлена ляпная кераміка ранняга перыяду бронзавага веку (сярэднедняпроўская культура), сярэдняга перыяду бронзавага веку (сосніцкая культура), ранняга жалезнага веку (зарубінецкая культура) і ганчарная (кругавая) кераміка перыяду старажытнай Русі.

Прадукты першаснага расшчаплення прадстаўлены наступнымі катэгорыямі вырабаў (табл. 1).



Мал. 2. План аб'екта 1 (жытла). Узровень 0,5–0,8 м ад дзённай паверхні. Раскоп 1. Ніжняя Алба. 2011 г.

Табліца 1. **Агульная структура калекцыі крамянёвага інвентару: адходаў вытворчасці і нуклеусаў**

Вырабы		Пл. 1	Пл. 2	Пл. 3	Пл. 4	Пл. 5	Аб. 1	Усяго
1.	Адшчэпы	153	453	392	274	39	4	1315
2.	Пласціны	11	26	17	17	6	1	78
3.	Асколкі, кускі аморфныя	–	3	4	3	3	1	14
4.	Сячэнні пласцін	1	–	3	1	4	–	9
5.	Фрагменты пласцін	2	5	6	4	1	–	18
6.	Нуклеусы	2	1	1	2	–	–	6
7.	Абломкі нуклеусаў	–	1	3	2	1	1	8
8.	Сколы падпраўкі	1	1	6	1	–	–	9
9.	Сколы краявыя	–	9	2	3	9	1	24
	Разам:	170	499	434	307	63	8	1481

Нуклеусы прадстаўлены ў калекцыі 14 экзэмплярамі, 8 экзэмпляраў у абломках. 3 вырабы па афармленні ўдарных пляцовак блізкія да прызматычных, яшчэ 3 нуклеусы канічнай формы (мал. 3: *9*). Яны ў асноўным дробных памераў, моцна спрацаваныя, аднапляцовачныя.

Прылады працы на помніку Ніжняя Алба прысутнічаюць як ў закончаным выглядзе, так і ў форме нарыхтовак, а таксама ў фрагментах, што адлюстроўвае табл. 2.

Сярод прылад вылучаецца серыя трапецый: сустракаюцца асіметрычныя формы (мал. 3: *2*) з паўкрутой дробнай рэтушшу па краях са спінкі і выкананыя на медыяльных фрагментах пласцін (мал. 3: *5*). Сячэнні пласцін выяўлены ў 2 экзэмплярах (мал. 3: *1, 6*). Вастрыё выраблена на праксімальным фрагменце пласціны, па краі вырабу нанесена дробная паўкрутая рэтуш са спінкі (мал. 3: *4*). Наканечнікаў стрэл у культурным пласце паселішча Ніжняя Алба знойдзена ўсяго 2 экзэмпляры: трохвугольнай формы (мал. 3: *3*) і асіметрычнай, блізкай к рамбічнай, формы (мал. 3: *7*). Паверхня абодвух наканечнікаў апрацавана сплошчанай папраўляючай рэтушшу з боку спінкі і брушка. Самай прадстаўнічай катэгорыяй прылад на помніку з'яўляюцца скрабкі, канцавыя і бакавыя, выкананыя на адшчэпах (мал. 3: *8*) і пласцінах.

Табліца 2. **Вырабы з другаснай апрацоўкай**

Прылада		Пл. 1	Пл. 2	Пл. 3	Пл. 4	Пл.	Усяго
1.	Наканечнікі стрэл	–	2	–	–	–	2
2.	Фрагменты наканечнікаў стрэл	–	–	–	1	–	1
3.	Нарыхтоўкі наканечнікаў стрэл	–	–	–	–	1	1
4.	Скрабкі	3	7	3	3	2	18
5.	Нажы (рэжучыя прылады)	–	–	1	–	–	1
6.	Сякеры	–	–	1	–	1	2
7.	Адшчэпы з рэтушшу	1	2	1	–	2	6
8.	Пласціны з рэтушшу	1	4	3	2	1	11
9.	Сколы з рэтушшу	1	–	–	–	1	2
10.	Трапецыя (укладыш)	1	2	2	3	–	8
11.	Праколкі	–	–	1	–	–	1
	Разам:	7	17	12	9	8	53



Мал. 3. Крамянёвы інвентар (*1–9*). Пласты 0,1–0,2 м и 0,2–0,3 м. Раскоп 1. Ніжняя Алба. 2011 г.

У 2011 г. на паселішчы Ніжняя Алба ў раскопе 1 былі знойдзены абломкі ляпной і ганчарнай керамікі. Неалітычны посуд прадстаўлены абломкамі, сярод якіх пераважаюць неарнаментаваныя і ўпрыгожаныя грабеньчатымі адбіткамі, што адлюстроўвае табл. 3.

Табліца 3. **Неалітычная кераміка**

Кераміка неалітычная		Пл. 1	Пл. 2	Пл. 3	Пл. 4	Пл. 5	Аб. 1	Усяго
1.	з грабеньчатым арнаментам	77	248	382	158	79	18	962
2.	з адступаючымі наколамі	9	3	11	18	8	4	53
3.	з разрэджанымі наколамі	15	38	85	48	29	5	220
4.	з лапчастым штампам	–	1	5	2	–	1	9
5.	з наразнымі лініямі	–	2	1	–	–	–	3
6.	з насечкамі	–	–	–	–	1	–	1
7.	з перакрыжаванымі расчосамі	–	–	–	–	1	–	1
8.	са шнурам	–	1	1	–	–	–	2
9.	з пракрэсленымі лініямі	–	1	–	2	–	–	3
10.	з адбіткамі птушынага пяра	–	–	–	1	–	–	1
11.	з ямкамі	2	–	–	1	–	–	3
12.	неарнаментаваная	493	1158	494	228	127	15	2515
	Разам:	596	1452	979	458	245	43	3773



Мал. 4. Неалітычная кераміка (*1–5*). Пласты 0,3–0,4 м и 0,4–0,5 м. Раскоп 1. Ніжняя Алба. 2011 г.

Арнаментацыя неалітычных пасудзін суцельная, гэта у першую чаргу тычыцца гаршкоў, дэкарыраваных грабеньчатымі адбіткамі (мал. 4: *1*), і занальная (мал. 4: *2–5*). На фрагментах неалітычнай керамікі заўважаюцца матывы з дыяганальных шэрагаў грабеньчыка (мал. 4: *1*), якія арганізоўваліся ў рамбічныя фігуры (мал. 4: *3*), альбо ў косасетчатыя матывы (мал. 4: *2*) ці ў крыжападобныя кампазіцыйныя пабудовы (мал. 4: *5*). Марфалагічна вылучаюцца фрагменты венчыкаў, акруглыя па зрэзе, ад гаршкоў С-падобнага профілю, з крыху зведзенымі ўнутр сценкамі (мал. 4: *3*). Адзначаюцца ў керамічным комплексе паселішча Ніжняя Алба (урочышча Лукошыніца) і фрагменты, у профілі якіх праглядаецца павольны перагін сценкі пасудзіны (мал. 4: *4*). Арнаментаваны гэтыя фрагменты адступаючымі наколамі.

Вельмі цікавая знаходка была выяўлена за межамі раскопу, прыблізна праз 210 м на паўночны ўсход ад яго, на адным з вялікіх па плошчы пясчаных раздуваў. Па меркаванні мясцовых жыхароў у гэтай частцы паселішча ў 1970-х гадах былі вырыты дзве траншэі для захавання сіласных кармоў. Каменная свідраваная матыка была знойдзена жыхаром вёскі Верхняя Алба Гузавым Станіславам Рыгоравічам у 2011 г.

Сама прылада выраблена з мяккай пароды каменю, аднатоннага, без ўкрапін, светла-шэрага колеру. Памеры: даўжыня – 191 мм, шырыня – да 65, таўшчыня ў абушковай частцы – да 30, у самай шырокай частцы – 28, бліжэй да ляза – 20 мм. Дыяметр свідраванай адтуліны – 18–20 мм, прычым зроблена ў некалькі спроб-прыёмаў, што заўважаецца па змене дыяметра па знешняй і ўнутранай паверхні вырабу (мал. 5).

Марфалагічна прылада мае выцягнутую авальную форму, вузкі абушок, значна даўжэйшую лязовую частку: суадносіны 2 : 1, прычым знешняя яе паверхня падпаліравана пад невялікім ухілам. Функцыянальна адзначаны артэфакт можа быць аднесены альбо да сякерападобных матык [3, с. 421], альбо да каменных кайлоў ці поліфункцыянальных прылад [4, с. 9; с. 16, рис. 7: *3*]. Культурная атрыбуцыя выяўленай прылады папярэдне можа быць звязана з колам культуры шнуравой керамікі, але для



Мал. 5. Свідраваная матыка. Камень. Паверхневыя зборы. Ніжняя Алба. 2011 г.

больш дакладнай інтэрпрэтацыі неабходна працягнуць стацыянарныя даследаванні на помніку.

Такім чынам, у час даследаванняў на паселішчы Ніжняя Алба (урочышча Лукошыніца) выяўлены рэшткі матэрыяльнай культуры розных эпох: ад позняга мезаліту (яніславіцкая культура ?) – ранняга неаліту (днепра-данецкая культура) і да перыяду позняга сярэдневякоўя. Найбольш перспектыўным для вывучэння неалітычнага перыяду застаецца паўднёва-заходняя частка паселішча як тая, што найменш закранута антрапегенным уздзеяннем.

Літаратура і крыніцы

1. Палікарповіч, К. М. Досьледы культур каменнага і бронзавага перыядаў у Усходняй Беларусі / К. М. Палікарповіч // Зап. аддз. гуманіт. навук. – 1928. – Кн. 5. – Працы кафэдры археолёгіі. – Т. 1.– С. 263 – 274.

2. Ксяндзоў, У. П. Ніжняя Алба / У. П. Ксяндзоў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Гомельская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1985. – С. 179.

3. Ісаенка, У. Ф. Матыка / У. Ф. Ісаенка // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1993. – С. 421.

4. Килейников, В. В. Культурно-типологические традиции и функциональные новации в орудийных комплексах бронзового века лесостепного Подонья [Электронный ресурс] / В. В. Килейников. – Режим доступа : vspu.as.ru/historic/internation_hist/publish/kileynikov/kileyn.htm. – Дата доступа : 12.06.2011 г. – С. 9–23.

Резюме

И. Н. Езепенко, С. С. Юрецкий

Раскопки на поселении каменного века Нижняя Олба-1 (урочище Лукошиница) в низовье р. Березина в 2011 г.

Проведен предварительный анализ стратиграфической и планиграфической ситуации в пределах раскопа 2011 г., кремневого и каменного инвентаря, керамического комплекса поселения Нижняя Олба (урочище Лукошиница) Жлобинского района Гомельской области. Типологическая характеристика остатков материальной культуры поселения позволяет утверждать, что данный памятник имел несколько этапов заселения. Доминирующей эпохой, судя по статистическим параметрам, представляется неолитическая, и, что наиболее ценно, выявлены фрагменты керамики, которые могут отражать ранний этап (фазу) неолитического периода на данном поселении.

Summary

I. Yazepenka, S. Yurecki

Excavations at the stone age settlement in Lower Olba-1 (Lukoshinitsa tract) at the lower of the river Berezina in 2011

The article presents a preliminary analysis of stratigraphic and planigrafic condition within the excavations in the year of 2011, mainly flint and stone tools, ceramic complex settlements found in Lower Olba (Lukoshinitsa tract), Zhlobin city, Gomel region. Typological characteristics of the material culture remains found at the settlement, which allows the authors to state that the settlement had several stages of population of the territory. Judging from the statistic parameters dominant age is the Neolithic one. And what is more, pieces of pottery were excavated, which may reflect the early stage (phase) of the Neolithic period to the present settlement.

УДК 903.4(476.5)

А. В. Вайцяховіч, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, загадчык сектара навуковых археалагічных фондаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск);*
М. А. Плавінскі, *Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, загадчык аддзела археалогіі, нумізматыкі і зброі, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск)*

Новыя даследаванні археалагічнага комплексу на р. Менка

У 2011 г. на падставе Дазволу па форме 1 (№ 2311) былі адноўлены даследаванні археалагічнага комплексу на рацэ Менка каля вёскі Гарадзішча Шчомысліцкага сельсавета Мінскага раёна. Раскопкі пад кіраўніцтвам А. В. Вайцяховіча былі праведзены ў той частцы селішча, якая размешчана на паўднёвы ўсход ад вялікага гарадзішча[1].

Вывучэнне селішча каля гарадзішча на р. Менка мае дастаткова працяглую гісторыю. У 1964 г. раскопкі селішча праводзіў Э. М. Загарульскі [1, с. 32], у 1975 і 1983 гг. – Г. В. Штыхаў [11, с. 66–69; 12, с. 189–191], у 1992 г., 1996–2001 гг. – Ю. А. Заяц [3, с. 223].

Асноўнымі мэтамі аднаўлення даследаванняў гэтай часткі селішча было выяўленне ступені захаванасці культурнага пласта і вызначэнне перспектыў музеефікацыі археалагічнага комплекса на р. Менка.

Раскоп памерам 6 × 4 м (кв. 1–6 памерам 2 × 2 м) быў закладзены на полі ўздоўж лініі схілу яра з паўднёва-ўсходняга боку вялікага гарадзішча. З мэтай вызначэння перспектыў даследавання дадзенага ўчастка селішча да кв. 6 уздоўж паўднёвай сценкі раскопу была закладзена траншэя даўжынёй 3 м і шырынёй 1 м (кв. 7–9 памерам 1 × 1 м). З прычыны таго, што ўся плошча селішча пастаянна разворваецца і абрыс схілу яра змяняецца, звязаць раскоп 2011 г. з раскопамі папярэдніх гадоў немагчыма. Стацыянарнага рэпера на ворыўным полі няма, таму за ўмоўную нулявую адзнаку быў прыняты ўзровень дзённай паверхні паўночна-заходняга кута раскопу.

Стратыграфія раскопу і аб'екты.

Пласт 1 прадстаўляў сабой ворыўны слой цёмна-шэрага колеру. У слаі трапляліся дробныя (з прычыны шматразовага разворвання) фрагменты кругавой керамікі і глінянай абмазкі. Таксама выяўлены фрагменты жалезных нажоў, цэлыя і фрагментаваныя цвікі і жалезныя пласцінкі, фрагментаваная абутковая падкоўка, каменны асялок з адтулінай.

Пласт 2 па структуры і кансістэнцыі падобны да пласта 1, толькі ў кв. 5, 6 і ва ўсходняй частцы кв. 4 выяўлены непарушаны культурны слой. Пасля зачысткі ў гэтых квадратах пачала прасочвацца мацерыковая паверхня. У кв. 3, 5, 6 выяўлены камяні памерам да 20 см. У кв. 5 на глыбіні 35 см ад дзённай паверхні зафіксавана авальная гліністая пляма з уключэннем пяску, пазначаная як ***Аб'ект 1***, у заходняй частцы плямы назіраюцца сляды абпалу. Памер плямы па лініі захад–усход – 50 см, па лініі поўнач–поўдзень – 36 см.

Акрамя фрагментаў кругавой крамікі і глінянай абмазкі, у пласце 2 выяўлены шэраг індывідуальных знаходак. Сярод іх варта адзначыць вырабы з жалеза: палова двухчасткавых колкавых цугляў (мал. 1: *1*), фрагмент механізма навяснога замка (мал. 1: *2*), ігла ад фібулы, фрагменты ляза сякеры, ляза нажа, іголкі. Таксама выяўлены іншыя цэлыя і фрагментаваныя жалезныя вырабы – цвікі, кастылі, пласцінкі, кручок. Вырабы з каляровага металу з пласта 2 прадстаўлены – грушападобнай крыжапразной бразготкай (мал. 1: *3*), фрагментам лірападобнай спражкі (мал. 1: *4*) і некалькімі дробнымі фрагментаванымі прадметамі.

Пласт 3 прадстаўляе сабой па большасці некрануты культурны слой шэрага колеру. Пасля выбаркі пласта ва ўсіх квадратах выяўлены мацярык – шчыльны суглінак жоўтага колеру з уключэннямі чырвонай гліны. Акрамя кругавой керамікі і глінянай абмазкі, у пласце 3 выяўлена некалькі індывідуальных знаходак, сярод якіх варта адзначыць вырабы з жалеза: кальчужнае колца, фрагмент дужкі ад вядра, долата, фрагмент ляза нажа, дзве фрагментаваныя іголкі. Вырабы з каляровых ме-

[1] У раскопках прымалі ўдзел загадчык аддзела археалогіі, нумізматыкі і зброі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь М. А. Плавінскі і супрацоўнікі Інстытута гісторыі НАН Беларусі: загадчык аддзела археалогіі сярэдневяковага перыяду В. І. Кошман, навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі сярэдневяковага перыяду С. Д. Дзярновіч, малодшы навуковы супрацоўнік сектара навуковых археалагічных фондаў Э. А. Ляшкевіч. Замалёўку профіляў і планаў раскопаў, а таксама першасную камеральную апрацоўку знаходак выканала студэнтка IV курса гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта М. І. Сцяпанава.



Мал. 1. Археалагічныя знаходкі: *1* – цуглі (фрагмент); *2* – механізм навяснога замка (фрагмент); *3* – бронзавая грушападобная крыжапраразная бразготка; *4, 6* – лірападобная спражка (фрагмент); *5* – фаянсавая пацерка; *7* – трапецападобная падвеска; *8* – упрыгажэнне з ліставога металу (фрагмент); *1–4* – пласт 2; *5–8* – пласт 3. Селішча на р. Менка. 2011 г. Малюнак М. А. Плавінскага

талаў прадстаўлены трапецападобнай падвескай (мал. 1: *7*), фрагметаванымі лірападобнай спражкай (мал. 1: *6*) і колцам, фрагментам упрыгажэння з ліставога металу (мал. 1: *8*), на якім меўся ціснёны арнамент. Акрамя таго, у пласце 3 выяўлена рабрыстая блакітная фаянсавая пацерка (мал. 1: *5*).

У мацерыку выяўлены 3 аб'екты.

Аб'ект 2 размешчаны ў кв. 2–5. Гэта яма, якая мае блізкую да авальнай форму (кв. 3, 5) з канаўкай, якая дамыкае да яе (кв. 2, 4). Яма арыентавана з паўночнага ўсходу на паўночны захад. Канаўка дамыкае да яе з паўночна-ўсходняга боку, а з паўднёва-заходняга боку яна злучаецца з аб'ектам 3. Паўночна-ўсходні край ямы выходзіць за паўночны край раскопу. Даўжыня ямы – 2,5 м, шырыня ў паўночна-ўсходняй частцы – 1,7, у паўднёва-заходняй – 1,4 м. Максімальная глыбіня ад узроўня мацерыка – 0,75 м. Даўжыня канаўкі – 1,6 м, яе шырыня ў паўночна-ўсходняй частцы – 1,1 м, у паўднёва-заходняй – 0,5 м. Максімальная глыбіня – 0,4 м. Аб'ект 2 запоўнены культурным слоем, які перамяжаецца праслойкамі пяску. У верхняй частцы канаўкі прасочаны вугальны слой таўшчынёй 0,18 м. У яме гэты слой паступова паніжаецца і ў паўночна-ўсходняй частцы дасягае дна ямы. Падчас зачысткі дна ў паўночна-ўсходняй частцы ямы зафіксавана 14 невялікіх паглыбленняў, размешчаных папарна. Дыяметр паглыбленняў – 4–5 см, глыбіня – да 3 см. Паглыбленні запоўнены вуголлем. Верагодна, гэта сляды жэрдак, якія падтрымлівалі навес над аб'ектам 2.

Падчас выбаркі аб'екта 3 у яго запаўненні былі выяўлены шматлікія фрагменты кругавой керамікі, некалькі кавалкаў глінянай абмазкі, косткі жывёл і рыб. Дастаткова шматлікія індывідуальныя знаходкі прадстаўлены артэфактамі: 1) жалезныя: ключ (мал. 2: *1*), фрагмент язычка ад спражкі, кальчужнае колца, фрагмент іголкі, нож (мал. 2: *4*), цвікі і неазначальныя вырабы; 2) бронзавыя: падковападобная фібула з макападобнымі галоўкамі (мал. 2: *2*), фрагмент лірападобнай спражкі (мал. 2: *3*) і фрагмент колца.

Аб'ект 3 размешчаны ў паўднёва-заходняй частцы кв. 2 і меў выгляд ямы, большая частка якой выходзіла за паўднёвы і заходні краі раскопу. Памеры даследаванай часткі ямы па лініі поўнач–поўдзень – 0,8 м, захад–усход – 1,7 м. Максімальная глыбіня – 0,84 м. На дне ямы выяўлена вугальная праслойка таўшчынёй да 0,2 м. Верхняя частка яма запоўнена культурным слоем цёмна-шэрага колеру. У запаўненні ямы выяўлены фрагменты кругавога посуду, фрагмент жалезнага нажа і цвік.

Аб'ект 4 знаходзіўся ў кв. 1, 3 і меў выгляд ямы, чатска якой выходзіла за ўсходні і паўночны краі раскопу. Памер даследаванай часткі ямы па лініі захад–усход – 2,4 м, поўнач–поўдзень – 1,7, глыбіня – 0,5 м. Яма запоўнена культурным слоем цёмна-шэрага колеру. На дне выяўлена праслойка вуголля таўшчынёй 0,15 м, у запаўненні фіксуюцца праслойкі пяску і гліны. У заходняй частцы ямы на



Мал. 2. Археалагічныя знаходкі: *1* – ключ; *2* – бронзавая падковападобная фібула з макападобнымі галоўкамі; *3* – ліpападобная спражка (фрагмент); *4, 5* – нажы; *6* – свінцовая пломба (фрагмент); *7* – грушападобная крыжапаразная бразготка; *1–4* – аб'ект 2; *5–7* – аб'ект 4. Селішча на р. Менка. 2011 г. Малюнак М. А. Плавінскага



Мал. 3. Донцы кругавых гаршчкоў з клеймамі (*1, 2*): *1* – пласт 2; *2* – аб'ект 4. Селішча на р. Менка. 2011 г. Малюнак М. А. Плавінскага

глыбіні 0,2 м ад яе дна выяўлена праслойка суглінку таўшчынёй да 0,1 м. Акрамя фрагментаў кругавой керамікі (сярод якіх маецца донца з кляймом (мал. 3: *2*)), кавалка глінянай абмазкі і костак жывёл у запаўненні аб'екта 4 знойдзены фрагментаваныя жалезныя вырабы, у тым ліку нож (мал. 2: *5*), бронзавая грушападобная крыжапаразная бразготка (мал. 2: *7*) і фрагмент свінцовай пломбы (мал. 2: *6*).

Траншэя была прырэзана да ўсходняй сценкі раскопу з мэтай высвятлення перспектывы яго пашырэння ва ўсходнім накірунку. Квадраты памерамі 1 × 1 м атрымалі нумары 7–9.

Пласт 1 прадстаўляў сабой перамешаны ворыўны слой цёмна-шэрага колеру, у якім знойдзены вельмі дробныя фрагменты кругавой керамікі і неазначальны жалезны выраб. *Пласт 2* па структуры і кансістэнцыі падобны да пласта 1 і толькі ля самага мацерыка выяўлены рэшткі непереаадкладзенага культурнага слою. У ім знойдзены фрагменты кругавой керамікі, у тым ліку донца гаршка з кляймом, а таксама фрагмент ліpападобнай спражкі і цвік ад падковы. *Пласт 3* выяўлены толькі ў кв. 9 і, часткова, у кв. 8. Ён складаецца з культурнага слою цёмна-шэрага колеру. У ім выяўлены фрагменты кругавой керамікі і кальчужнае колца.

Аб'ект 5 выяўлены ў кв. 9 на глыбіні 0,5 м. Гэта мацерыковая яма, краі якой выходзілі па-за межы траншэі. Яма паступова паніжалася ва ўсходнім кірунку. Яе максімальная глыбіня – 0,56 м. Запаўненне складалася з культурнага слою цёмна-шэрага колеру, у якім прасочваліся шматлікі праслойкі пяску і ўключэнні гліны. У заходняй частцы ямы, на дне, зафіксаваны слой вуголля таўшчынёй 0,15 м. У запаўненні аб'екта 5 знойдзены фрагменты кругавой керамікі, глінянай абмазкі і косткі жывёл.

Шурф памерамі 1 × 1 м быў закладзены на правым схіле яра, які аддзяляе селішча ад вялікага гарадзішча (на паўночны ўсход ад раскопу). Глыбіня шурфа дасягала 0,61–0,82 м. Яго запаўненне складалася з перамешанага слою шэрага колеру з сучасным смеццем і некалькімі вельмі дробнымі неазначальнымі фрагментамі керамікі. Рэшткаў культурнага слою ў шурфе не выяўлена.

Храналогія раскопу. Для вызначэння датавання культурнага пласта і аб'ектаў раскопу 2011 г. на менкаўскім селішчы найбольшую каштоўнасць маюць індывідуальныя знаходкі, аналіз якіх дазваляе зрабіць вельмі істотныя заўвагі наконт датавання дадзенай часткі паселішча. Разам з тым варта адзна-

чыць фактычна поўную адсутнасць у раскопе ляпной керамікі, што дазваляе меркаваць аб адсутнасці тут адносна ранніх напластаванняў.

У ***пласце 1*** ніводнага вузкадатаванага артэфакта не выяўлена. Пры гэтым варта адзначыць наяўнасць познесярэдневяковай абутковай падкоўкі.

У ***пласце 2*** да ліку надзейна датаваных артэфактаў належаць фрагмент цугляў, фрагмент механізма навяснога замка, бронзавая грушападобная крыжапаразная бразготка і фрагмент лірападобнай спражкі:

– фрагмент цугляў (мал. 1: *1*) належыць да тыпу I ці падтыпаў Іа, Іб, паводле А. М. Кірпічнікава. Улічваючы тое, што псалій не захаваўся, наяўны фрагмент цугляў можа быць датаваны ў межах IX–XI стст. [4, с. 13–15, 19];

– фрагмент механізма навяснога замка (мал. 1: *2*) датуецца часам не раней за пачатак XII ст. [5, с. 160, рис. 3];

– бронзавая грушападобная крыжапаразная бразготка (мал. 1: *3*) датавана канцом X – пачаткам XII ст. [7, с. 136];

– фрагмент лірападобнай спражкі (мал. 1: *4*) можа быць шырока датаваны – XI–XII стст. У Ноўгарадзе лірападобныя спражкі знаходзяцца ў слаях першай чвэрці XI – апошняй чвэрці XII ст. [9, с. 144].

У ***пласце 3*** да ліку хронаіндыкатараў належаць блакітная фаянсавая пацерка і фрагмент лірападобнай спражкі:

– фаянсавая пацерка (мал. 1: *5*) можа быць датаваная сярэдзінай X – сярэдзінай XI ст. [10, с. 98–99];

– фрагмент лірападобнай спражкі (мал. 1: *6*) датаваны XI–XII стст.

У ***аб'екце 2*** да ліку вузкадатаваных знаходак належаць бронзавая падковападобная фібула з макападобнымі галоўкамі, ключ ад нутранога замка і фрагментаваная лірападобная спражка:

– бронзавыя падковападобныя фібулы з макападобнымі галоўкамі (мал. 2: *2*) датуюцца на Русі пераважна XI ст. [6, с. 163]. У Ноўгарадзе яны выяўлены ў слаях сярэдзіны XI – сярэдзіны XII ст. [9, с. 88]. Таксама ў XI ст. падковападобныя фібулы з макападобнымі галоўкамі шырока распаўсюджваюцца ў латгалаў [8, с. 103];

– ключ ад нутранога замка (мал. 2: *1*) можа быць датаваны канцом XI – сярэдзінай XIV ст. [5, с. 161];

– фрагментаваная лірападобная спражка (мал. 2: *3*) можа быць датавана XI–XII стст.

У ***аб'екце 4*** да вузкадатаваных знаходак можа быць аднесена толькі грушападобная крыжапаразная бразготка (мал. 1: *6*) канца X – пачатку XII ст.

Такім чынам, большасць індывідуальных знаходак з культурнага слою і аб'ектаў раскопу 2011 г. датуюцца X ст., ці некалькі шырэй: канцом X – пачаткам XI ст. Разам з тым выразна вызначаецца група артэфактаў (ключ, фрагмент механізма замка і, часткова, лірападобныя спражкі), якая сведчыць аб працягу жыцця на дадзеным участку менкаўскага селішча і ў XII ст. нават у больш позні час. Гэта дазваляе больш упэўнена ставіць пытанне аб верхняй храналагічнай мяжы функцыянавання археалагічнага комплексу. Варта ўзгадаць, што Г. В. Штыхаў і Ю.А. Заяц пісалі аб магчымасці працягу жыцця на селішчы і ў пачатку XII ст. [2, с. 28–29; 12, с. 189–191]. Г. В. Штыхаў таксама адзначаў, што невялікія паселішчы маглі існаваць на тэрыторыі селішча і на тэрыторыі гарадзішча яшчэ і ў XII ст. [12, с. 191]. Гэтыя высновы рабіліся найперш на падставе керамічных матэрыялаў. Пасля раскопак 2011 г. стала магчымым больш упэўнена казаць аб працягу функцыянавання менкаўскага селішча і ў XII ст., прынамсі той яго частцы, якая размешчана на паўднёвы ўсход ад вялікага гарадзішча.

Высновы

1. У выніку прац, якія былі праведзены на тэрыторыі археалагічнага комплексу на р. Менка, была даследавана плошча памерамі 28 м^2. Матэрыялы, атрыманыя падчас раскопак на селішчы, размешчаным на паўднёвы захад ад вялікага гарадзішча, дазваляюць меркаваць, што найбольш актыўная жыццядзейнасць на гэтым участку адбывалася ў канцы X – пачатку XI ст. Але і ў XII ст. жыццё на ім таксама працягвалася. Выяўленне дадзенага факту можна лічыць адным з найбольш важных вынікаў даследаванняў 2011 г.

2. Нягледзячы на шматгадовае разворванне і працяглую дзейнасць «чорных капацелей», перадмацерыковыя ўчасткі культурнага слою селішча засталіся ў непераадкладзеным стане. Тое ж можна сказаць і ў дачыненні да мацерыковых ям. Таму працяг даследаванняў на дадзеным участку археалагічнага комплексу на р. Менка можа быць прызнаны цалкам перспектыўным.

Літаратура

1. Загорульский, Э. М. Возникновение Минска / Э. М. Загорульский. – Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1982. – 358 с. : ил.

2. Заяц, Ю. А. К проблеме первоначального Менска (сравнительная хронология поселений на реках Менка и Немига) / Ю. А. Заяц // Материалы по археологии Беларуси. – Минск, 2005. – Вып. 9. – С. 26–31.

3. Заяц, Ю. А. Гарадзішча / Ю. А. Заяц // Археалогія Беларусі : у 2 т.– Мінск : БелЭН імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1 : А–К. – С. 222–223.

4. Кирпичников, А. Н. Снаряжение всадника и верхового коня на Руси IX–XIII вв. / А. Н. Кирпичников / Свод археологических источников. – Л., 1973. – Вып. Е1–36. – 140 с. : ил.

5. Колчин, Б. А. Хронология новгородских древностей / Б. А. Колчин // Ногородский сборник. 50 лет раскопок Новгорода. – М. : Наука, 1982. – С. 156–177.

6. Мальм, В. А. Подковообразные и кольцевидные застежки-фибулы / В. А. Мальм // Очерки по истории русской деревни X–XIII вв. / Труды Государственного исторического музея. – М., 1967. – Вып. 43. – С. 149–190.

7. Мальм, В.А. Привески-бубенчики / В. А. Мальм, М. В. Фехнер // Очерки по истории русской деревни X–XIII вв. / Труды Государственного исторического музея. – М., 1967. – Вып. 43. – С. 133–148.

8. Радиньш, А. Погребальный обряд и инвентарь латгальских захоронений 10–13 веков / А. Радиньш // Archaeologia Lituana. – Vilniaus, 2001. – Vol. 2. – С. 65–118.

9. Седова, М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода / М. В. Седова. – М. : Наука, 1981. – 196 с. : ил.

10. Френкель, Я. В. Опыт датирования пойменной части гнездовского поселения на основании анализа коллекции стеклянных и каменных бус (по материалам раскопок 1999–2003 гг.) / Я. В. Френкель // Гнездово. Результаты комплексных исследований памятника. – СПб. : Альфарет, 2007. – С. 78–117.

11. Штыхов, Г. В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1978. – 160 с. : ил.

12. Штыхаў, Г. В. Гарады Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі / Г. В. Штыхаў // Археалогія Беларусі : у 4 т. – Минск : Беларус. навука, 2000. – Т. 3 : Сярэдневяковы перыяд (IX–XIII стст.). – С. 171–229.

Резюме

А. В. Войтехович, Н. А. Плавинский

Новые исследования археологического комплекса на р. Менка

В 2011 г. были возобновлены исследования археологического комплекса на р. Менка. Раскопки под руководством А. В. Войтеховича проводились в той части селища, которая размещается к востоку от большого городища. Исследованная площадь составила 28 м^2.

Полученные в ходе раскопок материалы позволяют предполагать, что наиболее активная жизнедеятельность на этом участке памятника существовала в конце X – начале XI в., причем и в XII в. жизнь на этом участке поселения продолжалась.

Summary

A. Vaitsekhovich, M. Plavinski

New research of Menka archaeological sight

Research of the archaeological sight on the river Menka was renewed in 2011. Excavations under the guidance of A. Vaitsekhovich where conducted on the territory of unfortified settlement which lies to the east from the big hill fort. The area of 28 sq. m was investigated.

The materials obtained during the excavations make it possible to consider that the most active live took place on this part of the monument in the end of the 10th – beginning of the 11th century. However in the 12th century life on this part of the monument continued.

УДК 903.4(476.5)

***А. В. Войтехович**, Институт истории НАН Беларуси, заведующий сектором научных археологических фондов Института истории НАН Беларуси, кандидат исторических наук (г. Минск)*

Археологические работы на селище «Дружба» в городе Минске в 2011 г.

На территории современного Минска расположен ряд поселений, относящихся к древнерусскому времени. Еще в первой половине XX в. подобные памятники соотносились с населенными пунктами (деревнями), расположенными за пределами городской черты, но после строительства новых микрорайонов они становились частью города. Однако старые топографические названия сохранились. Одно из таких поселений было расположено на правом берегу р. Лошица, возле д. Дружба (прежнее название – Рыловщина). В 1925 г. И. А. Сербов проводил археологические исследования сохранившихся курганов распаханной группы у вышеназванной деревни [9, с. 196–209].

Селище было выявлено Ю. А. Заяцем в 1986 г. По предварительному заключению исследователя оно занимало площадь равную примерно 2,5 га. Согласно современному трассированию улиц г. Минска, территория селища «Дружба» расположена по обе стороны ул. Космонавтов и имеет вид вытянутой полосы (рис. 1). Западное окончание селища выходит за пределы пр. Дзержинского, северная ограничена руслом р. Лошица, южная граница определена в результате археологических исследований 2011 г. Она находится не более чем в 50 м на юг от бордюра ул. Космонавтов. Западная граница требует уточнения. В 1986–1987 гг. Ю. А. Заяцем в зоне строительства жилых домов микрорайона Малиновка-1 были исследованы археологические объекты на площади 1120 м^2. [1, 2]. Культурный слой на территории строительства был снят техникой до проведения археологических работ. В результате археологических раскопок были выявлены следы 16 наземных домов с подпольными и печными ямами, развалы каменных глинобитных печей. Вещевой материал представлен, главным образом, фрагментами керамических сосудов, также найдены изделия из железа и цветных металлов. Согласно хронологии, данное поселение существовало с XI по XIII в. и являлось одним из сельских поселений округи г. Минска [3, 5].

В 2011 г. часть территории селища, расположенная в районе пересечения пр. Дзержинского и ул. Космонавтов, попала в зону строительных работ. В результате нивелировки был снят насыпной гумусированный слой и раскрыта материковая поверхность, на которой четко фиксировались следы ям. Некоторые ямы имели квадратную форму и являлись, видимо, остатками заглубленных в грунт жилищ. Одно из таких пятен было прорезано узкой траншеей, осмотр которой показал, что глубина ямы, заполненной культурным слоем, достигает 0,7 м.

Согласно плану строительных работ, по этому участку должна была быть проложена траншея водопровода. Управление по охране историко-культурного наследия и реставрации Министерства культуры Республики Беларусь приостановило земляные работы на строительной площадке до проведения археологических раскопок. Однако, несмотря на запрет, была прорыта траншея глубиной и шириной до 2 м, и практически все археологические объекты были уничтожены. В результате осмотра траншеи был собран археологический материал – изделия из железа, цветного металла, камня, кости и фрагменты гончарных сосудов. Также было проведено изучение сохранившихся археологических объектов на прилегающих к траншее участках (рис. 2), так как при упорядочивании территории, после прекращения земляных работ, эти объекты могли пострадать.

Археологические работы на селище «Дружба» проходили в несколько этапов. Первый этап включал зачистку профилей траншеи водопровода и сбор археологического материала, второй этап – археологические раскопки вдоль линии траншеи.

Первый этап. Археологические объекты в виде остатков ям, заполненных темным культурным слоем, фиксировались в профилях траншеи, часть культурного слоя осыпалась на ее дно. После зачистки остатков объектов и просмотра осыпавшегося слоя и грунта, вынутого из траншеи, был собран археологический материал. К изделиям из цветных металлов относятся: лировидная поясная пряжка (рис. 3: *1*) и рамка приемника пояса от похожей пряжки (рис. 3: *2*). Подобные пряжки в окрестностях Минска встречаются в комплексах XI в. [4, с. 69]. Еще одна поясная пряжка имела рамку квадратной формы (рис. 3: *3*), такие изделия датируются в основном XII в. [8, с. 147]. К деталям поясного набора может иметь отношение и обоймица, представляющая собой согнутую пластинку с отверстием для заклепки (рис. 3: *4*). Украшения представлены фрагментами изделий. Это фрагмент орнаментированного узкомассивного литого браслета (рис. 3: *6*), характерного для древностей X–XII вв. [8, с. 103]. Найденный фрагмент браслета использовался вторично (подвеска ?), о чем свидетельствует просверленное отверстие.



Рис. 1. Границы селища «Дружба» на выкопировке из карты г. Минска (масштаб 1 : 5000)

Изделия из железа представлены различными вещами хозяйственного назначения. Это кресала для высекания огня – целое калачевидное с язычком (рис. 3: *6*) и фрагмент овального кресала (рис. 3: *7*). Согласно Новгородской хронологии, калачевидные кресала с язычком датируются X – третьей четвертью XII в., а овальные началом XIII – серединой XV в. [7, с. 163]. Однако найденное калачевидное кресало имело переходную форму к более поздним кресалам без язычка и может датироваться не ранее XI в., а овальное, согласно общей хронологии памятника, не выходит за рамки XIII в. Ножи представлены только фрагментами лезвий. Один фрагмент имеет толстую спинку (4 мм). Нож был изготовлен в технике пакетирования, когда между двух половинок мягкого железа размещали полоску стали. Такая технология была характерна для X–XI вв. (рис. 3: *8*). Другой фрагмент ножа (рис. 3: *9*) цельнокованный и имеет толщину спинки 3 мм, подобные изделия относятся ко всему времени существования селища. К категории инструментов принадлежит фрагмент стамески, рабочая часть которой практически целиком обломана (рис. 3: *10*). Такие стамески в Новгороде появляются в XI в. [6, с. 41]. Также найдено шило (рис. 3: *11*). Детали одежды представлены пряжкой от обуви или амуниции (рис. 3: *12*) и фрагментами подковообразных фибул (с дужкой ромбического сечения (рис. 3: *13*) и часть дужки фибулы круглого сечения со спиральной головкой).



Рис. 2. Схема размещения участков раскопок археологических объектов на селище «Дружба» относительно траншеи водопровода



Рис. 3. Археологические материалы, найденные во время первого этапа работ на селище «Дружба»: *1–5* –изделия из цветного металла; *6–13* – изделия из железа; *14* – клык животного

Среди найденных вещей имеются изделия из костей животных. Это подвеска-амулет, изготовленная из клыка лисы (рис. 3: *14*), и фрагмент костяной проколки, сделанной из трубчатой кости.

Среди изделий из глины выделяется фрагмент красноглиняной амфоры с ручками. Остальные находки представлены фрагментами венчиков гончарных горшков XI–XII вв. (рис. 4: *1–12*). Кроме этого, найдены фрагменты стенок и донышек от гончарных горшков, на одном из донышек было клеймо в виде солярного знака (рис. 4: *13*). Также были встречены фрагменты красной глиняной обмазки от деревянных конструкций.

Второй этап. ***Участок № 1.*** Было решено провести исследование участка № 1, прилегающего к траншее, параллельной пр. Дзержинского, со стороны микрорайона (рис. 5). Данный участок мог быть поврежден при дальнейших работах по благоустройству этой территории, а археологические объекты, находящиеся на этом участке, уничтожены техникой. Слой балласта был снят, его толщина колебалась от 0,2 до 0,4 м. Балласт представлял собой очень плотный грунт черного цвета, в котором встречались фрагменты битого красноглиняного кирпича, следов археологического материала в слое бал-



Рис. 4. Венчики (*1–12*) и донышко (фрагмент) (*13*) гончарных горшков, найденные во время первого этапа работ на селище «Дружба»



Рис. 5. План зачистки материковой поверхности с контурами археологических объектов на первом участке работ на селище «Дружба» (здесь и далее нивелировочные отметки приводятся по балтийской системе). Условные обозначения: *1* – материк; *2* – культурный слой; *3* – песок; *4* – глина; *5* – обожженая глина; *6* – уголь; *7* – перекоп

ласта не обнаружено. Зафиксированный черный слой, видимо, был насыпан во время благоустройства территории микрорайона после строительства. В результате зачистки был размечен участок материковой поверхности размером 10 × 7 м со сторонами, параллельными пр. Дзержинского и ул. Космонавтов. Одна из сторон участка примыкала к засыпанной траншее. Материковая поверхность была зачищена вручную. Были выявлены следы четырех археологических объектов – ям (рис. 6).

Объект № 1 примыкал к краю траншеи. Он представлял собой пятно темного цвета округлой формы. На расстоянии 2,8 м от него на юг выявлено скопление глины размерами 1,0 × 1,2 м. Между объектом и пятном прослеживалась полоса глины длиной около 3 м при ширине 0,2 м. После выборки выяснилось, что объект № 1 представляет собой углубление диаметром около 2 м, в юго-западной части которого была яма овальной формы размерами 0,6 × 0,8 м и глубиной до 0,2 м, заполненная темным слоем (рис. 7: *1*). Общая глубина объекта достигала 0,3 м. Полоса глины также была углублена в материк на 0,1 м.

Тип 7 (31 экз., 57,4%). Глина этих горшков аналогична предыдущему типу. Венчики отогнуты наружу, а их край оформлен сверху в виде валика или треугольного выступа. Традиционно в Беларуси их датируют XII–XV вв. Характерно, что в предыдущих раскопах нет более поздних вариантов этого типа – с ребром на плечике, с вертикальной высокой шейкой, с рельефным ломким профилем, с очень короткой шейкой или без нее вовсе, с массивным венчиком. На поселении Лискове-1 наши горшки характерны для комплексов, датируемых серединой XI – началом XII в. Для более ранней датировки керамики этого типа в Юровичах следует также учесть, что здесь пока не было зафиксировано ни одной находки фрагментов стеклянных браслетов, характерных для XII – первой половины XIII в.

Тип 8 (7 экз., 12,9%). В Юровичах встречен впервые – один из поздних вариантов предыдущего типа – с массивным венчиком, без шейки. Датируется XIV–XV вв.

Тип 9 (4 экз., 7,4%). Также, как и предыдущий тип, датируется XIV–XV вв. и является поздним вариантом развития венчиков типа 7.

Таким образом, траншея на «Церковище» показала, что в отличие от детинца ранней керамики (X – середина XI в.) здесь крайне мало. Значительная часть керамического материала принадлежит горшкам XIV–XV вв., а большая часть – горшкам типа 7 (57,4%).

Литература

1. Іоў, А. В. Археалагічныя даследаванні летапіснага Смедзіна. Раскопкі 2001 г. / А. В. Іоў // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск : Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2003. – № 18. – С. 226–230.

2. Іоў, А. В. Новыя даследаванні ў Юравічах і на паселішчы Чарнаўчыцы-1 / А. В. Іоў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск: Беларуская навука, 2012. – Вып. 23 : Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі ў 2009–2010 гг. – С. 306–308.

3. Кирпичников, А. Н. Древнерусское оружие / А. Н. Кирпичников // САИ, Е1-36. – М. ; Л. : Наука, 1966. – Вып. 2. – 147 с.

4. Культура Биляра. Булгарские орудия труда и оружие X–XIII вв. / под ред. А. Х. Халикова – М. : Наука, 1985. – 216 с.

5. Kazakevičius, V. On One Type of Baltic Sword of the Viking Period / V. Kazakevičius // Archaeologia Baltica. 2. The Balts and their Neighbors in the Viking Age. – Vilnius. – P. 117–132.

6. Кошман, В. Прадметы ўзбраення з гарадзішча Свіслач (па матэрыялах раскопак 2000, 2005–2007 гадоў) : да пытання аб мангольскіх нападах на тэрыторыю Беларусі ў сярэдзіне XIII ст. / В. Кошман, М. Плавінскі // Acta Archaeologica Albaruthenica. – Мінск : Выдавец І. П. Лагвінаў, 2008. – Vol. IV. – С. 85–110.

Рэзюмэ

А. В. Іоў

Раскопкі старажытнарускіх помнікаў на Прыпяцкім Палессі

У 2011 г. аўтарам было працягнута даследаванне курганнага могільніка X–XI стст. Паставічы ў Старадарожскім раёне Мінскай вобласці, гарадзішча XII–XIII стст. летапіснага Смедзіна (в. Снядзін Галубіцкага сельсавета) у Петрыкаўскім раёне, а таксама гарадзішча X–XI стст. ў в. Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

Summary

A. Iov

Excavations of the Ancient Rus sites in the region of Polesie

The author has continued investigatoins of the burial mound cemetry of Pastovichi (the 10th–11th centuries) (Minsk region), the hill-forts of Smedzin (the 10th–13th centuries) and Yurovichi (the 10th–11th centuries) (Gomel region) in 2011.

УДК 902/904 (476)«2011»

***А. Ф. Касюк**, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі сярэдневяковага перыяду (г. Мінск)*

Асноўныя вынікі археалагічных даследаванняў на Палессі ў 2011 г.

У палявым сезоне 2011 г. аўтарам былі абследаваны помнікі археалогіі на тэрыторыі Драгічынскага, Ляхавіцкага і Пінскага раёнаў Брэсцкай вобласці, а таксама праведзены раскопкі на помніках Востраў-8 Пінскага раёна і Барыскавічы-1 Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. Мэтай даследаванняў быў пошук і абследаванне помнікаў V–IX стст. на тэрыторыі Паўднёвай Беларусі, а таксама вывучэнне раннеславянскіх паселішчаў шляхам правядзення раскопак. Разведкі ў Пінскім і Драгічынскім раёнах праводзіліся сумесна з В. Г. Беляўцом, Г. М. Бяліцкай і А. В. Іовам. У раскопках на помніку Востраў-8 прымаў удзел В. А. Кабрынец. Падчас даследаванняў на паселішчы Барыскавічы-1 дапамогу аказваў настаўнік сярэдняй школы в. Зімовішчы В. Гімбут. Вызначэнне матэрыялаў каменнага веку і эпохі бронзы зроблена М. М. Крывальцэвічам. Усім, хто дапамагаў падчас палявых даследаванняў і пры камеральнай апрацоўцы матэрыялаў, аўтар выказвае шчырую падзяку.

Падчас працы ў Драгічынскім раёне быў абследаваны вядомы помнік Жабер-4 на правым беразе Ясельды (месцазнаходжанне апрацаванага крэменю і ляпной керамікі жалезнага веку) [7, с. 251] і курганны могільнік каля вёсак Ласінцы і Белінок. На тэрыторыі Ляхавіцкага раёна палявыя даследаванні праводзіліся па р. Шавялёўка, левым прытоку р. Ведзьма – каля вёсак Шавялі і Падлессе, а таксама каля в. Набярэжная (правы бераг Шчары) і каля в. Гарадзішча на р. Свідроўка, левым прытоку Шчары. Было зафіксавана некалькі новых месцазнаходжанняў археалагічных матэрыялаў: Падлессе-1, Шавялі-1.

У Пінскім раёне археалагічныя разведкі праводзілі ў міжрэччы Прыпяці і Ясельды – былі агледжаны вядомыя помнікі каля вёсак Крывічы (Крывічы-1, -2, -3), Курадава (Курадава-1, -2). Паселішча Крывічы-1 размешчана за 1 км на паўднёвы захад ад вёскі, на краі надпоймавай тэрасы левага берага р. Прыпяць. Падчас першапачатковага абследавання ў 1988 г., В. С. Вяргей і М. М. Крывальцэвіч, акрамя апрацаванага крэменю і абломкаў пасудзін эпохі бронзы–жалезнага веку, сабралі тут раннекругавую кераміку [2, с. 35–36]. У 2011 г. на ўзаранай паверхні помніка былі знойдзены 43 фрагменты ляпной керамікі, сярод іх – некалькі абломкаў пасудзін канца I тысячагоддзя н. э. з лінейным шматрадным і ямкавым арнаментам (мал. 1: *3, 4*). Таксама было знойдзена глінянае праселка. Яно пляскатае, з акруглымі бакамі, дыяметр – 3,6 см, вышыня – 1,6 см, адтуліна прамая, дыяметр адтуліны – 1,1 см (мал. 1: *1*).

Некалькі новых пунктаў было зафіксавана каля в. Плошчава. Наваколлі гэтай вёскі ў 1988 г. абследаваў У. Ф. Ісаенка, які выказаў меркаванне аб тым, што на поўдзень і захад ад населенага пункта могуць быць выяўлены старажытныя паселішчы [5, с. 13].

Плошчава-1 – размешчана за 0,3 км на поўдзень ад вёскі, на левым беразе р. Прыпяць, на ўзвышэнні паміж старыцай (з поўначы) і сучасным рэчышчам. Паселішча выцягнута з захаду на ўсход на 800 м, з поўначы на поўдзень – на 250 м. Вышыня над поймай – 1,0–1,5 м. Разворваецца. На паверхні было знойдзена 16 крамянёвых артэфактаў, сярод якіх – фрагмент нажа на пласціне, праколка, разец, скрабок на адшчэпе. Таксама знаходкі прадстаўлены ляпной керамікай эпохі позняй бронзы–ранняга жалезнага веку (107 адз.).

Плошчава-2 – размешчана за 0,1 км на паўднёвы захад ад вёскі, на левым беразе р. Прыпяць, на ўзвышэнні паміж старыцай (з поўдня) і вёскай. Памеры – 500 × 250 м, вышыня – 1,0–1,5 м. Разворваецца. На паверхні помніка быў знойдзены падскарыністы адшчэп з рэтушшу, 9 фрагментаў ляпной керамікі эпохі позняй бронзы–ранняга жалезнага веку, металургічны шлак.

Археалагічныя разведкі праводзіліся і па правым беразе р. Прыпяць. Тут былі агледжаны вядомыя помнікі каля вёсак Балгары (Балгары-1), Лемяшэвічы (Лемяшэвічы-3, -6), Церабень (Церабень-1), зафіксаваны новыя пункты каля вёсак Хрысцібалавічы, Чарнова-1-е.

Хрысцібалавічы-1 – размешчана за 0,5 км на поўнач ад вёскі, на паўночна-ўсходняй ускраіне вясковых могілак, на правым беразе р. Прыпяць. Помнік займае ўзвышэнне 300 × 150 м, выцягнутае з усходу на захад, вышынёй 3–4 м. Знаходкі прадстаўлены крамянёвай пласцінай з участкамі рэтушы, 3 адшчэпамі, 2 абломкамі крэменю і 2 фрагментамі ляпной керамікі.

Чарнова-1-е-1 – размешчана за 0,5 км на паўночны захад ад вёскі, на правым беразе р. Прыпяць. Помнік займае ўзвышэнне памерамі 450 × 250 м, выцягнутае з захаду на ўсход, вышынёй 2 м. Разворваецца. Культурны пласт цёмна-шэрага колеру, добра насычаны археалагічнымі матэрыяламі. На паверхні помніка былі знойдзены крамянёвыя артэфакты: 2 прылады з рэтушшу (1 цэлая, 1 фрагмент), 2 абломкі крэменю, адшчэп.

Найбольш прадстаўнічай атрымалася калекцыя ляпной керамікі. Сярод 99 фрагментаў пасудзін паводле спосабу апрацоўкі паверхні вылучаюцца глян-



Мал. 1. Археалагічныя матэрыялы, выяўленыя падчас павярховых зборaў на помніках Крывічы-1 (*1–5*), Чарнова-1-е-1 (*6–25*), Чарнова-1-е-2 (*26–39*). 2011 г.

цаваныя (з аднаго ці абодвух бакоў) жоўтага, чырванаватага, шэрага і чорнага колеру, таксама пасудзіны з гладкай і шурпатай паверхняй (мал. 1: *6–25*). Глянцаваныя пасудзіны танкасценныя (0,4–0,7 см), шурпатыя – маюць больш тоўстыя сценкі (0,8–1,2 см). Трэба таксама адзначыць разнастайнасць спосабаў арнаментацыі керамікі. У калекцыі ёсць фрагменты пасудзін з налепленым валікам (мал. 1: *17*), «елачным» арнаментам з гарызантальных ліній, зробленых пазногцем (мал. 1: *20*), штрыхоўкай (мал. 1: *24*), рэльефным лінейным арнаментам (мал. 1: *21*), з арнаментам, зробленым ўцісканнямі пальцам (мал. 1: *18*). Дамешкі ў фрагментах з глянцаванай паверхняй – шамот і пясок, у астатніх – жарства і шамот. Пераважаюць дамешкі шамоту. Знойдзеная кераміка папярэдне датуецца раннім жалезным векам.

Да знаходак эпохі позняга сярэдневякоўя з помніка адносяцца 3 фрагменты кругавых пасудзін, гліняны грузік цыліндрычнай формы, дыяметрам 3,6 см, вышынёй 3 см, з прамой адтулінай дыяметрам 1,6 см.

Чарнова-1-е-2 – размешчана за 0,2 км на поўнач ад вёскі, на правым беразе р. Прыпяць, на ўзвышэнні памерамі 450 × 200 м, вышынёй 2,5–3,0 м. Разворваецца. На паверхні помніка былі сабраны крамянёвыя артэфакты ад мезаліту да эпохі бронзы: 4 нуклеусы (мал. 1: *36–39*), скрабок на краявым сколе (мал. 1: *33*), фрагмент крамянёвага вырабу (мал. 1: *34*), 2 сколы з участкамі рэтушы (№ 13 – мал. 1: *32*), 9 пласцін і іх фрагментаў (№ 10 – мал. 1: *35*), 8 адшчэпаў (№ 14 – бронзавы век, мал. 1: *31*), 7 абломкаў. Ляпная кераміка з паверхневых збораў прадстаўлена 96 фрагментамі (№ 32 – венца пасудзіны пражскай культуры ?), яна падобная да керамікі з пункта Чарнова-1-е-1 і ў цэлым датуецца раннім жалезным векам (мал. 1: *26–30*). З культурнага пласта паходзяць таксама 36 фрагментаў кругавых пасудзін эпохі позняга сярэдневякоўя, 4 кавалкі металургічнага шлаку.

На поўдні Пінскага раёна, у басейне р. Стыр, былі агледжаны помнікі каля вёсак Востраў (Востраў-4, -5, -6, -7) і Ласіцк (Ласіцк-3), сабраны крамянёвыя артэфакты і фрагменты ляпных пасудзін ад эпохі неаліту да сярэдневякоўя.

Паселішча Востраў-7 (Ласіцк-2 А) размешчана за 3–4 км на ўсход ад в. Востраў, ці за 1,5–2,0 км на захад ад в. Ласіцк. Помнік выявіў у 1991 г. У. Ф. Ісаенка [6, с. 9–10]. У 2011 г. супрацоўнік Пінскага краязнаўчага музея В. А. Кабрынец на агаленнях культурнага пласта сабраў 83 фрагменты ляпных і 9 фрагментаў кругавых пасудзін. Частка ляпной керамікі датуецца эпохай неаліту–раннім жалезным векам: № 84 – з ямкавым арнаментам, неаліт (мал. 2: *2*), № 83 – неаліт–бронзавы век, № 14 – бронзавы век, шнуравая кераміка палескага тыпу (мал. 2: *1*), № 43, 44, 67, 76, 82 – бронзавы век–ранні жалезны век, №№ 26–28 – ранні жалезны век (мілаградская культура) (мал. 2: *3–5, 7–8*), № 12 – жалезны век (мал. 2: *6*). Астатнія фрагменты (70% ад агульнай колькасці) паходзяць ад пасудзін пражскай культуры (мал. 2: *9–20*). Абломкі танкасценныя, абпал добры, колер ад светла-чырвонага да шэрага. Паверхня пасудзін шурпатая, у цесце дамешкі жарствы, зрэдку – шамоту.

У 2011 г. стацыянарныя даследаванні былі праведзены на паселішчы **Востраў-8** (селішча Востраў-2). Помнік размешчаны за 1 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Марфінец, займае ўсходнюю частку пясчанага ўзвышэння, якое з усходу і паўночнага ўсходу абмежавана старыцай р. Стыр – р. Заліска. Упершыню паселішча абследаваў у 1987 г. і правёў раскопкі А. А. Егарэйчанка. У раскопе плошчай 296 м^2 былі выяўлены рэшткі 3 жытлаў зрубнай канструкцыі, якія ацяпляліся агменямі, складзенымі з кавалкаў жалезнага шлаку. Сярод знаходак – вялікая колькасць абломкаў ляпных і кругавых пасудзін, глінянае праселка, крамянёвыя скрабкі, фрагмент фібулы IV ст. н. э., падвескі, кольца, пранізкі, спражка, шкляныя пацеркі, розныя вырабы з жалеза. На паселішчы былі зафіксаваны матэрыялы эпохі бронзы, ранняга жалезнага веку (мілаградская культура). Большасць знаходак адносяцца да зарубінецкай і пражскай культур [3, с. 61–82].

Сённяя культурны пласт на помніку практычна знішчаны ў выніку прыроднага і антрапагеннага ўздзеянняў. Па ўсёй плошчы расце сасновы лес. Археалагічныя матэрыялы, у асноўным ляпная кераміка, у значнай колькасці сустракаюцца на паверхні паселішча (мал. 2: *21–44*). Сярод найбольш цікавых знаходак – палова каменнай шліфавальнай пліткі з другасным выкарыстаннем (пасля таго, як плітка зламалася пасярэдзіне даўжыні, палавінку ад яе працягвалі выкарыстоўваць) (мал. 2: *21*). Даўжыня – каля 12 см, шырыня – 14,5, таўшчыня – 2,9 см. Глыбіня выемкі ад шліфавання (старой) – каля 0,3 см, новай – каля 0,2 см. Знаходка датуецца эпохай неаліту–бронзавым векам.

У 2011 г. раскоп плошчай 32 м^2 быў разбіты ў паўднёва-ўсходняй частцы помніка, недалёка ад раскопу 1987 г., на адным з бязлесых участкаў. Мэтай даследаванняў быў пошук ацалелых старажытных аб'ектаў. Культурны пласт складаўся з пяску шэрага колеру магутнасцю 0,1–0,25 м, перамяшанага да мацерыка. На глыбіні 0,1 м ад дзённай паверхні па ўсёй даўжыні раскопу былі прасочаны контуры траншэі шырынёй 1,0–1,2 м у паўночнай яго частцы і да 3,4 м у паўднёвай. Уздоўж траншэі зафіксаваны плямы пяску шэра-карычневага, часам, чорнага колеру, насычаныя вуголлем. Тут жа сустракаліся кальцыніраваныя косці і фрагменты моцна абпаленай таўстасценнай керамікі жалезнага веку. Пасля выбаркі траншэі да мацерыка, аказалася, што яна мае пакатыя сценкі, глыбіню ў паўночнай частцы – да 0,2 м, у паўднёвай частцы – да 0,5 м. Вызначэнне функцыянальнай і храналагічнай прыналежнасці выяўленага аб'екта выклікае пэўныя цяжкасці. Можна меркаваць, што гэта працяг «остатков блиндажа и траншеи периода мировой войны», зафіксаваных у раскопе 1987 г. [3, с. 61–82]. У заходняй частцы доўгай пясчанай дзюны, на якой размешчана паселішча, таксама сустракаюцца археалагічныя матэрыялы (дробныя фрагменты ляпной керамікі). Культурны пласт тут мае магутнасць да 0,3 м. Пункт пазначаны намі як Востраў-8 «А».

Па выніках даследаванняў, праведзеных у 2011 г. на помніку Востраў-8, можна канстатаваць, што найбольш старажытны перыяд засялення адносіцца да мезаліту (?) – бронзавага веку. Сярод знаходак гэтага часу – 10 фрагментаў пасудзін (культура шнуравой



Мал. 2. Знаходкі з павярховых збораў на паселішчах Востраў-7 (*1–20*), Востраў-8 (*21–44*). 2011 г.

керамікі (?), 25 адз. апрацаванага крэменю, палова каменнай шліфавальнай пліткі.

Найбольш інтэнсіўны этап жыццядзейнасці на паселішчы прыпадае на рубеж эр – першыя стагоддзі нашай эры, калі тут пражывалі прадстаўнікі зарубінецкай культуры. Ляпная кераміка «зарубінцаў» складае пераважную большасць усіх знаходак – звыш 800 фрагментаў (з іх 166 – з павярховых збораў). Часцей за ўсё, гэта абломкі таўстасценных грубаляпных пасудзін (карычневага і жаўтаватага колераў) з шурпатай паверхняй. На некаторых фрагментах прасочваюцца шырокія вертыкальныя палосы ад загладжвання пальцамі, ці шматлікія сляды пальцавых адбіткаў (мал. 2: *30, 31*). Дамешкі – жарства розных памераў і шамот. Фрагменты танкасценных пасудзін з глянцаванай паверхняй чорнага, шэрага і карычневага колераў складаюць 6,5% ад агульнай колькасці (мал. 2: *25, 26*; 3: *1, 5, 13, 17,*

19, 21, 34, 35, 39, 43, 48), сустракаюцца фрагменты з храпаватай паверхняй (мал. 2: *36*; 3: *36, 37*). Глянцаваныя і падглянцаваныя пасудзіны часцей за ўсё маюць рабрыстыя сценкі. Таксама знойдзены фрагменты ляпных дыскаў-накрывак жоўтага колеру з падглянцаванай знешняй паверхняй, гліняныя «вушкі» (мал. 3: *2, 8, 15, 22, 29*). Арнаментацыя керамікі заключалася ў нанясенні насечак і наколаў па зрэзе венца, уціскананяў пальцам і пазногцем па баках пасудзіны (мал. 2: *28, 33, 39, 43*; 3: *27*). На шмат якіх фрагментах ёсць адбіткі зерня, у адным выпадку гэта ячмень (мал. 3: *13, 15*).

Аб занятках мясцовага старажытнага насельніцтва металургічным промыслам сведчаць знаходкі кавалкаў жужалю і абломкаў ашлакаваных пасудзін. Таксама на помніку быў знойдзены камень невялікіх памераў з гладкай паверхняй, які выкарыстоўвалі для расцірання ці загладжвання (мал. 2: *23*).



Мал. 3. Ляпная кераміка (*1–48*). Паселішча Востраў-8. 2011 г.

Сярод асноўнай масы ляпной керамікі з паселішча некалькі фрагментаў трэба вылучыць асобна. Яны карычневага колеру, маюць тонкія і тоўстыя (звыш 1 см) сценкі, гладкую (падглянцаваную) і шурпатую паверхню, у цесце – дамешкі шамоту (мал. 3: 32, 38, 44–45). Гэтыя фрагменты былі знойдзены ў паўднёва-ўсходняй частцы раскопу на глыбіні 0,2 м. Яны адрозніваюцца ад керамікі зарубінецкай культуры, прадстаўленай на помніку, і могуць быць аднесены да II–IV стст. – перыяду пасля знікнення на паселішчы Востраў-8 «зарубінцаў» і да з'яўлення тут прадстаўнікоў пражскай культуры. Адсутнасць у керамічным комплексе 2011 г. абломкаў пасудзін пражскага тыпу можа сведчыць аб тым, што ў раннім сярэдневякоўі паселішча выкарыстоўвалі не так інтэнсіўна, як у папярэдні перыяд, таму славянская кераміка, а таксама іншыя рэчы гэтага часу, звязаны пераважна з закрытымі комплексамі (жытламі), што, у сваю чаргу, добра бачна па выніках раскопак 1987 г.

Таксама ў 2011 г. былі праведзены раскопкі на паселішчы **Барыскавічы-1**. Помнік размешчаны на заходняй ускраіне вёскі Барыскавічы (Прудкоўскі сельсавет Мазырскага раёна Гомельскай вобласці), на тэрасе правага берага р. Тур (правы прыток р. Прыпяць), выцягнуты ўздоўж ракі на 500 м, шырыня – больш за 100 м. Вышыня над сучасным рэчышчам – да 5 м. Паверхня паселішча разворваецца. Помнік выявіў у 2009 г. і даследаваў на плошчы 30 м^2 М. М. Крывальцэвіч. Сярод знаходак – фрагмент бронзавай пранізкі, праселка, вытачанае са сценкі ляпной пасудзіны, крамянёвыя артэфакты, ляпная кераміка ад бронзавага веку (кола культуры шнуравой керамікі) – да канца I тысячагоддзя н. э., фрагменты кругавога посуду [8].

Раскоп 2011 г. плошчай 44 м^2 быў разбіты ў цэнтральнай частцы паселішча адносна яго даўжыні, за 10 м ад краю тэрасы, прыкладна за 10–15 м на захад ад раскопу 2009 г. Ён арыентаваны старанамі па баках свету, выцягнуты па лініі поўнач–поўдзень. Стратыграфія культурнага пласта наступная: пласт ворнай глебы магутнасцю 0,10–0,25 м складаўся з супеску шэра-карычневага колеру, у паўночна-заходняй частцы адсутнічаў. Культурны пласт – супесак цёмна-жоўтага колеру, святлейшы дадолу, меў магутнасць да 0,25 м у паўднёвай частцы раскопу, да 0,35 м – у паўночнай. Мацярык – пясок светла-жоўтага колеру, быў расчышчаны на глыбіні 0,4 м у паўночнай і ўсходняй частках раскопу, на глыбіні 0,55 см – у паўднёва-заходняй.

Раскоп па ўсёй даўжыні пашкоджаны траншэяй, у якой траплялася смецце. У паўднёвай частцы, на ацалелых участках, былі даследаваны рэшткі двух аб'ектаў. *Аб'ект 1* – ацяпляльнае збудаванне (печ ?), складзенае з камянёў, было выяўлена ў паўднёва-ўсходняй частцы раскопу. На глыбіні 0,15 м ад дзённай паверхні аб'ект прасочваўся ў выглядзе плямы цёмнага колеру з вуголлем. Дыяметр плямы – 1,2 м. Ніжэй, на глыбіню 0,8 м ад дзённай паверхні, быў расчышчаны развал камянёў з сярэднімі памерамі 10–15 см. Камяні моцна абпаленыя, з вострымі краямі, падобныя на друз вялікіх памераў, ляжалі ў межах ямы бессістэмна на рознай вышыні, найбольш шчыльна – ў цэнтры. Запаўненне паміж камянямі – чорная вуглістая зямля. У межах аб'екта былі знойдзены абломкі трох ляпных гаршкоў, палова глінянага праселка шарападобнай формы, каменны тачыльны брусок, 4 фрагменты костак жывёл. Па формах і тэхналогіі вырабу выяўленыя гаршкі адносяцца да пражскай культуры на заключнай фазе яе існавання (канец VII ст.) і да ранняга этапу Лука-Райкавецкай культуры (VIII ст.). Магутны пласт вуголля (да 0,6 м) і моцная абпаленасць камянёў сведчаць аб высокай інтэнсіўнасці выкарыстання гэтага ацяпляльнага збудавання. Вызначыць яго месца ў забудове старажытнага паселішча можна будзе пасля правядзення раскопак на прылеглым участку.

Аб'ект 2 (вогнішча) быў расчышчаны ў паўднёва-заходняй частцы раскопу. Прасочваўся на глыбіні 0,15–0,20 м ад дзённай паверхні ў выглядзе плямы пяску цёмна-шэрага колеру з уключэннем вугольчыкаў. У плане – авальнай формы, памеры – 1,0 × 1,9 м, выцягнуты па лініі поўнач–поўдзень, глыбіня – 0,35–0,40 м. У межах аб'екта выяўлены фрагмент крамянёвага вырабу са стромкай рэтушшу (позні неаліт), 5 фрагментаў сценак ляпных пасудзін (3 – позні неаліт).

У паўночнай частцы раскопу, на ўзроўні мацерыковай паверхні, былі расчышчаны 3 ямы акруглай у плане формы дыяметрам 0,30–0,40 м, з чашападобным профілем, глыбінёй у мацерыку 0,23–0,34 м. Знаходак у ямах не было.

Па выніках палявых даследаванняў, праведзеных у 2009 і 2011 г., можна зрабіць выснову, што старажытнае паселішча каля вёскі Барыскавічы ў III – пачатку II тысячагоддзя да н. э. было заселена плямёнамі усходнепалескага варыянта днепра-данецкай неалітычнай культуры (позні этап). У бронзавым веку тут з'явіліся прадстаўнікі культуры шнуравой керамікі палескага тыпу. Паселішча існавала і ў жалезным веку – выяўлены нешматлікія фрагменты ляпной керамікі гэтага часу, бронзавая пранізка. Найбольш выразныя матэрыялы на помніку датуюцца эпохай ранняга сярэдневякоўя, адносяцца да пражскай і Лука-Райкавецкай культур.

Вядомыя і могілкі жыхароў раннесярэдневяковага паселішча. На заходняй ускраіне вёскі ў канцы XIX ст. адзначаўся курганны могільнік з 15 насыпаў вышынёй 1–3 м, дыяметрам 3–6 м. У. З. Завітневіч раскапаў 6 курганоў. Былі выяўлены пахаванні па абрадзе трупаспалення на гарызонце (1) і ў насыпе (5). Другі могільнік, больш позняга часу

(X–XII стст.), быў зафіксаваны на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Курганы [1, с. 259–260; 4, с. 1–2; 9, с. 171]. У культурным пласце паселішча Барыскавічы трапляюцца фрагменты кругавой керамікі і гэтага перыяду.

Такім чынам, у выніку разведак, праведзеных у 2011 г. на тэрыторыі Драгічынскага, Ляхавіцкага і Пінскага раёнаў Брэсцкай вобласці, былі абследаваны ўжо вядомыя помнікі археалогіі і выяўлены новыя. Сярод апошніх – найбольш цікавыя і перспектыўныя для даследаванняў – паселішчы эпох каменю і бронзы, ранняга жалезнага веку: Чарнова-1-е-1, -2; Плошчава-1, -2 у Пінскім раёне. Падчас раскопак на паселішчах з культурнымі напластаваннямі розных перыядаў Востраў-8 і Барыскавічы-1 былі атрыманы прадстаўнічыя калекцыі керамікі жалезнага веку–эпохі ранняга сярэдневякоўя.

Літаратура

1. Барыскавічы // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1985. – С. 259–260.

2. Вергей, В. С. Отчет о полевых исследованиях в Брестской области в 1988 г. / В. С. Вергей // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 1120. – 44 с. : 36 ил., 36 с. кол. оп.

3. Егорейченко, А. А. Поселение у д. Остров Пинского р-на Брестской обл. / А. А. Егорейченко // Archaeoslavica. – Krakow, 1991. – С. 61–82.

4. Завитневич, В. З. Из археологической экскурсии в Припятское Полесье / В. З. Завитневич // ЧИОНЛ. – Киев, 1890. – Кн. IV.

5. Исаенко, В. Ф. Отчет о полевых исследованиях 1988 года / В. Ф. Исаенко // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 1118. – 17 с., 17 с. кол. оп. : 25 ил.

6. Исаенко, В. Ф. Отчет о полевых исследованиях Припятского отряда в 1991 году / В. Ф. Исаенко // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 1469. – 16 с. : 6 ил., карты, 5 с. прилож.

7. Касюк, А. Ф. Археалагічныя разведкі на тэрыторыі Брэсцкай і Мінскай абласцей / А. Ф. Касюк // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Археалагічныя даследаванні на Беларусі ў 2008 годзе. – Мінск, 2011. – Вып. № 20. – С. 249–266.

8. Крывальцэвіч, М. М. Справаздача аб выкананні археалагічных даследаванняў у 2009 годзе на аб'екце «Размеркавальны газаправод высокага ціску для газіфікацыі індывідуальнага жыллёвага фонду аграгарадка Прудок Мазырскага раёна» Гомельскай вобласці / М. М. Крывальцэвіч // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2661. – 49 с.

9. Лысенко, П. Ф. Дреговичи / П. Ф. Лысенко ; под ред. В. В. Седова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 242 с.

Резюме

А. Ф. Касюк

Основные результаты археологических исследований на Полесье в 2011 г.

В полевом сезоне 2011 г. в результате исследований, проведенных на территории Дрогичинского, Ляховичского и Пинского районов Брестской области, а также Мозырского района Гомельской области, было обследовано 28 памятников археологии, на двух из них – Остров-8 и Борисковичи-1 – были проведены раскопки. Для дальнейшего изучения наиболее перспективны поселения эпох камня и бронзы, раннего железного века Черново-1-е-1, -2; Площево-1, -2 в Пинском районе, а также селище эпохи раннего средневековья Борисковичи-1 в Мозырском районе. На поселении Борисковичи-1 были исследованы остатки отопительного сооружения (печи ?) и выявлен представительный набор лепных сосудов пражской и Лука-Райковецкой культур.

Summary

A. Kasjuk

The main results of archaeological research in Polesie in 2011

In 2011 investigations had place on the territory of Drogichin, Lyakhovichi and Pinsk districts of Brest region, Mozyr district of Gomel region. 28 archaeological monuments were examined. Two settlements (Ostrov-8 and Boriskovichi-1) were excavated. The monuments of Stone Age and Bronze Age – Early Iron Age Chernovo-1, -2; Ploschevo-1, -2 (Pinsk district) and settlement of the Early Middle Ages Boriskovichi-1 are the most promising for further research. On the settlement Boriskovichi-1 remnants of heating installations were investigated and a representative set of ceramic of Prague culture and Luka-Raykovetskaya culture were found.

УДК 903.4(476.5)

М. В. Клімаў, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск)*

Завяршэнне археалагічных доследаў на помніку Лучна-1

Помнік Лучна-1 знаходзіўся за 12 км на ўсход ад Полацка, на высокім левым беразе р. Заходняя Дзвіна, на вышыні 12–14 м ад узроўню вады. Помнік даследаваўся з 1998 па 2005 г. і з 2010 па 2012 г. Да 2011 г. на помніку была даследавана плошча 3324 м^2. Асабліва маштабныя работы разгарнуліся ў 2010 г. у межах раскопу IX на плошчы 1140 м^2. У выніку акрамя комплексаў паселішчаў XI–XIII стст. і пахаванняў грунтовага могільніка I (XVI ст.) быў выяўлены грунтовы могільнік II, які папярэдне датавалі канцом XII – XIII ст. [3, с. 324, 328]. У сувязі з планамі будаўніцтва электрастацыі «Полацкая ГЭС», плаціна якой непасрэдна павінна была будавацца на месцы археалагічнага помніка, былі запланаваны і праведзены доследы помніка Лучна-1 у 2011 г. Усе археалагічныя працы на помніку ў 2011 г. праводзілі згодна з Дазволам № 2153 па форме № 4.

Асноўнай мэтай археалагічных прац у 2011 г. з'яўлялася максімальнае вывучэнне плошчы помніка з фіксацыяй ўсіх комплексаў і аб'ектаў, бо планамі будаўніцтва не прадугледжвалася спыненне пабудовы абваднога канала зімой 2011/12 г. Археалагічныя раскопкі і археалагічны нагляд за рознымі этапамі будаўнічых прац на помніку Лучна-1 працягваліся з 2 ліпеня па 21 снежня 2011 г. і ў студзені 2012 г. У выніку ў 2011 г. былі даследаваны 4 археалагічныя раскопы, X, XI, XII, XIII /часткова/ сумарнай плошчай 3136 м^2 (мал. 1). У археалагічных працах прынялі ўдзел В. В. Шадыра, студэнты-практыканты гістфака Белдзяржуніверсітэта пад кіраўніцтвам В. Сідаровіча і А. Плавінскага, малодшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі П. М. Кенькі, валанцёры[1].

Паралельна з археалагічнымі раскопкамі з жніўня 2012 г. праводзіўся і археалагічны нагляд за дзейнасцю будаўнікоў, бо асноўнай іх мэтай з'яўлялася будаўніцтва абваднога канала, які непасрэдна праходзіў па помніку, частка плошчы яго аказалася пад лясным масівам, які быў ліквідаваны. Звернемся да агульнага аналізу вынікаў даследавання.

Раскоп X, плошчай 1172 м^2 быў разбіты з улікам працягу паступовага даследавання ўсёй плошчы помніка, таму з усходняга боку ён быў выцягнуты ўздоўж левага берага р. Заходняя Дзвіна. З паўднёвага боку раскоп X датыкаўся да ранейшых раскопаў V і VIII. Самы паўднёва-усходні кут раскопу X стыкаваўся з паўночна-заходнім кутом раскопу IX, 2010 г. (мал. 1).

Стратыграфія раскопу X не мела адрозненняў ад папярэдне вывучанай плошчы на помніку, пры ваганні магутнасці культурнага пласта ў межах 0,30–0,55 м, ён складаўся з шэрай і цёмна-шэрай супесі з праслойкамі вугольлю, абпаленай гліны (памерамі 1,0 × 1,5 м; 1,5 × 2 м), вялікімі вуголлямі (памерамі 0,05 × 0,10 м; 0,1 × 0,2 м), фрагментамі глінянай абмазкі. Вышэйпазначаныя элементы сведчылі аб наяўнасці пабудоў з рэшткамі печаў. Ніжэй праслоек з вуголлямі і абпаленай глінай пры далейшых доследах былі зафіксаваны падпечкавыя і гаспадарчыя ямы. Асноўная колькасць сведчанняў пабудоў была сканцэнтравана ў заходняй і паўночнай частках раскопу. Плошча кожнай з пабудоў перавышала 20 м^2. Найменшая канцэнтрацыя ям характэрна для паўднёва-усходняй часткі раскопу.

Рэшткі пабудоў добра датуюцца па асобных артэфактах і манетах. У раскопе выразна прасочваліся сведчанні пажараў, якія адбываліся ў межах помніка. Адзін з пажараў датаваўся мяжой XII–XIII стст., другі – першай паловай XVI ст. Канцэнтрацыя матэрыялаў на раскопе мае выразны падзел па храна-



Мал. 1. План археалагічных прац (*А, Б*). Лучна-1. 2011 г.

[1] Прыносім удзячнасць усім удзельнікам археалагічных раскопак у 2011 г.

лагічных маркёрах. У заходняй частцы раскопу найбольш прысутнічалі матэрыялы і сведчанні пажару XI–XIII стст. (мал. 1: *Б*), ва ўсходняй частцы раскопу – матэрыялы і сведчанні пажару XV – першай паловы XVI ст. (мал. 1: *А*) У паўднёва-заходняй і цэнтральнай частках раскопу выразна назіраецца «накладанне» матэрыялаў і аб'ектаў абодвух перыядаў. У гэтай сувязі цікавасць выклікалі падмуркавыя траншэі ў цэнтральнай частцы раскопу (ямы № 531, 536), якія мелі накірунак: захад–усход, датаванне: XV – першая палова XVI ст., «праразалі» шэраг ям з матэрыяламі XII–XIII стст., былі звязаны з абарончымі драўлянымі сценамі.

На мяжы раскопачнага пласта 2 (0,35–0,40 м ніжэй дзённай паверхні) і мацерыка ў кв. 951 і 950 быў зафіксаваны скарб у выглядзе раскіда 11 манет на невялікай плошчы. Манеты знаходзіліся сярод цёмна-шэрага пласта з вуголлямі, адна з манет мела абпалены стан. Усе манеты былі вызначаны А. В. Іовым і адносіліся да грошаў і паўгрошаў чаканкі Аляксандра Ягелончыка, Жыгімонта I Старога, Жыгімонта II Аўгуста. Самая позняя манета ў скарбе датавана 1548 г.

У адрозненне ад раскопу X, раскопы XI, XII, XIII распрацоўвалі пасля зняцця верхняй часткі культурнага пласта пры дапамозе бульдозера. Гэта было выклікана хуткімі тэмпамі будаўніцтва канала і немагчымасцю поўнай разборкі культурных напластаванняў пры адсутнасці працоўнай сілы. Усе індывідуальныя знаходкі фіксавалі да пачатку і пасля працы бульдозернай тэхнікі, якая здымала культурны пласт праслойкамі па 20–25 см. Пасля згортвання бульдозерных прац раскоп XI быў разбіты на захад ад раскопу X і датыкаўся па нумерацыі квадратаў да раскопу X. У сувязі з інтэнсіўным працягам будаўніцтва катлавана было вырашана даследаваць яшчэ адзін раскоп XII, далучыўшы яго да заходняй і паўночнай сценак раскопу XI (мал. 1). Раскоп XIII быў разбіты на мяжы раскопаў 1998 г., 2001 г., 2003 г. з мэтай даследавання некалькіх ям, выяўленых раней. У выніку было знойдзена дадаткова некалькі ям і даследавана 2 з іх ліку. Снег і мароз перапынілі доследы на раскопе XIII. На аснове аналізу матэрыялаў мацерыковых ям і асобных артэфактаў адзначым асаблівасці помніка ў межах раскопаў.

Як указвалася вышэй, усходняя частка раскопу X мела ямы, датаваныя XV–XVI стст., што звязвалася з фінальнай стадыяй існавання феадальнай сядзібы. У заходняй частцы раскопу X, у межах раскопаў XI і XII амаль усе ямы ўтрымлівалі матэрыялы XI–XIII стст. Ямы XV–XVI стст. адносіліся ў асноўным да гаспадарчых і падпечкавых. У адной з падпечкавых ям былі выяўлены фрагменты аплаўленай квадрыфалійнай гаршковай кафлі (мал. 2: *8*). Падобныя ямы мелі поўны спектр матэрыялаў, характэрных менавіта для XV–XVI стст. З гэтай кропкі погляду характэрна запаўненне падпечкавай ямы № 469, памерамі 1,55 × 2,3 м і глыбінёй 0,20–0,85 м. У запаўненні ямы сярод цёмна-шэрага пласта з фрагментамі абпаленай гліны і вуголлямі быў размешчаны шэраг венцаў гаршкоў XV–XVI стст., часткі керамічных плітак, адна з якіх мела таўшчыню 3 см, кавалак цэглы таўшчынёй 7 см, камяні. Фрагмент сценкі пасудзіны з зялёнай палівай і штампам «сэрца з завітком» (мал. 2: *6*). Падобная кераміка з палівай і адпаведным штампам вядома яшчэ з раскопак 2002 г. У яме выяўлены і фрагменты ваконнага шкла таўшчынёй 2,0 і 1,5 мм.

Асаблівасцю ям XI–XIII стст. у межах раскопу X з'яўлялася тое, што вялікія па памерах ямы змяшчалі істотную колькасць фрагментаў бітых гаршкоў з венцамі, звернутымі ўнутр (в. з. у.) (мал. 2: *1*). Акрамя венцаў гаршкоў падобныя ямы ўтрымлівалі і іншыя матэрыялы. Так, з ямы № 480 паходзіў поўнасцю захаваны нож з касцяным, арнаментаваным дзяржальцам, частка палатна сярпа (?), асялок, шыфернае праселка. Ямы з падобнай керамікай пераважаюць і на раскопе XI. Сярод ям на раскопе XI вылучаецца яма № 657. Яма мела авальную форму памерамі 1,6 × 1,7 м і глыбінёй 0,75 м. Пры далейшай разборцы высветлілася, што яма была запоўнена бітымі гаршкамі з венцамі толькі схемы в. з. у. Гаршкі ляжалі даволі шчыльна сярод вугольля і вялікай колькасці жарствы. Вугольная праслойка «падсцілала» перадмацерыковы ўзровень ямы. Пры далейшай разборцы заходняй сценкі ямы звярнула на сябе ўвагу тое, што некаторыя з фрагментаў гаршкоў былі шчыльна «ўціснуты» ў праслойку неабпаленай гліны. Пры далейшай разборцы гэтай часткі ямы працягвалі сустракацца вялікія кавалкі абпаленага дрэва, якія нібы злучаліся між сабой пад вуглом 45º–50º. Такім чынам, яма мела авальную форму і яе выкарыстоўвалі ў мэтах вытворчасці керамічнага посуду.

Акрамя гаспадарчых ям найбольшую цікавасць уяўлялі ямы № 531 і 536. Яны мелі выгляд траншэй, пачыналіся ў раскопе X, перакрыжоўваліся і працягваліся ў раскопе XI. Ямы вызначаліся незвычайнымі памерамі. Яма № 531 пры шырыні ў межах 0,3–0,4 м, мела глыбіню ад 0,3 да 0,4 м. Яма № 536 пры шырыні 0,3–0,8 м вызначалася яшчэ большай глыбінёй – 0,4–0,6 м. Гэтыя ямы па прызначэнні выступалі як падмуркавыя для драўлянай агароджы на розных этапах існавання сядзібы XV – першай паловы XVI ст.

Асаблівасцю зместу ям з раскопу XII з'яўлялася тое, што некалькі закрытых комплексаў мелі ў сваім запаўненні кавалкі амфар трапезундскага тыпу (ямы № 727, 728, 734). У раскопе XIII адна з ям адносілася да XII ст., другая – да падпечкавай ямы XV–XVI стст.

Спынемся на агульнай характарыстыцы знаходак. Керамічныя вырабы на помніку традыцыйна прадстаўлены вялікай колькасцю фрагментаў гарш-



Мал. 2. Керамічныя вырабы (*1–8*): *А* – XI–XIII стст.; *Б* – XV–XVI стст. Лучна-1

коў, сярод якіх пераважаюць фрагменты венцаў схемы в. з. у. (мал. 2: *1*). Іншыя фрагменты дадзенага перыяду адносіліся да тыпаў, характэрных для XI ст., мяжы XII–XIII стст., XIII ст. (мал. 2: *2)* і сустрэтых у іншых гарадах Полацкай зямлі [1, с. 190, рис. 55; 4, рис. 2, 3]. Неабходна адзначыць, што сярод гэтага посуду пераважаюць гаршкі з дыяметрамі ад 18 да 21–22 см, частка з якіх арнаментавана хвалямі, лініямі, наколамі, уцісканнямі. На некаторых донцах гаршкоў зафіксаваны клеймы ў выглядзе «кола», «зорачкі», «трызубца». Большасць з донцаў не маюць ніякіх слядоў.

Для керамічнага посуду XV–XVI стст. характэрны тыпы венцаў з адметным выгінам сцябла (мал. 2: *3–5*). Сярод іншай наменклатуры пабытовай керамікі ў раскопах 2011 г. былі знойдзены накрыўкі, міскі, макотры (мал. 2: *7*), патэльні, свяцільнік, рукамыі, фрагменты паліванага посуду і посуду тыпу «каменны тавар».

Будаўнічая кераміка прадстаўлена фрагментамі выключна гаршковай кафлі, керамічных плітак і цэглы. Круглыя вусці кафлі мелі дыяметры ад 11 ад 13 см. Выяўлены фрагменты і квадрафалійнай кафлі. Варыятыўнасць таўшчыні цэглы вагалася ад 5 см (цэгла-пальчатка) да 6,5–7,4 см.

Сярод вырабаў з косткі вылучаецца некалькі рэчаў: лыжачка, часткі грабянёў, жужалка і ігральная костка. Выклікае цікавасць дзяржальца нажа, якое выканана з косткі.

Вырабы са шкла з раскопаў мелі традыцыйную наменклатуру: фрагменты бранзалетаў, донца невялікага келіха, шкляныя пацеркі, фрагменты ваконных шкляных дыскаў.

Вырабы з каменю прадстаўлены трыма катэгорыямі рэчаў: асялкамі, шыфернымі праселкамі, прыладамі працы (часткі сякер-кліноў і камянёў-цёрачнікаў), крамянёвай «скалкай». Толькі адна пласціна была аднесена да мезалічнай індустрыі[1].

Металічныя вырабы таксама адлюстроўваюць два перыяды ў жыццядзейнасці на помніку: XI–XIII стст. (мал. 3) і XV–XVI стст. (мал. 4). Пры гэтым вырабаў з каляровых металаў было істотна больш ў першы перыяд жыццядзейнасці. Да вырабаў з каляровых металаў з раскопаў адносіліся экзэмпляры культавай мелкай пластыкі (крыжыкі-цельнікі, мал. 3: *3*), крыж-энкалпіён XII ст., упрыгажэнні (пярсцёнкі (мал. 3: *8, 9*), бранзалеты (мал. 3: *5*), прывескі (мал. 3: *6, 7*), фрагмент грыўні, скроневыя і пасавыя кольцы, накладкі (мал. 4: *4*), спражкі (мал. 3: *10*), фібулы (мал. 3: *11*), гузікі (мал. 3: *2;* мал. 4: *3*), бразготкі (мал. 3: *1*), ланцужкі, ланцугатрымальнік), кніжныя зашпількі (мал. 4: *1, 2*), пломбы таварныя (мал. 3: *4*), пераплёты ваконныя, кулі, грузілы, манеты. Аб'ем артыкула не дазваляе разгледзіць усе

[1] Вызначэнне зроблена А. Вашанавым, за што прыносім яму ўдзячнасць.



Мал. 3. Асноўныя тыпы вырабаў XI–XIII стст. з каляровых (*1–11*) і чорных металаў (*12–14*). Лучна-1

катэгорыі рэчаў падрабязна, але, напрыклад, адносна спражак магчыма сказаць, што ўсе яны датуюцца ў межах канца X – XIII ст. і маюць шэраг аналогій сярод матэрыялаў з іншых помнікаў Беларусі [2, с. 156–159, рис. 16–19]. Некаторыя з бранзалетаў і пярсцёнкаў блізкія па матэрыялах да артэфактаў з Ноўгарада [6, с. 112, рис. 42: *22*; с. 125, рис. 45: *12*]. У выніку археалагічных раскопак былі выяўлены некалькі тыпаў манет, сярод якіх дзірхамы, дэнарыі Вітаўта, дэнарыі Аляксандра, паўгрошы Жыгімонта I; паўгрошы Жыгімонта II, пражскія грошы Вацлава IV, швецкія соліды рыжскай чаканкі Хрысціны Аўгусты, соліды Яна II Казіміра (барацінкі), медныя манеты расійскай чаканкі XVIII–XIX стст., «чашуйкі» расійскай чаканкі XVII – пачатку XVIII ст.[1]

Вырабы з чорных металаў прадстаўлены традыцыйнай для помніка Лучна-1 наменклатурай вырабаў: замкамі (мал. 3: *14*; 4: *5*) і ключамі (мал. 4: *7*), нажамі (чаранковыя і тронкавыя экзэмпляры; мал. 4: *6*), брытвай для галення; прыладамі і інструментамі, наканечнікамі стрэл (мал. 3: *13*), рыштункам вершніка і каня, крэсівамі (мал. 3: *12*), скабянымі вырабамі і інш. Многія вырабы маюць прамыя аналогіі сярод знаходак з чорнага металу з іншых помнікаў Беларусі [5, с. 273–274].



Мал. 4. Асноўныя тыпы вырабаў XV–XVI стст. з каляровых (*1–4*) і чорных металаў (*5–7*). Лучна-1

[1] Прыносім удзячнасць за вызначэнне манет Вяч. С. Куляшову, А. В. Іову, Ш. І. Бекцінееву і В. А. Кобрынцу.

Высновы

1. У выніку археалагічных раскопак на помніку Лучна-1 у 2011 г. былі атрыманы больш дакладныя даныя аб храналогіі помніка. Ранняя храналогія жыццядзейнасці ў мікрарэгіёне, дзе знаходзіўся помнік, была пацверджана двума фрагментамі дзірхамаў. Выяўленыя рэчы прэстыжнага характару, звязаныя з раннім перыядам бытавання сядзібы (I) (сярэбраныя ўпрыгажэнні, рамбічная прывеска, паліваны посуд, амфары), указвалі на тое, што яна была заснавана адным з бліжэйшых падначаленых полацкага князя. У сувязі з гэтым звяртае на сябе ўвагу наяўнасць на помніку пломбаў з выявамі «праквітнеўшага крыжа» і «трызубца».

Былі атрыманы новыя доказы перапынення жыццядзейнасці на помніку Лучна-1 у перыяд існавання сядзібы, у XII–XIII стст., у выніку ваеннага катаклізму. Не выключана, што наканечнікі стрэл маглі трапіць у пласт паселішча падчас міжусобных канфліктаў XII – пачатку XIII ст.

Археалагічныя раскопкі засведчылі, што феадальная сядзіба (II) XI–XIII стст. была абкружана значным вясковым паселішчам, у якім жылі рамеснікі і сяляне.

У выніку раскопак было атрымана ўдакладненне адносна планіроўкі сядзібы ў перыяд XV–XVI стст., асабліва гэта датычылася абарончых сцен (ямы № 531 і 536). Важнае значэнне ў 2011 г. мела выяўленне скарба першай паловы XVI ст., блізкага па складу да скарба 1551 г. (2002 г.), але ранейшага за яго на некалькі гадоў – 1548 г. Гэты скарб, як і іншыя сведчанні (перанос абарончай сцяны, некаторыя комплексы), гавораць аб тым, што ў першай палове XVI ст. у існаванні феадальнай сядзібы (III) магчыма вылучыць два падэтапы развіцця.

Літаратура

1. Заяц, Ю. А. Заславль в эпоху феодализма / Ю. А. Заяц. – Минск : Наука и техника, 1995. – 207 с. : ил.

2. Кенько, П. М. Поясная гарнитура с территории Беларуси (I–XIII вв.). Свод археологических источников / П. М. Кенько. – Минск : Беларус. навука, 2012. – 172 с.

3. Клімаў, М. В. Асноўныя вынікі археалагічных раскопак на помніку Лучна-1 у 2010 годзе / М. В. Клімаў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2012. – Вып. 23. – С. 324–332.

4. Левко, О. Н. Средневековое гончарство Северо-восточной Белоруссии / О. Н. Левко – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 164 с. : ил.

5. Сагановіч, Г. М. Прылады працы і пабытовыя рэчы. Асартымент, тыпалогія, храналогія / Г. М. Сагановіч // Археалогія Беларусі : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Т. 4 : Помнікі XIV–XVIII стст. / пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.] / Г. М. Сагановіч – Мінск : Беларус. навука. – С. 260–276.

6. Седова, М. В. Ювелирные изделия Древнего Новгорода (X–XV вв.) / М. В. Седова. – М. : Наука. – 195 с. : ил.

Резюме

М. В. Климов

Завершение археологических исследований на памятнике Лучно-1

Помещены результаты археологических раскопок на памятнике Лучно-1, которые были получены в 2011 г. В этом году на памятнике Лучно-1 была исследована площадь равная 3136 м^2. Приведены данные об основных исследованых объектах и артефактах. В 2011 г. на памятнике был найден небольшой клад и собрана богатая коллекция украшений из цветных металов и керамической посуды XI–XIII вв., в том числе фрагменты амфор. В результате работ были получены новые данные о хронологии и планировке феодальной усадьбы в XV–XVI стст.

Summary

M. Klimau

Completion of the archaeological study at the monument Luchna-1

The article deals with the results of archaeological excavations at the monument Luchna-1, which were obtained in 2011. In this year on the monument Luchna-1 was investigated area equal to 3136 sq. m. The article prazants data on the main research sites and artifacts. In 2011 a monument was found a little treasure and a fine collection of ornaments from non-ferrous metals and ceramics 11th–13th centuries. Including fragments of amphorae. As a result of the work was to obtain new information about the history and layout of the feudal manor 15th–16th centuries.

УДК 903.4 (476–11)«9/12»

***В. І. Кошман**, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, загадчык аддзела археалогіі сярэдневяковага перыяду, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Мінск)*

Археалагічныя даследаванні помнікаў басейна сярэдняй Бярэзіны ў 2011 г.

Згодна з Дазволам № 2234 па форме № 1, выданага Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, аўтарам былі праведзены археалагічныя раскопкі плошчай 40 м^2 на гарадзішчы Свіслач (Асіповіцкі раён) і палявыя археалагічныя разведкі на тэрыторыі Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці, Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Мэтай працы сталі далейшыя раскопкі помнікаў старажытнарускага часу для збору матэрыялаў па заданні № 1.5.6. «Свіслач і акруга ў часы сярэднявечча».

Гарадзішча Свіслач размешчана на высокім мысе, які ўтвораны ўпадзеннем р. Свіслач ў р. Бярэзіна. З поўдня, захаду і ўсходу гарадзішча мае высокія стромкія схілы вышынёй 10–12 м. Пляцоўка гарадзішча блізкая да трохвугольнай, яе памеры – каля 70 × 70 м. З боку вёскі (з поўначы) умацавана ровам глыбінёй да 2 м і шырынёй да 13–17 м, валам вышынёй каля 2,2–2,5 м і шырынёй каля падэшвы 8,5–9,0 м. Уезд на гарадзішча размешчаны ў разрыве вала з напольнага боку. Помнік даследаваўся ў 1962 г., 1969–1971 гг. Э. М. Загарульскім (каля 720 м^2). У 2000-х гадах вывучэнне паўднёва-заходняй і паўднёва-ўсходняй часткі гарадзішча было адноўлена А. У. Ільюцік і В. І. Кошманам (з улікам сезона 2011 г. раскапана 172 м^2).

Культурны слой на гарадзішчы мае магутнасць 1,7–2,3 м. Верхнія пласты (0,2–0,4 м) перамешаны і плотныя, маюць шэрую афарбоўку з шматлікімі дамешкамі бітай цэглы, шкла, вапны. Паступова слой набывае інтэнсіўна чорную афарбоўку (0,4–0,6 м) і да мацерыка прадстаўлены гумусіраваным, насычаным вуголлем, часам вільготным слоем з невялікімі ўкрапінамі гліны, пяску, які добра захоўвае косткі рыб і жывёл, часам абпаленае дрэва. Верхнія пласты стратыграфічна можна датаваць XVI–XVII стст., асноўная колькасць культурных адкладанняў звязана з XII–XIII стст. (пачаткам XIV стст. ?), у перадмацерыковым пласце сустракаюцца матэрыялы ранняга жалезнага веку (культура штрыхаванай керамікі).

Падчас работ 2011 г. у раскопе выяўлены:

– фундамент з буйных камянёў на вапнавай рошчыне, для забутоўкі таксама выкарыстоўвалася чырвоная цэгла з клеймамі «Розенбергъ» і «Бобруйскъ». Даўжыня раскрытага фундамента – 10 м, шырыня – 0,5–0,6 м. Час ўзвядзення – другая палова–канец XIX ст. На схематычным плане гарадзішча 1926 г. на гэтым месцы паказаны драўляны сарай;

